культуры адносіцца курганная група № 2 у раёне воз. Арэхаўскае, якая складаецца з 9 круглых і аднаго падоўжанага насыпу. Пры раскопках падоўжанага кургана (9 × 21,3 × 1,5) у яго насыпе выразна фіксуюцца попельна-вугальныя праслойкі. Найбольшая інтэнсіўнасць попельна-вугальнага слоя назіралася ля падножжа насыпу, дзе яго таўшчыня склала ад 0,15—0,2 м каля краёў да 0,4—0,5 м у цэнтральнай частцы. Рэшткі трупаспалення былі змешчаны ў урну вялікіх памераў, устаноўленую вертыкальна ў верхняй частцы насыпу і выяўленую адразу пад слоем дзірвана. Косці былі знойдзены і ў насыпе паблізу пахавальнай урны. Агульная плошча распаўсюджання плямы з развалам гаршка і кальцыніраванымі касцямі склала 1,4 × 1 м. Падобную будову мелі круглыя курганы № 2 (дыяметр 8 м, вышыня 1, 2 м) і № 3 (дыяметр 10 м, вышыня 1, 4 м), якія размяшчаліся побач з падоўжаным курганом. У насыпах абодвух курганоў выразна прасочваюцца попельна-вугальныя праслойкі. Ля падножжа курганоў таўшчыня попельна-вугальнага слоя склала ад 0,2 да 0,4—0,6 м, паступова павялічваючыся ад краёў да цэнтра. У верхняй частцы кургана № 3 выяўлены дзве пахавальныя урны з кальцыніраванымі касцямі. Маленькая пасудзіна ляжала на баку побач з развалам вялікага рабрыстага гаршка, устаноўленага, як можна меркаваць, вертыкальна. У кургане № 2 слядоў пахавання не выяўлена.

Па характары будовы і абрадзе пахавання курганная група № 2 каля возера Арэхаўскае аналагічная курганным могільнікам каля вёсак Дарохі і Павалішына ва ўрочышчы Атокі на поўначы Беларусі, якое Г.В.Штыхаў адносіць да ліку найбольш ранніх курганных старажытнасцей сярэдзіны — 3-й чвэрці 1-га тысячагоддзя н.э.

Літаратура

Левко О.Н. К проблеме этнокультурного развития населения северо-восточной Белоруссии в 1-м — начале 2-го тысячелетия // Славяне: адзінства і мнагастайнасць. Міжнародная канферэнцыя. 24—27 мая 1990 г.: Тэзісы дакладаў і паведамленняў. Мн., 1990.



Пахаванне ў урне з курганнай групы № 2 (курган № 1) каля г.п. Арэхаўск (воз. Перавалочна).

Копысь. Пятроўскі вал.

Заходнія валы крэпасці каля в. Вялікая Міцькаўшчына.

С е д и н А.А. Результаты исследования городища Никодимово в Восточной Беларуси // Насельніцтва Беларусі і сумежных тэрыторый у эпоху жалеза: Тэзісы дакладаў канферэнцыі, прысвечанай 80-годдзю з дня нараджэння А.Р.Мітрафанава. Мн., 1992.

Очерки по археологии Белоруссии. Мн., 1972. Ч. 2. С. 18—20.

Ю.У.Каласоўскі.

Археалагічныя даследаванні ў Аршанскай акрузе

У канцы ліпеня і ў пачатку жніўня 1928 г. экспедыцыя кафедры археалёгіі Інстытуту Беларускае Культуры, у складзе А.Н.Леўданскага, С.А.Дубінскага, пры ўдзеле студэнта А.Каваленкі і настаўніцы І.І.Рытар і дапамозе Аршанскага Акруговага Краязнаўчага Таварыства (у раскопках прымалі ўдзел Д.М.Васілеўскі і інш., на археолёгічныя даследы ў Аршаншчыне таварыствам было адпушчана 70 р.) правялі археолёгічныя раскопкі: гарадзішча ў Воршы, 3-х курганоў у ўроч. Дубкі на левым беразе Дняпра, 5 курганоў каля вёскі Гразівец пад Воршай на р. Аршыцы, гарадзішча і 21 кургана каля в. Чаркасава Аршанскага раёна.

Група курганоў, лікам 30, знаходзіцца ў 2,5 км ад Аршанскага гарадзішча, на левым беразе р. Днепра, у ўроч. Дубкі. 29 курганоў згрупаваны разам каля падошвы ўзгорка, парасьлі рэдкімі дубамі. Вясной яны заліваюцца павадкамі. Адзін курган ляжыць водаль, на ўзгорку, на рольлі. Магчыма, што тут было і больш курганоў, але яны развораны.

Усе курганы маюць невялікія памеры, а некаторыя ледзь прыкметны на паверхні. Насыпаны яны з супяску і маюць навокал ямкі, з якіх узята зямля для насыпання курганоў. На вяршынях некторых курганоў таксама есьць ямкі, якія ўтварыліся, як высьветлена пры раскопках, ад асядання зямлі пад грунтавымі магіламі.

Былі раскопаны 3 самыя вялікія курганы. У ва ўсіх трох знойдзены звычайныя пахаванні ў грунтовых ямах, без рэчаў.

На поўнач ад Аршанскага гарадзішча, у 4,5 км, на левым баку р. Аршыцы, каля в. Гразівец знаходзіцца група курганаў, лікам 169. Насыпаны яны на ўзвышаным месцы і амаль усе параслі хвоямі і хмызьняком.

Курганоў было тут значна больш, але шмат іх разворана. Разворваюцца яны тут ужо з даўніх часоў, аб чым піша ў сваіх працах Н.Е.Брандэнбург, які рабіў тут раскопкі ў 1889 годзе (Н.Е.Бранденбург. Журнал раскопок. Сиб. 1908, стр. 200—221).

У значнай колькасці курганы насыпаны блізка адзін каля другога, памеры ў большасці нязначныя, але сярод іх ёсць 4 курганы, якія ў вышыню дасягаюць да 2 і больш метраў. Курганы насыпаны з пяску; навокал іх ёсць раўкі і ямкі, з якіх бралі зямлю да пабудовы курганаў.

Аршанскае гарадзішча дагэтуль нікім не дасьледвалася (!).

У пазьнейшыя часы (у канцы 13 і пачатку 14 ст.) плошча гарадзішча была павялічана, выкапаны быў упоперак мыса новы глыбокі роў з р. Аршыцы ў Дняпро і пабудаваны драўляныя сьцены.



Прадметы, знойдзеныя А.М.Ляўданскім у час раскопак курганоў каля в. Чаркасава.

Зробленыя раскопкі ў старадаўняй частцы гарадзішча паказалі, што яно ўзнікла не раней 10 ці ў пачатку 11 ст. З раскопак выявілася, што на месцы гарадзішча існавала стаянка бронзавай эпохі. Было знойдзена два каменных скрабкі, шліфаваны клін, тры абломкі глінянай пасуды.

У час раскопак была заложана адна траншэя памерам 1 × 13 м і 3 невялікія шурфы. З рэчаў тут знойдзены: абломкі ганчарнай пасуды, жалезны замок, частка цугляў, абломкі жалезнага нажа, жалезны цвік, кавалкі сьлюды, абломкі тачыльных брускоў, сердалікавая пацерка, абломкі шкляных вітых і гладкіх бранзалетаў, сьветлага, цёмнага, шэрага, жоўтага, сіняга і зялёнага колераў з жоўтымі палоскамі і без іх, абломкі глінянай замазкі (атынкоўкі) ад драўляных хат, якія тут ка-



Рэчы з раскопак курганоў каля в. Чаркасава.

лісьці былі. Усе гэтыя рэчы і гліняную замазку можна аднесці да часу раней 15 ст.

Знойдзена тут досыць значная колькасць касцей свіні, бабра і інш. дробных і буйных жывёл.

Кераміка гарадзішча. Пасуда гарадзішча зроблена на ганчарнам коле ў большасці з шэрай і чырвонаватай (добра адлучанай і з дамешкай пяску) гліны. Пасуда добра апалена. Форма яе — гаршкападобная і без вушкаў (у адным выпадку ў краі гаршка заместа вушка зроблена дзірачка). Памер пасуды сярэдні: шырыня горла ў большасці 14—18 см, шырыня днішча 14 і менш, таўшчыня сьценак пераважна 0,5—1,1 см. На днішчы есьць сьляды пяску, які падсыпалі на кола ў працэсе вырабу пасуды.

Арнамент пасуды ў большасці прасталінейны і хвалісты, у адну або некалькі ліній, рэдка сустракаюцца орнамент насечкі і інш. У большасці ж пасуда была не орнаментавана.

Прадметаў жа, у тым ліку і абломкаў глінянай пасуды больш знойдзена 11—12 ст. А гэта ў сваю чаргу сьведчыць аб тым, што ў гэтыя стагоддзі і жыццё на гарадзішчы ішло больш інтэнсіўна.

З прадметаў, якія трапілі ў Воршу з поўдня і Візантыі, зьяўляюцца шкляныя бранзалеты 12 ст. і шыферныя прасліцы, якія выраблялісь на Валыні.

У наступныя 13—14 ст. гарадзішча было пашырана і служыла ваенна-адміністрацыйным цэнтрам. Рэчаў гэтага часу на гарадзішчы знойдзена вельмі мала: некалькі цьвікоў, абломкаў жалезных прадметаў, невялікая колькасць абломкаў глінянай пасуды.

Патрэбна адзначыць, што такіх гарадзішч, як Аршанскае, пабудаваных у пазьнейшы час (9—11 ст.) на Дняпры мы знаем яшчэ пакульшто два ў Гнездаве пад Смаленскам.

А.М.Ляўданскі.

Друкуецца па кн.: Запіскі аддзела гуманітарных навук БАН. Мн., 1930. Кн. 11. Працы археалагічнай камісіі, т. 2.

Шляхамі далёкіх продкаў

(турысцка-краязнаўчае даследаванне)

Шэраг навукоўцаў спрабуе знайсці адказ на пытанне аб месцазнаходжанні волака ў Днепра-Дзвінскім міжрэччы старажытнага воднага шляху з «варагаў у грэкі». У «Аповесці мінулых часоў» летапіс толькі ўзгадвае агульны накірунак гэтага шляху з Дняпра на Ловаць, прапускаючы прамежкавыя пункты. Значыць, кожны можа мець свой пункт погляду на маршрут старажытнага волака з Дняпра на Заходнюю Дзвіну. Сёння яшчэ цяжэй адназначна вызначыць маршрут волака з-за недахопу інфармацыі ў розных узаемазвязаных галінах ведаў (гісторыя, геаграфія, археалогія, лінгвістыка і г.д.). Няма і пісьмовых крыніц.

Вывучэнню розных варыянтаў воднага шляху з Дняпра на Заходнюю Дзвіну (ці наадварот) былі прысвечаны дзве водныя навукова-турысцкія экспедыцыі аршанцаў — «Барысфен—Рубон'89» (са старажытнагрэчаскай — «Дняпро—Заходняя Дзвіна») і «Рша—Орша—ORSA'90». У выніку гэтых даследаванняў прыадкрылася тайна ўзнікнення назвы нашага горада, абазначаны вузлавыя пункты міграцыі фіна-угорскіх плямён і ўдакладнены маршруты перасоўвання балтаў.

Мінулае, асабліва невядомае, заўсёды спачатку інтрыгуе, а ўжо потым абуджае затоенае ў кожным з нас імкненне да пазнання ісціны. Пры падрыхтоўцы да экспедыцыі кінулася ў вочы тое, што раён Днепра-Дзвінскага міжрэчча каля Оршы абдзелены ўвагай спецыялістаў. Сёння яшчэ лічыцца, што прадстаўнікі балцкага насельніцтва пры пераходзе з Заходняй Дзвіны на Дняпро выкарыстоўвалі звязку рэк Каспля—Катынь. Але геаграфічнае становічша Оршы, наяўнасць у гэтым раёне помнікаў археалогіі, гідронімаў з балцкай асновай, водны рэжым рэк сведчаць аб яўным прырытэце гэтай мясцовасці над раёнам каля пас. Гнёздава. Па-першае, найбольш блізка Заходняя Дзвіна і Дняпро адна да адной падыходзяць менавіта паміж гарадамі Оршай і Віцебскам (па прамой 80 кіламетраў). А воднае падарожжа з Віцебска ў Оршу з волакам праз водападзел складае каля 150 кіламетраў. Гэта на 100 кіламетраў меней, чым па звязцы рэк Каспля—Катынь. Па-другое, менавіта ў вузлавых пунктах найкарацейшай адлегласці паміж Дняпром і Заходняй Дзвіной яўна не выпадкова размешчаны два даволі буйныя паселішчы — Орша на Дняпры і Віцебск на Заходняй Дзвіне. Па-трэцяе, гэтыя два гарады знаходзяцца на берагах не толькі вялікіх рэк, але яшчэ адначасова і ў вусці сярэдніх рэк, якія збягаюць з супрацьлеглых бакоў водападзела: Орша — на берагах Дняпра і ў вусці Аршыцы, Віцебск — на берагах Заходняй Дзвіны і ў вусці Лучосы. Па-чацвёртае, сёння (верагодна, і раней) сярэднегадавы расход вады ў вусці Аршыцы ў 3 разы большы, чым у вусці Катыні (калі параўноўваць 2 варыянты вандроўкі з Заходняй Дзвіны на Дняпро па звязках рэк Лучоса—Аршыца і Каспля—Катынь). У вусці Аршыцы — 3,3 куб. м/сек, а ў вусці Катыні — каля 1 куб. м/сек. Па-пятае, менавіта на водападзеле ў вярхоўі р. Аршыца падчас першай экспедыцыі ў 1989 г. было знойдзена каля 80 старажытных курганных пахаванняў. Падобных пахаванняў і ў такой колькасці няма на водападзеле ў вярхоўях рэк Каспля і Катынь. Па-шостае, у вярхоўі р. Аршыца знаходзіцца невялікае воз. Перавалочна, у корані назвы якога прысутнічае славянскае слова «волак». Падобных гідронімаў ад Смаленска да Лепеля ў Днепра-Дзвінскім міжрэччы няма.

У час першай экспедыцыі 8 груп аршанскіх турыстаў (90 чалавек) прайшлі па трох магчымых варыянтах воднага шляху, стартаваўшы ў Оршы, а фінішаваўшы ў Віцебску. Адзін маршрут пралягаў па р. Адроў з волакам праз водападзел да вытоку р. Дабрынка, пасля сплаву якой вандроўка завяршылася на р. Лучоса ў Віцебску. Другі і трэці маршруты пачыналіся з пад'ёма па р. Аршыца да воз. Перавалочна, адкуль быў праведзены волак праз водападзел. У адным выпадку на воз. Дзевінскае, а далей сплаў па р. Серакаратнянка да р. Абалянка і далей па Лучосе да Віцебска. У другім выпадку — волак з воз. Перавалочна быў праведзены на воз. Ардышэва, а далей сплаў па р. Ардышэўка да Лучосы ў Віцебску.

У выніку экспедыцыі былі атрыманы доказы магчымасці ажыццяўлення воднай вандроўкі з Оршы да Віцебска з волакам праз водападзел, даследаваны месцы магчымых

волакаў, дзе знойдзены шэраг помнікаў археалогіі, яшчэ невядомых археолагам.

Так, у сярэднім цячэнні р. Адроў, паміж вёскамі Ламачына і Горная Веравойша, на левым беразе ракі знойдзена сістэма невядомых каналаў, нават сёння напоўненая рачной вадой. Шырыня канала ад 1 да 3 м, даўжыня да 30 м. З бакоў яны абмежаваны прадаўгаватымі пагоркамі шырынёй 5—6 м, вышынёй да 3 м. Перапад паміж вяршыняй пагоркаў і ніжняй адзнакай канала сёння складае 5—6 м. Невядома іх прызначэнне і час з'яўлення. Але, калі па р. Адроў у старажытнасці пралягаў водны шлях, то гэта сістэма каналаў магла служыць рамонтнай базай, «стрэлачным пераводам» суднаў ці месцам для перавалкі грузаў.

Болей за ўсё на знаходкі пашанцавала тым, хто ішоў па р. Аршыца. Спачатку мясцовыя жыхары падказалі, што на воз. Вялікае Арэхаўскае ёсць шэраг месцаў, дзе ў назвах прысутнічае слова «прыстань». Гэта Кірэеўская, Юр'ева, Пляханаўская і Бабінская прыстань. Значыць, прынамсі, славяне выкарыстоўвалі гэты раён для водных перасоўванняў. Гэта пацвярджае і назва размешчанага побач воз. Перавалочна. Галоўным жа аргументам на карысць існавання тут, у далечыні ад дарог, менавіта на водападзеле, буйнога паселішча з'яўляюцца знойдзеныя ўдзельнікамі экспедыцыі каля 80 курганных пахаванняў. Відавочна, што людзі, якія жылі тут, удзельнічалі ў пераадоленні водападзела.

Ёсць і яшчэ адна знаходка — камень, падобны на паказальнік, які ўдзельнікі пераходу знайшлі прыкладна на сярэдзіне волака паміж азёрамі Перавалочна і Ордышава (даўжыня волака каля 6 км). На яго амаль гарызантальнай плоскасці прыкладна на 2 см выразна выступае адносна правільная страла, вастрыё якой дакладна паказвае на азёры Дняпроўскага схілу водападзела. Азімут стралы прыкладна 120°.

Доказаў штучнага паходжання гэтага каменя няма. Але ж колькі выпадковасцей уварваў у сябе гэты нямы сведка гісторыі асваення Днепра-Дзвінскага міжрэчча! Па-першае, ён размешчаны на водападзеле; па-другое, менавіта па сярэдзіне водападзела; па-трэцяе, камень мае выступ, падобны на стралу; пачацвёртае, вастрыё гэтай стралы накіравана не куды-небудзь, а паказвае менавіта правільны накірунак волака з воз. Ордышава на вадаёмы Дняпроўскага схілу...

Піянерамі ў асваенні шляху «з варагаў у грэкі», як лічыцца, былі балты. Мы ж пакуль вялі гаворку пра ролю славян у асваенні водападзела ў гэтым раёне. А ці ёсць сляды балтаў? Як аказалася, маюцца, і даволі яўныя. З гідронімаў неславянскага паходжання побач з Оршай увагу прыцягнула назва р. Адроў (правы прыток Дняпра). Раней, да сярэдзіны 19 ст. яна называлася Адроў, часам Ордаў. Вядомы беларускі навуковец В.А.Жучкевіч у сваім «Кароткім тапанімічным слоўніку Беларусі» выказаў меркаванне пра тое, што першапачатковая назва ракі найбольш верагодна блізкая да балтыйскага АРДА(С) — «спрэчка, падзел». У сваю чаргу ён не выключае і цюркскага паходжання асновы «орд», якая азначае «саюз, калектыў, аб'яднанне». Дык ці можна сёння, пасля таго, як прайшлі стагоддзі, устанавіць «хросных» асновы «орд»?

Аказалася, з пэўнай ступенню дакладнасці, можна! Так, у нашай Віцебскай вобласці маецца шэсць гідронімаў з асновай «орд». Прычым у Днепра-Дзвінскім міжрэччы менавіта паміж Оршай і Віцебскам размешчаны чатыры. Гэта рэкі Адроў (Ордаў), Ордышаўка, Ордзежанка, воз. Ордышава. А на водападзеле рэк Заходняя Дзвіна — Ловаць яшчэ два. Гэта азёры Ордава і Ордасна. Усе 6 названых гідронімаў аб'ядноўваюць 2 агульныя прыкметы: яны размешчаны менавіта на водападзелах вялікіх рэк і строга на маршруце прадстаўнікоў балтыйскага насельніцтва, якія рухаліся з Балтыкі на Чорнае мора. Іх месцазнаходжанне менавіта на водападзеле болей адпавядае балцкаму паходжанню гідронімаў з асновай «орд». Бо тлумачэнне гэтай асновы як «спрэчка, падзел» блізкае да значэння «водападзел» (а верагодна, гэта значэнне і з'яўляецца першасным). Дарэчы, у Днепра-Дзвінскім міжрэччы ад Смаленска да Лепеля няма гідроніма з асновай «орд».

Гідронімы з гэтай асновай сустракаюцца як на поўнач, так і на поўдзень ад Оршы, але зноў жа на нітцы старажытнага шляху «з варагаў у грэкі». Так, у Ленінградскай вобласці ёсць р. Орадзеж, прыток р. Луга, якая ўпадае ў Фінскі заліў, у Румыніі — р. Арджэш, левы прыток Дуная, які ўпадае ў Чорнае мора, у Балгарыі — р. Арда, прыток р. Марыца, якая ўпадае ў Міжземнае мора.

Ёсць і яшчэ адна акалічнасць, якая сведчыць на карысць балтыйскіх каранёў асновы «орд». Існуе такое паняцце, як «фіёрд» — заліў. Як відаць, аснову гэтага слова складае «орд». Яе вытокі знаходзім у Скандынавіі (у шведскай і нарвежскай мовах).

Падказка ў разважаннях і штуршок да новых пошукаў былі адшуканы ў дзённікавых запісах вядомага беларускага даследчыка Сібіры канца 19 ст. Д.Чэрскага, зробленых ім падчас яго экспедыцыі па р. Калыма. Апісваючы наваколлі ракі ніжэй Сярэднекалымска, ён прыводзіць мясцовую назву аднаго з раёнаў — «Орта-тас», якая азначае «Сярэдні камень». Такім чынам, значэнне балтыйскай асновы «орд» — «спрэчка, падзел» (па В.А.Жучкевічу), «водападзел» (новае значэнне слова, якое з'явілася ў выніку вышэй прыведзеных разважанняў) і якуцкай асновы «орт» — «сярэдзіна» ў прымяненні да гідрасеткі, азначае адно і тое ж — сярэдзіну воднага шляху, нейкае сярэдняе становішча.

Але як звязаць амаль аднолькавае значэнне асновы «орт—орд»? Ёсць адно меркаванне. Як лічаць навукоўцы, фіна-угорскія плямёны, якія раней жылі за Уралам, пачалі мігрыраваць раней за балтыйскае насельніцтва. У такім выпадку, дасягнуўшы Балтыкі, прадстаўнікі паўночнай галіны фіна-уграў цалкам маглі сюды прыўнесці сваё значэнне асновы «орт», якая трансфарміравалася ў «орд». І сапраўды, у Буріяціі маецца пасёлак Усць-Ардынскі, у Новасібірскай вобласці — Ардынскае, у Пермскай вобласці — Арда, у Марый Эл і ў Ніжне-Наўгародскай вобласці — Ардатаў, на водападзеле рэк Волга — Заходняя Дзвіна — Ардынок і г.д. Такім чынам, праз некалькі стагоддзяў ужо балцкая аснова «орд» цалкам магла зрабіць падарожжа з поўначы на поўдзень разам з балтамі.

Пры разглядзе тапанімікі, характэрнай для фіна-уграў, на Урале, у Акцюбінскай і Арэнбургскай абласцях увагу прыцягнула р. Ор, левы прыток р. Урал, у вусці якой размешчаны г. Орск. Аснова гэтых назваў — «Ор». Некалькі відазмяніўшыся і як складаная частка яна таксама ўваходзіць у словы «арлея» і «орша».

Спачатку разгледзім арэал распаўсюджання гідронімаў з асновай «орл». Першае месца, дзе яны сустрэліся, — водападзел Волгі і Заходняй Дзвіны. Гэта воз. Арлінскае, з якога бярэ вытык р. Арлінка, якая ўпадае ў воз. Волга. На водападзеле рэк Заходняя Дзвіна—Дняпро маецца толькі адзін гідронім — р. Арлея, правы прыток р. Дняпро. Няма падобных гідронімаў і на поўдзень.

Але затое цэлае сямейства падобных гідронімаў знойдзена на верагодным паўночным шляху перамяшчэнняў фіна-уграў. Гэта азёры Арлейка і Арлея ў вярхоўях правых прытокаў Заходняй Дзвіны; на водападзеле рэк Заходняя Дзвіна — Вялікая — воз. Арлея, у вытоку р. Невядранка, левага прытока р. Вялікая. Маюцца падобныя гідронімы і перад Балтыкай. Гэта воз. Арлінскае, з якога бярэ вытык р. Арлінка, правы прыток р. Орадзеж, якая ўпадае ў р. Луга, якая сваімі водамі сілкуе Фінскі заліў.

Зыходзячы з аналізу размяшчэння гідронімаў з асновай «орл», напрошваецца выснова, што яна, верагодна, характэрная для фіна-угорскіх плямён, якія рухаліся ў паўночным накірунку. І ці не паказвае яна на іх маршрут? У прымяненні да гідрасеткі аснова «орл», верагодна, можа азначаць «вадазбор», таму што існуе трава орлік, іншая назва якой — «вадазбор»...

Для паўднёвага ж адгалінавання мігрыруючых фіна-угорскіх плямён, верагодна, найбольш характэрная аснова «орша». Так, у Марый Эл размешчана 7 населеных пунктаў і адна рака з асновай «орша». На Урале, на ўсход ад Волгі, таксама сустракаюцца тапонімы з гэтай асновай. Гэта ў Пензенскай вобласці пас. Аршанаўка, у Буріяціі і ў Іркуцкай вобласці — пас. Аршан, у Краснаярскім краі — пас. Аршанаў. Дарэчы, «аршан» па-бурацку азначае «лекавая крыніца». У марыйскай мове слова «орша» складаецца з двух слоў. «Ор» — рэчышча, «ша» — суфікс, які азначае ваду. Такім чынам, па-марыйску «орша» — праточная вада, рака ці вада, якая цячэ ў рэчышчы. А варыянт слова «Орша» — верагодна, вынік славянскай адаптацыі.

Уверх па Волзе ад Марый Эл, у Цвярской вобласці, знаходзіцца р. Орша, а ў яе вярхоўях — воз. Аршынскае. Пераадолеўшы водападзел рэк Заходняя Дзвіна — Вялікая, ужо ў Пскоўскай вобл. знойдзем воз. Орша, з якога бярэ вытык р. Аршыца (басейн р. Вялікая). Падобныя тапонімы знаходзім і на поўдзень. Гэта наш горад — Орша, які стаіць ля вусця р. Аршыца. У Чарнавіцкай вобласці ў вярхоўі р. Прут размешчаны пас. Аршэўцы, а

ў Румыніі на р. Дунай знаходзіцца пас. Аршова.

Вось мы і падышлі да магчымай разгадкі назвы нашага горада Оршы і вызначэння яго заснавальнікаў. Яны — яўна фіна-угорскага паходжання з Ніжняга Паволжа.

Такім чынам, сёння можна выказаць меркаванне, што ў месцы, дзе знаходзілася паселішча Орша (на Дняпры), у старажытнасці ў розныя стагоддзі перасякаліся водныя шляхі фіна-угорскіх плямён (верагодна, іх паўднёвае адгалінаванне), затым балцкага, а ўжо потым — славянскага насельніцтва. Так, на памяць аб сабе фіна-угорскія падарожнікі на поўнач ад нашага горада пакінулі воз. Вялікае Арэхаўскае, р. Аршыца і паселішча Орша, балты — рэкі Адроў (Ордаў), Ардзежанка, Ордышаўка і воз. Ордышава. Ну, а славяне — воз. Перавалочна. Болей нідзе ў Днепра-Дзвінскім міжрэччы няма такой канцэнтрацыі гідронімаў, што яўна сведчыць аб значным прыярытэце гэтага раёна перад іншымі месцамі магчымых водных перамяшчэнняў старажытных падарожнікаў.

Завяршыўшы даследаванні, разумею, што шэраг меркаванняў і разважанняў навеяны паходнай рамантыкай. Зразумела і тое, што пры экскурсе ў мінулае заўсёды прысутнічаюць элементы домыслу і здагадак.

Для мяне ж удзел у водных даследаваннях — існасць жыцця, абвостранае адчуванне сваіх вытокаў, абуджаны покліч продкаў, які спачатку пацягнуў у дарогу, а затым запрасіў да найцікавейшага пошуку.

Э.Э.Навагонскі.

У СКЛАДЗЕ ПОЛАЦКАГА І СМАЛЕНСКАГА КНЯСТВАЎ

Аршаншчына ў часы Усяслава Полацкага

Першы ўспамін у пісьмовых крыніцах аб мясцовасці, дзе ўзнік г. Орша, адносіцца да 1067 г. Гэта дата звязана з важнымі падзеямі ў жыцці маладой Полацкай дзяржавы. У той час полацкі прастол займаў унук Ізяслава Усяслаў па мянушцы Чарадзей, вядомы сваёй няўрымслівасцю ў дасягненні пажаданага. Ён неаднаразова ўдзельнічаў у ваенных сутыкненнях з паўднёварускімі князямі. Полацкага князя Усяслава не магло задаволіць панаванне паўднёварускіх князёў на Дняпры таму, што шлях з «вараг у грэкі» ў 11 ст. меў велізарнае значэнне. Заходняя Дзвіна давала магчымасць жыхарам Полаччыны далучацца да паўночнай часткі гэтага шляху. Выхад на поўдзень па р. Друць быў малаперспектыўным, таму што яе нізоўе кантраляваў Кіеў. Таму, падтрыманы заможнай часткай насельніцтва зямлі, Усяслаў пачаў ваенныя дзеянні супраць Яраславічаў, спадзеючыся прымусіць іх аддаць яму паўднёвы (у Аршанскім Падняпроўі) адрэзак воднага шляху. У 1065 г. ён зрабіў спробу авалодаць Псковам, але не змог. У 1066 г. ён нечакана лёгка перамог наўгародскага князя Мсціслава, які звярнуўся за падмогай да сваіх родзічаў на поўдні. Усяслаў, акрылены перамогай, разрабаваў Ноўгарад і з вялікім палонам вярнуўся дамоў. Расплата за гэты набег была цяжкай. У 1067 г. Яраславічы захапілі горад на р. Мена, парабавалі воласць на паўднёвай ускраіне Полацкай зямлі і ў крывавай бітве сышліся з Усяславам на р. Неміга, дзе перамаглі, хаця і панеслі вялікія страты. Гэта адбылося зімовай парой, а летам Усяслаў ужо зноў шукаў сутыкнення з Яраславічамі. У гэты раз ён накіраваўся на левы бераг р. Днепр, магчыма, да Святаслава Чарнігаўскага. Ухіляючыся ад бітвы, Усяслаў пад націскам Святаслава падсоўваўся да пераправы на р. Днепр пры ўпадзенні ў яе р. Рша (Аршыца). Адсюль адкрываўся самы кароткі шлях на Полацк. Але на правым беразе Дняпра яго чакалі Ізяслаў і Усевалад. Як паведамляецца ў летапісе, Усяслаў «перееха в лодьи черес Днепр, Изяславу же в шатёр предъидущю и тако яша Всеслав на Рши у Смолиньска». Пастка зачынілася, і Усяслаў Полацкі трапіў у палон, яго адвезлі ў Кіеў і пасадзілі ў поруб (турма з бярвення без дзвярэй).

Няясназць выразу «На Рши у Смолиньска» вызвала розныя тлумачэнні. Так, У.М.Таціщаў і І.П.Барсаў лічылі «Ршу» горадам, прычым апошні з іх сутыкненне Усяслава з Яраславічамі разумеў як барацьбу за Оршу і Копысь. На яго думку, Яраславічы змаглі часова авалодаць Оршай. Абапіраючыся на лінгвістыку і тапанімію, сучасны даследчык Ю.І.Драгун таксама спрабаваў абгрунтаваць магчымасць існавання горада Оршы ў 1067 г. У процілегласць яму М.М.Карамзін, С.М.Салаўёў, а потым археолагі Г.В.Штыхаў і Л.В.Аляксееў ставілі пад сумненне магчымасць прызнаць наяўнасць летапіснай Оршы як горада ў 11 ст. Культурны пласт 11 ст. на аршанскім гарадзішчы самастойна не выдзяляецца. У пласце, што быў выяўлены аўтарам артыкула ў раскопках 1988 г. пад насыпам вала, знойдзены рэчы, якія могуць датавацца гэтым часам. Ю.І.Драгун таксама называе рабрыстыя пацеркі, пацеркі-лімонкі, красала з язычком, наканечнікі стрэл і інш. прадметы, якія адносіць да 11 ст. Але і ў яго раскопах пласт гэтага часу не выдзелены. Упамянутыя рэчы знаходзяцца побач з матэрыяламі, якія могуць датавацца 12 ст. Няма сумнення ў тым, што сам вал вакол пляцоўкі гарадзішча насыпаны ў пачатку 12 ст. Рэчы, якія датуюцца гэтым стагоддзем, сустракаюцца як пад насыпам вала, так і ў перыяд яго існавання. Таму, на наш погляд, гарадскі этап развіцця Оршы пачаўся не раней 12 ст.

Успамін пра Ршу «у Смолиньска» тлумачыцца сучасным даследчыкам А.А.Мяцельскім як арыенцір прыналежнасці рэгіёна Смаленску ў 11 ст. Калі б гэта было так, то барацьба за Аршанскае Падняпроўе не набыла б той вастрыні, якая прасочваецца па пісьмовых крыніцах 11—12 ст. У даным выпадку Смаленск упамінаецца ў летапісе таму, што ён быў адзіным на той час горадам у дняпроўскіх крывічоў. Гэта не азначае, што крывічы Падняпроўя не мелі іншых цэнтраў. Такія цэнтры былі і на тэрыторыі сучаснай Смаленшчыны, і ў Аршанскім Падняпроўі. Некаторыя з іх аб'ядноўвалі вакол сябе радавыя абшчыны, ці невялікія плямёны; іншыя цэнтры — пагосты — былі ўсталяваны княжацкай уладай, якая абкладала данінай крывіцкія землі.

Крывіцкія племянныя структуры ў зоне памежжа Полацкай і Кіеўскай раннесярэдневяковых дзяржаў на водападзеле Заходняй Дзвіны і Дняпра ў 10—11 ст. былі аб'ектамі, куды накіроўвалі свой дзяржаўны позірк як полацкія, так і кіеўскія князі. Верагодна, што ў басейне р. Адроў у гэты час полацкая ўлада магла заснаваць свой фарпост, які павінен быў сачыць за становішчам на паўднёва-ўсходняй ускраіне дзяржавы. Пацвярджэннем гэтага меркавання можа быць успамін у «Павучэнні» Уладзіміра Манамаха пад 1078 г. Одрэска, які размяшчаўся недзе паміж Полацкам і Чарнігаўскім княствам. М.М.Карамзін крытычна ставіўся да гэтага паведамлення, ён лічыў, што назва «Одрэск» адносіцца да Друцка. С.М.Салаўёў давяраў летапісу і лакалізаваў Ордэск на Дняпры ў тым месцы, дзе ў яго ўпадала р. Адроў (Одраў). С.М.Салаўёва падтрымалі Б.А.Рыбакоў, М.М.Ціхаміраў і інш. даследчыкі. Да рэальнай магчымасці існавання такога пункта схіляецца і Л.В.Аляксееў, які неаднаразова праводзіў археалагічныя разведкі па берагах р. Адроўка (Адроў) у пошуках старажытнага горада, хаця і беспаспяхова.

Асноўным ворагам Усяслава Полацкага быў Усевалад Яраславіч, які бачыў у ім рэальнага канкурэнта на велікакняжацкі прастол. Летам 1077 г. Усевалад Яраславіч са сваім сынам Уладзімірам Манамахам хадзіў на Полацк. Магчыма, штуршком да гэтага было тое, што, паводле меркаванняў Л.В.Аляксеева, каля 1073 г. адбылося сватанне сына Усяслава Полацкага Глеба да дачкі Яраполка Ізяславіча. Паколькі Ізяславічы, як і Усеваладавічы, былі нашчадкамі Яраслава Мудрага, яны пастаянна спрачаліся за права наследавання таго ці іншага ўдзела. Шлюбны саюз адной з ліній Яраславічаў з полацкімі князямі ўзмацняў яе і не мог прыйсціся да спадобы другой лініі, у даным выпадку Усеваладавічам. Зімой 1077—78 гг. Уладзімір Манамах (Усеваладавіч) разам з сынам Ізяслава Святаполкам, які накіроўваўся на княжанне ў Ноўгарад, дайшоў да Полацка. Святаполк адправіўся далей, а Уладзімір Манамах спаліў Полацк, а потым з наёмным палавецкім атрадам пайшоў «на Одрьскъ, воюя, та Чернігову», як паведамляецца ў «Павучэнні».

У тым жа 1078 г. Усевалад Яраславіч заняў кіеўскі прастол, а Усяслаў Полацкі, скарыстаўшы адсутнасць Уладзіміра Манамаха ў яго тагачаснай вотчыне Смаленску, напаў на Смаленск. Манамах кінуўся наўздагон і

«павоевав до Лукомля до Логожьска (Логойска), та на Дрьютьскъ воюя, та Чернігову».

Можна зрабіць выснову, што полацкі князь Усяслаў, паставіўшы фарпост на р. Адроў, зрабіў спробу падабрацца да Аршанскага Падняпроўя. Але Манамах адным рэйдам знішчыў гэты пункт. Тое, што даследчыкі дасюль не знайшлі летапіснага Одрэска, можа тлумачыцца тым, што шукалі горад. Але ў Аршанскім Падняпроўі ў часы Усяслава гарадоў не было. Нават Копысь і Орша не мелі тых умацаванняў, якія маглі б аднесці іх да гарадоў. Відаць, полацкі князь Усяслаў не рабіў больш спробы ўмацавацца на тэрыторыі сучаснай Аршаншчыны, і таму Одрэск не аднаўляўся.

Хаця Орша і Копысь не згадваюцца ў часы Усяслава Полацкага ў складзе гарадоў Полацкай зямлі, гэта не значыць, што яны належалі Смаленскаму княству. Абодва гэтыя пункты былі размешчаны на вялікім гандлёвым шляху з «вараг у грэкі». Прычым Копысь заснавана да сярэдзіны 11 ст., а аршанскае паселішча ўзнікла толькі ў канцы 11 ст. Як адзін, так і другі пункты на пачатковым этапе свайго існавання маглі выкарыстоўвацца як пераправы цераз р. Днепр, месца пастою на шляху з поўдня на поўнач і наадварот. І, верагодна, абодва паселішчы ў гэты час падпарадкоўваліся кіеўскай уладзе.

В.М.Ляўко.

Літаратура

З а я ц Ю.А. Полоцкий князь Всеслав и Ярославичи в 1065 – 1066 гг. от Пскова до Белгорода // ГАЗ. 1994. № 4.

Д р а г у н Ю.И. Социально-экономическое развитие белорусского города в XI – XVIII вв. (по материалам Орши). Автореф. канд. дисс. Мн., 1969.

Л е в к о О.Н. Средневековая Орша и ее округа. Орша, 1993.

Лаврентьевская летопись // ПСРЛ. М., 1962. Т. 1.

К а р а м з и н Н.М. История государства Российского. Т. 2. М., 1991. Алексеев Л.В. Полоцкая земля в IX – XIII вв. М., 1966.

Аршанскае Падняпроўе пад уладай Глеба Менскага

У 1101 г. памёр полацкі князь Усяслаў Чарадзей. Да гэтага часу адзін з яго сыноў Глеб атрымаў сабе ў спадчыну Менскі ўдзел. Гэта магло адбыцца да 1085 г. Ён ажаніўся з дачкой Яраполка Ізяславіча і меў магчымасць да смерці бацькі добра ўсталявацца ў сваёй вотчыне. У тым жа 1101 г. Уладзімір Манамах, вораг Усяслава Полацкага і яго сына Глеба, які парадніўся з Ізяславічамі, зноў стаў князем Смаленскім. Відаць, менавіта тады ён давёў заходнюю мяжу Смаленскага княства да Дняпра, уключыўшы ў яго ўсё левабярэжжа Аршанскага Падняпроўя. У Копысі з'яўляюцца ўмацаванні, якія ператварылі яе ў парубежны фарпост. Тым часам пасля смерці Усяслава яго сыны пачалі дзяліць бацькаўшчыну. У Полацку сядзелі Барыс, потым Давід Усяславічы, у Менску — Глеб Усяславіч. Князь менскі Глеб пачаў актыўна шукаць шляхі пашырэння свайго ўдзела. У 1104 г. ён адбіў напад кааліцыі паўднёварускіх князёў, якія хацелі яго прыцішыць: «Сего же лета исходяша, посла Святополк Путяту на Менеск, а Володимер сына своего Ярополка, а Олег сам иде на Глеба, поемше Давыда Всеславича». Але кааліцыя «не успеша ни что». На працягу 11 гадоў Глеб вёў няспынную барацьбу за новыя землі. Гістарычная постаць князя менскага Глеба была адметнай таму, што ён выступае як сапраўдны нашчадак спраў, распачатых дзедам і бацькам. Геаграфічнае становішча ўдзелу Глеба Усяславіча спрыяла пашырэнню яго прасторы аж да Дняпра, адкуль адкрываліся перспектывы шырокіх сувязей са знешнім светам. Гэта, у сваю чаргу, суліла эканамічную моц, упэўненае палітычнае становішча ўсёй Полацкай дзяржаве. Ён не толькі ўзвёў крэпасць Оршу, уключыўшы астатнія племянныя структуры крывічоў у межы Полацкай дзяржавы на правабярэжжы Дняпра. Глеб захапіў і Копысь, якая была парубежным фарпостам Смаленскага княства на левым беразе Дняпра. Гэты горад прываблівaў і сваім эканамічным значэннем. Перавоз цераз раку, мытня і корчмы давалі значныя прыбыткі княжацкай казне. Існаванне на правым беразе Дняпра паблізу ад Копысі вёскі Падкняжэння можа арыентаваць на месцазнаходжанне княжацкага цівуна.

З 1113 г. Уладзімір Манамах займаў вялікі кіеўскі стол, а Смаленскім княствам правіў яго сын Вячаслаў. Каб асадзіць страпцівага князя, Манамах у 1116 г., скарыстаўшы малазначны повад, пайшоў ваяваць Менск. Яго сын Вячаслаў Смаленскі па паведамленню Іпацьеўскага летапісу «взя... Ръшю и Копысу». Захоп і ўключэнне ў склад Смаленскага княства Копысі і Оршы, рабаванне Друцка і вывад яго жыхароў у Пераяслаўскае княства фактычна ліквідавалі галоўныя дасягненні Полацкай зямлі. Таму ў 1119 г. Глеб Менскі ўжо разам з палачанамі «паки начал воевать области Владимировых детей, Новогородскую и Смоленскую». Гэта была кроўная справа ўсёй дзяржавы. Паланенне Глеба Менскага, яго хуткая смерць у Кіеве, далучэнне Менска з воласцю да кіеўскіх уладанняў і страта гэтага ўдзела Полацкай зямлёй не маглі не абярнуцца варожым стаўленнем полацкіх князёў да Кіева. Нездарма ў матэрыялах В.Таціщава, пазначаных 1121 годам, ёсць запіс: «Владимир, князь великий, был с детьми своими в Смоленске для рассмотрения несогласей и усмирения полоцких князей...» Л.В.Аляксееў тлумачыў гэты запіс як паказчык таго, што полацкія князі выступалі ў ролі васалаў Манамаха, якім той дыктаваў сваю волю. М.Ермаловіч правільна ацаніў прычыны «несогласей» полацкіх князёў. Але ён надаў больш шырокі сэнс сустрэчы Манамаха і яго сыноў з полацкімі князямі, параўнаўшы яе са з'ездам у Любечы. На самой справе, тут хутчэй за ўсё клопат Манамаха датычыў толькі інтарэсаў яго сям'і. Таму і дзеці Уладзіміра былі з ім. Верагодна, вырашалася пытанне полацка-смаленскай мяжы ў святле нядаўніх падзей. Узнікненне шэрагу парубежных крэпасцей на правым беразе р. Днепр у 12 ст., якія разам з мяжою Віцебскай воласці, далучанай да полацкай зямлі яшчэ ў 11 ст., утваралі адзіную лінію мяжы са Смаленскім княствам, дазваляе ўспрымаць гэты факт як вынік перамоў. Такім чынам, у якасці кампенсацыі за страту Менскай воласці полацкія князі атрымлівалі Аршанскае Падняпроўе з цэнтрам у Оршы на правым беразе Дняпра. Левы бераг з Копыссю належаў Смаленску. Гэта было вельмі важным дасягненнем Полацкай дзяржавы, якая атрымала магчымасць кантролю над волакамі з басейна Дняпра ў басейн Заходняй Дзвіны на найбольш значным адрэзку воднага шляху.

Пасля смерці Уладзіміра Манамаха (1125) зноў разгарэлася барацьба паміж полацкімі князямі і манамахавічамі. Кіеўскі стол належаў Мсціславу Уладзіміравічу, які арганізаваў напад паўднёварускіх князёў на Полаччыну. У выніку былі ўзяты і парабаваны Лагойск і Ізяслаўль. Друцкі князь Барыс займае полацкі стол. Усё гэта адбылося ў 1128 г., а праз год Барыс Полацкі памёр, полацкія князі зноў узбунтаваліся і былі ў 1130 г. за тое, што «преступиша хрестьное целование», высланы вялікім кіеўскім князем у Візантыю. Гэта падзея рэзка падарвала цэласнасць Полацкай зямлі. Мсціслаў Уладзіміравіч завалодаў усёй зямлёю і «мужи свои посади по городам их», як паведаміў летапіс. У гэты час Аршанскае Падняпроўе магло знаходзіцца пад уладай Смаленскага княства. *В.М.Ляўко.*

У складзе Полацкай зямлі і Смаленскага княства

На мяжы 11—12 ст. Смаленскае княства займала ўсё левабярэжжа р. Днепр, дзе былі размешчаны воласці Мірацічы, Басея, Копыская воласць. Воласць Басея прылягала да воласці Мірацічы на паўднёвым захадзе. Яна ўключала тэрыторыю ўздоўж р. Бася ў сучасных Шклоўскім і Горацкім раёнах. Паміж гэтай воласцю і р. Днепр знаходзілася Копыская воласць. Памеры гэтай воласці спачатку, відаць, былі невялікімі. Ад воласці Басея яе аддзяляла р. Лешча з паўночнага ўсходу, на поўдні яна была абмежавана прытокамі рэк Днепр і Бася крыху вышэй сучаснага г. Шклоў. Заходняй мяжой воласці была р. Днепр. Размешчаная на р. Днепр Копысь выкарыстоўвалася кіеўскай уладай на шляху «з варагаў у грэкі» як месца пастою, зручная пераправа з аднаго боку ракі на другі і адначасова была цэнтрам невялікай акругі. Функцыі Копысі змяніліся, калі, як паказалі археалагічныя даследаванні, на мяжы 11—12 ст. яна ператварылася ў крэпасць. Крэпасцю Копысь магла стаць тады, калі пачала выконваць функцыю фарпоста на заходнім рубяжы

Смаленскага княства. Верагодна, гэта адбылося неўзабаве пасля таго, як у 1101 г. Уладзімір Манамах зноў стаў смаленскім князем. Магчыма, з пераходам Копыскай воласці ў склад Смаленскага княства яе памеры павялічыліся за кошт далучэння тых зямель, што знаходзіліся паміж рэкамі Днепр і Крапіўна, ці Дубровенка (калі яны не ўваходзілі ў воласць Мірацічы). З поўдня да Копыскай воласці прымыкала воласць, цэнтрам якой было, магчыма, паселішча, заснаванае ў 10 ст. каля в. Стары Шклоў. Вёскі з назвамі Смалянцы і Капысіца на правым беразе р. Днепр, размешчаныя паблізу Копысі (у наваколлі р. Бярозаўка — прытока Дняпра), дазваляюць дапусціць, што ў гэтым месцы Копыская воласць пашыралася на правабярэжжа р. Днепр. Але гэта адбылося не напачатку 12 ст., калі Копысь стала парубежнай крэпасцю Смаленскага княства, а значна пазней.

Амаль адначасова з крэпасцю ў Копысі ў процілегласць ёй на правым беразе р. Днепр пры ўпадзенні ў яе р. Аршыца (Ршы) з'явілася крэпасць Орша на падставе адкрытага паселішча канца 11 ст. Яна размешчана на поўнач ад Копыскай воласці, у месцы, адкуль шлях вядзе па р. Аршыца да волаку ў р. Лучоса. Умацаванні крэпасці ў Оршы адносяцца да пачатку 12 ст. Гэтым жа часам датуюцца ўмацаванні гарадзішча каля в. Стражава на правым беразе р. Днепр на тэрыторыі Дубровенскага раёна. Блізкая да стражаўскай канструкцыя абарончага вала зафіксавана і на гарадзічшы каля в. Германы (Дняпроўка), таксама на правым беразе Дняпра. Такім чынам, у 12 ст. з'яўляюцца некалькі крэпасцей уздоўж правага берага р. Днепр адначасова з пашырэннем тэрыторыі Смаленскага княства на захад па яе левабярэжжу. Гэта можна тлумачыць як падпарадкаванне правабярэжных зямель крывіцкіх плямён у зоне волакаў (Аршанскі і Дубровенскі раёны) Полацкай дзяржаве.

Аналіз пісьмовых крыніц, якія адлюстроўваюць палітычную сітуацыю гэтага перыяду, дазваляе зрабіць выснову, што падзел тэрыторыі, якая належала крывічам у межах сучасных Аршанскага і Дубровенскага раёнаў, паміж Полацкай дзяржавай і Смаленскім княствам, адбыўся на працягу 1-й чвэрці 12 ст. Першымі крокамі ў гэтай справе было ўстанаўленне галоўных фарпостаў на р. Днепр — Копысі і Оршы. Калі далучэнне Копысі да Смаленскага княства і будаўніцтва крэпасці звязваць з Уладзімірам Манамахам (1101), то крэпасць Оршу паміж 1104 і 1116 гг. мог пабудаваць Глеб Менскі (Усяславіч), каб супрацьстаяць далейшаму пашырэнню Смаленскага княства на захад, у бок Полацкай зямлі. Паколькі ад Копысі адкрываўся прамы шлях да паўднёвых полацкіх уладанняў, Глеб, відаць, да 1116 г. захапіў і Копыскую воласць. За гэта ён паплаціўся не толькі стратай Менскага ўдзела на карысць Кіева, але і сваім жыццём. Верагодней за ўсё, смаленска-полацкае памежжа было прадметам перамоў паміж полацкімі князямі, з аднаго боку, і Уладзімірам Манамахам і яго дзецьмі, з другога. Перамовы адбыліся неўзабаве пасля таго, як Менскі ўдзел быў адабраны ў Полацкай зямлі. Відаць, у якасці кампенсацыі было абгаворана памежжа па р. Днепр са Смаленскім княствам. Лінію абароны з полацкага боку (правабярэжжа) утваралі крэпасці Орша, Стражава, Германы, якія знаходзіліся на аднолькавай адлегласці адна ад адной. Гэты рад крэпасцей уздоўж правага берага р. Днепр лагічна завяршае гарадзішча каля в. Ганчарова. Яно размешчана паблізу перахода ад вярхоўяў р. Вярхіта да р. Расасна на левабярэжжа р. Днепр і магло кантраляваць гэты пераход яшчэ ў 9—10 ст. Полацкая дзяржава магла выкарыстаць яго пры ўтварэнні памежнай лініі абароны з Смаленскім княствам. Такім чынам, волакі на правабярэжжы р. Днепр, што спалучаліся з р. Лучоса (Аршанскі і Дубровенскі раёны) трапляліі ў сферу эканамічнай дзейнасці Полацкай дзяржавы ў 12 ст. Тыя ж волакі і водныя шляхі, якія вялі з р. Днепр у басейн р. Заходняя Дзвіна на землях, дзе знаходзіўся племянны цэнтр дняпроўскіх крывічоў Смаленск (Гнёздава), трапілі пад кантроль Смаленскага княства пры фарміраванні яго тэрыторыі. Уздоўж воднага шляху з р. Днепр па р. Бярэзіна цераз волак у р. Рутавеч (прыток р. Каспля) з захаду (Полацкі бок) размешчаны ўмацаваныя гарадзішчы, якія храналагічна супадаюць з часам утварэння полацка-смаленскага памежжа з поўначы на поўдзень. Так, на мяжы з Віцебскай воласцю, якая ў 1021 г. была далучана да Полацкай дзяржавы, у 11 ст. ўзнікаюць гарадзішчы каля в. Кашэвічы на левым беразе р. Каспля, каля в. Кавалі на левым беразе р. Рутавеч і каля в. Мікуліна на беразе воз. Вялікая Рутавеч. Ад-

сюль пачынаўся волак у р. Бярэзіна, аб чым сведчыць назва в. Перавалочча. У 12 ст. ўмацаванае паселішча ўзнікае каля в. Прыволле на правым беразе р. Бярэзіна (прыток Дняпра), менавіта тады, калі Полацкая дзяржава ўзводзіць свае крэпасці па правабярэжжы Дняпра. Такім чынам, можна прасачыць, як фарміравалася полацка-смаленскае памежжа ў 11—12 ст. Дарэчы, усе пералічаныя памежныя ўмацаваныя паселішчы спынілі сваё існаванне ў 13 ст.

Пры заснаванні ў 1136 г. Смаленскай епіскапіі князь Расціслаў Мсціславіч (унук Манамаха) у сваёй Устаўной грамаце называе Копысь сярод гарадоў, якія выплочваюць дзесяціну. Грамата «Аб пагароддзі і пачэсці» (1211—18) называе Копысь у ліку 5 адміністрацыйных цэнтраў Смаленскага княства, што плацяць пагароддзе, і ў ліку 2, што маюць права запрашаць на службу епіскапа. Гэта значыць, што да таго часу Копысь дасягнула высокага ўзроўню развіцця, мела значную па памерах воласць і з парубежнай крэпасці ператварылася ў сапраўдны гарадскі цэнтр. Пацвярджэннем гэтага з'яўляецца ўтрыманне ў Копысі такіх даходаў, як «корчмити», «торговое», на карысць князя. На правым беразе р. Днепр у басейне яе прытока р. Бярозаўка на захад ад Копысі, акрамя вёсак Капысіца і Смалянцы, размешчаны вёскі Межнік, Падкняжэння, якія маглі ўваходзіць у правабярэжную частку Копыскай воласці напачатку 13 ст. На поўначы яна набліжалася да Аршанскай воласці.

Адсутнасць у дакуменце Оршы, якая разам з Копыссю была, па паведамленні Іпацьеўскага летапісу, у 1116 г. ўзята сынам Манамаха Вячаславам Смаленскім, дазволіла Л.В.Аляксееву і Г.В.Штыхаву выказаць меркаванне, што яе павярнулі да Полацкай дзяржавы. Верагодна, гэта адбылося тады, калі абазначылася памежжа дзвюх дзяржаўных тэрыторый. На наш погляд, Орша магла быць павернута паміж 1121 і 1128 гг., да таго часу, калі полацкіх князёў выслалі ў Візантыю. *В.М.Ляўко.*

Літаратура

Загорульский Э.М. Открытия в Копыси. // Неман. 1973. № 1.

Ляўко В.М. Гісторыя Шклоўшчыны па археалагічных і пісьмовых крыніцах (да сярэдзіны XVIII ст.) // Беларускі гістарычны часопіс. 1996. № 2.

Левко О.Н. Средневековая Орша и ее округа. Орша, 1993. С. 19.

Дубінскі С.А. Гарадзішча каля в. Германоў Аршанскае акругі // Запіскі аддзела гуманітарных навук БАН. Мн., 1930. Кн. 11. Працы археалагічнай камісіі. Т.2.

Татищев В.Н. История Российская с древнейших времен. М., 1963. Т.2, С. 134.

Штыхов Г.В. Археологическая карта Белоруссии. Мн., 1971. Вып. 2. С. 54, № 352.

Шмидт Е.А. Древние пути из Днепра через водораздел в Западную Двину // Тверской археологический сборник. Тверь. 1994. Вып. 1.

Алексеев Л.В. Смоленская земля в IX—XIII вв. М., 1980. С. 48.

Штыхов Г.В. Города Полоцкой земли (IX—XIII вв.). Мн., 1978. С. 96.

Орша і яе воласць у 12—13 ст.

Як развівалася Орша ў 12—13 ст. паводле археалагічных даных? Матэрыялы раскопак паказваюць, што пасля ўзвядзення ў пачатку 12 ст. крэпасці на месцы неўмацаванага паселішча канца 11 ст., побач з ёю, а таксама на процілеглым беразе р. Аршыца (Рша) насупраць крэпасці пачынае фарміравацца тэрыторыя гарадскога пасада. Пазней тут утварыліся Зааршыцкі і Надняпроўскі пасады. Стаўшы ў пачатку 12 ст. ключавым фарпостам Полацкай дзяржавы на р. Днепр, Орша паступова пераймае функцыі цэнтра ад пагоста каля в. Чаркасава, які быў заснаваны тут яшчэ кіеўскай уладай у 10 ст. Чаркасаўскі пагост (а потым Аршанская воласць) ахопліваў тэрыторыю паміж рэкамі Аршыца (Рша) і Адроў. Само Чаркасаўскае паселішча было размешчана ў цэнтры пагоста на р. Пачаліка (правы прыток р. Аршыца). Апошні этап існавання Чаркасаўскага гарадзішча, як паказалі раскопкі 1990 г., адносіцца да 10—12 ст. Тады ж на ім былі ўзведзены ўмацаванні ў выглядзе падковападобнага вала. Побач з гарадзішчам развівалася селішча. Тут жа знаходзіцца вялікі курганны могільнік. А.М.Ляўданскі ў 1928 г. налічыў там каля 136 курганоў, з якіх быў даследаваны 21.

Гаршчок 13 ст., знойдзены на гарадзішчы ў Оршы. Раскопкі В.М.Ляўко.

Аб тым, што ў басейне рэк Адроў і Аршыца (Рша) магла сфарміравацца ўстойлівая тэрытарыяльная адзінка — воласць (пагост), гаворыць значная колькасць помнікаў археалогіі, якія адносяцца да 2-й палавіны 1-га тысячагоддзя н.э. і пачатку 2-га тысячагоддзя н.э. Гэта гарадзішчы і паселішчы, а таксама курганныя могільнікі, размешчаныя адзін ад аднаго на адлегласці 3—6 км. Варта ўвагі тая акалічнасць, што гарадзішчы, на якіх (або побач з якімі на селішчах) зафіксаваны матэрыялы 10—12 ст. (Вусце, Яромкавічы, Тумінічы, Кучына), утвараюць ланцуг, што цягнецца ад р. Днепр уздоўж правабярэжжа р. Адроў і ахоплівае пагост з поўдня і захаду. Гэты ланцуг дапаўняе гарадзішча каля в. Кісялі, якое размешчана на прытоку р. Адроў — р. Сакалянка і крыху выступае ў бок Друцкай воласці. Яно добра ўмацавана і, як сведчаць раскопкі аўтара артыкула 1988—89 гг., яго верхнія напластаванні ўтрымліваюць разнастайныя матэрыялы 10—12 ст.

Гарадзішча каля в. Кісялі магло выконваць 2 функцыі: галоўнага фарпоста на падыходах да пагоста Чаркасава, а потым Аршанскай воласці і кантралюючага пункта на пераправе з басейна р. Друць у басейн р. Адроў цераз волак паміж р. Крывая (прыток р. Друць) і р. Сакалянка. Аб наяўнасці ў гэтым месцы волака сведчыць назва в. Перавалочна ў Талочынскім раёне, а таксама значная канцэнтрацыя раннесярэдневяковых помнікаў менавіта на паўднёвым адрэзку ўздоўж абодвух берагоў р. Адроў.

На поўдзень ад в. Кісялі таксама на невялікім прытоку р. Адроў каля в. Дзятлава знаходзілася гарадзішча. За 0,5 км ад яго ў бок сучаснага Коханава быў знойдзены Рагвалодаў камень. Вядома, што другі камень — Барысаў — размяшчаўся каля в. Высокі Гарадзец у Талачынскім раёне. Верагодна, што Рагвалодаў і Барысаў камяні вызначалі ў 12 ст. памежжа Друцкай воласці — удзела з суседнімі валасцямі (Лукомскай і Аршанскай). Лукомская воласць увайшла ў Полацкую дзяржаву ў 10 ст. і мела ўжо пэўную тэрыторыю, калі Барыс адзначыў (прыкладна ў 1127—28) заходнюю мяжу Друцкай воласці, што была ў стадыі фарміравання. Рагвалодаў камень паблізу Дзятлаўскага гарадзішча быў устаноўлены (1171), калі побач утварылася новая структурная адзінка Полацкай дзяржавы — воласць з цэнтрам у Оршы. Дагэтуль Чаркасаўскі пагост — утварэнне ў межах племянной структуры — не выклікаў неабходнасці ў замацаванні ўсходняга рубяжа Друцкай воласці.

Тэрыторыя Аршанскай воласці ў 12—13 ст. ахоплівала ўсё правабярэжжа р. Днепр, куды ўвайшлі землі з волакамі ў р. Лучоса. З усходу яна была абмежавана р. Бярэзіна (правы прыток р. Днепр), уздоўж левага берага якой праходзіла мяжа Полацкай дзяржавы. Такое меркаванне можа быць пацверджана тым, што сярод валасцей, якія ў пачатку 16 ст. ўваходзілі ў склад Аршанскага павета, названы Мікулінская і Любаўская. Цэнтры гэтых валасцей размешчаны каля воз. Рутавеч (Мікуліна) і на р. Бярэзіна (Любавічы).

Няма сумнення ў тым, што Аршанская воласць у 12 ст. рэальна існавала, мела значныя памеры і ўваходзіла тэрытарыяльна ў склад Полацкай дзяржавы. У той жа час 2-я палавіна 12 ст. адзначана нестабільнасцю палітычнай абстаноўкі. Гэта датычыцца частай змены князёў на полацкім прастоле, часовага палітычнага падпарадкавання асобных удзелаў Полацкай дзяржавы смаленскім князям.

Усталяванне ў 1-й палавіне 13 ст. гандлёвага шляху па р. Заходняя Дзвіна звязала Полацк, Віцебск і Смаленск у адзіны эканамічны ланцуг. У гэты час фарміруюцца новыя тэрытарыяльна-адміністрацыйныя адзінкі на падставе княстваў-удзелаў, што выдзеліліся са складу Полацкай зямлі. Сярод іх Віцебская зямля, у якую ўваходзіць Аршанская воласць. *В.М.Ляўко.*

Літаратура

Левко О.Н. Средневековая Орша и ее округа. Орша, 1993.

Дубінскі С.А. Чаркасоўскае гарадзішча пад Воршай // Запіскі аддзела гуманітарных навук БАН. Мн., 1930. Кн. 11. Працы археалагічнай камісіі. Т.2.

Ляўданскі А.М. Курганны могільнік каля в. Чаркасава Аршанскае акругі // Запіскі аддзела гуманітарных навук БАН. Мн., 1930 Кн. 11. Працы археалагічнай камісіі. Т.2.

Поболь Л.Д. Археологические памятники Белоруссии. Железный век. Мн., 1983, С. 165–169.

Шынкевіч А.М. Аршаншчына ў адлюстраваннях. Орша, 1993. С. 31, карта.

Штыхов Г.В. Археологическая карта Белоруссии. Мн., 1971. Вып. 2. С. 63, 80.

Насевіч В.Л. Лукомль і Лукомльская воласць // ГАЗ, 1994. № 4.

Любавский М.К. Областное деление и местное управление литовско-русского государства до Люблинской унии. М., 1892.

Летапіс сведчыць

ВЫТРЫМКА З «АПОВЕСІЦІ МІНУЛЫХ ГАДОЎ», ДЗЕ ЎПЕРШЫНЮ ЎПАМІНАЕЦЦА ОРША

В лето 6577 (1067). Заратися Всеслав, сын Брачиславль, Полочьска, и зая Новъгород. Ярославичи же трие, — Изяслав, Святослав, Всеволод, — совокупивше вои, идоша на Всеслава, зиме сущи велице. И придоша ко Меньску, и меня не затворившася в граде. Си же братья взяша Менск, и исекоша муже, а жены и дети вдаша на щиты, и поидоша к Немизе, месяца марта в 3 день; и бяше снег велик, и поидоша противу собе. И было сеча зла, и мнози подоша, и одолеша Изяслав, Святослав, Всеволод, Всеслав же бежа. Ео сем же, месяца иуля в 10 день, Изяслав, Святослав и Всеводод, целовавше крест честный к Всеславу, рекше ему: «Приди к нам, яко не сотворим ти зла». Он же надеявься целованью креста, перееха в лодьи черес Днепр. Изяславу же в шатер предъидущю, и тако яша Всеслава на Рши у Смолиньска, преступивше крест.

В лето 6624 (1116). Приходи Володимер на Глеба; Глеб бо бяше воевал Дреговича и случеск пожёг, и не каяшеться о сем, не покорящеться, но б оне противу Володимеру глаголюще, укоряя и. Володимер же, надеся на бога и на правду, поиде к Меньску с сыны своими и с Давыдом Святославичем, и Ольговича. И взя Вячеслав Ръшю и Копысу, а Давыд с Ярополком узя Дрьютеск на щит, а Володимер сам поиди к Смоленску; и затворися Глеб в граде.

Друкуецца па кн.: Белоруссия в эпоху феодализма. Мн., 1959. Т.1.

ВЫТРЫМКА З «ЛЕТАПІСЦА ВЯЛІКІХ КНЯЗЁЎ ЛІТОЎСКІХ» ПРА МІЖУСОБНУЮ БАРАЦЬБУ КНЯЗЁЎ У ЛІТВЕ І ЗАХОДНІХ ЗЕМЛЯХ РУСІ

Дзейнасць Собаля ў Куцейне працягвалася менш за 2 гады. За гэты час ён выдаў 5 кніг, у тым ліку «Буквар». Затым друкар пераехаў у Буйнічы. Прычына ад'езду дакладна не вядома. Магчыма, яго актыўная дзейнасць выклікала ганенні з боку езуітаў. Верагодна і тое, што ініцыятарам ад'езду аўтара «Буквара» і стварэння ім друкарні ў Буйніцкім манастыры быў сам Труцэвіч, які выдатна зразумеў, што з заснаваннем новай друкарні паявяцца дадатковыя магчымасці для выдання кніг. А тут, у Куцеінскай друкарні, справу якой займаўся Собаль, Труцэвіч спадзяваўся прадоўжыць самастойна. За час сумеснай работы ён стараўся спасцігнуць усе яе прамудрасці. Да таго ж, Собаль пакідаў групу маладых друкароў, з якімі ён ахвотна дзяліўся сакрэтамі ўласнага майстэрства.

Пасля ад'езду Собаля аршанскія друкары выдалі яшчэ 15 кніг. Прадмовы да іх па-ранейшаму пісаў Труцэвіч. З іх можна даведацца, што хвалявала аўтара, якімі думкамі і мэтамі жыў гэты неспакойны і чалавекалюбівы грамадзянін свайго часу.

Як сапраўдны патрыёт і гуманіст паўстае Труцэвіч у такіх простых і ў той жа час шматзначных словах: «Не дзеля прыбытку, а дзеля агульнай патрэбы і карысці надрукавалі і выдалі мы, грэшныя, гэтую кніжыцу ў друкарні манастыра Куцеінскага».

Важна падкрэсліць тое, што ў друкарскай справе Труцэвіч быў безумоўна наватарам. Сведчанне таму — другое выданне «Новага

завета со Псалтирью» (1652). Ужо з першай старонкі чытач не мог не пераканацца, што кніга выдадзена новым чынам. На адных экзэмплярах быў адлюстраваны герб праваслаўнага епіскапа Іосіфа Гарбацкага, на іншых — герб Статкевіча. У першым выпадку змешчана прадмова, прысвечаная епіскапу, у другім — знатнаму феадалу. Такім чынам атрымаліся як бы два выданні. На палях кнігі даваліся тлумачэнні асобных незразумелых слоў або цэлых абзацаў. Перад кожным евангеллем выкладаўся яго змест. Характэрна, што ў далешым і іншыя друкарні пачалі выпускаць кнігі па ўзоры куцеінскага выдання.

І.Труцэвіч многа зрабіў дзеля захавання культуры свайго народа. Ён рэальна ацэньваў тагачасную абстаноўку. У час вайны Расіі з Рэччу Паспалітай 1654—1667 гг. у жніўні 1654 г. Труцэвіч накіраваўся ў Магілёў, дзе асабіста пераканаў гараджан падтрымаць рускае войска. За гэта «Иоиль терпел не малое озлобление», — адзначаў у пісьме цару магілёўскі ваявода Міхаіл Ваейкаў. Аляксей Міхайлавіч пажадаў убачыць ігумена. Сустрэча адбылася неўзабаве пад Смаленскам. Змест гутарак да нас не дайшоў. Але вынік быў нечаканы. Манахі Куцеінскага манастыра паклалі друкарскае абсталяванне на падводы і на чале са сваім ігуменам накіраваліся ў Іверскі манастыр, што пад Ноўгарадам. У даследчыкаў няма адзінай думкі аб такім рашэнні. Па дарозе, у мястэчку Болдзіна, Іаіль памёр. Дакладная дата смерці, як і нараджэння, невядома. Але, па ўсім мяркуючы, адбылося гэта ў канцы 1654-га або пачатку наступнага года, бо ўжо ў лютым 1655 г. куцеінскія манахі выбралі новага кіраўніка, якога ў тым жа месяцы патрыярх Нікан узвёў у сан ігумена.

Пахаваны Труцэвіч у цвінтары Іверскага манастыра. Па загадзе Нікана над яго магілай быў узведзены прыгожы помнік з надпісам і магчыма, партрэтам. У манастырскай рызніцы доўгі час захоўваліся культавыя рэчы, якімі карыстаўся пры жыцці Іаіль. Яны нагадвалі нашчадкам пра чалавека, які сумленна пранёс факел, запалены ад нязгаснага скарынаўскага агню. *І.А. Яршоў.*

Собаль Спірыдон Багданавіч

Пачатак плённай дзейнасці друкароў Аршаншчыны паклаў Спірыдон Багданавіч Собаль — дастойны прадаўжальнік вялікай справы Францыска Скарыны.

Біяграфічных звестак пра С.Собаля захавалася вельмі мала. Невядомы нават год нараджэння славутага друкара. Большасць даследчыкаў лічыць, што нарадзіўся ён не раней 1590-х гадоў. Што датычыць месца нараджэння, ёсць думка, што ён нарадзіўся ў Магілёве ў сям'і мясцовага купца Багдана Ігнатавіча Собаля. Да нашага часу дайшоў дакумент, у якім Багдан Собаль упамінаецца як актыўны член магілёўскага праваслаўнага брацтва яшчэ ў 1597 г. Таму не выклікае здзіўлення тое, што ён стаў адным з кіраўнікоў паўстання жыхароў Магілёва супраць уніяцкага архіепіскапа Іасафата Кунцэвіча ў снежні 1618 г. Вядома, што высокапастаўлены уніят спрабаваў прымусіць гараджан адмовіцца ад праваслаўнай веры і перайсці ва уніяцтва. Крыху раней жыхары Оршы таксама адмовіліся пусціць яго ў горад.

Спірыдон, відаць, быў сведкам снежаньскіх падзей, якія зрабілі ўплыў на ўсё далейшае жыццё друкара. Справа ў тым, што вестка аб паўстанні магіляўчан супраць уніяцтва дайшла да ўрада Рэчы Паспалітай, у склад якой у той час уваходзілі беларускія землі. Кароль Рэчы Паспалітай Жыгімонт ІІІ Ваза наказаў Варшаўскаму суду, які разглядаў гэту справу, жорстка пакараць зачыншчыкаў і кіраўнікоў паўстання. Суд, як і патрабаваў кароль, вынес рашэнне аб пакаранні іх смерцю. Прыгавор быў выкананы ў маі 1619 г. Сярод павешаных быў і бацька Спірыдона Собаля. Больш таго, па рашэнні суда закрываліся праваслаўныя манастыры і цэрквы, іх маёмасць перадавалася Кунцэвічу. Горад павінен быў выплаціць вялікі штраф. С.Собаль рэальна ацэньваў становішча. Жыццё, барацьба, пакуты і мужная смерць бацькі высветлілі перад ім мэту асабістага існавання. Нягледзячы на свой адносна малады ўзрост, ён атрымаў добрую для таго часу адукацыю. Пасля вучобы ў Магілёўскай брацкай школе юнак працягваў навучанне ў Кіеўскай акадэ-

Спірыдон Собаль. Малюнак А.Ермалюгіна.

міі, перавагу ён аддаваў авалоданню замежнымі мовамі. Відаць, у гэты час адбылося яго знаёмства з друкарскай справай, бо Кіеў лічыўся буйным цэнтрам славянскага кнігадрукавання. Даследчыкі мяркуюць, што менавіта пры актыўнай дапамозе маладога друкара ў магілёўскай брацкай друкарні ў 1616 г. была выдадзена першая кніга — «Служэбнік».

Пасля магілёўскага паўстання дзейнасць мясцовых друкароў была забаронена. Чым займаўся Собаль амаль 10 гадоў — невядома. Нечакана аб ім загаварылі, бо ў 1628 г. ў друкарні Кіева-Пячэрскай лаўры ён выдае 3 кнігі. Выданне адразу 3 кніг патрабавала значнай падрыхтоўчай работы, таму верагодна, што ў Кіеў Собаль прыехаў значна раней.

Першым самастойным выданнем Спірыдона Собаля быў «Ліманар» — помнік візантыйскай літаратуры VII ст. Дагэтуль на Русі яго ніхто не друкаваў, і ён быў вядомы толькі ў рукапісах. Малады друкар асабіста зрабіў пераклад найбольш ранняга выдання «Ліманара», які выйшаў у Парыжы на грэчаскай і лацінскай мовах. Духавенства выказала незадаволенасць гэтым выданнем, бо кніга мела шмат свецкіх расказаў. Таму собалеўскае выданне было паўторана толькі ў 1787 г.

Кнігі Собаля былі добра вядомы на Радзіме. Калі паўстала пытанне аб кіраўніку створанай у 1630 г. Куцеінскай друкарні, яе заснавальнікі звярнуліся з прапановай да Собаля. Куцеінскі манастыр ветліва сустрэў маладога, але ўжо вядомага друкара. Дзякуючы намаганням першага Ігумена Іаіля Трупцэвіча і значнай матэрыяльнай падтрымцы багатага беларускага феадала Багдана Статкевіча для яго былі створаны добрыя ўмовы.

Захаваўся пералік друкарскага абсталявання, якое перавёз з Кіева ў Куцейну Собаль — 2 шрыфты, 13 дошак-застaвак, сярод іх тая, якой ён асабліва ганарыўся і даражыў, бо некалі яна належала Івану Фёдараву, 3 дошкі-канцоўкі, некалькі дзесяткаў буйных і малых ініцыялаў, 2 рамкі для тытульных лістоў. Астатнія прыстасаванні зрабілі манахі і мясцовыя жыхары.

Вялікая эрудыцыя, назіранні за жыццём простых людзей, гутаркі з аршанцамі і наведвальнікамі манастыра з іншых месц Беларусі раскрылі перад друкаром цяжкую, змрочную карціну жыцця народа. Ён усё больш пераконваўся ў правільнасці свайго рашэння — аб прыняцці прапановы распачаць друкаванне кніг у Куцейні. Псавала настрой патрабаванне друкаваць толькі рэлігійныя кнігі. Але другога шляху пакуль не было, бо багатыя мецэнаты-апекуны фінансавалі тыя заказы, якія адпавядалі іх інтарэсам. Уласных сродкаў у гэтага таленавітага і надзвычай працаздольнага чалавека ніколі не было. Собаля ўвесь час не пакідала думка, што галоўнай кнігай, створанай Іванам Фёдаравым, перад памяццю якога ён з глыбокай павагай схіляў галаву, была «Азбука». Такую кнігу марыў выдаць і ён.

Іаіль Труцэвіч спачувальна адносіўся да задумак Собаля, але лічыў, што ў абстаноўцы вострай барацьбы супраць польска-каталіцкага націску трэба пачынаць дзейнасць з друкавання богаслужэбных кніг. Вопыт выдання такой літаратуры ў Собаля ужо быў, таму яму спатрэбіўся мінімум часу для іх падрыхтоўкі. Ужо ў пачатку лета 1630 г. з друку выходзіць «Брашна духоўнае», а праз непрацягглы час — «Малітваслоў». Пасля іх выхаду адразу пачалася падрыхтоўка той асноўнай кнігі, аб якой ён столькі марыў, якой жыў і


ПАРАДЕІГМАТА
пѧти славенскі Грамматіки
склоненій.
Первагѡ: мужеское: Числа
единственнагѡ.
Тоѡ влка, тогѡ влки, тому
влцѣ, того влку, ѡ влко,
тѣмъ влкою, ѡтом влцѣ.
Числа двойственнагѡ.
Та влка, тою влку, тѣма
влкама, тыма влкома:

Застаўка куцеінскага буквара Спірыдона Собаля.

якая лепш за іншых павінна была паслужыць справе захавання роднай мовы. Нарэшце прыйшоў гэты доўгачаканы дзень. Собаль апрануў сваю лепшую вопратку. Больш звычайнага затрымаўся ў манастырскім храме. Не хаваючы хвалявання, пайшоў ў друкарню. Вакол сабраліся манахі, шматлікія члены аршанскага праваслаўнага брацтва, мясцовыя жыхары. Ён выйшаў. Высока падняў адбітак тытульнага ліста. Свежая, непресохлая фарба зіхацела на сонцы. Уверсе буйнымі літарамі было надрукавана: «БУКВАР», ніжэй літарамі значна меншымі: «сиречь начало учения детям начинающим чтению извыкати». У цэнтры старонкі і ўнізе друкаваліся выхадныя даныя: «В Кутейне изобразися в типографии Спиридона Соболя Року 1631». Назву кнігі па краях старонкі абрамляў арнамент. Выданне Собалем «Буквара» было значнай падзеяй у кнігадрукаванні.

Аршанскі «Буквар» унёс значны ўклад у справу распаўсюджвання асветніцтва не толькі ў Беларусі, але таксама на Украіне, у Расіі, Літве і нават за мяжой.

У 1632 г. друкар выдае яшчэ адну кнігу — «Часаслоў». У ёй, як і ў папярэдніх выданнях, майстар не парушае склаўшуюся традыцыю беларускага кнігадрукавання. Кожная яго кніга мела прадмову, у якой давалася кароткае тлумачэнне сэнсу, выказвалася падзяка тым людзям, якія аказвалі маральную і матэрыяльную дапамогу ў іх падрыхтоўцы і друкаванні кнігі. Дакладна вядома, што аўтарам многіх прадмоў быў сам друкар.

У гэтым жа годзе Спірыдон Собаль пакідае Оршу і перабіраецца ў Буйнічы, што пад Магілёвам. Чаму? Гэты крок, відаць, быў зроблены пад націскам узнікшых абставін. Актыўная дзейнасць аршанскіх друкароў на чале з Собалем, асабліва выданне вучэбных кніг, занепакоіла мясцовых іезуітаў, якія значна ўзмацнілі свае пазіцыі ў выніку адкрыцця калегіі, будаўніцтва шэрага касцёлаў, а таксама забароны польскімі ўладамі адкрываць у Оршы і наваколлі праваслаўныя школы. Для іх таксама не было сакрэтам, з якой сям'і паходзіў друкар.

Акрамя таго, у куцеінскім манастыры было шмат пісьменных і кемлівых манахаў. Многія з іх дапамагалі майстру ў выданні кніг. Да таго ж дакладна вядома, што і сам Іаіль Труцэвіч таксама добра ведаў друкарскую справу. Таму ў апекуноў і ў самога Собаля не было ніякага сумнення, што выданне кніг у куцеінскай друкарні будзе працягвацца.

У Багдана Статкевіча, якому належалі землі, дзе быў пабудаваны Буйніцкі манастыр, відаць, быў план распачаць і тут кнігадрукаванне. Патрабаваўся вопытны друкар. Спачувальна ставіўся да задумак феадала І. Труцэвіч, якому падпарадкоўвалася гэта рэлігійная ўстанова. Буйніцкі перыяд дзейнасці Собаля адзначаны выданнем толькі адной кнігі. Гэта тлумачыцца тым, што ў сакавіку 1633 г., у адказ на шматлікія просьбы магіляўчан, каралём Уладзіславам IV была знята забарона на дзейнасць магілёўскай брацкай друкарні. Собаль з задавальненнем прыняў прапанову пераехаць у Магілёў. Тут у 1636 г. ён выдаў школьны падручнік «Букварь языка словеньска». Магілёўскі «Буквар» адрозніваецца ад куцеінскага. І не толькі знешнім выглядам. Гэта выданне мела шмат малітваў і іншых рэлігійных тэкстаў. Собаль быў прыхільнікам праваслаўя. Ён добра разумеў важнасць выхавання ў духу вернасці рэлігіі сваіх

Мемарыяльная дошка Спірыдону Собалю на будынку Святадухаўскай царквы Куцеінскага манастыра.

бацькоў. Напружанае становішча ўсё часцей прымушала праваслаўных успамінаць аб Маскве, спадзявацца на яе дапамогу. Менавіта ў гэты час у Собаля ўзнікла думка самому наведаць рускую сталіцу.

Собаль быў не толькі добрым друкаром, але і актыўным прапагандыстам кнігі. З надрукаванай ім літаратурай ён неаднойчы наведаў Кіеў, Вільню, іншыя ўкраінскія і прыбалтыйскія гарады, а у 1637 г. ўпершыню прыехаў у Маскву. Ён падрабязна знаёміўся з друкарскай справай, пераймаў вопыт, дзяліўся сваім, пасябраваў з вядомым друкаром В. Бурцавым. Умовы дзейнасці друкароў расійскай сталіцы былі больш спрыяльнымі, чым у Беларусі. Аб развіцці кнігадрукавання клапаціўся сам цар. Гэтыя ўражанні выклікалі ў Собаля жаданне распачаць самастойную друкарскую дзейнасць у Маскве. У архівах захавалася чалабітная друкара да цара, датаваная 16 красавіка 1639 г., аб дазволе выдаваць кнігі ў Маскве. Адказ цара быў адмоўным. Маскоўскі друкар В.Бурцаў, з якім пазнаёміўся Собаль у першы свой прыезд, даў яму адмоўную характарыстыку. Собаль меў больш дакладнае друкарскае абсталяванне і інструменты. Акрамя таго, яшчэ ў 1628 г., у час падрыхтоўкі «Актаіха», тады яшчэ зусім малады друкар зрабіў смелы крок да авалодання новай, больш прагрэсіўнай тэхнікай гравюры, у аснову якой быў пакладзены медзярыт. Усе гэта азначала, што кнігі Собаля былі больш высокай якасці. Іх ахвотна куплялі ў Маскве, што стварала канкурэнцыю маскоўскім выданням.

У чалабітнай да цара друкар гаворыць аб цесным сяброўстве з кіеўскім мітрапалітам Пятром Магілай, якога ў Маскве памылкова лічылі уніятам. Мітрапаліт цвёрда стаяў на пазіцыі умацавання і пашырэння сувязей з замежнымі краінамі, у тым ліку і з тымі, дзе панавала каталіцтва. Такая палітыка П. Магілы не падабалася маскоўскім уладам.

У адказе рускага цара друкару былі такія словы: «чтоб в его уменье и в книгах смуты не было и от нево б, Спиридона, какая ересь не об'явилася».

Апошнім дакладным фактам жыцця Собаля з'яўляецца яго ад'езд з Вязьмы 22 красавіка 1639 г. назад у Беларусь. Далейшы лёс Спірыдона Багданавіча Собаля — прадаўжальніка справы Скарыны і Фёдарава, перакладчыка кніг з рускай, украінскай, грэчаскай, лацінскай і польскай моў на беларускую — не высветлены. Ёсць думка, што шэраг няўдач, якія напаткалі друкара, прымусілі яго пастрыгчыся ў манахі. Архіяграфічны зборнік упамінае імя Сільвестра Собаля, «бывшего книгопечатника», сярод манахаў, якія сталі членамі магілёўскага брацтва. Большасць даследчыкаў старажытнай кнігі датуюць яго смерць 1645—1646 гг.

І.А. Яршоў.

Вучоныя мяркуюць

Нормальный в настоящее время термин «букварь» в XVI веке, по-видимому, означал скорее учителя или знатока писания чем книгу. Честь первого введения слова «букварь» на титульном листе, как кажется, принадлежит Соболю: Букварем называется его Кутеинская книга 1631 года, но она имела также подзаголовок «Букварь, сиречь начало учения детям, начинающим чтению извыкати». Наконец, в его могилевском издании 1636 года слово употребляется независимо, как обозначение элементарного учебника для детей: «Букварь языка словеньска».

Джон-С.Г.Симонс. О некоторых старопечатных кириллических книгах в Дублине // Исследования и материалы. М., 1963.

Соболь проявлял большой интерес к византийской литературе, одним из первых его изданий был «Лимонарь», вероятно, пользовавшийся успехом у читателей. «Лимонарь» или Луч духовный — памятник византийской литературы VII века. В рукописях «Лимонарь» уже давно был известен на Руси. Вероятно, для издания Соболя был сделан перевод с наиболее раннего издания Лимонаря 1624 года, напечатанного в Париже на латинском и греческом языках.

Из дальнейшего будет видно, что Соболь знал древние языки.

Зернова. А.С. Белорусский печатник Спиридон Соболь. // Книга: Исследования и материалы. М., 1965.

Собаль задумаў арганізаваць шырокую асветніцкую работу з дапамогаю Масквы. Перш за ўсё ў Маскве Собаль устанавіў сувязь з кнігавыдаўцом Васілем Бурцавым. Бурцаў пераймаў собалеўскія выданні, і такое перайманне відно ўжо з 1634 года.

Прашковіч Мікола. Спірыдон Собаль // Полымя. 1967. №3.

Есть достоверные сведения об издательской деятельности этого книгопечатника в Киеве, где при поддержке митрополита Иова Борецкого в 1628—1630 годах он выпустил несколько книг литургического характера. По приглашению мецената Богдана Статкевича, который владел многими землями на Могилевщине, Спиридон Соболь возвратился в Белоруссию. Статкевич выделил ему средства на создание типографии в Кутейно, под Оршей.

Марат Ботвинник. Откуда есть пошел букварь. Мн., 1983.

У «Букваре» Спірыдонам Собалем вырашалася адразу двухадзіная задача — навучанне падрастаючага пакалення і выхаванне яго ў духу праваслаўнай веры. Ён паступова ўводзіў навучэнцаў у каляіну патрэбных ведаў, выхоўваючы разам з тым у іх пэўныя жыццёвыя пазіцыі.

Кандрусевіч Аркадзь. Спірыдон Собаль — магілёўскі першадрукар // Магілёўская праўда. 1990. 18 ліпеня.

Паводле мастацкай аздобы куцеінскія выданні Собаля блізкія да яго кіеўскіх кніг, бо амаль увесь друкарскі матэрыял (два віды шрыфтоў, трынаццаць дошак — застaвак, некалькі дзесяткаў ініцыялаў, тры—чатыры канцоўкі, дзве рамкі тытульных лістоў, дзве дошкі для ілюстрацый «Іаан Дамаскін», «Апостал Лука», «Хрыстос з херувімамі») Собаль перавез з Кіева. Відаць, у Куцейне былі выкананы гравюры «Апостал Лука», «Герб Багдана Статкевіча» і «Піста».

Сапраўдным багаццем Собаля былі ініцыялы. Па стылю гэтыя ініцыялы ўзыходзяць да Скарыны, але ў Собаля яны яшчэ больш набліжаны да жыцця, да мясцовай флоры і фауны.

Шматаў В.Ф. Беларуская кніжная гравюра XVI—XVII стагоддзяў. Мн., 1984.

Самае каштоўнае ў духоўнай спадчыне Собаля — гэта ўпамінанне аб поўным тыражы — 1200 штук — кніжкі «Апостал», 44 аркушы якой былі ім надрукаваны і знаходзіліся як задатак у сыноў сястры друкара — Яўхіма і Мацвея Хадаровічаў. Трэба меркаваць, што было гэта вядомае сёння выданне 1638 года (ці яго другі тыраж), якое было пачата С. Собалем у Магілёве і закончана пазней, ужо пасля смерці друкара.

Ружыцкі Эдвард. Новыя весткі аб беларускім друкары Спірыдоне Собалю // Ніва. Беласток. 1973. 25 сакавіка.

Бярында Памва

Дзеяч усходнеславянскай культуры, вучоны-лексікограф, друкар, гравёр, пісьменнік. Год нараджэння невядомы. Звестак пра адукацыю, месца вучобы, нацыянальнасць, месца нараджэння не захавалася. Пісаў вершы, лісты, празаічныя прадмовы і пасляслоўі. З апошніх відаць, што Бярында валодаў беларускай, стараславянскай, украінскай, грэчаскай, лацінскай, яўрэйскай і інш. мовамі. Пэўны час займаўся выдавецкай справай у Львове, потым быў архітыпографам славянскай друкарні пры Кіева-Пячэрскай лаўры. Кніга Бярынды «На рождество господа бога и спаса нашего Исуса Христа вършъ» (Львоў, 1616) акрамя калядных вершаў уключала творы «На Стефана Первомученника», «На обрѣзаніе господне», «З евангеліа на обрѣзаніе господне», «З ламенту над Васіліем вешким», «На святыя Феофаніа альбо богоявленіа». Яна мае прысвячэнне львоўскаму епіскапу Ераміі Цісароўскаму, у канцы якога аўтар выказвае думку пра патрэбу кнігадрукавання: «Кгды бы ся с книг хвала божаа помножала! «Верш «На Стефана Первомученика» характарызуе Бярынду як паэта-грамадзяніна. Евангелічная гісторыя сведчыць, што Стафан быў асвечаным эліністам, горача прапаведаваў новае вучэнне, за што царкоўныя фанатыкі абвінавацілі яго ў богазневажанні. З евангельскага апавядання Бярында бярэ вобраз мужнага байца «Кротый крви своеі для вѣры не лътовал // и для гонитв менжых сам ся впрод короновал. // Вшелякую боязнь от себе отложивши. // З непрятальми ся Христовыми зразивши, // Фуріи ся орхіеров не боячи, // анъ о их ласку и бы наймнъй стоячи». Вобраз Стафана-першапакутніка выклікаў у сучаснікаў асацыяцыю з пісьменнікам-палемістам С. Зізаніем, які першы ўзняўся супраць украінска-беларускіх царкоўных іерархаў, што далі згоду на унію праваслаўнай і каталіцкай цэркваў. У вершы «На обрѣзаніе господне» Бярында звяртаецца да дзяцей з просьбаю не забываць хрысціян, герояў і рабіць патрыятычныя ўчынкі, як яны. У Кіеве Бярында выдаў «Анфалагіён» (1619), «Гутаркі Іаана Златавуста на 14 пасланняў апостала Паўла» (1623) і інш. Самы значны твор Бярынды, над якім ён працаваў 30 гадоў, — двухмоўны «Лексіконъ славенороссків и имен тлъкованіе» (Кіеў, 1627, 2-е выд. ў 1653 у Куцейне каля Оршы, пад рэдакцыяй і з прадмовай І.Труцэвіча). Памва Бярында памёр 13 (23) ліпеня 1632 г.

І.У. Саламевіч.

Філіповіч Афанасій

Беларускі пісьменнік-публіцыст, палітычны і царкоўны дзеяч. Нарадзіўся у 1597 (?) г. на Брэстчыне у сям'і рамесніка. У дзяцінстве атрымаў даволі добрую адукацыю, што пазней дало яму магчымасць працаваць хатнім настаўнікам. З 1620 г. працаваў пры двары князя Льва Сапегі настаўнікам Я.Лубы, якога польскія прыдворныя колы выдавалі за рускага царэвіча. У 1627 г. Філіповіч пастрыгся ў манахі пры віленскім Святадухаўскім манастыры. Жыў у Куцеінскім (пад Оршай), Міжгорскім (пад Кіевам), Дубайскім, Купяіцкім (каля Пінска) манастырах; у 1640—43 г. Ігумен Сімяонаўскага манастыра ў Брэсце. У 1637—38 г. ездзіў да расійскага цара ў Маскву. Пра мэту і вынікі свайго візіту у Маскву напісаў спецыяльную рэляцыю, або, якім потым сам назваў яе, «Гісторыю падарожжа ў Маскву». Гэта быў першы публіцыстычны твор Філіповіча, у яім ён у своеасаблівай форме, выкарыстоўваючы арыгінальныя паэтычныя прыёмы, расказаў пра цяжкае становішча праваслаўнага насельніцтва Беларусі і Украіны ў складзе Рэчы Паспалітай. Лічачы набожнага расійскага цара Міхаіла Фёдаравіча адзінай апорай прыгнечаных праваслаўных, Філіповіч імкнуўся пераканаць яго ў неабходнасці ваеннага ўмяшання ў справы Рэчы Паспалітай. За актыўнае процідзеянне Брэсцкай царкоўнай уніі 1596 г. і рэзкія выпады ў адрас караля на дзяржаўных сеймах (1641 і 1643 гг.) Філіповіча саслалі ў Кіеў (1643). Тут у чаканні суда духоўнай кансісторыі з мэтаю свайго апраўдання Філіповіч на-

Дыярыуш

Дыярыуш А.Філіповіча.

пісаў тлумачальную запіску, у якой выклаў мітрапаліту Пятру Магілу прычыны, што прымусілі яго рабіць пэўныя захады ў абарону праваслаўя. Суд кансісторыі вызваліў Філіповіча з-пад арышту і адпусціў у Брэст. У кастрычніку 1744 г. польскія ўлады арыштавалі Філіповіча як «дзяржаўнага злачынцу» па справе Я.Лубы, выхавацелем якога ён быў. Падставай для арышту паслужыла паведамленне Філіповіча расійскаму паслу ў Рэчы Паспалітай пра ролю, якую адводзілі Лубу польскія палітыкі. Луба, які ў той час знаходзіўся ў Маскве, быў затрыманы. Польскія ўлады ў адказ затрымалі Філіповіча як заложніка. Зняволены ў варшаўскай турме, ён напісаў і накіраваў каралю шэраг артыкулаў («Навіны», «Фундамент непарадку касцёла рымскага», «Рыхтаванне на суд», «Парада набожная» і іншыя), у якіх з дэмакратычных пазіцый крытыкаваў палітыку Рэчы Паспалітай, царкоўных іерархаў і свецкіх магнатаў, выступаў супраць царкоўнай уніі, за саюз з Расійскай дзяржавай. Выратаванне свайго народа Філіповіч бачыў у адраджэнні і ўмацаванні праваслаўнай царквы. Сваё зняволенне разглядаў як палітычную акцыю і помсту за нястомную барацьбу ў абарону праваслаўнага насельніцтва Рэчы Паспалітай. Ён лічыў, што менавіта з-за царкоўнай уніі ў краіне беспакарана парушаюцца агульнапрынятыя законы і правы як у свецкім, так і ў духоўным жыцці народа, што неаднойчы станавілася прычынай абвастрэння сацыяльных і рэлігійных супярэчнасцей. У адрозненне ад іншых антыуніяцкіх палемістаў, Філіповіч не закранаў супярэчлівых пытанняў царкоўна-дагматычнага багаслоўя, бо добра разумеў, што польскія феадалы і каталіцкая царква пры падтрымцы некаторых праваслаўных іерархаў імкнуліся да уніфікацыі праваслаўнага і каталіцкага веравызнанняў не з рэлігійных, а выключна з палітычных меркаванняў. Яго крытыка уніяцкай і каталіцкай царквы выліваласа ў бязлітаснае выкрыццё кіруючых вярхоў Рэчы Паспалітай.

Нават калі Луба шчасліва вярнуўся з Масквы, Філіповіч не атрымаў жаданай волі. Яго накіравалі ў чарговую ссылку у Кіева-Пячэрскі манастыр. На гэты раз і П.Магіла не прыслухаўся да яго тлумачэнняў. На волю Філіповіч выйшаў толькі ў 1647 г. пасля смерці мітрапаліта. Свабода яго, аднак, была кароткатэрміновая. Паводле даносу па абвінавачванні ў дапамозе казакам Б.Хмяльніцкага фанатычныя салдаты ваяводы Масальскага пасля жорсткіх катаванняў расстралялі Філіповіча каля в. Гершановічы пад Брэстам. У зборніку публіцыстыкі Філіповіча «Дыярыуш» («Дзённік», 1646 г.) сабраны яго падарожныя і тлумачальныя запіскі, успаміны і дзённікі, аўтабіяграфічны нарыс, легенды і містычныя прывіды, пасланні і лісты, выкрывальныя прамовы, канспектыўныя накіды асобных артыкулаў, філасофскія трактаты багаслоўскага характару, а таксама вершы, прысвечаныя барацьбе. Ідэйная насычанасць, каларытнасць і разнастайнасць стылёвых адценняў, багацце апавядальных сродкаў, розных мастацкіх прыёмаў робяць «Дыярыуш» А.Філіповіча адным з яркіх помнікаў пале-

мічнай публіцыстыкі 17 ст. У ім знайшлі адлюстраванне пэўныя грані гераічнай барацьбы беларускага народа за свае нацыянальныя і рэлігійныя правы, культуру, звычаі і традыцыі. Афанасій Філіповіч памёр 15 верасня 1648 г.

ІЯЎЛЕВІЧ (Яўлевіч) Ігнацій

Грамадскі і царкоўны дзеяч. Нарадзіўся 26.9.1619 г. ў сям'і небагатага магілёўскага мешчаніна. Першапачатковую адукацыю атрымаў у г. Шклоў. Потым вучыўся ў Магілёўскай брацкай школе, тры гады вывучаў тэалогію і медыцыну ў Замойскай акадэміі (Польшча). Пасля вучобы працаваў выкладчыкам у Кіева-Магілянскай калегіі, быў прафесарам свабодных навук. Разам з рэктарам гэтай калегіі С.Пачаскім удзельнічаў у арганізацыі у Ясах (цяпер Румынія) славяна-грэка-лацінскай акадэміі — першай буйной малдаўскай навучальнай установы, якая адкрылася ў 1640 г. Калі быў студэнтам 2-га курса філасофіі, 31.8.1647 г. пастрыгся ў Кіеве ў манахі. Пэўны час жыў у Львове, Яраслаўлі (у Галіцыі), Кракаве, Скіце, Камянцы, Сочаве (у Валахіі), Оршы і інш. месцах. З 1655 г. жыў у Полацку, быў Ігуменам Богаяўленскага манастыра, пры якім адкрыў школу і бібліятэку. У 1660 г. стаў таксама архімандрытам Полацкага Барысаглебскага манастыра. Жывучы ў Полацку, апекаваў мясцовых паэтаў, Філарэта Утчыцкага, Сімяона Полацкага, падтрымліваў прыязныя адносіны з тагачаснымі рускімі дзяржаўнымі і культурнымі дзеячамі Ф.Рцішчавым і Л.Ардын-Нашчокіным. У час прыезду ў Полацк цара Аляксея Міхайлавіча (1656 г.) выступіў з прамовай. Прымаў актыўны ўдзел у Маскоўскім царкоўным саборы 1660 г. па справе патрыярха Нікана. Апошнія звесткі пра Іяўлевіча ўтрымліваюцца ў перапісцы з маскоўскім патрыярхам Іаакімам за студзень — сакавік 1686 г.

З літаратурнай спадчыны Іяўлевіча да нашага часу дайшла яго аўтабіяграфічная запіска на польскай мове (апублікавана у 1886 г. С.Голубевым), у якой прыведзены важныя матэрыялы па гісторыі гарадской адукацыі 2-й чвэрці 17 ст. і пра цесныя культурныя і педагагічныя ўзаемасувязі беларускага і ўкраінскага народаў. Захаваліся яго прамовы з нагоды розных рэлігійных і палітычных падзей таго часу і некалькі лістоў Іяўлевіча да Сімяона Полацкага. Вядомы таксама яго дэкламацыі на прыезд у Магілёў віцебскага, аршанскага, мсціслаўскага і магілёўскага епіскапа Іосіфа Гарбацкага (4.8.1650) і некалькі элегічных вершаў, створаных на ўзор элегій Авідзія. Памёр Ігнацій Іяўлевіч у 1686 г.

А.Ф. Коршунаў.

У СКЛАДЗЕ РАСІЙСКАЙ ІМПЕРЫІ

У выніку першага падзелу Рэчы Паспалітай у 1772 г. Орша і навакольле ўвайшлі ў склад Расійскай імперыі.

Для кіравання далучанай часткай Беларусі было створана Беларускае генерал-губернатарства, у склад якога ўвайшлі Магілёўская і Пскоўская губерні. Магілёўская губерня падзялялася на 4 правінцыі: Магілёўскую, Аршанскую, Мсціслаўскую і Рагачоўскую. У Оршы была створана правінцыяльная канцылярыя. У 1777 г. правінцыі былі перайменаваны у паветы, а правінцыяльныя гарады сталі павятовымі.

Пасля ўваходжання ў склад Расійскай імперыі Орша падпала пад уздзеянне цэлай серыі адміністрацыйных рэформ. Згодна з Установай для кіравання губерняй» ад 7 лістапада 1775 г., «Уставай благачынння» ад 8 красавіка 1782 г., «Даравальнай граматай дваранству» ад 21 красавіка 1785 г. і адначасова з ёю прынятай «Даравальнай граматай гарадам», даўнія вольнасці магдэбургскага права ў беларускіх гарадах скасоўваліся, а на іх месцы ўсталёўвалася адзіная для ўсёй Расійскай імперыі сістэма адміністрацыі і кіравання. У горадзе, які з'яўляўся самастойнай адміністрацыйнай адзінкай, на чале адміністрацыі стаяў гараднічы. Гарадское самакіраванне складалася з гарадскога сходу і шасці галосай думы. Яно знаходзілася ў падпарадкаванні адміністрацыі, гарадскі сход склікаўся толькі з дазволу губернатара, дума была падсправаздачная губернатару і казённай палаце; губернатар і губернская ўправа давалі органам гарадскога самакіравання па-

драбязныя ўказанні, якія выключалі ініцыятыву з іхняга боку.

Увасабленнем новых парадкаў стала стварэнне новага гарадскога герба. Замест герба 1620 г. царскай Геральдмейсцерскай канторай у 1781 г. быў нададзены новы герб — 5 скрыжаваных стрэл, таму што, як лічылася «город построен еще древними скифами», якія «таковыми орудиями похвально действовали».

Уключэнне беларускіх зямель у склад цэнтралізаванай, з моцнай вярхоўнай уладай дзяржавы прывяло да пэўнай палітычнай стабілізацыі, якая паклала канец ваенным сутычкам на беларускіх тэрыторыях, феадальнай анархіі. Уцягванне Беларусі ў агульнарасійскую гаспадарчую сістэму пашырыла рынак збыту прадуктаў земляробства, садзейнічала пэўнай эканамічнай арыентацыі і спецыялізацыі.

У першым дзесяцігоддзі пасля далучэння царскі ўрад імкнуўся інтэграваць беларускія землі ў імперыю такімі сродкамі, каб выклікаць у кожнага саслоўя пачуццё лаяльнасці да новых улад. Насельніцтву былі прадастаўлены эканамічныя ільготы шляхам значнага памяншэння на працягу многіх гадоў некаторых відаў падаткаў.

Летам 1812 г. напалеонаўская армія пачала свой захопніцкі паход у Расію. Каб прыцягнуць на свой бок польскіх і мясцовых землеўладальнікаў, Напалеон абяцаў узнавіць Рэч Паспалітую ў межах 1772 г. ўзамен на падтрымку сваіх ваенных планаў.

Аршаншчыне давялося перажыць нашэсце войск Напалеона. Прыкладна праз месяц пасля пачатку вайны на заходніх землях Расійскай імперыі, 5 ліпеня 1812 г., атрад генерала Кольберта з корпуса Грушы, які, у сваю чаргу, уваходзіў у групу войск маршала Даву, падышоў да Оршы. Не сустрэўшы значнага супраціўлення з боку расійскіх войск, французы на наступны дзень увайшлі ў горад. Згодна з планам рускага камандавання, Оршы адводзілася роля базы забеспячэння войск неабходным правіянтам. Вялікія запасы мукі, амуніцыі аказаліся захопленымі французамі. За кароткі час інжынерныя службы напалеонаўскага войска навялі цераз Днепр два масты, і пад аховай дзвюх батарэй імператарская армія хутка пераправілася на левы бераг.

Сам Напалеон спыніўся ў Віцебску на 2 тыдні — з 16 ліпеня да 1 жніўня. Тут ён меркаваў завяршыць кампанію 1812 г., наладзіць кіраванне захопленымі Літвой і Беларуссю, папоўніць войска і чакаць мірных перамоў з царом Аляксандрам I. На гэты час спыніла рух і ўсё войска. На працягу тых 2 тыдняў у Оршы гаспадарыў корпус Даву. Захапіўшы горад і павет, французы пачалі сістэматычнае рабаванне насельніцтва. Перш за ўсё адбіралі коней, хлеб. Значная частка насельніцтва пахавалася ў лясах. Калі ў рэшце рэшт Напалеон змяніў свае планы і французскае войска рушыла далей на ўсход, у Оршы застаўся вялікі шпіталь, у якім знаходзілася каля 10 тыс. параненых і хворых французскіх салдат.

У адрозненне ад расійскіх паветаў і Латвіі, дзе дзейнічала акупацыйная адміністрацыя, Напалеон утварыў у Вільні Камісію Часовага ўрада Вялікага княства Літоўскага, якая прысягнула яму на вернасць. Губернямі, якія падпарадкоўваліся Часоваму ўраду, кіравалі асобныя адміністрацыйныя камісіі, якія складаліся з прысягнуўшых Напалеону магнатаў з прызначаным імператарам інтэндантам на чале. Такое кіраванне было і ў Віцебскай і Магілёўскай губернях, толькі без падпарадкавання віленскай Камісіі.

Неўзабаве пасля ўтварэння Камісіі адміністрацыйна-тэрытарыяльны падзел падпарадкаваных ёй земляў быў зменены па ўзору Францыі. Губерні замяніліся дэпартаментамі, а губернскія камісіі — адміністрацыяй дэпартамента. На чале дэпартаментаў стаялі французскія губернатары і інтэнданты. Паветы былі перайменаваны ў падпрэфектуры. Камісіі падпрэфектур павінны былі выконваць загады мясцовых французскіх военачальнікаў. У Оршы з дваран, шляхты і каталіцкага духавенства, якія прысягнулі Напалеону, была ўтворана адпаведная камісія на чале з прэфектам, у абавязак якой уваходзілі пошукі правіянту.

Шмат жыхароў горада і павета падаліся ў партызаны. Аршанскі памешчык Леў Салагуб падрыхтаваў для рускага войска 2-тысячны полк, які цалкам экіпіраваў за ўласны кошт. Сам Салагуб на працягу усёй вайны ваяваў у «лятучым корпусе» генерала Бараздзіна, быў адзначаны баявымі ўзнагародамі.

Напачатку лістапада 1812 г. пасля жорсткіх паражэнняў пад Смаленскам і Красным французы падышлі да Оршы. 7 лістапада з рэшткамі сваёй гвардыі прыбыў у горад Напалеон. Тыя 7—8 тыс., што засталіся жывымі

з 35 тыс. гвардзейцаў, размясціліся ў горадзе і яго наваколлі. Штабам імператара стаў езуіцкі калегіум. Увечары таго ж дня да Напалеона быў дастаўлены аршанскі памешчык Іосіф Васілеўскі, якога імператар дапытваў аб месца знаходжанні рускіх войск. На ўсе пытанні Васілеўскі адказваць адмаўляўся.

Позняй ноччу ў Оршу прыбылі рэшткі корпуса маршала Нэя, якога праследавалі казакі Платава. Неўзабаве прыйшла вестка аб вызваленні рускімі войскамі Мінска. Найбольш кароткі шлях адыходу быў адрэзаны. Да Оршы набліжаліся казакі, і гэта прымусіла Напалеона спешна пакінуць горад. Перад адыходам французы спалілі 60 пантонаў з усім начыннем да іх. Тут жа, у Оршы, былі спалены ўсе паперы імператарскай паходнай канцылярыі. Французы пакінулі ў Оршы большую частку абозу з нарабаванымі ў Маскве, Смаленску і іншых гарадах каштоўнасцямі. Частка іх была патоплена ў Дняпры разам з гарматамі і іншым узбраеннем. У шпіталях і дамах мясцовых жыхароў заставалася шмат параненых і хворых французскіх салдат і больш за 50 афіцэраў. Нягледзячы на гэта, маршал Нэй загадаў падпаліць горад. Казакі Платава ўвайшлі ў Оршу 9 лістапада і дапамаглі жыхарам патушыць горад, захапілі 26 гармат і да 2500 адзінак зброі ў арсенале.

Напалеонаўскае нашэсце нанесла вялізныя страты эканоміцы Аршаншчыны. Працэс аднаўлення прамысловасці працякаў вельмі марудна. У рапарце аршанскага гараднічага магілёўскаму грамадзянскаму губернатару за 1820 год паведамлялася: «У горадзе Оршы фабрык, заводаў і мануфактур не было. Ва ўсім Аршанскім павеце ў 1819 г. існавалі 2 мануфактуры — суконная і талесная. Нягледзячы на дармавую прыгонніцкую сілу і наяўнасць мясцовай сыравіны, прадукцыйнасць іх была вельмі нізкай. Гатовая прадукцыя ў асноўным выкарыстоўвалася на месцы і толькі часткова вывозілася ў іншыя гарады Магілёўскай губерні.

Толькі праз 14 гадоў пасля выгнання французскіх захопнікаў у Оршы быў заснаваны гарбарны завод.

Пасля ўключэння беларускіх зямель у склад Расійскай імперыі царызм да сярэдзіны 19 ст. не умешваўся ў пазямельныя ўзаемаадносіны прыгоннай вёскі. Але ўцягванне Беларусі ў агульнарасійскую гаспадарчую сістэму пашырыла рынак збыту сельскагаспадарчай прадукцыі і стымулявала рост яе вытворчасці. Рыначная кан'юнктура садзейнічала пашырэнню на тэрыторыі Беларусі пасеваў тэхнічных культур: ільну, канаплі, бульбы.

На беларускіх землях царскі ўрад даволі асцярожна ўводзіў агульнарасійскую сістэму падаткаабкладання. Напачатку ён пайшоў на палёгку для насельніцтва беларускіх губерняў у выплатах па дзяржаўных зборах. Аднак гэта былі часовыя льготы, выкліканыя гаспадарчай неабходнасцю і палітычнымі мерапрыемствамі.

У сваёй сацыяльнай палітыцы царскі ўрад займаў цвёрдую прадваранскую пазіцыю. За памешчыкамі, якія прынеслі прысягу Расіі, захоўваліся ўсе правы на валоданне ўсёй нерухомай маёмасцю і прыгоннымі сялянамі.

Становішча сялян пагоршылася. Шэраг пастаноў расійскага ўрада патрабаваў вышуку і вяртання беглых сялян. Узаконьваўся продаж сялян без зямлі. Стаў практыкавацца іх набор у рэкруты.

Сельская гаспадарка заставалася галоўнай вытворчай галіной. Але метады гаспадарання былі адсталымі, ураджайнасць нізкай. Звычайна ўрадлівасць азімых у сялянсіх гаспадарках складала «сам-2», а яравых «сам-4». Такі ўраджай не дазваляў нармальна забяспечыць сям'ю селяніна хлебам — асноўным прадуктам харчавання. Не толькі ў галодныя, а нават і ў звычайныя гады жыхары Аршанскага краю былі вымушаны купляць хлеб, прывезены мясцовымі купцамі з іншых рэгіёнаў краіны, часцей за ўсё з Украіны. Цэны на яго былі вельмі высокія. Так, у 1-й трэці 19 ст. сярэдняя цана чвэрці пшаніцы вагалася ў межах ад 6 да 8 руб., ячменю — ад 4 да 5, аўса — ад 2 да 3 руб. серабром. Такія грошы былі далёка не ў кожнай сям'і, а таму з зімы хлеб выпякалі з рознымі дамешкамі раслінага характару.

Марудна павялічвалася пасяўная плошча пад лён і каноплі. Да 2-й палавіны 19 ст. іх удзельная вага ў параўнанні з іншымі культурамі была нязначнай. Апрацаваны лён прадавалі на месцы. Сярэдняя цана за беркавец (12,5 пуда) льну складала ад 20 да 30 руб. серабром. Набытае льняное валакно мясцовыя і прыезджыя купцы праз прыстані Віцебска і Бешанковіч дастаўлялі ў Рыжскі порт.

Жывёлагадоўля давала насельніцтву прадукты харчавання, сыравіну, а земляробству — рабочую жывёлу і ўгнаенні. У 19 ст.

на Аршаншчыне у сярэднім на 1 сялянскі двор прыходзілася два кані (без коней было 5,3 % двароў, з адным канём — 15,8 %), 1 карова, 4 свінні, 4 авечкі, з дзесятак птушак. Даволі актыўна жывёлагадоўляй займаліся жыхары горада і асабліва мястэчак. Аснову кармавой базы складалі натуральныя травы. Лугі займалі да 10 % агульнай плошчы ворыўнай зямлі. Адна дзесяціна такіх лугоў давала да 80 пудоў сена. У вёсцы і горадзе вырошчвалі таксама гародніну — буракі, цыбулю, капусту, моркву, агуркі, часнок, рэдзьку. З 19 ст. ў харчовы рацыён нашых продкаў трывала ўвайшла бульба. З часам яна стала адной з важнейшых тэхнічных культур. Бульба істотна палепшыла кармавую базу жывёлагадоўлі.

Сярод фактараў, яія зрабілі вялікі ўплыў на эканамічнае і сацыяльнае развіццё Оршы і павета у 2-й палавіне 19 ст. важнейшае значэнне мела адмена прыгоннага права.

У Аршанскім павеце мясцовым «Палажэннем» устанаўліваліся павіннасці ў памеры 40 мужчынскіх і 30 жаночых дзён з душавога надзела. За памешчыкамі замацоўвалася права прымушаць сялян працаваць на яго землях у любыя дні. Такое «вызваленне» выклікала ў сялян рэзкае незадаволенне. Ужо вясной 1861 г. па павеце пракацілася хваля сялянскіх выступленняў. Для іх падаўлення ў Аршанскі павет былі кінуты войскі на чале з контрадмірапам Зорыным.

Галоўнай перашкодай на шляху ўсталявання новых капіталістычных адносін сталі феадальныя перажыткі і, у першую чаргу, памешчыцкае землеўладанне. Не стала выключэннем Аршаншчына, дзе ў пачатку 1880-х гадоў налічваліся 244 памешчыцкія гаспадаркі. Пры гэтым 131 гаспадарка мела надзелы ад 100 да 500 дзесяцін, 49 — ад 500 да 1000, 55 — ад 1000 да 5000 і 7 — ад 5000 да 7000 дзесяцін. І гэта ў той час, калі гораду належала толькі 2664 дзесяціны. На адну сялянскую гаспадарку ў сярэднім прыходзілася 15 дзесяцін зямлі. У параўнанне можна адзначыць, што графіні М.Ронікар толькі ў Высокім належала 7300 дзесяцін, надворнаму саветніку В.Цітову — каля 5 тыс. у Смалянах, межаўскай памешчыцы А. Лубенскай — больш за 3 тыс. дзесяцін і г.д. Сяляне Аршаншчыны пакутавалі не толькі ад беззямелля і малазямелля. Непамерна вялікімі былі выкупныя плацяжы, якія штогод складалі 164 210 руб. 66,5 кап.

Асноўным насельніцтвам Аршанскага павета з'яўляліся сяляне — вясковыя жыхары (80,9%). Сярэдняя велічыня вёсак ў павеце — 12 сядзіб, 9 вёсак мелі больш за 50 сядзіб, 550 — менш за 10 сядзіб. У сярэднім на сядзібу прыходзілася 17 дзесяцін зямлі, або 5—6 дзесяцін зямлі на душу. На Беларусі, дзе патрабавалася ўзмоцненае ўгнаенне глебы, пражытачны мінімум мог забяспечыць надзел не меншы, чым 8 дзесяцін зямлі на душу.

У 1887 г. ў павеце было занята жытам 47% ворыва, аўсом — 27,3%, ячменем — 9,2, грэчкай — меней 5, гарохам — 1,7, ільном — 1,3, канаплёй — 1,3%. У земляробстве Аршаншчыны пераважала сярэдневяковая сістэма севазвароту ў выглядзе трохполля: пар — жыта — яравы хлеб. У структуры пасеваў манапольнае месца займалі збожжавыя, перш за ўсё жыта. Гадавы збор збожжа на душу насельніцтва за вылікам насення ў канцы 19 ст. ў Аршанскім павеце складаў 9—11 пудоў. У той жа час на шырокіх лясных прасторах з менш урадлівымі дзярнова-падзолістымі глебамі яшчэ ў 19 — пачатку 20 ст. нярэдка ўжывалася лясная падсека. Мясцовыя землеўладальнікі здавалі вялікія ўчасткі старога лесу на 6—8 і больш гадоў у арэнду сялянам пад ляднае земляробства. Арэндная плата складала 204 руб. з дзесяціны. Спосаб апрацоўкі зямлі ў павеце доўгі час заставаўся старажытным. Аралі звычайна сахою, якую «вёз адзін маленькі конік». Яна ўзнімала усяго 2—3 вяршкі (прыблізна 9—13 см) зямлі. Араць глыбей сяляне баяліся, каб не зачэрпваць паглебы, таму што ўрадлівы слой быў вельмі тонкі (20—30 см) ад недастатковага ўгнаення. Угнойвалася толькі 18% ворыўнай сялянскай зямлі. На Аршаншчыне найбольшае распаўсюджанне атрымала так званая беларуская «магілёўская, падняпроўская» саха. У сялян Магілёўскай губерні сустракаўся таксама і плуг, які з'явіўся тут да адмены прыгоннай залежнасці. Але распаўсюджанне яго было слабае. У Магілёве ў 1882 г. быў адкрыты склад плугоў. Найбольшае распаўсюджанне плуг атрымлівае ў паўночных паветах — у прыватнасці, Аршанскім, Сенненскім і Горацкім. Але набыць плуг мог звычайна заможны селянін. Кошты на плугі вагаліся ў

наступных памерах — 4 руб., 5 руб. 50 кап., 7—8 руб.

На адну дзесяціну ворыўнай зямлі прыходзілася 0,28 — 0,34 дзесяцін луга. Загатаванага сена не хапала, таму прыходзілася або купляць яго, або скошваць чужыя лугі за грошы, за адпрацоўку.

Развіццё земляробства і жывёлагадоўлі ішло сінхронна, адлюстроўваючы агульнае эканамічнае становішча краю.

У канцы 19 — пач. 20 ст. расце ўвага ўлад да развіцця сельскай гаспадаркі і кустарных промыслаў. Дэпартамент земляробства выдаў у С.-Пецярбургу справаздачу з 1-й Магілёўскай сельскагаспадарчай і прамысловай выставы, якая праходзіла з 5 па 16 верасня 1896 г. На выставе было прадстаўлена 1177 экспанатаў, многія з іх — з Аршанскага павета.

Аддзел паляводства, нягледзячы на даволі значную колькасць экспанатаў, не даваў поўнага малюнка гаспадаркі ўласніка, таму ніводны экспанат гэтага аддзела не атрымаў вышэйшай узнагароды. Да таго ж, як адзначаецца ў справаздачы, глеба апрацоўваецца дрэнна і ў большасці сялянскіх гаспадарак застаецца трохпольны севазварот. Горацкае земляробскае вучылішча, з жалем адзначаюць аўтары, не зрабіла якога-небудзь слушнага ўплыву на тэхніку сялянскай гаспадаркі.

Затое жывёлагадоўля, прадстаўленая багатымі экспанатамі, выклікала цікавасць у наведвальнікаў. Гаспадарка Цітова з маёнтка Смаляны выставіла групу чыстакроўных кароў альгаўзкай пароды. Адзначана і гаспадарка Венцловіча з Высокага, асобныя каровы якой даюць больш за 200 вёдзер малака.

Садоўніцтва, хоць і было прадстаўлена на выставе вялікай колькасцю разнастайных экспанатаў, у той час не давала прыбытку. Сярод прычын называліся здача садоў у арэнду незацікаўленым асобам, недахоп вопытных садоўнікаў і крадзяжы ў садах.

У перапрацоўчай галіне на 1-м месцы стаяла вытворчасць гарэлкі, сталовага віна і піва. Пасля гэтага — малочная вытворчасць: масла, сыры, смятана.

Адным з паказчыкаў развіцця матэрыяльнага дабрабыту гарадоў у мінулым прынята лічыць колькасць мураваных пабудоў. З пачатку 19 ст. хутка раслі губернскія і найбольш развітыя ў гаспадарчых адносінах павятовыя цэнтры, да якіх можна аднесці і Оршу. Калі ў канцы 18 ст. ў Оршы было 2 мураваныя дамы, то ў 1828 г. — 5, а ў 1860-я гады — ужо 22.

У дарэформенны перыяд на Беларусі пераважалі вотчынныя прадпрыемствы, якія перапрацоўвалі ў асноўным сельскагаспадарчую сыравіну, былі звязаны з гаспадаркай памешчыкаў і размяшчаліся пераважна ў прыватнаўласніцкіх мястэчках і сёлах. У гарадах пераважала дробнатаварная вытворчасць у форме рамесніцкіх майстэрняў і невялікіх прамысловых прадпрыемстваў. У самым пачатку 19 ст. ў Оршы былі 62 рамеснікі; у пачатку 1860-х гадоў — ужо 356, прычым 193 з іх займаліся вырабам вопраткі і абутку, 55 выраблялі прадметы хатняга ўжытку і прылады працы з дрэва і металу, 91 працаваў у харчовай галіне, было 17 гадзіннікавых майстроў, ювеліраў, цырульнікаў і мэбельшчыкаў.

У 1-й палавіне 19 ст. складаліся спрыяльныя ўмовы для развіцця гандлю ў Оршы. З далучэннем беларускіх зямель да Расіі былі ўмацаваны старыя і пабудаваны новыя галоўныя дарогі, з якіх дзве — Пецярбургска-Кіеўская і Маскоўска-Варшаўская — перасекліся ў Оршы. Важнымі былі таксама губернскія дарогі, па якіх перавозіліся транзітныя і мясцовыя грузы. У 1-й палавіне 19 ст. праз Оршу пралягалі тракты Орша – Сянно і Орша – Барысаў – Мінск. Увосень і ўвесну грунтавыя дарогі размякалі, і царскі ўрад пачаў будаваць шашэйныя. Адна з іх, Пецярбургска-Кіеўская, у 1830—1840 гг. прайшла праз Оршу. Па Дняпры праз Оршу везлі хлеб з Украіны у Віленскую, Віцебскую, Смаленскую губерні, а з цэнтральных губерняў Расіі ішлі прамысловыя тавары на Украіну. У параўнанні з іншымі гарадамі Магілёўскай губерні, якія размяшчаліся на Дняпры, Орша выдзялялася па колькасці адпраўленых суднаў і плытоў. Так, у 1858 г. ў Оршы больш за 120 суднаў было загружана вапнай (каля 360 тыс. пудоў на суму на 20 тыс. руб.), каменем, мэбляй, рыдлёўкамі, гарэлкай, дошкамі на 6 тыс. руб.

Згодна са статыстычнымі данымі ў 1825 г. ў Оршы было 2 купцы; у 1833 — ужо 33 купцы, з іх 3 першай гільдыі, астатнія трэцяй. У 1842 г. ў Оршы 51 купец, усе яны адносіліся да трэцяй гільдыі. У пачатку 1850-х гадоў у горадзе налічвалася 53 купцы, з якіх 1 належаў да першай гільдыі, 6 — да другой і 46 — да трэцяй. У 1861 г. ў Оршы было ўжо 219 купцоў. Хоць унутраны гарадскі гандаль у

1-й палавіне 19 ст. характарызуецца як значны, у пачатку 1850-х гадоў з 53 купцоў толькі 22 мелі лаўкі ў горадзе. Астатнія з-за адсутнасці попыту і недахопу пакупнікоў гандлявалі ў сёлах і мястэчках павета. У 1861 г. ў горадзе было 110 лавак.

Прамысловасць у гарадах Беларусі ў дарэформенны перыяд не дасягала высокага ўзроўню, тым болей гэта датычыцца Оршы. Першае аршанскае прадпрыемства, пра якое маюцца звесткі, — вапнавае, якое дзейнічала ў 1800—02 гг. На ім працавала 30 чалавек, у 1802 г. было выпалена 7 тыс. пудоў вапны. У рапарце аршанскага гараднічага магілёўскаму губернатару за 1826 г. гаворыцца пра 2 піваварныя заводы, якія выраблялі для продажу ў піцейных дамах 35—60 вёдраў піва за год. За той жа 1826 г. было прададзена таксама 60 вёдраў мёду. У 1850 г. ў Оршы былі адкрыты 2 гарбарныя заводы па перапрацоўцы скур, кожны з гадавым выпускам прадукцыі на 5 тыс. руб. У Оршы ў 1-й палавіне 19 ст. існавала дробнае прадпрыемства па перапрацоўцы бавоўны.

У 2-й чвэрці 19 ст. ў Беларусі назіраецца значны прамысловы ўздым. Ахапіў ён і Аршаншчыну, дзе ў перыяд паміж 1826 і 1848 гг. колькасць фабрык і заводаў павялічылася да 14.

У 1840-х гадах Орша мала чым адрозніваласа ад іншых павятовых гарадоў Магілёўскай губерні.

Асноўным заняткам жыхароў з'ўляліся гандаль, рамёслы і гародніцтва. Гандаль вёўся праз крамкі, якіх у 1843 г. налічвалася каля 70. Аршанскія купцы гандлявалі і з іншымі гарадамі Беларусі. Прамысловасць тагачаснага горада прадстаўлялі рамеснікі, якіх налічвалася 88.

Бюджэт горада быў зусім невялікі (у 1843 г. — 15 208 руб. серабром). Асноўная яго частка выдаткоўвалася на ўтрыманне адміністрацыйна-паліцэйскага апарату, турмы і інш.

У пачатку 1850-х гадоў у Оршы былі 3 плошчы, 35 незабрукаваных вуліц і завулкаў. Тратуараў не было, і горад патанаў у непралазным брудзе. Большасць гарадскіх будынкаў былі драўлянымі.

Рэлігійныя патрэбы насельніцтва забяспечвалі 3 праваслаўныя царквы, 4 манастыры, 8 сінагог. У горадзе не было бібліятэк, тэатраў, іншых культурна-асветных устаноў, затое мелася 7 пітных дамоў, або кабакоў. Не ў лепшым становішчы знаходзілася і ахова здароўя. У горадзе мелася толькі адна невялічкая бальніца, у якой працавалі 2 медыцынскія работнікі і 8 чалавек абслугоўваючага персаналу. Цяжкія матэрыяльна-бытавыя ўмовы жыцця насельніцтва прыводзілі да высокай смяротнасці.

Пасля адмены ў 1861 г. прыгоннага права Орша заставалася тыповым павятовым горадам. Тут знаходзілася паліцэйскае ўпраўленне, спраўнік, воінскі начальнік, казначэйства, паштовая кантора, гарадская ўправа, дума і інш. Апрача таго, у горадзе былі з'езд міравых суддзяў Аршанскай акругі, дваранская апека на 3 паветы, камера намесніка губернскага пракурора, жандарскае ўпраўленне Аршанскага і Сенненскага паветаў і тэлеграфная станцыя.

У 1880 г. ў Оршы налічвалася 1028 будынкаў, жылых дамоў было 837, з якіх 22 — мураваныя і 815 — драўляныя. У горадзе на гэты час пражывала 5025 чалавек.

З 1870-х гадоў пачаліся работы па добраўпарадкаванні горада. На сродкі насельніцтва, сабраныя па падпісцы, у 1873 г. ў цэнтры горада быў разбіты гарадскі сад. На цэнтральных вуліцах устаноўлены некалькі газавых ліхтароў, «забрукавана каменнем базарная плошча за ракой Аршыцай і забрукаваны чатыры самыя нізкія топкія вуліцы». Цераз цэнтральную частку горада на працягу каля 4 км у 1878 г. быў таксама пракладзены брук, які злучыў горад з чыгуначнай станцыяй. Мерапрыемствы па добраўпарадкаванні рабіліся на сродкі насельніцтва.

І толькі нязначная частка адпускалася з гарадскога бюджэту, які, дарэчы, быў вельмі невялікі. Значныя сродкі з яго паглыналіся адміністрацыйна-паліцэйскім апаратам. Так, у 1891 г. на ўтрыманне гарадскога ўпраўлення, паліцыі і турмы, на воінскі пастой было выдаткавана 6706 руб. н.о амаль палавіна ўсяго гадавога бюджэту. У той жа час на асвету было выкарыстана ўсяго 130 руб., менш 1 працэнта бюджэту.

Як і на ўсёй тэрыторыі тагачаснай Беларусі, прамысловасць горада пачала развівацца толькі ў 1870-х гадах. У 1871 г. праз Оршу прайшла Маскоўска-Брэсцкая чыгунка. З цягам часу Орша ператварылся у буйны чыгуначны вузел.

У 1881 г. ў Оршы было 20 фабрык і заводаў: 2 дражджавых, 3 гарбарных, 2 льнотра-

пальных, 2 цагельных і 5 вапнавых заводаў. Прадпрыемствы былі невялікія: на іх працавала ўсяго 12 майстроў і 251 рабочы, а валавы даход складаў 62 211 руб.

Значнае месца ў эканоміцы горада займалі промыслы. У 1881 г. ў Оршы налічвалася 460 рамеснікаў-саматужнікаў. Асноўную групу іх складалі краўцы, сталяры, шаўцы, цесляры.

У 1880-х гадах у горадзе былі 173 гандлёвыя крамы. Па даных Магілёўскага губернскага статыстычнага камітэта, у гандлёвых адносінах Ора займала 3 месца ў губерні. «На прыстані грузіцца штогод да 100 вялікіх і малых суднаў і разгружаецца ад 10 да 15. Аршанская чыгуначная станцыя адпраўляе 560 тыс. прымае каля 680 тыс.пудоў рознага тавару. Галоўны прадмет адпускнога гандлю — вапна, якая здабываецца ля самага горада, вядомая сваёй дабраякаснасцю. Яна адпраўляюца пераважна ў нізавыя губерніі, і асабліва ў Кіеў. Пянькі адпраўляецца ў Рыгу на суму да 100 тыс. руб.

Штогод 9 мая праводзіўся кірмаш, куды прывозіліся сельскагаспадарчыя і рамесныя вырабы. У 1880 г. гандлёвы абарот кірмашу складаў 10 тыс. руб.

Матэрыяльнае становішча працоўных горада заставалася вельмі цяжкім. Рабочы дзень працягваўся 12—14 гадзін. Умовы працы былі неспрыяльнымі. Заводы і майстэрні туліліся ў сырых неапальваемых памяшканнях. Ніякай тэхнікі бяспекі не існавала. За сваю знясільваючую працу рабочыя атрымлівалі капейкі. Да даных таго часу, месячны заработак кваліфікаванага рабочага не перавышаў 7—8 руб.

У канцы 19 ст. медыцынская дапамога насельніцтву была арганізавана вельмі дрэнна. Плата за лячэнне складала 8 руб у месяц, незалежна ад таго, колькі дзён лячыўся хворы. У горадзе на аднаго ўрача прыходзілася 5025 чалавек. У гарадской бальніцы было 30 ложкаў, і на кожны прыадала 2294 чалавекі. Антысанітарны стан горада, які не меў каналізацыі і вадаправода, недастатковасць медыцынскай дапамогі, дрэнныя матэрыяльна-бытавыя ўмовы жыцця большасці насельніцтва параджалі эпідэміі. Надзвычай высокай была дзіцячая смяротнасць.

Патрапіўшы ў склад Расійскай імперыі з колькасцю насельніцтва каля 800 чалавек, Орша паступова набірала сілу, адпаведна павялічвалася і насельніцтва горада. У 1786 г. ў Оршы было 1757 жыхароў, у 1796 г. — 1940, у 1811 г. — 1954, у 1815 г. — 2145, у 1825 г. — 2158, у 1842 г. — у1814, у 1843 г. — 2914, у 1858 г. — 4876, у 1861 г. — 5329 жыхароў. Такім чынам, дасягнуць лічбы 5000, якой азначаецца колькасць насельніцтва Оршы ў сярэдзіне 17 ст., горад змог толькі праз... 200 гадоў. І тое дзякуючы перасяленню яўрэяў з сельскай мясцовасці ў гарады і мястэчкі ў 1-й палавіне 19 ст.

Па сацыяльнаму становішчу насельніцтва Оршы ў канцы 18 — пач. 19 ст. размяркоўвалася наступным чынам: дваране — 8 чалавек (0,4%), духавенства — 32 чалавекі (1,2%), купцы — 181 чал. (9,3%), «прочие» — 121 чал. (6,2%), мяшчане — 1607 чал. (82,9%). Звестак пра колькасць чыноўнікаў, сялян, вайскоўцаў, замежнікаў няма.

У 1830-я гады паменшала купцоў — да 0,9%, з'явіліся звесткі пра чыноўнікаў — 3,3%, вайскоўцаў — 9,6%, сялян — 1,6%. У 1850-я гады, удвая павялічылася колькасць чыноўнікаў, невысокім быў працэнт купцоў — 4,3%, паменшала мяшчан — 75,2%, жылі дваране — 6,1%, духавенства — 1%, вайскоўцы — 4,4 %, няма звестак пра сялян і замежнікаў.

У гэты час у асяроддзі дваран адбываўся працэс дыферэнцыяцыі. Частка дваран збяднела і сышла ў горад — на вайсковую службу, у чыноўнікі. У гарадах жыла значная колькасць дваран, якія валодалі нерухомай маёмасцю — зямлёю або дамамі.

Духавенства жыло ва ўласных або царкоўных дамах з невялікімі сядзібамі. Некаторыя са святароў валодалі зямлёй, лаўкамі, млынамі, дамамі. На Беларусі жылі святары праваслаўныя, уніяцкія (да 1839 г.), каталіцкія, лютэранскія. Сюды ж уключаліся і манахі, якія складалі ў 1830—50-х гг. каля 30% святароў усяго духавенства.

Значную групу насельніцтва складалі вайскоўцы, у склад якіх уваходзілі афіцэры і салдаты гарнізонаў, ваенныя кантаністы, жандары, унутраная варта, а таксама члены іх сем'яў.

Самую шматлікую і складаную частку насельніцтва горада ўяўлялі сабой мяшчане. Да іх адносіліся дробныя гандляры, уладальнікі рамесных майстэрняў, рамеснікі, адыходнікі, рамізнікі, агароднікі, прыслуга. Часам да мяшчан прылічвалі ўрачоў, музыкантаў, мастакоў.

Вызначэнне дакладнага нацыянальнага складу насельніцтва горада ў азначаны перыяд ускладняецца тым, што ў якасці вызначальнага крытэрыя бралася веравызнанне, і таму такія звесткі трэба лічыць ускоснымі. Больш-менш дакладна можна ўстанавіць колькасць яўрэйскага, татарскага, цыганскага насельніцтва. Палякамі лічылі сябе католікі, а перасялення этнічных палякаў не было. Беларусы ж, рускія і ўкраінцы маглі быць і праваслаўнымі, і уніятамі (да 1839), і католікамі. Па даных беларускага гісторыка А.Лютага, у 1820-я гады аршанскае насельніцтва размяркоўвалася так: 1160 яўрэяў, 567 уніятаў, 65 католікаў, 15 цыганоў. Пра колькасць праваслаўных, пратэстантаў, мусульман звестак няма. У 1796 г. была ўведзена так званая «мяжа яўрэйскай аселасці», паводле якой яўрэям быў забаронен пераезд ў цэнтральныя губерні Расіі.

З цягам часу памешчыцкія і сялянскім гаспадаркі страчвалі свой натуральны характар і прыстасоўваліся да патрэб рынку. Мяняўся і эканамічны твар горада, які значна вырас. У пачатку 20 ст. заселеная плошча горада дасягнула 658 дзесяцін, а колькасць насельніцтва ў 1904 г. ў параўнанні з 1843 г. павялічылася ў 5 разоў.

Гістарычныя падзеі канца 19 — пач. н. 20 ст. закранулі Аршаншчыну ва ўсёй сваёй паўнаце.

Гісторыю народнай адукацыі ў Оршы можна прасачыць з 1612 г. Менавіта з таго часу да 1820 г. ў горадзе дзейнічаў езуіцкі калегіум. У 1791 г. ў горадзе адкрылася двухкласнае народнае вучылішча, у якім выкладаліся нават танцы, у 1820 г. — павятовае дамініканскае вучылішча, якое праіснавала да 1917 г. У 1821 г. было заснавана прыходскае аднакласнае вучылішча.

З 1824 г. навучальныя ўстановы Оршы падпарадкоўваліся Пецярбургскай вучэбнай акрузе, з 1829 г. — Беларускай, з 1850 г. — Віленскай вучэбнай акрузе. З 1866 да 1917 існавала дырэкцыя народных вучылішчаў Магілёўскай губерні, якая кіравала адпаведнымі ўстановамі ў Оршы і Аршанскім павеце. Пасля скасавання ў 1832 г. (пасля разгрому паўстання 1830—1831 гг.) Віленскага універсітэта ў 1834 г. ўзнік план стварэння вышэйшай навучальнай установы ў Оршы. Яе меркавалася зрабіць на ўзор Царскасельскага ліцэя, і ліцэй гэты ў Оршы павінен быў замяніць сабой закрыты Віленскі універсітэт. Але плану гэтаму не дадзена было ажыццявіцца з-за недахопу сродкаў.

У 1843 г. ў горадзе былі духоўнае вучылішча, казённае і прыватнае вучылішчы, у якіх займаліся 231 хлопчык і 20 дзяўчынак, выкладалі 18 настаўнікаў.

У 1878 г. ў горадзе адкрыліся 3-класнае павятовае вучылішча і прыватнае 2-класнае яўрэйскае жаночае вучылішча, 15 кастрычніка 1906 г. — дзень адкрыцця рэальнага вучылішча (ліквідавана ў 1918), у якім да 1910 г. працаваў вядомы рэвалюцыянер, бальшавік П.М. Лепяшынскі. З 1911 да 1919 г. працавала жаночая настаўніцкая семінарыя.

У «Памятнай кніжцы Віленскай навучальнай акругі за 1877—1878 гг.» маюцца звесткі пра адкрыццё ў пас. Барань у 1875 г. народнага вучылішча. На ўтрыманне штогод выдзялялася з казны 270 руб. 87 кап.

Нягледзячы на, здавалася б, немалую колькасць разнастайных навучальных устаноў, узровень народнай адукацыі ў Оршы ў канцы 19 — пач. 20 ст. трэба лічыць нізкім. Так, па перапісе 1897 г. непісьменныя складалі каля палавіны — 48,2% насельніцтва горада. Масавую непісьменнасць абумовілі недастатковая колькасць школ і высокая плата за навучанне.

Паводле звестак архіваў і справаздач аб царкоўнапрыходскіх школах за 1899—1900 гг. Аршанскі павет займаў тэрыторыю 4832 кв. вярсты, на тэрыторыі павета пражывала 102 804 душы абодвух палоў. Але частка тэрыторыі цяперашняга Аршанскага раёна ўваходзіла ў Горацкі павет, які займаў 2487 кв. вёрст пры насельніцтве 82 903 душы. Аршанскі павет меў шчыльнасць насельніцтва 21 чалавек на 1 кв. вярсту, Горацкі — 33 чалавекі.

Агульная колькасць школьнікаў ад 7 да 14 гадоў у Аршанскім павеце была 21 318, з іх 10 695 хлопчыкаў і 10 623 дзяўчынкі. У Горацкім павеце было 11 444 школьнікі, з якіх 5969 хлопчыкаў і 5475 дзяўчынак. Праваслаўных прыходаў у Аршанскім павеце — 51, у Горацкім — 40.

Па паветах школы і народныя вучылішчы размяркоўваліся наступным чынам: у Горацкім 27 царкоўнапрыходскіх школ і 101 школа пісьменнасці, 15 пачатковых вучылішчаў ведамства Міністэрства народнай асветы; у Аршанскім — 38 царкоўнапрыходскіх школ, 81

Ярмарка ў Оршы. Пачатак 20 ст.

школа пісьменнасці і 21 вучылішча Міністэрства народнай асветы.

Супастаўляючы колькасць школ з лічбай праваслаўнага насельніцтва, знаходзім, што ў Горацкім павеце адна пачатковая школа прыходзілася на 579 чалавек, а ў Аршанскім — на 734 чалавекі. Па плошчы адна школа ў Горацкім павеце прыходзілася на 17 кв. вёрстаў, у Аршанскім — па 34 кв. вярсты. Не было царкоўнапрыходскіх школ і школ пісьменнасці толькі ў Дабрамысленскім прыходзе Аршанскага павета. Ад агульнай колькасці дзяцей школьнага ўзросту школу наведвалі больш за чвэрць, прычым хлопчыкі складалі больш за трэць агульнай колькасці хлопчыкаў школьнага ўзросту, у той час як дзяўчынкі толькі 1/28 частку колькасці дзяўчынак школьнага ўзросту.

Падручнікамі і дапаможнікамі для аднакласных царкоўнапрыходскіх школ служылі: па рускай мове — «Подвижная славяно-русская азбука», «Букварь для обучения юношества церковному и гражданскому чтению», «Русско-славянский словарь» Лубенца. «Русские прописи» Горбача, «Первая пчёлка» Поливанова, «Азбука правописания» Тихомирова, «Практическое руководство по русскому языку» Еремко и Волотковского. Акрамя таго, існавалі падручнік па царкоўна-славянскай мове, па Закону Божаму, па абучэнні царкоўным спевам, па арыфметыцы.

Для прыкладу працы пачатковай школы таго часу возьмем даныя са статыстычнага абследавання народных вучылішчаў Расійскай імперыі паводле перапісу ад 18 студзеня 1911 г. па Макараўскім земскім вучылішчы в. Макараўка. Вучылішча размяшчалася за 5 вёрстаў ад прыходскай царквы і падпарадкоўвалася Дырэкцыі народных вучылішчаў. Мела 1 клас, 3 паралельныя аддзяленні, курс абучэння — 3 гады. Заснавана ў 1908 г. Абучаліся 22 хлопчыкі і 19 дзяўчынак. Навучальны год цягнуўся з 20 кастрычніка па 1 мая. Працягласць заняткаў 5 гадзін у дзень, 29 гадзін за тыдзень. Вучылішча размяшчалася ў наёмным доме за плату 190 руб. у год. Мела 3 пакоі: клас, кухню, прыхожую. Памеры класнага пакоя: даўжыня 12 аршынаў, шырыня 9



Маёнтак Барань. 1890 г.

аршынаў, плошча 108 кв. аршынаў. Меліся 2 кватэры для навучэнцаў плошчай 72 і 54 кв. аршыны.

У вучылішчы мелася 246 вучэбных тамоў 15 назваў на суму 61 руб. 45 кап. Для пазакласнага чытання кніжак не было. Для настаўнікаў было 7 кніг на суму 3 руб. 5 кап. Мелася 10 насценных геаграфічных карт, 5 карцін, чароўны ліхтар, глобус, лікі, разразная азбука. Вучні атрымлівалі бясплатна кніжкі, паперу, прылады. Праводзіліся дадатковыя заняткі па гімнастыцы мясцовым унтэр-афіцэрам запасу ў 1—3 класах. Пералічаны імёны і прозвішчы вучняў з указаннем узросту, адлегласці ад вучылішча, дзе пражываюць вучні, і назвы класа.

Ёсць даныя і пра настаўнікаў. Законанастаўнік Аляксандр Ерахееў Стульскі, 34 гады, стаж 9 гадоў, у гэтым вучылішчы 3 гады. Праводзіць 3 урокі на тыдні. Гадавы аклад 50 руб. Ён таксама выкладае ў Пугляеўскім і Крапівенскім вучылішчах. Усе астатнія дысцыпліны выкладае настаўніца Ніна Мікалаеўна Шчэрбава, 19 гадоў, дачка святара, дваранка, незамужняя. Скончыла Магілёўскую жаночую духоўную семінарыю ў 1909 г. Гадавы аклад 360 рублёў. Залічана з 1909 г. ў земскую пенсійную касу Міністэрства Народнай асветы, выплачвае 34 руб. 60 кап. Мае кватэру, на вакацыі ад'язджае.

Для параўнання можна прывесці кошт на тавары натуральнай гаспадаркі, узяты са статыстычнага агляду Магілёўскай губерні за 1914 г.: яйкі (1 дзесятак) — 20 кап., курыца — 41 кап., рабочы конь — 86 руб., карова дойная — 51 руб., авечка — 5 руб. 20 кап., свіння адкормленая — 48 руб., фунт мёду — 22 кап., пуд яблык — 2 руб. 15 кап., пуд пшаніцы — 90 кап., пуд грэчкі — 76 кап.

У пачатку 20 ст. бяднейшыя жыхары горада ўсё больш настойліва патрабавалі ад улады паляпшэння народнай адукацыі, пашырэння сеткі навучальных устаноў, замены царкоўнапрыходскіх школ пачатковымі гарадскімі вучылішчамі. Гарадскі галава ў кастрычніку 1903 г. паведамляў начальніку Маскоўска-Брэсцкай чыгункі, што жыхары трэцяй часткі Оршы патрабавалі замены чыгуначнага царкоўнапрыходскага вучылішча, бо яно «па сваёй праграме не падтрымлівае адукацыйных мэт у той ступені, у якой мае патрэбу пры сучасных сацыяльных умовах падрастаючае пакаленне».



Баранскі механічны завод. 1905 г.

У 1903 г. ў горадзе была адкрыта жаночая гімназія (цяпер у яе будынку — педагагічнае вучылішча). У 1904 г. ў двух сярэдніх навучальных установах займалася 216 дзяцей. Існавала і 6 пачатковых школ, дзе вучылася 1016 дзяцей. У горадзе на той час працавалі толькі 47 настаўнікаў.

У пас. Барань у 1907 г. адкрылася земская школа, якая памяшчалася ў доміку па вул. Аршанскай. У гэтай школе працаваў адзін настаўнік адначасова з 4 класамі. Два разы ў тыдзень прыходзіў поп вучыць дзяцей Закону Божаму. У земскай школе займалася ад 35 да 40 хлопчыкаў. Дзяўчынак сярод вучняў не было.

У 1914 г. ў Оршы было ўжо 628 вучняў, але і яны складалі толькі 50% усіх дзяцей школьнага ўзросту. Дзеці працоўных па-ранейшаму не маглі наведваць школы з-за высокай платы за навучанне. Так, плата ў рэальным вучылішчы складала 100 рублёў, што раўнялася амаль сярэднегадавому заробку рабочага. У 1913 г. гарадская дума затраціла на народную адукацыю 4393 руб., а на ўтрыманне паліцыі — 9323 руб. У справаздачы аб рабоце гарадскога чатырохкласнага вучылішча з прадметнай сістэмай навучання (у 1912 г. — 136 вучняў, у 1915 — 163 вучні) пісалася, што гістарычная экскурсія ў Смаленск не змагла адбыцца, бо жаданне ўдзельнічаць у ёй выказалі толькі 4 вучні. І тут галоўная прычына ў іх беднасці, бо не ўсе бацькі маглі панесці расходы на экскурсію.

Згодна справаздачы інспектара народнай адукацыі дырэкцыі пачатковых народных вучылішчаў па стану на 1 студзеня 1917 г. існавалі прыходскія вучылішчы: Аршанскае аднакласнае (150 вучняў), Аршанскае 1-класнае (131 вучань), Аршанскае 2-класнае (103 вучні), Аршанскае чыгуначнае (89 вучняў), Баранскае заводскае (74 вучні).

У 1-й палавіне 19 ст. Орша не мела ніводнага грамадскага сада або сквера, не было бібліятэк, тэатраў і іншых культурных устаноў. Асноўная частка выдаткаў гарадскога бюджэту ішла на ўтрыманне паліцыі гарадской думы і магістрата, а таксама акруговай лячэбніцы.

У 2-й палавіне 19 ст., пасля вядомых рэформ у дзяржаве і гаспадарцы, тэмпы развіцця горада паскараюцца, імкліва павялічваецца насельніцтва. Побач з Оршай узнікае аднайменная чыгуначная станцыя, якая хутка становіцца чыгуначным вузлом. Доўгі час



Духавы аркестр пас. Барань. 1908 г.

станцыя і горад былі асобнымі населенымі пунктамі нават у адміністрацыйных адносінах і, зразумела, асобна праходзіла іх культурнае жыццё.

Зручнае становішча станцыі і блізкага ад яе горада прадвызначыла знаёмства аршанцаў з тэатральным мастацтвам. Гэтаму яшчэ спрыяла паяўленне ў раёне гарадскога парка драўлянага тэатральнага будынка, адлюстраванага на паштоўцы пачатку 20 ст. пад модная тады назвай «Мадэрн». Сваёй прафесійнай трупы ў горадзе не было, але ўжо ў 1902 г. ўзнікае аматарскі тэатральны гурток. Ствараецца ён на станцыі Тумінскімі і Лаўрыновічамі, напэўна, работнікамі чыгункі, а кіруе ім настаўніца К.Сцяпанава.

Орша. Жылы дом. Пачатак 20 ст.

Вялікае культурнае значэнне мела адкрыццё ў 1890-х гадах 2 аршанскіх друкарняў — Падземскага і Іёсялевіча, якія распачалі выданне кніг рознага характару і зместу: гістарычных, рэлігійных, гаспадарчых і нават мастацкіх.

Плёнам грамадскіх намаганняў стала стварэнне першай гарадской бібліятэкі. Сродкі на яе збіраліся па падпісцы. Ля вытока гэтай ініцыятывы стаяў чыноўнік гарадской управы, а потым гарадскі галава Іван Андрэевіч Стратановіч. Бібліятэка адкрылася 6 чэрвеня 1899 г., да 100-годдзя з дня нараджэння вялікага рускага паэта А.С.Пушкіна і была названа яго імем. Фонд бібліятэкі налічваў тады 3—4 тыс. тамоў, у ёй працаваў адзін бібліятэкар,

Настаўніца Аршанскай гімназіі з вучнямі. 1915 г.

колькасць чытачоў не перавышала 150 чалавек, карыстанне кнігамі было платнае.

Да таго моманту існавалі таксама 3 бібліятэкі-чытальні пры навучальных установах. А ў «Отчете могилевского попечительства о народной трезвости за 1899 год» (Магілёў, 1900) прыгадваюцца кніжныя сховішчы для народа ў Аршанскім павеце.

Прыкладна ў той жа час свае кніжныя зборы ствараюць узнікаючыя палітычныя арганізацыі. У красавіку — верасні 1900 г. ў Оршы існаваў сацыял-дэмакратычны гурток, які меў бібліятэку нелегальнай літаратуры, а Аршанская рабочая арганізацыя (1889—1900 гг.) мела падпісную бібліятэку з прыкладна 80 выданняў РСДРП, Бунда, беластоцкай «Группы рабочых рэвалюцыянераў» і інш. Адзначаецца існаванне ў Оршы прыватных бібліятэк Кагана, Шулькоўскага, Брайніна, Зархі, кнігарань Левіна, Вольфіна, Азаліна, Рыўкіна.

Статыстычныя даныя за 1904 г. сведчаць аб наяўнасці ў горадзе 3 бібліятэк і 2 чытальняў, 2 друкарняў, 3 фотамайстэрняў пры адсутнасці тэатраў, музеяў і газет. У Оршы штогод праводзіліся два кірмашы — вясновы і летні, утрымліваўся адзін начлежны дом, дзейнічала таварыства цвярозасці.

Таварыства цвярозасці і рэлігійныя брацтвы пры цэрквах, якія сваёй мэтай ставілі асвету і маральна-рэлігійнае выхаванне народа, у пачатку 20 ст. актыўна ўключаюцца ў дабрачынную дзейнасць.

Значнай падзеяй для ўсёй Беларусі і Оршы таксама было перанясенне мошчаў святой Ефрасінні Полацкай. У межах Магілёўскай губерні гэта адбывалася з 26 красавіка да 6 мая 1910 г. Да Оршы святыня пераносілася па Дняпры, а ад Оршы да мяжы з Віцебскай

губерняй — па шашы. Святыня заносілася ў храмы, размешчаныя на шляху перанясення. Усё гэта прываблівала вялізную колькасць паломнікаў і багамольцаў.

У 1907 г. членам савета бібліятэкі імя А.С.Пушкіна стаў педагог і рэвалюцыянер П.М.Лепяшынскі. Тады ж павялічыўся штат бібліятэкі, папоўніўся разнастайнай літаратурай яе фонд. У 1903 г. (з дадаткамі ў 1903 і 1904) і ў 1913 г. ў друкарні Іёсялевіча выдаваліся каталогі бібліятэкі імя Пушкіна. Згодна з апошнім каталогам, у старэйшай бібліятэцы горада мелася мастацкая, дзіцячая, гістарычная, геаграфічная, этнаграфічная, юрыдычная літаратура, кнігі па іншых грамадскіх навуках, па гаспадарцы. Былі кнігі на замежных мовах — польскай, нямецкай, французскай.

У 1909 г. адзначаецца існаванне бібліятэк пры чыгуначным вучылішчы і на станцыі Орша.

В.П.Лютынскі, Л.Д. Радомская, В.М. Сцяпанаў, Л.В. Яршова, І.А. Яршоў.

Літаратура

Полное собрание русских летописей. Т. 1, вып. 1. Л., 1926. С. 166.

Ермаловіч М.І. Старажытная Беларусь. Мн., 1990. С. 168.

Штыхов Г.В. Города Полоцкой земли (IX—XIII вв.). Мн., 1978. С. 14, 29.

Ігнатоўскі У.М. Кароткі нарыс гісторыі Беларусі. Мн., 1991. С. 37, 78

Гісторыя Беларусі ў дакументах і матэрыялах. Т. 1. IX—XVIII стст. Мн., 1936. С. 59—60, 337, 449.

Полное собрание русских летописей. М., 1975. Т. 32. С. 72, 73, 155, 199.

Лойка П.А. Палітычная барацьба ў Вялікім княстве Літоўскім, Рускім, Жамойцкім у XIV — першай палове XV ст.: вытокі і вынікі // Старонкі гісторыі Беларусі. Мн., 1992.

Драгун Ю.И. Орша в XVI — первой половине XVII в.: Историко-экономический очерк // Вопросы истории БССР. Мн., 1969. Вып 37.

Документы Московского архива Министерства юстиции. М., 1897. Т. 1. С. 128, 129, 130.

Акты, относящиеся к истории Южной и Западной России. Спб., 1863. Т. 1. С. 252, 129, 212, 213, 253.

Акты, относящиеся к истории Западной России. М., 1851. Т. 4. С. 58.

Белоруссия в эпоху феодализма. Мн., 1959. Т. 1. С. 307.

Статут Вялікага княства Літоўскага, 1588. Мн., 1989. С. 481, 489, 540.

Ткачев М.А. Замки Белоруссии. Мн., 1988. С. 100, 101.

Опыт описания Могилевской губернии / Под ред. А.С.Дембовецкого. Могилев, 1884. Кн. 2. С. 97, 98.

Мальцев А.Н. Россия и Белоруссия в середине XVII в. М., 1974. С. 41—42, 136, 173, 222, 234.

Русско-белорусские связи: Сборник документов (1570—1667). Мн., 1963. С. 338—339.

Цітоў А. Гарадская геральдыка Беларусі. Мн., 1989. С. 44, 158—159.

Копысский З.Ю. Экономическое развитие городов Белоруссии (XVI—XVII вв.). Мн., 1966. С. 32.

Копысский З.Ю. Социально-политическое развитие городов Белоруссии в XVI — первой половине XVII в. Мн., 1975. С. 127, 144, 147.

Капыскі З.Ю. Аршанскае права // Помнікі гісторыі і культуры Беларусі. 1971. № 2.

Игнатенко А.П. Борьба белорусского народа за воссоединение с Россией (2-я половина XVII—XVIII в.). Мн., 1974. С. 13.

Корнейчик Е.И. Белорусский народ в Отечественной войне 1812 г. Мн., 1962. С. 41.

Слоўнік геаграфічны каралеўства Польскага і іншых славянскіх краін (пераклад з польскай). Варшава, 1886. С. 385.

Лютый А.М. Социально-экономическое развитие городов Белоруссии в конце XVIII — первой половине XIX вв. Мн., 1981.

Чепко В.В. Города Белоруссии в первой половине XIX в. Мн., 1981. С. 27, 31, 63, 67, 69, 79, 88, 97, 99.

Болбас М.Ф. Развитие промышленности в Белоруссии, 1795—1861. Мн., 1966. С. 186, 200.

Дакументы сведчаць

З ЗАГАДА МІНСКАГА ГУБЕРНАТАРА НЯПЛЮЕВА РЭЧЫЦКАМУ ЗЕМСКАМУ СУДУ ПРА УЦЁКІ СЯЛЯН

12 кастрычніка 1793 г.

Могилевского наместничества, Оршанской округи, помещика надв. сов. Адама Василевского поверенной хорунжей Игнатий Василевской же двумя прошениями мне представил 1) что после издания уже высоч. именного ее и.в., мая в 3-й день, манифеста, с деревни вителя его сказанного надв. сов. Василевского, состоящей в Копыском уезде, зовемой Жупнова, бежало крестьян мужеска пола 25, а женска 12 душ, учиня не малое похищение, кои перешел границу, проживают здешней губерни в разных селениях переходя с места на место.

Друкуецца па кн.: Сборник документов, касающихся административного устройства Северо-Западного края 1792—1796. Вильна, 1903.

З КУПЧАЙ ГРАМАТЫ

8 сакавіка 1824 г.

1823 года июня 26-го дня я ниже подписавшийся Белорусско-Могилевской губернии Копыского повета помещик... Николай Мартинов, сын Корсак, учинил сей мой добровольно уступочной документ от армии г-ну майору Григорию Григорьевичу Полешке, на крепостного моего крестьянина сироту Петра Степановича Пасючу, записанного за мною по последней ревизии Копыского повета... и имеющего от роду 20 лет с землею урочище Голого болота одною десятиною за сумму государ. ассигнациями 300 руб., а потому и вольно ему г-ну Полешке, жене, детям, наследникам его сим уступленном крестьянином Петром Пасюцом владеть вечно и бесповоротно, и властен будет кому похочет продать, подарить, заложить по всякие крепости укренить...

Друкуецца па кн.: Дакументы і матэрыялы па гісторыі Беларусі. Мн., 1940 Т.2 С. 143.

ПАВЕДАМЛЕННЕ ПАЛКОЎНІКА КАРНЕЕВА Ў АРШАНСКІ ЗЕМСКІ СУД

12 красавіка 1827 г.

Хотя оный суд отношением от 11 числа сего апреля за ¤ 868 ко мне последовавшим и просит присылки сего числа в деревню Селище одного офицера и 20 человек вооруженных солдат для усмирения князя Любомирского крестьян, но как вверенного мне полка батальон находится весьма мало нижних чинов только для одного полковаго караула, то по сей причине вышеписанного удовлетворить не могу.

Полковник Корнеев.

З ЗАПІСУ Ў ЖУРНАЛЕ АРШАНСКАГА ЗЕМСКАГА СУДА

12 красавіка 1827 г.

... приказом командиру 4-х инвалидных и Толочинской этапной команд г-ну майору Ельшину отнестись истребовать дабы благоволил для проведения в повиновение волнующихся против своего владельца князя Константина Любомирского деревни Селище крестьян командовать оршанской внутренней стражи начальника с 15 чел. рядовыми.

ПАВЕДАМЛЕННЕ МАЙСТРА МАСЮКОВА АБ ПАПЯРОВАЙ ПРЫГОННАЙ МАНУФАКТУРЫ ГЕНЕРАЛА ГУРКО Ў ФАЛЬВАРКУ ВЫСОКАЕ

12 снежня 1850 г.

Бумаги нижнего сорта продается стопа по 1 р. 30 к. сер., а самой лучшей стопа по 3 р. сер. Выделывается на 5 чанах в год 16000 стоп, на сумму 25200 руб.

О мастеровых. На фабрике имеются чугунные машины, медная и деревянная посуда. Мастер из русских вольный 1, вольнонаемных русских 3 чел., чернорабочих крепостных своих мужеска пола 140 челов., крепостных женска пола 120, всего 264 челов.

Особые сведения. На бумажной фабрике употребляется материала в год: тряпья 15000 пуд. на сумму 9500 руб., масла купоросного 500 пудов на 750 руб., марганца 250 пуд. на сумму 900 руб., соли 250 пудов на сумму 700 руб. сер. Все вышеописанные материалы покупаются в разных губерниях, а более в Московской и Калужской. Продается бумага в разных местах, в год на 25200 рублей, а преимущественно сбыт оной в Ригу и по разным ярмаркам. 2) Улучшений на фабрике в течение сего года никаких не учинено. 3) Особых изобретений никаких не сделано. Фабрика помещается в деревянных и каменных строениях. Машины действуют силою воды.

Мастер калужский мещанин Петр Осипов Масюков.

Друкуецца па кн.: Дакументы і матэрыялы па гісторыі Беларусі. Мн., 1940. Т. 2.

З УКАЗА МАГІЛЁЎСКАГА ГУБЕРНСКАГА ПРАЎЛЕННЯ

29 лістапада 1856 г.

В Губ. правлении по рассмотрению следственного дела о жестоком обращении помещика с крестьянами «Приказали» Крестьяне помещика Оршанского уезда Ивана Прус-Жуковского, имения Королей, в 1854 году жаловались г. бывшему генерал-губернатору Витебскому, Могилевскому и Смоленскому, что они обременены пригоном, отбывая таковой по три раза

в неделю, урожая работа дается несоразмерно ни силам и возможности, отчего они с 10-ти лет, не исключая стариков, постоянно находятся на барщине, что хлеб им дается худой и по одному гарнцу в неделю, а по снятии хлеба с полей помещик отбирает у них скот, числит на сие большие денежные недоимки и жестоко наказывает. Наконец, что отец его Ивана Жуковского, Роман Жуковский, ведет распутную жизнь, насилует молодых крестьянок и девиц от 14 до 15 лет.

РАПАРТ ПРЫСТАВА КОПЫСКАМУ ЗЕМСКАМУ ІСПРАЎНІКУ ПРА СЯЛЯНСКІЯ ХВАЛЯВАННІ

май 1861 г.

Помещик Иосиф Бржостовский в объявлении 2 сего мая мною полученным, поясняя, что крестьяне имения его Чирчика не повинуются согласно положению, не отбывают барщины, просил меня съехать в имение к нему и внушить повиновение.

Вследствие того 3 сего мая вместе с полицейскими служителями в числе четырех человек, отправился в имение Чирчик г. Бржостовского и приказал фольварковому войту собрать крестьян, которых явилось более 20 человек, давал им наставление, а после того при распросе, как оказалось из этого числа двух более виновных в полном неповиновении и неотбывании по положению барщины, потребовал их вперед для законного с них взыскания, то вдруг, как они тебе и прочие разбежались, отзываясь, что пойдут жаловаться высшему начальству, — и где они ныне находятся неизвестно.

ЗАЯВА ПАМЕШЧЫКА ПРА ПАРУБКУ ПАНСКАГА ЛЕСУ І АДМАЎЛЕННІ АД ПАНШЧЫНЫ СЯЛЯН ПАМЕШЧЫКА СТАХОЎСКАГА Ў КОПЫСКІМ ПАВЕЦЕ

8 мая 1861 г.

С объявлением высоч. манифеста 10-го марта я позволил крестьянам Ф.Щетинки служить барщины по два дня в неделю до 23-го апреля, а с наступлением яровых посевов они должны были по прежнему отбывать по три дня согласно высоч. утвержденному Положению о крестьянах; ныне же прошло 2 недели как они не хотят отбывать по третьему дню говоря, что им только следует по два дня, некоторые же являясь на барщину в нетрезвом виде не слушаются распоряжений экономии, и этим волнуют и других спокойных крестьян, другие же совершенно перестали служить барщину.

Помещик Антоний Стаховский.

Друкуецца па кн.: Дакументы і матэрыялы па гісторыі Беларусі. Мн., 1940. Т. 2.

З ЗАГАДА КОПЫСКАГА ІСПРАЎНІКА ПРЫСТАВУ 2-га СТАНА АБ АДМАЎЛЕННІ СЯЛЯН МАЁНТКА СМОЛЯН ВЫКОНВАЦЬ ПАВІННАСЦІ

16 мая 1861 г.

Г. копыский уездный предводитель дворянства уведомил меня о жалобе помещика Иосифа Заржецкого, что некоторые из крестьян, водворенных на его земле, отказываются исполнять те повинности, кои в высоч. утвержденных Положениях крестьян означены, что к таковому неповиновению подстрекает их, имении Смолян крестьянин деревни Шубачова Данила Кулеш ложно толкуя им Положения.

Друкуецца па кн.: Дакументы і матэрыялы па гісторыі Беларусі. Мн., 1940. Т. 2.

Орша ў вайне 1812 г.

Навала. Першыя чэрвеньскія дні 1812 г. выдаліся выключна гарачымі і душнымі. Прырода, замараная летняй спякотай, прагнула асвяжаючай навальніцы. Насельніцтва Заходняй Расіі, Беларусі і Літвы жыло ў страшэнным і трывожным прадчуванні іншай навальніцы — ваеннай. Тое, што яна вось-вось павінна была пачацца, ні ў каго не выклікала сумнення. Як бы прадвеснікам чаканай бяды стала камета, што пранеслася па небе восенню 1811 г. «Не да дабра гэта зорка, — казалі ў народзе, — памяце яна зямлю, быць ці то мору, ці то голаду». Але

большасць схілялася да думкі аб вайне з французамі. Ну, а вайна заўжды грунтоўна «мяце» зямлю. Падрыхтоўка да яе ў Расійскай імперыі ішла поўным ходам з 1810 г. Менавіта тады і наведалі Оршу (невялікі павятовы горад Магілёўскай губерні) рускія маракі — удзельнікі экспедыцыі па Міжземным моры. Адзін з іх, У.Бранеўскі, занатаваў у сваім дзённіку: «Орша намнога меншая, чым Талачын, і падобна на звычайную вёску з драўлянымі хацінамі, пачарнелымі ад часу. Вуліцы не брукаваны, і ўсё разам уяўляла сабою беднасць». Трохі раней Оршу наведаў вядомы рускі мінералог і хімік, акадэмік В.М. Севяргін. Ён налічыў у горадзе 1570 жыхароў мужчынскага полу, у тым ліку 62 рамеснікі, 5 казённых пабудоў, 347 драўляных дамоў, 36 крам, 1 мураванку, 1 млын. Упрыгожаннем паселішча былі культавыя будынкі-касцёлы, цэрквы і шматлікія кляштары, што ўтульна размясціліся на маляўнічых берагах Дняпра і Аршыцы.

Орша, якая знаходзілася на перасячэнні шляхоў, мела важнае стратэгічнае значэнне, але ўсё ж такі была адносна далёка ад заходніх рубяжоў дзяржавы. Таму ў планах, што распрацоўваліся напярэдадні вайны расійскім камандаваннем, яна, па сутнасці, ніяк не пазначана.

Грымнула нашэсце, але асноўныя ваенныя дзеянні разгарнуліся, як вядома, на поўнач і на поўдзень ад Оршы. 1-я Заходняя армія генерала М.Б. Барклая дэ Толі, якая праследавалася галоўнымі сіламі «Вялікай арміі» на чале з Напалеонам, адыходзіла праз Полацк—Віцебск на Смаленск. Заходняя армія генерала П.І. Багратыёна пад націскам большых сіл французаў, з цяжкімі баямі адступала праз Нясвіж—Слуцк—Бабруйск на Магілёў.

У Оршы перад вайной быў створаны правіянцкі магазін, які аказаўся ў эпіцэнтры перапіскі рускіх ваенных і цывільных чыноўнікаў. Так, магілёўскі губернатар выдзеліў для нарыхтоўкі харчавання і фуражу 90 тыс. руб. Няясна толькі, ці былі яны выкарыстаны па прызначэнні, бо ваенны саветнік Траццякоў, якому даручылі загадваць правіянцкім магазінам, з набліжэннем французаў «знік невядома куды».

Аршанская правіянцкая база і перапраўчныя сродкі, што знаходзіліся тут, турбавалі і віцебскага генерал-губернатара герцага Аляксандра Вюртэмбергскага. 5(17) ліпеня ён пісаў ваеннаму міністру Барклаю дэ Толі аб неабходнасці ў выпадку набліжэння непрыяля да Оршы адвезці харчаванне праз Мсціслаў у Чэрыкаў, лодкі ж сплавіць да Магілёва, а пры немагчымасці — усё знішчыць. Для выканання гэтага плана з Віцебска ў Оршу накіраваўся чыноўнік Каўроўскі, але, не даехаўшы да горада 4 вёрст, ён даведаўся, што той ужо захоплены французамі, і разважліва павярнуў назад.

У 9 гадзін раніцы 6 (18) ліпеня 1-ы атрад з кавалерыйскай брыгады генерала Э. Кальбера з двухсот чалавек уварваўся ў Оршу (у данясенні віцебскага грамадзянскага губернатара Ляшэрна ёсць удакладненне на гэты конт: «французы прайшлі ў горад ярамі», хаця маглі б і па дарозе — ніхто ім не перашкаджаў, бо чыноўнікі загадзя збеглі ў Красны, а некалькі інвалідаў павятовай каманды супраціўлення аказаць не маглі). Атрад адразу авалодаў правіянцкім магазінам. У рукі французаў трапіў і ўвесь перапраўчны парк. Каб не губляць час, яны адразу сталі перавозіць харчаванне і фураж у Талачын.

Між тым лёс аршанскага правіянту па-ранейшаму хваляваў рускіх інтэндантаў. Адзін з іх, палкоўнік П.А. Чуйкевіч, рапартаваў 6 (18) ліпеня Барклаю: «У правіянцкай камісіі (у Віцебску, — В.Л.) ёсць галаварэз і п'яніца, якога я пераканаў ехаць у Оршу і пасярод самога непрыяцела, пераадзетым, спаліць магазін. Пабачым, што будзе». Чым жа скончылася гэтая авантура, невядома, ці то чыноўнік працверазеў і пабаяўся наведаць захоплены ворагам горад, ці то яшчэ што перашкодзіла, але французы добра папоўнілі свае зрасходаваныя запасы за кошт прадуктаў, што міласціва пакінулі ім рускія ў Оршы.

7 (19) ліпеня горад заняў 3-і кавалерыйскі корпус генерала Э.Грушы. Напалеон, калі даведаўся, што ў Оршы знайшлі вялікую колькасць харчовых прыпасаў, вельмі ўзрадаваўся. Але ўжо 9 (21) ліпеня раздражнёны імператар пытаўся ў Грушы, чаму той не дасылае муку ў Глыбокае, дзе засяроджваўся цэнтр «Вялікай арміі».

Праз Оршу праходзілі і часткі 8-га (вестфальскага) корпуса генерала А. Жуно. Загарадзіўшы шлях Багратыёну, які меў намер праз Магілёў і Оршу пайсці на злучэнне з Барклаем да Віцебска, правае крыло напалеонаўскай арміі на чале з маршалам Л.Н. Даву рухалася на Смаленск, дзе, нарэшце, і адбылося злучэнне 1-й і 2-й рускіх армій.

Напалеонаўская акупацыя. На дзіва мімалётным па сваёй працягласці было нашэсце Напалеона на Расію — часавы прамежак паміж трыумфальным пераходам праз Нёман і ганебнымі ўцёкамі за мяжу рэшткаў «Вялікай арміі» складаў больш за 6 месяцаў. З іх 4 Орша знаходзілася пад уладай французаў. Тэрмін невялікі. Але па трагічнай насычанасці ён адпавядаў некалькім гадам.

У планах напалеонаўскага камандавання Орша ўваходзіла ў 4-ю прамежкавую базу паміж Дзвіной і Дняпром. Тут, як і ў Віцебску, Магілёве, адчыняліся правіянцкія магазіны. Адкрыўся ваенны шпіталь на 10 тыс. чалавек, размешчаныя ў горадзе кляштары былі для гэтага падыходзячым месцам.

Орша, якая апынулася на галоўнай аперацыйнай лініі, трапіла ў поле зроку інжынернай службы напалеонаўскай арміі. А.С. Дамбавецкі ў «Опыте описания Могилевской губернии» паведамляў, што, захапіўшы ў ліпені горад, французы хутка «навялі (цераз Дняпро. — В.Л.) два масты, прыкрыўшы іх двума пабудаванымі на вышынях левага берага тэт-дэ-понамі (ад франц. tête — галава і pont — мост, прадмаставыя ўмацаванні. — В. Л.)». Вядомы аршанскі краязнавец А.М. Шынкевіч заўважыў з гэтай нагоды: «Гэтыя ўзвышшы і цяпер добра прыкметныя на левым беразе ракі па абодва бакі ад яра, па якім некалі ад моста праходзіў пад'ём у левабярэжныя прадмесці Оршы. На схілах і ля падножжа яшчэ і сёння ляжаць вялікія апрацаваныя камяні. Магчыма, яны выкарыстоўваліся ў тых самых тэт-дэ-понах, а больш верагодна, што гэта старыя надмагіллі даўніх гарадскіх могілак» (А.М. Шынкевіч. Аршанская даўніна. 1992. С. 31—32). Іншы пункт гледжання на размяшчэнне тэт-дэ-понаў выказвалі журналіст Ю. Копцік і гісторык В. Абрамовіч у артыкуле «Унікальная знаходка ў Задняпроўі» («Аршанская газета». 1994. 27 студзеня).

У Аршанскім павеце, як і на ўсёй акупіраванай тэрыторыі, французамі была створана павятовая камісія, у абавязкі якой уваходзіла назіранне за парадкам, выкананне мясцовым насельніцтвам шматлікіх павіннасцей. На чале яе стаяў падпрэфект Васілеўскі, былы павятовы прадвадзіцель дваранства. Сярод найбольш актыўных прыхільнікаў новай улады аказаліся шляхціцы Артышэўскі, Стахоўскі, Сербіеўскі.

Насельніцтву было загадана прысягнуць на вернасць імператару французаў. І калі ў Оршы, пастаянна наводненай часткамі напалеонаўскай арміі, прысяга адбылася, то, напрыклад, у Копысі (у той час цэнтры асобнага павета) насельніцтва неяк змагло ўхіліцца ад гэтай працэдуры.

Галоўным клопатам як ваеннай, так і грамадзянскай адміністрацыі, быў збор харчавання і фуражу. Пачаліся бесперапынныя рэквізіцыі, калі з сусека выграбалася апошняя жменя зерня, выводзіўся з двара адзіны конь, забіраўся апошні жмут сена.

Цікава, што нарыхтоўку правіянту тут узначальваў інтэндант Анры Бейль, які стаў пазней знакамітым французскім пісьменнікам, вядомым пад псеўданімам Стэндаль. У адным з лістоў А. Бейль з гонарам заўважыў, што ў час адступлення паміж Оршай і Барысавам «даў арміі той адзіны кавалак хлеба, які яна атрымала... Не патраціўшы ні санціма з касы арміі, я забяспечыў армію ў Оршы і яе наваколлі. Гэтаму забеспячэнню ў тых абставінах цаны не было». Нездарма Бейль заслужыў асабістую падзяку Напалеона.

Пра тое, як ажыццяўляліся рэквізіцыі, а папросту грабеж, чытаем у складзеным пасля вайны дакументе: «Коні і розная жывёла, хлеб, палатно і ўсе харчовыя прыпасы... забіраліся непрыяцелем часткай пад квітанцыі, а больш без тых. Акрамя ж сяго, што толькі траплялася, забіраема было непрыяцелем, усё без выключэння». Што гэта каштавала краю, сведчаць «Ведамасць смаленскага губернскага пракурора аб спаленых і разораных паселішчах у Копыскім павеце Магілёўскай губерні ў час вайны 1812 года» (значная частка сучаснага Аршанскага раёна ўваходзіла ў склад гэтага павета. — В. Л.). Больш за 280 вёсак было разбурана, спустошана і спалена акупантамі. Не пашкадавалі не толькі маёнткі рускіх генералаў і афіцэраў (вёскі Барань, Зайцава, Якаўлевічы, Марозава, Балбасава і інш.), але нават і ўладанні аршанскіх ксяндзоў-езуітаў, што прытулілі напалеонаўцаў і маліліся за іх (вёскі Пагост, Ламачына).

Напрыклад, у мяст. Смаляны маёнтка князя Сангушкі быў пастаўлены «экіпаж да 300 коней з двума камендантамі, рознага роду прыдворнымі і нямалай колькасцю воінаў конных і пешых». Гарнізон прастаяў тут са жніўня да канца кастрычніка. У выніку была знішчана ўся жывёла, а таксама немалочаны

хлеб, які страўлялі коням. Пад пагрозай экзекуцыі жыхары Смалян былі абавязаны штотыднёва плаціць няпрошаным пастаяльцам па 150 руб. асігнацыямі на каву, гарбату ды цукар. Корпус маршала К.Віктора, што размясціўся паміж Сянном і Оршай, дачыста разрабаваў крамы і шмат якія дамы ў Смалянах, бліжэйшых вёсках і фальварках.

Прыклалі сваю руку да гвалту і пабораў войскі з польскага корпуса генерала Ю. Панятоўскага, якія ў жніўні прайшлі праз Оршу на Красны. Сумную славу сваімі бясчынствамі над мірным насельніцтвам здабылі тут, як усюды часткі вестфальскага корпуса. Сяляне гаварылі тады: «Француз, калі сыты ды п'яны, нікога не чапае, толькі язык яго лапоча, быццам млын. А гэтыя акаянныя, бяспальцы (вестфальцы. — В.Л.), праходу нікому не даюць і гатовыя кашулю апошнюю зняць».

Але гэта быў, як гаворыцца, афіцыйны грабеж. Не менш разбуральнымі былі набегі марадзёраў (сяляне іх трапна ахрысцілі «мірадзёрамі»), якія ў вялікай колькасці бадзяліся па навакольных лясах і дарогах. Хаця і змагаліся з гэтым страшэнным бедствам, ахапіўшым «Вялікую армію», але безвынікова. Па ўспамінах відавочцаў, салдаты з атрада Кальбера, што першыя ўварваліся ў Оршу, тут жа кінуліся рабаваць купецкія крамы, дамы мяшчан, цэрквы і манастыры.

З прыходам напалеонаўскіх войск акрыяла каталіцкае і уніяцкае духавенства, якое пакуль асабліва і не адчувала ўціску. У касцёлах узносілася хвала французскаму імператару як «вызваліцелю», «найвялікшаму з герояў» і інш.

А як жа праваслаўная (дзяржаўная) царква? Грымнула вайна, і Найсвяцейшы Сінод у звароце да вернікаў заклікаў «ўсіх... устрымлівацца ад усялякай ненабожнасці, свавольства і хістанняў ..., знаходзіцца ў паслушэнстве ад Бога ўстаноўленай уладзе». Але як быць тым, хто апынуўся пад пятой у «Антыхрыста» Напалеона і яго паслугачоў? І вось на ўсю Расію прагрымела скандальная «магілёўская царкоўная смута», галоўным вінаўнікам якой стаў архіепіскап Магілёўскі і Віцебскі Варлаам Шышацкі. Ён не толькі застаўся ў акупіраваным Магілёве, хоць мог з'ехаць у цэнтральныя губерні, як гэта зрабіла большасць прарасійскі настроеных чыноўнікаў і святароў, але і старанна пачаў супрацоўнічаць з новымі начальнікамі. Па яго загадзе духавенства Магілёўскай епархіі, куды ўваходзілі таксама аршанскія цэрквы і манастыры, прысягнула на вернасць Напалеону. Сам архірэй склаў форму прысягі: «Я, ніжэйназваны, клянуся ўсемагутным Богам у тым, што ўстаноўленаму ўраду ад Яго імператарскай Вялікасці, Французскага імператара і Італійскага караля Напалеона, маю быць верным і ўсе загады яго выконваць і каб выконваемы былі — старацца буду». У час малебнаў замест Аляксандра I патрэбна было памінаць імя французскага імператара. Усё гэта, на думку Варлаама, павінна было зберагчы храмы і праваслаўны люд у спакоі і недатыкальнасці. Але не дапамагло — варварскаму рабаванню падвергліся амаль усе цэрквы і манастыры. Не стала выключэннем і Орша. Вось адзін толькі прыклад, які дакладна занатаваны ў дакументах.

10 (22) чэрвеня 1812 г. быў складзены вопіс маёмасці Куцеінскага Богаяўленскага манастыра. Службы спраўляліся ў 2 цэрквах з багатымі рызніцамі: Богаяўленскай, драўлянай, у вопісу названай «старадаўняй», і мураванай двухпавярховай Святадухаўскай (з 1762 г. Троіцкая). Манахі месціліся ў 2 будынках: мураваным і драўляным. У манастыры, абнесеным мураванай агароджай (частка яе захавалася), меліся разнастайныя гаспадарчыя пабудовы. На жывёльным двары (т.зв. футары) гадавалася 26 кароў, 10 коней, 25 свіней і іншая жыўнасць. На р. Куцеінка знаходзіўся млын з каменнай плацінай (малацьба, праўда, ужо ў той час адбывалася толькі «вясною пры паводцы»).

31 снежня 1812 г. ўся манастырская ўласнасць была скрупулёзна «освидетельствована». Прадстаўнікі цывілізаванай нацыі тут сур'ёзна «пагаспадарылі». У мураванай царкве быў разбураны прастол, з абразоў сарваны сярэбраныя аправы, выкрадзена каштоўнае культавае начынне. Французы абадралі масіўныя сярэбраныя аправы з Евангелляў, аднак частку іх з 8 кніг вагой 17 футаў (каля 7 кг) потым знайшлі ў зямлі. Пры адступленні пазабіралі ўсе інструменты, што меліся ў гаспадарцы манастыра, экіпажы, калёсы, колы, збрую, раскралі літаральна ўвесь посуд: медны, алавяны, фаянсавы, драўляны. У вопісе коней, іншай жывёлы, птушак і пчол прыпіска: «Усё гэта разрабавана і знішчана французамі».

Доўга манастыр не мог ачуняць ад спустошвання. У Оршы існавала пасля вайны легенда пра тое, што данскія казакі, калі ўбачылі гаротнае становішча манастыра, ахвяравалі на яго аднаўленне дзесяткі пудоў трафейнага серабра. У вопісе ёсць на гэты конт удакладненне, што далі данцы манастырскай браціі.

У «Матэрыялах да крыўскай гісторапісі» А.Шлюбскага (1925) сярод вялізнага марты-ралога знішчаных помнікаў культуры і гісторыі беларускага народа пад п. 60 значыцца: «У Оршы, пасля разграблення манастыроў і цэркваў, непатрэбны «хлам» з іх быў выкінуты французамі на вуліцу, у лік якога трапілі кнігі і паперы, паміж іншым, — Евангелле («Аршанскае»), пісанае на пэргаміне крыўскім пісьмом 13 ст., частка выкінутага была падабрана, куды трапіў і гэты помнік крыўскай старадаўнай пісьменнаці...»

Адносіны яўрэйскага насельніцтва да французскага нашэсця неадназначныя. Але большасць была ўсё ж такі на баку расіян. Пра гэта сведчаць і шматлікія дакументы. Яўрэі часта выконвалі ролю праваднікоў, разведчыкаў і кур'ераў. Падчас адступлення рускай арміі генерал-маёр Аленін даносіў камандаванню з-пад Оршы: «Усе тутэйшыя яўрэі адданыя нам, чаму я бачыў вопыты».

Спачуванне і падтрымка яўрэйскім насельніцтвам рускіх войскаў выклікала злосную рэакцыю напалеонаўскай адміністрацыі і яе марыянетак. Часовы літоўскі ўрад прадпісваў падпрэфектурам: «З прычыны таго, што каварныя яўрэі, няўдзячныя да краіны, якая іх корміць, пераважна займаюцца шпіёнствам на карысць непрыяцеля... звяртаць на іх асабліваю ўвагу, так каб пашпарты ніхто з яўрэяў не меў з аднаго месца перамяшчацца ў іншае, пашпарты ж дазволіць выдаваць толькі тым, за каго паручыцца і абавяжацца кагал».

У перыяд контрнаступлення расійскай арміі яўрэі таксама аказвалі ёй дапамогу. Так, праслаўлены партызан А.Сяславін паведамляў 8 (20) лістапада з в. Грэкаўка, «што ў 2-х вярстах ад Крапіўны»: «Безупынна пасылаю жыдоў для дастаўлення мне з Оршы верных вестак». Але Дзяніс Давыдаў у той жа час перахапіў ліст з Оршы ў Горкі маёру Бланкару, які дастаўляў яўрэй.

Сельскія жыхары ў большасці варожа аднесліся да няпрошаных гасцей. Пры магчымасці, прыхапіўшы з сабой жывёлу, схаваўшы харчовыя прыпасы, небагатыя пажыткі, яны ішлі ў лясы. Тыя, што засталіся, сабатавалі мерапрыемствы акупацыйных улад: не здавалі харчаванне і фураж, не плацілі падаткі. Цяжарам была для сялян гужавая павіннасць. Аднак рэдка калі абозы прыходзілі на месца прызначэння ў сваім першапачатковым складзе. Сяляне, гвалтоўна прымушаныя суправаджаць транспарт, уцякалі пры першай магчымасці з дарогі, пакідалі даручаную ім маёмасць на волю лёсу. Так, са 103 возчыкаў, што дастаўлялі муку ў Дуброўна, пасля начлегу на Баранскім млыне засталося толькі 20 чалавек.

Дзесяткі, калі не сотні сялян (а менавіта гэта саслоўе было галоўным пастаўшчыком рэкрутаў) неслі суровую ратную службу ў расійскай арміі, гераічна змагаліся пад Астроўна і Барадзіно, на заснежаных берагах Бярэзіны, далёкіх пасля Еўропы.

Многія жыхары горада падаліся ў партызаны. Дакладна вядома, што аршанскі памешчык Леў Салагуб падрыхтаваў для рускай арміі двухтысячны полк, які цалкам экіпіраваў за ўласны кошт. Сам Салагуб стаў партызанам і на працягу ўсёй вайны змагаўся ў «лятучым» корпусе генерала Барадзіна. У жорсткіх баях з захопнікамі праяўляў адвагу і мужнасць, за што адзначаны баявымі ўзнагародамі.

Канец нашэсця. Надышлі апошнія дні напалеонаўскай акупацыі. Прайшоўшы з жорсткімі баямі выпаленую смаленскую зямлю, рэшткі некалі «Вялікай арміі» адыходзілі на захад, у Беларусь.

Раніцай 6 (18) лістапада Напалеон накіраваўся з мяст. Ляды ў напрамку да Оршы. Пасля працяглай сцюжы пачалася адліга. Гразь і галалёдзіца яшчэ больш ускладнілі шлях і прывялі да шматлікіх няшчасных выпадкаў і ахвяр.

У 5 гадзін вечара Напалеон са Старой гвардыяй прыбыў у Дуброўна, якое належала князям Любамірскім, і размясціўся ў іх палацы. У мястэчку было знойдзена крыху харчавання, меўся лазарэт «пад наглядам подлай княгіні Любамірскай, якая аказвала вялікую стараннасць французам» (Сяславін).

У авангардзе адыходзячай арміі ішлі часці маршала Л.Н.Даву і маршал Э.А. Марцье з Маладой гвардыяй. Наперадзе войскі генералаў І. Зайончака і А. Жуно.

У Дуброўне Напалеон атрымаў звесткі аб авалоданні рускімі Віцебска, няўдалых баях

пад Чашнікамі і Смалянамі і аб заняцці Мінска Дунайскай арміяй адмірала П.В. Чычагова.

Наперадзе была Орша. Размяшчэнне горада ў гэты драматычны момант спрыяла французам: тут французская армія, якая была прыкрыта Дняпром, магла б лічыць сябе на пэўны час застрахаванай ад праследавання з боку рускіх войскаў.

6 (18) лістапада ў Оршу ўвайшлі часці вестфальскага корпуса Жуно. Менавіта на яго Напалеон усклаў задачу навядзення парадку ў арміі. Жуно павінен быў заняць перадмаставое ўмацаванне на левым беразе Дняпра і патурбавацца пра арганізацыю раздачы прадуктовых запасаў з магазінаў. Уступіўшы ў горад, ён даў распараджэнне камандзе жандараў заняць масты і затрымліваць людзей, якія ішлі не ў страі, і накіроўваць іх у свае часці. Але гэта запозненая мера пацярпела поўны правал: маса галодных, што сабралася каля ўваходу на масты, сілай прарвалася праз іх, і горад напоўніўся бязладным натоўпам.

Раніцай 7 (19) лістапада Напалеон накіраваўся да Оршы. Па дарозе імператар, па словах генерала Г. Дэдэма, «ішоў пешшу і прапаведваў дысцыпліну». Аднак прапаведнік з яго атрымаўся, як пабачым ніжэй, не бліскучы. На шляху да Оршы Напалеон загадаў пастроіцца ў карэ Старой гвардыі — сваёй надзеі і апоры, якая захоўвала добрую баяздольнасць, і трымаў перад ёй прамову пра небяспеку дэзарганізацыі, заняпад парадку і паслухмянасці, пачуцці доўгу і інш.

Каля гадзіны апоўдні Напалеон прыбыў у Оршу, размясціўся ў езуіцкім манастыры. Частку дня ён правёў каля моста, агледзеў з левага берага горад, «як быццам збіраўся захаваць яго ў сваіх руках» (Каленкур). Галоўныя турботы, безумоўна, — накарміць армію. Але прадуктаў у Оршы хапіла толькі на патрэбы гвардыі і стаўкі. У горадзе «мы знайшлі харчовыя прыпасы, — успамінаў Дэдэм, — але беспарадак, што панаваў у арміі, быў прычынай таго, што яны не былі выдадзены правільна; тут паўтарылася тая ж гісторыя, як у Смаленску: адны атрымалі болей, чым патрэбна, іншым нічога не засталося, і яны гінулі ад голаду». Урач Г.Рос пісаў: «Мы знайшлі тут гарнізон і жыхароў, асабліва шмат яўрэяў. З апошнімі можна было мець справу; у іх былі прыпасы, у нас грошы, такім чынам, можна было раздабыць сабе нешта... Напалеонаўская гвардыя збывала тут асігнацыі, сабраныя (чытай — награбленыя — В.Л.) у Маскве. Толькі пазней (Рос папаў пад Барысавам у палон і жыў некаторы час у Беларусі. — В.Л.), калі я пазнаёміўся з гэтымі грашовымі знакамі, я зразумеў, наколькі страшэнна салдаты былі падмануты яўрэямі ў Оршы пры размене грошай». Зазначу: колькі жыхароў абдурылі французы, калі разлічваліся з імі за правіянт і пастой фальшывымі асігнацыямі, што былі надрукаваны ў Парыжы па загадзе імператара напярэдадні нашэсця.

Армія была разладжана і дэмаралізавана. Каб навесці нейкі парадак, Напалеон выдаў пракламацыю, у якой абвяшчалася, што салдаты, якія пакінулі свае часці ці згубілі зброю, будуць аддадзены пад суд. Аднак нават самыя жорсткія меры не маглі выратаваць становішча. Граф Солтык, успамінаючы Оршу, пісаў: «Увесь гэты час у нашых радах панаваў ужо такі эгаізм, ці, лепш сказаць, пачуццё асабістага самазахавання было настолькі моцнае, што не звярталі ўвагі на лёс свайго таварыша, і чыны згубілі ўсё сваё значэнне». Пачуўшы бой барабанаў, якія заклікалі збірацца пад «арлы», дэзерціры разбягаліся яшчэ далей. Армія скарачалася літаральна на вачах. Яна «перастала быць не толькі «вялікай», яна перастала быць арміяй» (А.Магфрэд). «Імператар увайшоў у Оршу з 6 тысячамі гвардзейцаў — з былых 35 тысяч! Яўген (Багарнэ — пасынак Напалеона, віцэ-кароль Італіі, камандзір 4-га корпуса. — В.Л.) з 1800 салдатамі з 42 тысяч! Даву з 4 тысячамі байцоў, што засталіся ад 70 тысяч!» — ускліквў генерал Ф.Сегюр.

У Оршы адбылася перагрупоўка і рэарганізацыя войскаў. Корпус Даву быў зведзены ў 3 батальёны, карпусы Яўгена Багарнэ і Жуно ў 2, з астаткаў кавалерыі І.Мюрата створаны конны атрад з адзінай мэтай — ахоўваць асобу Напалеона. Афіцэры занялі ў ім месца радавых, палкоўнікі — унтэр-афіцэраў, генералы — камандзіраў узводаў. Для збору дэзерціраў, марадзёраў і фарміравання з іх баяздольных часцей былі вызначаны пункты ў Оршы, Барані і Коханаве. Па загадзе Напалеона «арлы» і сцягі былі зняты з дрэўкаў і захаваны, потым каля Бабра спалены. У Оршы знаходзілася 36 гармат, якія былі прывезены раней з Вільні. З іх сфарміраваліся 6 батарэй, па 2 былі перададзены ў карпусы

Даву і Багарнэ, а таксама кавалерыі В.Латур-Мабура.

Буйныя прамысловыя прадпрыемствы Оршы станавіліся ўпоравень з прамысловымі гігантамі рэспублікі. Мясакамбінат, напрыклад, заняў 1-е месца сярод аналагічных прадпрыемстваў Беларусі ў выкананні вытворчага плана 1935 г. Камбінатам, дзе на той час працавала звыш 300 рабочых, было выпушчана за год 2740 тон мяса, 779 — бекону, 735 тон каўбасных вырабаў, шмат іншых відаў прадукцыі.

Нарошчвалі вытворчыя магутнасці і аб'ёмы прадукцыі іншыя заводы і фабрыкі горада. Паявілася значная колькасць прадпрыемстваў, якія выраблялі ў год прадукцыі больш чым на мільён рублёў. У 1935 г. завод «Чырвоны барацьбіт» даў рознай прадукцыі на 1106 тыс. рублёў, мясакамбінат — на 7778 тыс. рублёў. У наступным годзе льночасальная фабрыка выпусціла прадукцыі на 5713 тыс. рублёў.

Датэрмінова, 17 снежня, працоўная Орша выканала вытворчы план 1936 г. Прадпрыемствамі саюзна-рэспубліканскага значэння было выпушчана прадукцыі больш чым на 50 мільёнаў рублёў, а прадпрыемствамі прамысловай кааперацыі — больш чым на 18 мільёнаў рублёў. Рабочыя горада абавязаліся да канца года дадаткова вырабіць прадукцыі на чатыры мільёны рублёў.

У выніку выканання 2-га пяцігадовага плана горад пераўтварыўся ў адзін з развітых прамысловых і транспартных цэнтраў рэспублікі. Калі ў пачатку 1-й пяцігодкі ў прамыс-



Дабраахвотная пажарная дружына ў пас. Барань. 1933 г.

ловасці было занята 1095 рабочых, то пад канец другой — 11 200. Агульная колькасць насельніцтва горада ў 1935 г. склала 43 тыс. чалавек, а чыгуначнага пасёлка — 19 тыс.

Поспехі ў развіцці народнай гаспадаркі стварылі ўмовы для паляпшэння матэрыяльнага становішча працоўных. У 1935 г. ў Оршы, як і ва ўсёй краіне, была адменена картачная сістэма на прадукты харчавання, а ў наступным — на прамысловыя тавары народнага спажывання. Двойчы за пяцігодку, у студзені 1935 і ў лістападзе 1937 гг., павышалася заработная плата многім катэгорыям рабочых і служачых прамысловасці і транспарту. На аснове генеральнага плана былі праведзены значныя работы па рэканструкцыі і добраўпарадкаванні горада. Лініі аўтобусных зносін звязалі яго з чыгуначным вакзалам і БелДРЭС.

У 3-й пяцігодцы (1938 — 1942 гг.) працоўным горада трэба было вырашыць не менш буйныя, чым у папярэднія гады, задачы па далейшаму ўздыму прамысловасці, павышэнні культуры вытворчасці, паляпшэнні жыццёвага ўзроўню насельніцтва і г. д.

У снежні 1937 г. адбыліся выбары ў Вярхоўны Савет СССР 1-га склікання. 11 студзеня 1938 г. на ўсіх прадпрыемствах, у арганізацыях і ўстановах горада прайшлі шматлюдныя мітынгі, прысвечаныя адкрыццю 1-й сесіі Вярхоўнага Савета.

Шырокую падтрымку знайшла ў аршанцаў і падрыхтоўка да выбараў у Вярхоўны Савет рэспублікі і ў мясцовыя Саветы. У працоўных калектывах актывізавалася сацыялістычнае спаборніцтва, яшчэ больш разгарнуўся рух шматстаночнікаў. Так, па льнокамбінаце ў яго ўключыліся не толькі ткачыхі, але і памочнікі майстроў. У 1939 г. памочнік майстра Раманоўскі абслугоўваў 72 станкі, а Фальковіч і Ясючэня — па 36.

Самаадданая праца аршанцаў атрымала высокую ацэнку. У 1939 г. медалём «За працоўную адзнаку» былі ўзнагароджаны на-



Саломарэзка — прадукцыя Баранскага завода «Чырвоны Кастрычнік». 1930-я гады.

чальнік паравознага дэпо К. Заслонаў, у далейшым праслаўлены падпольшчык і партызанскі камандзір, Герой Савецкага Саюза, машыніст паравоза А. Андрэеў — таксама затым падпольшчык і партызан у гады Вялікай Айчыннай вайны, а ў пасляваенны час вядомы дзяржаўны дзеяч, Герой Сацыялістычнай Працы.

Расла прамысловая магутнасць горада. У 1938 г. ў Оршы размяшчалася 9 прадпрыемстваў саюзна-рэспубліканскага падпарадкавання: льнокамбінат, птушкакамбінат, хлебакамбінат, заводы «Чырвоны барацьбіт», пладавінны «Спартак», сілікатны, цагельны і млынзавод. Гадавы план быў выкананы імі на 109,1 працэнта. Магутная вытворчая і сыравінная база мясакамбіната дазволіла выпусціць прадукцыі на 9742 тыс. рублёў. Ужо на той час ён быў самым буйным прадпрыемствам мясной прамысловасці Беларусі, на яго долю прыпадала звыш 60 працэнтаў выпрацоўваемага ў рэспубліцы мяса.

Тэхнічнае ўдасканаленне вытворчасці праводзілася практычна на кожным прадпрыемстве. У 1939 г. была праведзена рэканструкцыя хлебакамбіната, у выніку чаго яго магутнасці павялічыліся ў 6 разоў. Амаль поўнасцю быў пераабсталяваны сілікатны завод. Больш за мільён рублёў асігнавалі на будаўніцтва цэха па выпуску тавараў народнага спажывання на заводзе «Чырвоны барацьбіт». У буйны піваварны завод быў пераўтвораны «Спартак», які выпускаў раней напіткі і віно.

Да 1940 г. ў горадзе функцыяніравала развітая тэкстыльная прамысловасць: калектыў ільнокамбіната даў краіне 9,8 млн м^2 ільняных тканін, што павялічыла іх выпуск у рэспубліцы ў 1000 разоў. Гэта прадпрыемства па праву называлі тады льняным гігантам. Кошт яго асноўных вытворчых магутнасцей вырас з 1,7 млн рублёў у 1933 г. да 49,8 млн руб. у 1940 г., г. зн. у 29 разоў. У 6 разоў выраслa металаапрацоўчая прамысловасць, у 8 — выпуск будаўнічых матэрыялаў. Далікатэсы мясакамбіната, тканіны ільнокамбіната, вырабы «Чырвонага барацьбіта» і іншых прадпрыемстваў былі вядомы не толькі ў Беларусі, але і за яе межамі.

Змяніўся і знешні воблік горада. Будаўніцтва новых прадпрыемстваў і жылых масіваў значна пашырыла яго межы. Указам Прэзідыума Вярхоўнага Савета БССР ад 22 жніўня 1940 г. ў гарадскую рысу быў уключаны чыгуначны рабочы пасёлак. Горад добраўпарадкоўваўся. Ад цэнтра ў бок чыгуначнай станцыі быў пасаджаны малады парк. Былі пракладзены новыя і адрамантаваны старыя вуліцы, пабудавана шмат дамоў.

На пачатак 1941 г. жылы фонд Оршы ўключаў у сябе 614 ведамасных, 315 камунальных, 55 кааператыўных і 5059 асабістых дамоў агульнай плошчай 302 150 м^2. У многія кватэры прыйшоў водаправод, а ў большасць — радыё. У горадзе дзейнічала шырокая сетка гандлёвых прадпрыемстваў, прадпрыемстваў грамадскага харчавання і камунальнага абслугоўвання. Менш чым за чвэрць

стагоддзя, якія мінулі пасля Кастрычніка 1917 г., з аблічча Оршы і ўклада жыцця яе насельніцтва амаль поўнасцю зніклі прыкметы дарэвалюцыйнай правінцыяльнасці. Але мірная праца была перапынена вераломным нападам фашысцкай Германіі.

З. М. Жураўлёва, Г. А. Каралёў, А. М. Кудзін.

Ахова здароўя

Бальніца ў Оршы існавала і да рэвалюцыі. З хірургічным, тэрапеўтычным, гінекалагічным, інфекцыйным аддзяленнямі. Пры ёй былі невялікая амбулаторыя і аптэка. Аднак 50 ложкаў, якія мела бальніца, ужо не задавальнялі нават тагачасны горад. Да таго ж, не хапала ўрачоў, сярэдняга медыцынскага персаналу.

Што ж тычыцца аховы здароўя маці і дзіцяці, то ў дарэвалюцыйны час у гэтым плане наогул ніякіх мерапрыемстваў практычна не праводзілася. Роды прымаліся павітухамі, на даму, нярэдка ў неспрыяльных умовах. Толькі ў 1914 г. пры земскай бальніцы было ўстаноўлена некалькі радзільных ложкаў, арганізаваны амбулаторны прыём гінекалагічных хворых. Вяла прыём акушэрка.

У 1918 годзе былая земская бальніца пераймяноўваецца ў бальніцу імя Сямашкі. У наступным годзе адкрываецца раддом на 10 ложкаў. З цягам часу колькасць ложкаў павялічвалася. Тут працавалі ўрачы І. Шабунін, П. Іткін, П. Ватман, І. Такела, з сярэдняга медыцынскага персаналу — Л. Чаплінская, П. Бярэза, Н. Буднік, П. Роніс і іншыя.

У 1924 г. ўпершыню адкрываецца, праўда, даволі прымітыўная дзіцячая кансультацыя. Дзе, дарэчы, прымалі і цяжарных жанчын. Праз год пры ёй была адкрыта малочная кухня, што выдавала да паўтары тысячы малочных сумесяў у дзень. Цікава, што пры кансультацыі дзейнічаў так званы савет сацыяльнай дапамогі. У склад яго ўваходзілі ўрачы, маці-актывісткі. Арганізоўваліся платныя лекцыі на медыцынскія тэмы, якія звычайна заканчваліся канцэртамі. Падобныя мерапрыемствы карысталіся вялікай папулярнасцю ў жыхароў горада і давалі добрыя зборы, якія накіроўваліся на дабрачынныя мэты. У тым жа 1925 г. раддом пераводзіцца ў невялікае памяшканне па вуліцы Леніна, дзе было ўжо 25 ложкаў. Галоўным урачом тут спачатку Шаціла, пазней — Петрусевіч. Адначасова пры бальніцы імя Сямашкі адкрываецца гінекалагічнае аддзяленне на 30 ложкаў (загадчык урач Клейман, акушэркі Еўдакімава, Марцынкевіч, Дубец, Шульман).

У 1932 г. радзільны дом па вуліцы Леніна быў закрыты, затое адкрываецца радзільнае аддзяленне на 110 ложкаў пры бальніцы імя Сямашкі. Гэта было зроблена з мэтай цэнтралізацыі акушэрска-гінекалагічнай службы. Аддзяленне пераводзіцца ў прасторны, светлы, добра абсталяваны двухпавярховы корпус. Значна паляпшаецца і амбулаторнае абслугоўванне цяжарных жанчын і гінекалагічных хворых. Дарэчы, прыём рабіўся не толькі ў гарадской паліклініцы (урач Клейман), а і ў калгаснай (урач Куршэўская), фізіялячэбніцы (урач Емяльяненка). Прыём цяжарных жанчын рабіўся таксама і ў дзіцячай кансультацыі (урач Петрусевіч). Такім чынам была створана даволі стройная сістэма абслугоўвання жанчын, што дазволіла рэзка скараціць мацярынскую і дзіцячую смяротнасць.

Аднак праблема дапамогі дзецям гэтым не абмяжоўвалася. Адлік павядзём з 1921 г., калі ў Оршы існавала толькі адна дзіцячая ўстанова — дом дзіцяці. І прызначалася яна для выхавання дзяцей-сірот. Загадвала домам А. Г. Заводчыкава, пазней заслужаны ўрач БССР. Смяротнасць сярод такіх дзяцей даходзіла да 15 працэнтаў. Бо не меў адпаведнай падрыхтоўкі па догляду за груднымі дзецьмі персанал дома, не было грудного малака, не быў падрыхтаваны і персанал дзіцячай кухні, дзе рыхтаваліся малочныя сумесі. У 1922 г. ясельныя дзеці былі пераведзены ў асобнае памяшканне.

У 1927 г. адкрываюцца першыя дзіцячыя яслі. У 1938 г. іх 3, утрымлівалася 135 дзяцей. У 1935 г. пры бальніцы імя Сямашкі адкрываецца дзіцячае аддзяленне на 50 ложкаў, загадвае якім А. Г. Заводчыкава. Дарэчы, у гарадскім аддзеле аховы здароўя існаваў аддзел аховы мацярынства і маленства, які зай-

Першая піянерская арганізацыя пас. Барань. 1924 г.

маўся арганізацыяй і правядзеннем усёй лячэбна-прафілактычнай работы.

Працавала станцыя хуткай медыцынскай дапамогі, якая размяшчалася пры гарадской паліклініцы. На выклікі па чарзе выязджалі ўсе ўрачы горада і найбольш вопытныя фельчары. Першая машына хуткай дапамогі была атрымана перад вайной, а так асноўным сродкам перасоўвання быў конь.

З адкрыццём у 1936 г. на тэрыторыі льнокамбіната бальніцы імя Варашылава, туды пераведзены хірургічнае і тэрапеўтычнае аддзяленні, а будынак, дзе яны размяшчаліся, перададзены акушэрска-гінекалагічнай службе. З 1930 г. рабочых ільнокамбіната і членаў іх сем'яў абслугоўваў медыцынскі пункт здароўя, дзе спачатку працаваў адзін фельчар, а пазней — урач і 3 сярэднія медыцынскія работнікі. Пункт працаваў кругласутачна.

Скурна-венерычную дапамогу да 1925 г. аказвалі прыватна практыкаваўшыя ўрачы, затым адкрыты дыспансер са стацыянарам на 12 ложкаў. У тым жа годзе пры дыспансеры быў адкрыты начны прафілакторый, які абслугоўвалі 2 фельчары.

У 1931 г. ў адным з будынкаў па вуліцы Леніна пачала функцыяніраваць гарадская санітарна-эпідэміялагічная служба, годам пазней — фізіятэрапеўтычная лячэбніца. Па ўзроўню абсталявання і аказання лячэбнай дапамогі яна неўзабаве выйшла ў лік лепшых у рэспубліцы. У 1937 годзе адкрываецца аддзяленне па пераліванню крыві.

Нельга тут не ўспомніць і пра школу медыцынскіх сясцёр, якая адкрылася ў 1930 г. Па сумяшчальніцтву выкладалі там урачы горада і настаўнікі школ. Тут рыхтавалі сярэдні медперсанал для лячэбных устаноў горада.

Асвета

З устанаўленнем Савецкай улады ў Оршы, як і па ўсёй краіне, пачынаецца барацьба за ліквідацыю непісьменнасці насельніцтва. Аршанскае рэальнае вучылішча ў 1918 г. рэарга-

Актыў жаночага савета Чыгуначнага раёна г. Орша. 1934 г.

нізуецца ў школу 2-й ступені (8 класаў), з 1921 г. школа існавала як доследна-практычная сямігодка. Тут жа размяшчаліся агульнаадукацыйныя курсы.

З 1919 г. пачынаецца гісторыя цяперашняй сярэдняй школы № 14. Вырасла яна з пачатковай. Першых яе вучняў вучыла Вольга Мікалаеўна Зіглен. У 1923 г. ў школе была створана піянерская арганізацыя.

У Барані мясцовымі органамі Савецкай улады пад школу было адведзена памяшканне ў асабняку былога ўпраўляючага заводам Гейбовіча. У 1918 г. ў гэтай школе было 115 вучняў, у 1926 г. адбыўся першы выпуск сямігодкі. У той час у школе вучыўся У. Корбан, будучы выдатны беларускі байкапісец.

На базе педагагічных курсаў 1 кастрычніка 1921 г. адкрыўся Аршанскі педагагічны тэхнікум, які ўнёс важкі ўклад у папаўненне арміі настаўнікаў рэспублікі.

Пасля разгрому замежнай інтэрвенцыі і заканчэння грамадзянскай вайны на Аршаншчыне актыўна ажыццяўлялася культурная рэвалюцыя. Арганізоўваліся пункты ліквідацыі непісьменнасці. У 1921 г. іх было 214. Вялікую работу ў гэтым накірунку праводзіла з 1926 па 1936 г. таварыства «Прэч непісьменнасць».

10 жніўня 1919 г. ў Оршы адкрыўся Пралетарскі універсітэт — папярэднік рабфака, 1 сакавіка 1921 г. — сам рабочы факультэт (фактычна існаваў у складзе Пралетарскага універсітэта з восені 1920 г.). У 1922 г. адбыўся першы выпуск Аршанскага рабфака — 12 чалавек, з іх 7 былі накіраваны на вучобу ў Беларускі дзяржаўны універсітэт і 5 — у інстытут шляхоў зносін і горны інстытут у Петраградзе.

У ліпені 1924 г. была заснавана школа № 2. Называлася яна «Другая Аршанская няпоўная сярэдняя школа», размяшчалася ў маленькім аднапавярховым будынку па вул. Леніна. Да рэвалюцыі гэта быў дом адной сям'і. У 1928 г. школа атрымала званне ўзорнай, у 1930 г. ёй было прысвоена яшчэ адно ганаровае званне — імя 1905 года.

У 1924 г. ў Оршы працавала ўжо 11 школ, у якіх займалася 2980 вучняў. У іх ліку былі адкрытая ў 1923 г. вячэрняя школа для дарослых павышанага тыпу (165 вучняў), адзіная працоўная школа другой ступені (706 вучняў), школа першай ступені (185 вучняў),

школа першай ступені пры дзіцячай камуне, размешчанай у жаночым манастыры і інш.

З 1927 г. пачынаецца гісторыя цяперашняй школы № 6.

Першая пяцігодка запатрабавала падрыхтоўкі спецыялістаў для народнай гаспадаркі, у тым ліку і па эксплуатацыі чыгункі. У Оршы ў 1929 г. быў адкрыты эксплуатацыйны тэхнікум — пазней тэхнікум чыгуначнага транспарту, які працуе і сёння.

У далейшым школы адкрываюцца ў горадзе адна за адной. Акрамя таго, засноўваюцца настаўніцкі інстытут, музычная школа, школа медсёстраў (у наступным — медыцынскае вучылішча), некалькі прафесійна-тэхнічных вучылішчаў. У 1940 г. ў школах горада займалася 5906 вучняў, працавала 10 дашкольных устаноў.

Л.Дз.Радомская.

Культура

1917 год прынёс не толькі бурныя палітычныя падзеі, але і шмат новага ў культурнае жыццё Оршы. Горад апынуўся ў цэнтры падзей. Праз станцыю рухаліся агітацыйныя цягнікі, тут выступалі франтавыя тэатральныя калектывы, трупы сталічных тэатраў. У канцы жніўня 1917 г. ў Оршы ўпершыню выступіў калектыў Першага беларускага таварыства драмы і камедыі з пастаноўкай «Паўлінкі» Янкі Купалы. 13 чэрвеня 1919 г. ў Оршу прыбыў агітцягнік «Кастрычніцкая рэвалюцыя» са старшынёй ВЦВК М. І. Калініным.

У той час у Оршы дзейнічаў тэатральны пададдзел пры грамадскім аддзеле народнай асветы, які праводзіў значную працу па стварэнні тэатральных калектываў. Больш актыўна стаў працаваць тэатральны гурток аршанскіх чыгуначнікаў, расло майстэрства выканаўцаў. Вельмі папулярнымі ў рэпертуары аршанцаў былі творы А. Астроўскага. Ішлі «Шалёныя грошы», «Таленты і паклоннікі», «Свае людзі — паладзім», «Беднасць не загана» і г. д. Значнае месца адводзілася і драматургіі М. Горкага. У 1920 г. былі пастаўлены «Мяшчане», некалькі пазней — «На дне». Асабліва ўдалымі былі вобразы Ніла ў выкананні машыніста У. Андрэева, Саціна ў выкананні М. Барсукова, таксама машыніста.

Мастацкае навучанне ўключалі ў праграму заняткаў новых навучальных устаноў. У 1918 г. ўсе сярэднія навучальныя ўстановы Аршанскага павета ўвайшлі ў веданне Народнага камісарыята па асвеце, ім надавалася найменне «Адзіная працоўная школа». Адзін з вучэбных дзён на тыдні быў тады асаблівым: зусім свабодны ад звычайных заняткаў, ён выкарыстоўваўся для чытання, экскурсій, спектакляў; заахвочвалася вучнёўская самадзейнасць.

З сакавіка 1918 г. ў Оршы выдавалася газета «Известия Советов рабочих и солдатских депутатов», неўзабаве перайменаваная ў «Набат», потым зноў у «Известия...». 20 снежня 1918 г. выйшаў першы нумар часопіса «На заре», орган савета саюза навучэнцаў Оршы. Мяркуецца, што гэта выданне звязана з існаваннем гарадской філіі «Пралеткульта». У 1921 г. выдаецца орган Аршанскага павятовага камітэта РКСМ «Юная коммунистическая мысль».

Працягвала сваю дзейнасць гарадская бібліятэка імя Пушкіна, якая пры пастаяннай актыўнай дапамозе І. Стратановіча папаўняла кніжныя фонды. У 1920 г. ў Оршы праходзіў 1-ы з'езд расійскіх бібліятэкараў. З 1919 па 1923 г. бібліятэкай кіравала В. Слонімская, якая разам з калектывам у 13 чалавек паставіла на навуковую аснову арганізацыю кніжных фондаў, займалася масавай асветніцкай работай. У 1924 г. бібліятэка мела больш за 30 тыс. тамоў.

Рабіліся крокі да развіцця выяўленчага мастацтва. У 1920 — 1921 гг. у Оршы працавала народная мастацкая школа.

З сакавіка 1924 г. Орша разам з іншымі раёнамі з пераважна беларускім насельніцтвам была перададзена ў склад БССР і такім чынам падпала пад уздзеянне магутнай плыні беларускага культурнага адраджэння. Ажывілася дзейнасць гарадскога тэатра, у якім з 1923 г. працаваў выдатны работнік культуры Аляксандр Пятровіч Фельдман. Тэатр быў цэнтрам усяго культурнага жыцця горада. Тут, апрача тэатральных спектакляў, наладжваліся канцэрты і кінасеансы, у фае часта



Выступленне спартсменаў завода «Чырвоны Кастрычнік». Барань. 1938 г.

іграў аркестр. Пры тэатры быў пакой для гульні ў шашкі і шахматы, пакой смеху з крывымі люстэркамі. Былі заключаны кантракты з маскоўскімі артыстамі, і ў Оршы пачалі выступаць оперныя і аперэтачныя трупы, эстрадныя ансамблі. Сам А. Фельдман суправаджаў паказы кінафільмаў ігрой на фартэпіяна. Пастаяннымі былі аншлагі і чэргі ў касе.

У кастрычніку — лістападзе 1924 г. Оршу наведала Беларуская дзяржаўная тэатральная трупа Уладзіслава Галубка. Орша адной з першых вітала гастролі і Другога Беларускага дзяржаўнага тэатра, адкрытага ў лістападзе 1926 г.

У сярэдзіне 1920-х гадоў шырока распаўсюдзілася спецыфічная плынь у мастацкай самадзейнасці — «Сіняя блуза». Сіняблузнікі — рабочая моладзь — наладжвалі тэатралізаваныя вусныя чытанні. Па ўспамінах сучаснікаў, у Оршы таксама дзейнічаў гурток (або нават некалькі) «Сіняй блузы».

У канцы 1920-х — пач. 1930-х гг. драматычны калектыў аршанскіх чыгуначнікаў аддае перавагу п'есам аб грамадзянскай вайне і сучасным жыцці. Найбольшы поспех меў спектакль «Любоў Яравая» (рэжысёр У. Лаўрыновіч). Вызначыліся выканаўцы галоўных роляў К. Сцяпанава (Яравая), У. Андрэеў (Яравы), В. Паўлючэнка (Швандзя), А. Громаў (Кошкін). Даволі часта гурток выязджаў з агітвагонам для выступленняў перад жыхарамі станцый і вёсак па лініі Орша — Негарэлае, бываў на гастролях у Мінску, Барысаве, Шклове, Капылі, Віцебску, Смаленску, на БелДРЭС.

У 1927 г. адкрыўся клуб чыгуначнікаў імя 10-годдзя Кастрычніка ст. Орша, які з 1934 г. носіць імя С. М. Кірава. У горадзе быў таксама драўляны клуб будаўнікоў і Дом селяніна. У будынку былога французскага кляштара размяшчаўся піянерскі клуб. Аднак ці не буйнейшым культурным цэнтрам горада на той час быў Дом асветы, дакладней — Дом саюза працаўнікоў асветы імя таварыша Ігнатоўскага. Менавіта тут падчас свайго візіту ў Оршу чытаў лекцыю першы дырэктар Інсты-

Духавы аркестр пас. Барань. 1938 г.

тута беларускай культуры Усевалад Ігнатоўскі. Гэта быў клуб інтэлігенцыі з залай на 200 месцаў і кабінетамі.

Менавіта з гэтым будынкам звязана такая неардынарная з'ява ў культурным жыцці краю, як дзейнасць Аршанскага акруговага таварыства краязнаўства, заснаванага 23 ліпеня 1924 г. Праз два гады, 25 красавіка 1926 г., у гэтым будынку праводзілася Другая Аршанская акруговая краязнаўчая канферэнцыя. Таварыства праводзіла шматпрофільную краязнаўчую работу. На ініцыятыве яго сяброў у Оршы быў створаны сельскагаспадарчы музей. У 1926 — 1927 гг. у аршанскай друкарні імя Ф. Скарыны былі выдадзены 1-ы і 2-і выпускі краязнаўчага зборніка «Аршаншчына».

У 1927 г. ў выніку зліцця сельскагаспадарчага і культурна-гістарычнага музеяў (абодва працавалі на той момант ужо тры гады) быў заснаваны Аршанскі акруговы краязнаўчы музей. Лёс гэтага музея трагічны. Сем разоў ён перамяшчаўся з будынка ў будынак, пакуль у 1939 г. па распараджэнні старшыні гарсавета Шчэрбы экспанаты музея не былі выкінуты на вуліцу, дзе праляжалі 2 дні. На гэтым музей спыніў сваё існаванне, і далейшы лёс яго фондаў невядомы. Апошні яго будынак быў перададзены тады ж, у 1939 г., гарадскому Асаавіяхіму.

У выніку агульнакультурнага ўздыму 1920-х гадоў актывізавалася мясцовае літаратурнае жыццё і пашырылася выдавецкая дзейнасць. Былі выдадзены 7 нумароў альманаха «Аршанскі маладняк» акруговай філіі літаратурнага аб'яднання «Маладняк», калектыўны зборнік чырвонаармейцаў — удзельнікаў будаўніцтва чыгункі Орша — Лепель «Стальной путь», кніга «1905 год на Аршаншчыне», юбілейны часопіс «Аршанскі рабфакавец», прысвечаны 5-годдзю аднаго з першых у рэспубліцы рабочых факультэтаў. Выдаюцца кнігі адміністрацыйна-гаспадарчага зместу.

У канцы 1920-х гг. — 1930-х гг. формы правядзення вольнага часу ўсё болей набываюць ваенна-спартыўны напрамак. У 1933 г. ў Оршы адкрываецца планерная станцыя і спартыўны сад «Дынама» з цірам, гімнастычным гарадком і кракетнай пляцоўкай, у наступным годзе — аэраклуб.

У 1930 — 1932 гг. па праектах Т. Лаўрова ўзведзены новыя будынкі драматычнага тэатра і кінатэатра. Гарадскі тэатр на 600 месц і кінатэатр на 680 месц, які атрымаў назву «11 ліпеня» — у гонар вызвалення Беларусі ад белапалякаў, існавалі ў Оршы да 1941 г.

У 1930 гады на гастролях у Оршы пабывалі Рагачоўскі калгасна-саўгасны тэатр, Дзяржаўны рускі драматычны тэатр БССР, навучэнцы студыі пры Ленінградскім тэатральным тэхнікуме, Полацкі калгасна-саўгасны тэатр.

У 1930 г. ўзнік драмгурток на Аршанскім ільнокамбінаце, пры 1-м клубе тэкстыльшчы-

каў. У 1935 г. ў горадзе выдавалася газета для дзяцей «Юны ленінец».

Да 1940 г. ў Оршы было 9 клубаў і 16 бібліятэк, з якіх гарадской заставалася толькі бібліятэка імя Пушкіна. На той момант яе фонды складалі 55 тыс. тамоў, працавалі чытальная зала, абанемент, дзіцячае аддзяленне.

У жніўні 1936 г. ў драўляным двухпавярховым будынку былой сінагогі адкрылася музычная школа, у якой напачатку было 3 выкладчыкі і 40 навучэнцаў. Да класаў фартэпіяна і віяланчэлі ў 1939/40 навучальным годзе дадаліся класы віяланчэлі, народных і духавых інструментаў, колькасць вучняў павялічылася да 180 — 200 чалавек.

В. М. Сцяпанаў.

Калектывізацыя на Аршаншчыне

Першыя сельскагаспадарчыя камуны на Аршаншчыне былі створаны ў 1918 г. Гэтаму папярэднічаў зварот загадчыка аддзела земляробства Аршанскага павета К. В. Падаляка да ўсіх «беспрытульных батракоў», у якім прапаноўвалася «працаваць і адстойваць свае правы разам у агульнай арганізацыі». Зварот заклікаў без прамаруджвання арганізоўваць камуны і арцелі, папярэдне вызначыўшы «наяўнасць маёмасці сваёй і ў панскім маёнтку».

Ужо ў 1919 г. ў Аршанскім павеце значылася 7 камун і 1 арцель «Чырвоны бераг». Пераважалі гэтыя камуны нядоўга, бо ў большасці сваёй былі яны невялікія (5 — 6 сямей, у якіх пераважалі непаўналетнія). Так, у арцелі «Машкова — Ліпкі» з 23-х членаў арцелі палавіну складалі малалетнія дзеці.

Як бачна са справаздачы губернскай камісіі аб дзейнасці арцелі «Волга» Аршанскага павета, якая была арганізавана з батракоў в. Забалацце, арцель «занадта бедная і знаходзіцца напярэдадні поўнага распаду». Вынікам дзейнасці арцельцаў стала «поўная апатыя і недавер да калектывізму». Падобнага роду заключэнне паступіла і з арцелі «Міцькаўшчына», «дзе свіннямі і птушкамі карыстаюцца асобна і абагульняць ніяк не згодны».

Масавая калектывізацыя, распачатая ў 1929 г., напачатку ішла цяжка. Як паведамляла мясцовая газета «Змычка» ад 26 кастрычніка 1930 г., пасля праведзенай дэкады калектывізацыі абагульненне сялянскіх гаспадарак дасягнула 12,7 працэнта. Калі на 21 ліпеня 1930 г. ў калгасы аб'ядналіся толькі 829 гаспадароў, то пасля правядзення дэкады іх колькасць павялічылася да 1020.

Дэкады ішлі адна за другой, і ўжо ў ліпені 1931 г., як сведчыць зводка ў газеце «Ленінскі прызыў», у раёне было ахоплена калектывізацыяй 56,7 працэнтаў гаспадароў. З 16 198 сем'яў у калгасы ўступілі 9182. Найбольш хуткімі тэмпамі ішла калектывізацыя ў Сталінскім, Веравойшанскім, Межаўскім сельскіх саветах (100 — 90 працэнтаў), менш як палавіна вяскоўцаў пажадалі аб'яднацца ў Багушэўскім, Якаўлевіцкім, Какоўчынскім, Лядзеўскім сельсаветах.

Тэмпы калектывізацыі на Аршаншчыне былі лепшымі ў рэспубліцы, бо ў 1931 г. «За паспяховае правядзенне веснавой сяўбы і дасягненні ў галіне калектывізацыі» Аршанскі раён быў узнагароджаны Пераходным сцягам імя ЦСПСБ і легкавой аўтамашынай («Ленінскі прызыў», № 72 за 10 ліпеня 1931 г.).

Калектывізацыя праходзіла ў складаных умовах, і мясцовая газета з нумара ў нумар друкавала матэрыялы з заклікамі «Уняць падкулачнікаў», «Серп і молат зменім на стрэльбу», «Біць апартуністаў суцэльнай калектывізацыі». Ледзь не ў кожным нумары змяшчаліся паведамленні аб судах над кулакамі і падкулачнікамі. Як бачна па публікацыях у «Ленінскім прызыве», найбольш актыўна дзейнічалі атрады чырвоных партызан у Межаве, бо газета заклікала: «Раўняйцеся на Межаўскіх Чырвоных партызан!», якія абавязаліся да 14-й гадавіны Кастрычніцкай рэвалюцыі (напачатку 30-х гадоў яе яшчэ не называлі Вялікай) «дабіцца поўнага выканання планаў збожжанарыхтовак».

У сярэдзіне 1931 г. на Аршаншчыне налічвалася 324 калгасы. Самая вялікая колькасць іх — 21 — у Межаўскім сельскім савеце, у Сталінскім існаваў толькі адзін калгас. У той жа год была прынята пастанова Наркамзему і Белкалгасцэнтру аб арганізацыйна-гаспадарчым узмацненні калгасаў. Прапаноўвалася выдаць калгаснікам працоўныя кніжкі і весці

запісы выпрацаваных працадзён. У пастанове ставілася задача — завяршыць у асноўным у 1932 г. суцэльную калектывізацыю.

І ўсё ж суцэльную калектывізацыю завяршыць у вызначаны час не ўдалося, бо ў 1935 г. быў прыняты новы закон аб сельгаспадатку. Згодна яму падатковыя стаўкі для гаспадарак аднаасобнікаў павышаліся на 60 — 80 працэнтаў, а «кулацкія» гаспадаркі абкладаліся падаткам у індывідуальным парадку. Новы закон, як сцвярджала газета «Ленінскі прызыў», быў «накіраваны на тое, каб яшчэ больш умацаваць калгасы, хутчэй зрабіць калгаснікаў заможнымі, каб спрыяць канчатковаму знішчэнню рэшткаў кулацтва».

Непамерныя падаткі знішчылі аднаасобнікаў, якія яшчэ заставаліся на хутарах. Хутары, да гаспадароў якіх ездзілі пераймаць вопыт сяляне з-за Урала і Украіны, зруйнавалі, моладзь паўцякала на будоўлі. На жаль, у мясцовым архіве не захавалася спісаў асуджаных, сасланых у Сібір і загінуўшых там «кулацкіх элементаў». *А. С. Танчэўская.*

Калектывізацыя ў Барздоўцы

Калгас у вёсцы быў арганізаваны 8 сакавіка 1929 г. і атрымаў назву «Вызваленне жанчын». З усёй вёскі ў калгас уступіла 13 двароў, старшынёй быў выбраны Канстанцін Восіпавіч Магер, аднавясковец. Разам з ім у калгас уступілі аднавяскоўцы: Апука Аляксей, Лабус Панас, Лабус Савелій, Мацвеева Матруна, Мацвееў Міхаіл, Пацёмкін Дзяніс, Пацёмкін Самуіл, Пацёмкіна Агаф'я, Пішчалаў Фёдар, Шутаў Трыфан, Шутава Дуня, Шутаў Яўмен.

На той час у калгасе было 14 коней, каровы, конныя плугі і культыватары, ветраны млын. Усе палявыя работы выконваліся ўручную, але ураджай у першы год сабралі добры, і да 1931 г. большасць жыхароў вёскі ўступіла ў калгас. Моладзь стварыла камсамольскую ячэйку, дапамагала арганізаваць дзіцячыя яслі ў калгасе. *В. Г. Пячонкін.*

Па старонках раённай газеты «Набат» за 13 мая 1920 г.

ВЫНІКІ ПЕРШАМАЙСКАГА СУБОТНІКА 1920 ГОДА ПА АРШАНСКАМУ ПАВЕТУ

ЛІК ПРАЦАВАЎШЫХ

Усяго ў суботніку ўдзельнічала чырвонаармейцаў 3035, грамадзянскага насельніцтва — дарослых 5810 (5120 мужчын і 690 жанчын). З іх камуністаў — 1026, членаў прафсаюза — 4322. Дзяцей працавала 1018 чалавек. Агульная колькасць адпрацаваных гадзін — 52 164. Работа выконвалася ў розных галінах нашага гаспадарчага жыцця.

НА ТРАНСПАРЦЕ

(Аршанскі чыгуначны вузел)

Працавала 4380 дарослых і 500 дзяцей. Сабрана і пастаўлена на рэйкі 50 пудоў вагонных колаў, падняты і пастаўлены на рэйкі 32 таварныя вагоны, заняты і перанесены рэйкі на адлегласць адной вярсты, нагружана чатыры платформы швелернымі рамамі, выняты з зямлі і пагружаны ў вагоны шпалы, знятыя на адлегласці адной вярсты. Разгружана 80 вагонаў сена і 40 харчовых, адцягнута ад пуці і ўкладзена ў штабелі 90 вагонаў дроў 48-вяршковых. Укладзена дроў для падачы на паравозы 180 куб. сажняў. Нагружана 4 вагоны дробнымі вагоннымі часткамі. Убраны і пагружаны па ўсёй тэрыторыі станцыі раскіданыя вагонныя і паравозныя часткі. Ачышчаны таксама пуці і двары ад смецця на ўсёй тэрыторыі станцыі.

НА АБАРОНУ

(У прыфрантавой паласе)

Працавала 2533 дарослых і 68 дзяцей. Зроблены насыпы на дарогу 5 куб. сажняў. Прыведзены ў поўную баявую гатоўнасць адзін акоп даўжынёй у 50 сажняў, ход зносін — 35 сажняў. Паглыблена два акопы па даўжыні 21 паг. сажань. Аплецена хворастам крутасцей 21 паг. сажань. Насыпана бруствe-

ру 17 паг. сажняў... Пабудаваны 2 невялікія навясныя масты. Пабудаваны адзін мост праз раку Адроў даўжынёй у 8 сажняў і шырынёй у 1 сажань. І 3 масты на прасёлачных дарогах даўжынёй у 1 сажань і шырынёй у 9 аршын кожны...

ПА ПАДРЫХТОЎЦЫ ПАЛІВА

Працавала 1170 чалавек. Нарыхтавана дроў 32,5 куб. сажняў, стоек — 150 штук, галля — 34 сажні. Вывезена 6 куб. сажняў дроў. Паднята дроў 136 куб. сажняў. Апрача таго развезена шпал 7500 штук на адлегласць 5 вёрст. Укладзена шпал 3750 штук на адлегласць 2,5 вярсты. Прымацавана рэек на працягу адной вярсты.

ПА ЗБУДАВАННЮ РАБОЧАГА ПАСЁЛКА

(У горадзе Орша)

Працавала 102 чалавекі, пастаўлена 3 зрубы.

ПА ЗАКЛАДЦЫ ПАРКУ

Працавала 450 дзяцей і 80 дарослых. Ачышчана плошча ў 5 дзесяцін для парку. Разбіты 2 алеі, засыпаны равы. Зроблена пляцоўка навучэнцамі 1-й ступені. Ачышчаны ад смецця гарадскі бульвар.

НАРМАЛЬНАЯ РАБОТА

Па рамонту сельскагаспадарчых машын і прылад у майстэрнях аддзялення ўтылізацыі, на Баранскім і Выдрыцкім заводах, у паштова-тэлеграфнай канторы, на электрастанцыі і ў лячэбных установах выконвалася бягучая работа.

«Даеш Лепель да Кастрычніка!»

З усіх галін народнай гаспадаркі Беларусі ў першыя гады сацыялістычнага будаўніцтва ў самым цяжкім становішчы знаходзіўся транспарт, асабліва чыгуначны. У цяжкіх умовах пасляваеннай разрухі прымаліся меры як па аднаўленні разбураных, так і будаўніцтве новых чыгунак.

У студзені 1924 г. Савет працы і абароны пры Саўнаркоме СССР прыняў рашэнне аб будаўніцтве лініі Орша — Лепель працягласцю ў 132 км. Пракладка яе ўскладвалася на чыгуначныя войскі. 1 кастрычніка падраздзяленні зводнага чыгуначнага палка размясціліся паблізу трасы ў населеных пунктах, зямлянках, палатках, вагончыках і прыступілі да нарыхтоўкі лесу, з якога на месцы выраблялі шпалы, слупы сувязі, брусы, сваі, потым дастаўлялі іх да трасы. Вясной 1925 г. ў раёне будаўніцтва знаходзіліся амаль усе чыгуначныя часці Чырвонай Арміі. Палкі былі аб'яднаны ў корпус войск шляхоў зносін, камандзірам якога прызначылі Л. І. Канавалава, камісарам В. Н. Вараб'ёва, начальнікам штаба І. В. Барадзіна.

Асноўныя будаўнічыя работы пачаліся ў маі 1925 г. Трэба было прайсці шматлікія ручаі, рэкі, забалочаныя нізіны, лясныя масівы. На ўсю будоўлю меўся толькі адзін экскаватар. Аўтапарк налічваў 22 машыны розных марак, амаль палавіна з іх пастаянна знаходзілася на рамонце. Асноўнымі «механізмамі» з'яўляліся рыдлёўка, тачка, грабарка, для забіўкі свай — ручны капёр.

Да 8-й гадавіны Кастрычніцкай рэвалюцыі ва ўсіх часцях і падраздзяленнях разгарнулася сацыялістычнае спаборніцтва па заканчэнні ўкладкі пуці. Палымяны заклік «Даеш Лепель да Кастрычніка!» знайшоў гарачы водгук у воінаў-чыгуначнікаў. Разгарнулася барацьба за кожны кубаметр грунту, метр моста, пікет выкладзенага шляху.

Сацыялістычнае спаборніцтва і зладжаная работа павысілі тэмпы ўкладкі пуці з 800 — 1000 метраў да 4,3 кіламетраў у суткі. Да 1 кастрычніка былі пабудаваны ўсе 72 масты, у асноўным адсыпана земляное палатно, на ўсёй адлегласці пракладзены галоўны пуць.

7 лістапада 1925 г. на станцыі Лепель адбыўся святочны мітынг, прысвечаны адкрыццю чыгункі. Першым поездам з Оршы прыбыў камандуючы войскамі Заходняй ваеннай акругі М. М. Тухачэўскі. За доблесную працу 2-і, 3-і, 5-ы, 7-ы, 10-ы, 11-ы чыгуначныя палкі (камандзіры А. І. Антонаў, Д. А. Лебедзеў, І. А. Нартаў, І. А. Блісцінаў, А. І. Матузенка, Ф. К. Гадлеўскі, камісары Л. А. Чэксцер, Г. Г. Шпілеўскі, І. М. Рыжоў, А. В. Пячэнін, Н. І. Навасельскі, І. П. Барынаў) былі ўдастоены ордэнаў Працоўнага Чырвонага Сцяга і ганаровых грамат ЦВК БССР. Удзельнікі будоўлі, якія найбольш вызначыліся, былі ўзнагароджаны спецыяльна ўста-

ноўленым нагрудным значком «Орша — Лепель. У памяць сумеснай працы работнікаў транспарту і Чырвонай Арміі».

Многія ўдзельнікі будаўніцтва лініі на Віцебшчыне сталі кіраўнікамі чыгуначных войск і транспарту. Праз усё жыццё пранёс памяць аб гэтай будоўлі Герой Сацыялістычнай Працы генерал-палкоўнік тэхнічных войск П. А. Кабанаў. Калі ўзводзілася траса Орша — Лепель, ён быў камандзірам узвода. Чыгуначны мост цераз р. Абалянка — гэта справа менавіта ўзвода П. А. Кабанава. Амаль праз паўстагоддзе П. А. Кабанаў у адной са сваіх кніг назваў трасу Орша — Лепель «выдатнай практыкай капітальнага будаўніцтва для маладых чыгуначных войск Чырвонай Арміі».

10 сакавіка 1926 г. пачалася часовая эксплуатацыя лініі Орша — Лепель, з 15 кастрычніка — пастаянная. Новая лінія садзейнічала хутчэйшаму эканамічнаму развіццю прылеглых да яе раёнаў.

У першыя дні Вялікай Айчыннай вайны па лепельскай лініі эвакуіраваліся на ўсход грузы і насельніцтва. Пасля адыходу часцей Чырвонай Арміі рух паяздоў спыніўся. Нямецкае камандаванне неаднаразова спрабавала пачаць яе эксплуатацыю, але партызаны актыўнымі дзеяннямі зрывалі яго планы. Толькі часам гітлераўцам удавалася арганізаваць рух «Элькавэ» — грузавікоў на чыгуначным хаду — паміж Лепелем і Чашнікамі. Больш за 90 км лініі поўнасцю бяздзейнічалі.

Адразу пасля вызвалення раёнаў войскамі Чырвонай Арміі, дзе праходзіла лінія Орша — Лепель (25 — 28 чэрвеня 1944 г.), яна была выкарыстана для адстою трафейнага рухомага саставу, што паскорыла работы па аднаўленні галоўнай франтавой магістралі Орша — Мінск. Толькі ў самым канцы вайны пачалося аднаўленне лініі, што паскорыла адраджэнне і далейшае развіццё гаспадаркі прылеглых раёнаў.

Л.Лыч.

Зорка над балотам

Шмат вякоў драмала Вялікае Арэхаўскае возера. Стралой блісне ў густым чароце пражэрлівы шчупак, ледзь ускалыхне сонную гладзь вады пласкадонка арахоўскага мужыка, і зноў — непарушны спакой. А навокал гэтак жа спяць абшары Асінаўскіх балот. Але ў 1927 г. гэтыя мясціны абудзіліся. Тут пачалося нечуванае — будаўніцтва электрастанцыі на беразе возера каля в. Арэхі (цяпер г. п. Арэхаўск). Якраз пра гэту будоўлю ў тым жа 1927 г. паэт Паўлюк Трус у паэме «Дзесяты падмурак» пісаў:

І тады я стану пад гарою,
Каб пазбыцца смутку і журбы,
Буду слухаць песні Асінстрою,
Захаплюся музыкай турбін.

Месца для будаўніцтва Беларускай дзяржаўнай раённай электрастанцыі было выбрана не выпадкова. Усё патрэбнае знаходзілася пад рукой: вада Вялікага Арэхаўскага возера і тарфяныя багацці Асінаўскіх балот.

Спробы асвоіць Асінаўскія балоты былі яшчэ ў 1912 — 13 гг., калі памешчык Гартан вырашыў частку іх асушыць. Аднак асушаная хапіла толькі на тарфяную падсцілку жывёле.

Цяпер пра электрафікацыю 1920-х гадоў ведае любы першакласнік. А тады як жа незвычайна гучала гэта слова — электрастанцыя — у тутэйшых балотных мясцінах!

Разведвальныя работы для будаўніцтва БелДРЭС праводзіліся ў 1925 — 26 гг. У пас. Выдрыца пабудавалі часовую электрастанцыю. Пракладвалася чыгунка ад в. Арахі да ст. Хлюсціна, а ад Арахоў да Асінторфа — 12-кіламетровая вузкакалейка і шаша да Грышаноў, што на аўтамагістралі Орша — Віцебск.

6 мая 1927 г. Савет працы і абароны прыняў пастанову, дзе адзначалася: «...Прызнаць неабходным прыступіць у 1927 г. да будаўніцтва Беларускай раённай электрычнай станцыі паблізу г. Орша на Асінаўскім тарфяным балоце для электразабеспячэння раёнаў: Віцебскага, Аршанскага і Магілёўскага, — магутнасцю 1-й чаргі 22 тыс. кВт з лініямі электраперадачы на Віцебск і Шклоўскую папяровую фабрыку». 11 ліпеня 1927 г. стаў днём закладкі Асінбуда і пачатку будаўніцтва першынца беларускай энергетыкі. У той урачыс-



Беларуская ДРЭС. Здымак 1990 г.

ты дзень будаўнікі і рабочыя электрастанцыі атрымалі прывітальную тэлеграму ад Г. К. Арджанікідзе. Пачалося будаўніцтва буйнейшай у той час электрастанцыі саюзнага значэння.

Спачатку пабудавалі баракі для жылля, потым сталовую і магазін. Хутка на балоце выросла 11 пасёлкаў торфапрадпрыемства «Асінторф» (цяпер у Дубровенскім раёне). Пачалася здабыча торфу — паліва для будучай электрастанцыі, якая, у сваю чаргу, будавалася поўным ходам.

Як будавалі, чым, якой цаной — гаварыць не даводзіцца. Рыдлёўка, тачка, на ўсю будоўлю — адзін аўтамабіль, ды і той больш прастойваў — добрых дарог для яго не было. Машыны і абсталяванне ўстанаўлівалі шведы, немцы, спецыялісты ленінградскіх заводаў. Ведаў у сваіх рабочых было малавата, затое энтузіязму варта было пазайздросціць.

Былы начальнік кацельнага цэха Іван Якаўлевіч Ефімоўскі расказваў, як васемнаццацігадовым хлопцам прыйшоў на будаўніцтва БелДРЭС з вёскі Заазер'е Багушэўскага раёна. Пачынаў землякопам, потым вучыўся на слесара. А тут пачаўся мантаж абсталявання. Рабілі яго замежныя спецыялісты. Да нашых працаўнікоў яны адносіліся з пагардай. Здавалася, што іх больш за ўсё непакоіла, як бы мясцовыя хлопцы не перанялі ў іх сакрэтаў. Але нашы энергетыкі дарма часу не трацілі, вучыліся, станавіліся тэхнічна адукаванымі людзьмі. Шырылася будаўніцтва. Паступова абуджаўся да новага ладу жыцця глухі балотны куток беларускай зямлі.

У часопісе «Вокруг света» (№ 4 за 1930 г.) змешчаны нарыс А. Раманоўскага «Зорка над балотам». Прысвячаецца ён будаўніцтву Беларускай ДРЭС і асваенню Асінаўскіх балот. Вось невялічкі, але характэрны для духу ўсяго нарыса ўрывак:

«Разрываючы ўбогі гарызонт, з балота падняўся небаскроб. Вакол ўсё нізкае, хілае, прыбітае да зямлі, а тут дзёрзкі профіль, што праектуецца проста на небасхіл. Вы ідзяце, спатыкаецеся, аднак ніяк не можаце адвесці вачэй ад незвычайнага відовішча. А ён, велічны, захутаны ў рыштаванні, масіўна і ўпэўнена ўздымаецца ўверх. Ён пагарджае старымі ўяўленнямі пра балота і нібы гаворыць:

— Не турбуйцеся! Я знайшоў у балоце спрадвечны грунт і стаў на яго мураванай нагой. А вашы ўяўленні пра гіблыя мясціны трэба перагледзець. Праз год-два ласкава запрашаем сюды, у цэнтр электрыфікацыі, у адзін з самых добраўпарадкаваных куткоў роднага краю... І над усімі гэтымі прапашчымі мясцінамі ўзняўся гігант, азірнуўшыся навокал гаспадарскім вокам, кінуў ва ўсе бакі зычны заклік: «Хопіць спаць! Хопіць гразнуць у ціне і балотах! Пара прачынацца да новага жыцця!»

10 лістапада 1930 г. газета «Савецкая Беларусь» паведаміла: «8 лістапада адбыўся ўрачысты пуск першай чаргі Беларускай электрастанцыі. На гэтую ўрачыстасць прыбылі больш за 5 тысяч рабочых, беднякоў і сераднякоў з навакольных вёсак. У гадзіну дня ў прысутнасці прадстаўнікоў ЦК КП(б)Б, членаў урада БССР, прадстаўніка урада СССР, прафсаюзных, камсамольскіх і грамадскіх арганізацый старшыня Саўнаркома БССР т. Галадзед перарэзаў чырвоную стужку, якая загараджала шлях да турбіны, і ўключыў электрычны ток».

БелДРЭС была ў той час адной з буйнейшых электрастанцый не толькі ў Беларусі, але і ва ўсім Савецкім Саюзе. Магутнасць першай чаргі яе па тагачасных вымярэннях была велізарнай — 22 тыс. кВт (для параўнання — магутнасць толькі адной турбіны сучаснай Лукомскай ДРЭС 300 тыс. кВт). Ішлі гады. У 1939 г. ўступіла ў строй 2-я чарга БелДРЭС, агульная магутнасць станцыі выросла да 32 тысяч кВт. Перад Вялікай Айчыннай вайной першынец беларускай энергетыкі даў народнай гаспадарцы 1,5 мільярда кілават-гадзін электраэнергіі.

У пачатку вайны 2 турбагенератары і дапаможнае абсталяванне БелДРЭС былі выве-



Мемарыяльная дошка на будынку БелДРЭС.

зены на Урал. Каля 200 спецыялістаў накіраваны на іншыя электрастанцыі краіны.

24 чэрвеня 1944 г. Арэхаўск быў вызвалены ад нямецка-фашысцкіх захопнікаў. Пры адступленні акупанты ўзарвалі БелДРЭС, ператварыўшы яе ў груды металу і бетону, пашкодзілі чыгуначныя пуці і многія дамы энергетыкаў. У надзвычай цяжкіх умовах пачалося аднаўленне станцыі і пасёлка. Пакуль ішла вайна, асноўны цяжар працы лажыўся на плечы старых, жанчын і падлеткаў. У верасні 1946 г. быў уведзены ў эксплуатацыю турбагенератар магутнасцю 12 тыс. кВт, 10 верасня 1948 г. — турбагенератар на 12,5 тыс. кВт і 20 снежня — на 10 тыс. кВт. БелДРЭС пасля вайны больш за 20 гадоў усё яшчэ была вядучай у Беларускай энергасістэме і ўнесла вялізны ўклад ва ўзнаўленне і развіццё народнай гаспадаркі рэспублікі, разам з тым была кузняй кадраў для далейшага развіцця энергетыкі Беларусі. Да 1960 г. большасць студэнтаў Беларускага політэхнічнага інстытута — будучыя энергетыкі — праходзілі вытворчую практыку на Беларускай ДРЭС. Акрамя таго, тут працяглы час праводзілася вялікая работа па навучанні энергетыкаў па розных спецыяльнасцях для работы на новых электрастанцыях Беларусі і Расіі.

У выніку тэхнічнага ўдасканалення, укаранення шматлікіх рацыяналізатарскіх распрацовак выпрацоўка электраэнергіі на БелДРЭС у параўнанні з даваенным часам павялічылася на трэць, а яе сабекошт знізіўся ў 3 разы. У 1967 г. Беларуская ДРЭС стала ўдзельніцай ВДНГ СССР і была ўзнагароджана Дыпломам галоўнага камітэта выстаўкі.

Час не стаіць на месцы. У нашай краіне выраслі новыя гіганты энергетыкі. БелДРЭС жыве сваім паўнакроўным жыццём. Бачная здалёк 90-метровая труба, як маяк, пазначае сёння шлях на Арэхаўск, туды, дзе ў 1930-я гады сярод балот і лясоў ішла вялікая будоўля. З 1986 г. станцыя працуе на мазуце. Зараз БелДРЭС забяспечвае цяплом комплекс па вырошчванні буйной рагатай жывёлы ў калгасе-камбінаце «Маяк камуны» і цяплічны камбінат у г. п. Арэхаўск на плошчы больш за 6 га. Будуецца газаправод «Ямал — Еўропа», а таксама насосная станцыя. Працягваецца рэканструкцыя белтрансгазавых газаправодаў, пабудаваных раней. У перспектыве станцыю плануецца перавесці на спальванне прыроднага газу. А самае галоўнае — на базе БелДРЭС задумана будаўніцтва магутнай электрастанцыі з газатурбіннымі ўстаноўкамі.

Закончыць гэтыя нататкі хочацца наступнымі радкамі з артыкула «Ад БелДРЭС да Лукомля», якія былі надрукаваны ў 4-м нумары часопіса «Работніца і сялянка» за 1970 г.: «Уласна кажучы, Лукомская ДРЭС — працяг БелДРЭС, яе сучаснае, больш магутнае ўвасабленне... Яна толькі лепш адцяніла ўсю веліч першынца беларускай энергетыкі. Першае — гэта нешта асабліва памятнае, дарагое і хвалюючае». *Б. Ф. Шалуха.*

Дакументы сведчаць

ПАСТАНОВА ЦЭНТРАЛЬНАГА ВЫКАНАЎЧАГА КАМІТЭТА І САВЕТА НАРОДНЫХ КАМІСАРАЎ БЕЛАРУСКАЙ ССР АБ ПУСКУ АСІНАЎСКАЙ ЭЛЕКТРЫЧНАЙ СТАНЦЫІ

6 мая 1927 г.

У барацьбе за індустрыялізацыю краіны і за сацыялістычную рэканструкцыю сельскай гаспадаркі на базе суцэльнай калектывізацыі рабочы клас БССР, пад кіраўніцтвам Камуністычнай партыі, дасягнуў вялікіх поспехаў. Дзякуючы велізарнаму творчаму энтузіязму рабочага класа ажыццяўляецца лозунг выканання пяцігодкі за 4 гады.

Вялікія поспехі дасягнуты ў справе сацыялістычнага будаўніцтва пры сістэматычнай дапамозе Саюза ССР. Адным з важнейшых дасягненняў пралетарыяту і ўсіх працоўных БССР з'яўляецца пабудова на Асінаўскіх тарфяных балотах першай магутнай раённай электрастанцыі.

Пабудова гэтай станцыі, з'яўляючыся найбольш яркім выкананнем запавета У. І. Леніна — «Савецкая ўлада плюс электрыфікацыя ёсць сацыялізм» і лепшым доказам правільнасці генеральнай лініі партыі, рашуча б'е па правых і левых апартуністах, па ўсіх тых, хто не верыць у магутную сілу рабочага класа.

Пабудовай Асінаўскай раённай электрычнай станцыі мы ўжо практычна паставілі беларускія балоты на службу індустрыялізацыі краіны. Віншуючы пралетарыят і ўсіх працоўных БССР з пабудовай першай чаргі раённай электрычнай станцыі, Цэнтральны Выканаўчы Камітэт і Савет Народных Камісараў ПАСТАНАЎЛЯЮЦЬ:

1. Пусціць першую чаргу раённай электрастанцыі 8 лістапада 1930 года — у дзень святкавання 13-й гадавіны Кастрычніцкай рэвалюцыі.

2. Узнагародзіць ордэнам Працоўнага Чырвонага Сцяга БССР галоўнага інжынера тав. Алейнікава і яго намесніка тав. Шаршнёва і лепшых рабочых-ударнікаў будаўніцтва гэтай станцыі тав. Шмідта, Смірнова, Штэера і Гаеўскага.

3. Выдаць ганаровыя граматы інжынерам таварышам Русакову, Меяровічу і рабочым ударнікам тав. Фёдараву, Санкіну, Гаўрыленку, Палікарпаву, Зудзіну і Аксідзіну.

4. Цэнтральны Выканаўчы Камітэт і Савет Народных Камісараў БССР заклікаюць рабочых і ўсіх працоўных накіраваць усе свае сілы і энергію на барацьбу за яшчэ больш высокія тэмпы сацыялістычнага будаўніцтва, за выкананне і перавыкананне плана народнага гаспадарчага развіцця, за далейшае паспяховае сацыялістычнае наступленне на капіталістычныя элементы па ўсяму фронту ў трэцім рашаючым годзе пяцігодкі, за выкананне пяцігодкі за 4 гады.

Старшыня Цэнтральнага Выканаўчага Камітэта БССР
А. ЧАРВЯКОЎ.
Старшыня Савета Народных Камісараў БССР
І. ГАЛАДЗЕД.
Сакратар Цэнтральнага Выканаўчага Камітэта БССР
А. ХАЦКЕВІЧ.

Расійскі дзяржаўны архіў эканомікі, ф. 5624, воп. 1, спр. 26, л. 75 — 77.

З любоўю да роднага краю

Першае дзесяцігоддзе Савецкай улады адзначана нябачным раней ростам грамадскай актыўнасці аршанцаў. Яны праяўлялі вялікую цікавасць да гісторыі роднага краю, яго прыроды, культуры і быту. У 1924 г. ўзнікла акруговае таварыства краязнаўства. У горадзе плённа працавалі яго гурткі пры рабфаку, піянерскім клубе, школе на чыгуначнай станцыі. У будынку першай школы-сямігодкі была адкрыта архіўная бібліятэка, якая складалася з вельмі рэдкіх кніг 18 — 19 стагоддзяў. Вялікая краязнаўчая бібліятэка існавала пры Доме работнікаў асветы. Па ініцыятыве краязнаўцаў у горадзе быў адкрыты сельскагаспадарчы музей. Таварыства падрыхтавала і выпусціла з друку 2 часткі неперыядычнага зборніка «Аршаншчына» і зборніка «1905 год на Аршаншчыне».

Вялікую работу ў галіне культурнага будаўніцтва правяла ў 2-й палавіне 1920-х гадоў мясцовая друкарня імя Францыска Скарыны. Выдавецкая дзейнасць яе не абмяжоўвалася выданнем газет. Друкаваліся рэзалюцыі і пастановы пленумаў акрвыканкома, канферэнцый, акруговых камітэтаў партыі і камсамола, выпускаліся вялікімі на той час тыражамі кнігі і часопісы, у тым ліку «Стальной путь» (1926) — калектыўны зборнік літаратурнай творчасці чырвонаармейцаў — удзельнікаў будаўніцтва чыгункі Орша — Лепель, юбілейны часопіс «Аршанскі рабфакавец» (1926), «Очерки по народному хозяйству Оршанского округа 2-му съезду Советов» (1927), літаратурны часопіс «Аршанскі маладняк» (1925 — 28), «Ваяўнічае бязбожжа» (1929) і інш.

Значнай з'явай у гісторыі літаратуры Аршаншчыны была дзейнасць філіі літаратурнага аб'яднання «Маладняк», створанай у маі 1925 г. У студыйных гуртках філіі ў гарадах Орша і Горкі шліфаваліся таленты многіх вядомых у далейшым беларускіх пісьменнікаў і паэтаў. Маладыя літаратары падрыхтавалі і выпусцілі 7 нумароў літаратурна-мастацкага часопіса «Аршанскі маладняк». У ім былі змешчаны вершы Алеся Вечара, Тодара Кляшторнага, творы Васіля Сташэўскага, пераклады і крытычныя артыкулы Юркі Гаўрука і іншых аўтараў.

З. М. Жураўлёва, А. М. Кудзін.

«Вулканілась жыццё на рубяжы вякоў»

Гэты радок з верша Тодара Кляшторнага найбольш ярка характарызуе паслярэвалюцыйную эпоху.

Рэвалюцыя і грамадзянская вайна падзялілі ў свядомасці людзей увесь свет на 2 палавіны: «чырвоных» і «белых», «нас» ды «іх», «новы» свет і «стары». Гэты падзел адбіўся не толькі на ладзе жыцця, але і на літаратуры. Наспела патрабаванне стварыць новую літаратуру, якая б адпавядала новаму часу. Новая літаратура, на думку тэарэтыкаў, мусіла быць гэткай дыстыляванай вадзічкай — выключна пралетарскай і бядняцка-сялянскай.

Гэта з'ява, якая была ўласціва тагачаснай савецкай літаратуры, у Беларусі найбольш яскрава выявілася ў дзейнасці першага ў рэспубліцы літаратурнага аб'яднання «Маладняк». Арганізацыя мела свае аддзяленні (філіі) у многіх гарадах рэспублікі і за яе межамі. Мелася філія «Маладняка» і ў Оршы.

Аршанскую філію ў маі 1925 г. заснавалі сакратар Цэнтральнага бюро арганізацыі, вядомы паэт Уладзімір Дубоўка і сябра «Маладняка» Кандрат Крапіва, якія пад той час наведалі горад.

Як толькі арганізавалася філія, аршанскія літаратары пачалі выдаваць часопіс «Аршанскі маладняк», які стаў яе друкаваным органам. На працягу чатырох гадоў (1925 — 28) было выдадзена 7 нумароў часопіса.

Першы нумар «Аршанскага маладняка» выдаваўся пры дапамозе Ул. Дубоўкі і К. Крапівы, які нават прысвяціў Оршы верш «Ворша, не будзь горшай».

Змешчаны ў гэтым жа нумары артыкул «Ад рэдакцыі» абвяшчаў мэту філіі: «Выяўленне мясцовых пісьменніцкіх і публістычных сіл — вось наша мэта». Гэта было цалкам у рэчышчы маладнякоўскіх ідэй: згуртаванне творчых сіл дзеля стварэння новай літаратуры. Далей мы можам прасачыць працяг думкі: «...мы будзем праводзіць на сваіх старонках рашучае змаганне з ідэалістычнымі, а таксама мяшчанскаўласніцкімі тэндэнцыямі ў беларускай літаратуры».

Мэты, якія ставіла перад сабой аршанская філія, супадалі з мэтамі «Маладняка» ў цэлым. Гэта лінія ў далейшым знайшла цалкам заканамерны працяг. Аршанская філія цесна супрацоўнічала з кампартыяй і камсамолам у развіцці літаратуры (дарэчы, як і «Маладняк», на рэспубліканскім узроўні). У 2-м нумары «Аршанскага маладняка» за 1925 г. ў рэдакцыйным артыкуле кіраўнік філіі М. Ганчарык пісаў: «Наша выяўленчае мастацтва павінна быць цалкам сваім рабоча-сялянскім, выяўляючы жыццё, быт, імкненні і перажыванні працоўных мас...» Далей аўтар гаворыць, што ў гэтым павінны быць заклапочаны ў першую чаргу камсамол, прафсаюзы, культурна-асветніцкія працаўні-

кі, настаўніцтва. Яны і мусяць спрыяць таму, каб новае мастацтва было сваім.

Плённасць такога супрацоўніцтва найбольш яскрава высвятляецца ў змесце «Аршанскага маладняка», 1-ы нумар за 1926 г. Падчас выхаду нумара праходзіла 2-я акруговая канферэнцыя камсамола. З гэтай нагоды ў часопісе былі змешчаны прывітанне ад бюро філіі, артыкул «Камсамол» і «Маладняк», а таксама верш Тодара Кляшторнага «Акруговаму з'езду камсамола».

Водгукам на гэта быў артыкул адказнага сакратара акруговага камітэта КП(б)Б Б. Стасовіча «Чарговыя задачы Аршанскай філіі «Маладняк» у 3-м нумары «Аршанскага маладняка» за 1926 г., у якім гаварылася, што літаратуру «Маладняка» павінна «папаўняць рабочая маса і бядняцка-серадняцкая частка сялянства. На іх і павінна быць скіравана энергія Аршанскай філіі «Маладняка». І далей: «Трэба рашуча адмовіцца ад празмернай асцярожнасці і залішняй падазронасці пры прыёме новых сяброў філіі».

Што ж! Такое супрацоўніцтва дало свае вынікі. З'явілася мноства траскучых вершаў, якія напоўнілі старонкі тагачасных выданняў. Але ідэалагічная зададзенасць вымушала друкаваць гэтыя вершы. Наогул, на той час, як правіла, не друкавалася толькі тое, што было «ні ў пір, ні ў вір, ні ў добрыя людзі», было ідэйна заганным або абсалютна непісьменным. Слабыя, невыразныя вершыкі, вучнёўскія спробы пяра, цьмяныя па думцы і бездапаможныя з боку формы ішлі бясконцым патокам. Гэтая з'ява была характэрнай і для аршанскай філіі «Маладняка».

Менавіта адсюль, з гэтых традыцый, з прыёму ў літаратурнае аб'яднанне людзей без культуры слова, без культуры мовы ідзе адмаўленне маладнякоўцамі набыткаў ранейшай беларускай і сусветнай культуры. Гэтая ідэя была вельмі пашыранай у маладнякоўскіх колах.

Вядома, што найбольш яркія пярэчанні ў маладнякоўцаў выклікала дарэвалюцыйная творчасць беларускіх пісьменнікаў: тут пад пытанне ставіліся нават таленты Янкі Купалы, Максіма Багдановіча, Якуба Коласа. Маладнякоўцы ўявілі сябе амаль што адзінымі стваральнікамі новай літаратуры, літаратуры савецкага часу, прэтэндуючы на манаполію ў гэтай справе.

Але... Аршанская філія, нягледзячы на ўсе вышэй працытаваныя дэкларацыі, паводзіла сябе ў адносінах да класікаў рэвалюцыйнага перыяду зусім не «па-маладнякоўску». У першым нумары «Аршанскага маладняка» быў змешчаны крытычны артыкул М. Ганчарыка «Аб творчасці Максіма Багдановіча». Кіраўнік філіі сцвярджаў, што М. Багдановіч не толькі «пясняр чыстай красы», што ўсе творы паэта — «гэта высокамастацкі, прыгожы перл, агульны змест якіх — кіпучае змаганне, у якім і згарэў сам паэт». Як бачым, ніводнага намёку на абвінавачванне М. Багдановіча тут няма. Гэтым артыкулам аршанская філія распачала шэраг публікацый па пытаннях літаратуры. Шмат якія з іх друкаваліся ў дыскусійным парадку.

Працягам дыскусіі пра творчасць класікаў з'яўляўся шэраг публікацый, прысвечаных Якубу Коласу. На рэспубліканскім узроўні творчасць Коласа (як і Купалы) маладнякоўцамі ганілася. І не толькі імі: вядомы грамадскі і партыйны дзеяч Вільгельм Кнорын у мноcтве артыкулаў кваліфікаваў творчасць Янкі Купалы і Якуба Коласа як «народніцкую», якая адыграла сваю ролю да рэвалюцыі, але цяпер быццам бы застарэла і не можа быць прынятай на ўзбраенне пралетарыятам.

У аршанскіх літаратараў стаўленне да Якуба Коласа і Янкі Купалы было зусім іншым. Першы нумар «Аршанскага маладняка» віншаваў Янку Купалу з 20-годдзем творчай дзейнасці.

Хто ж уваходзіў у аршанскую філію «Маладняка»? Дзякуючы каму яна набыла сваю пазіцыю?

У першую чаргу трэба назваць кіраўніка філіі Міхася Ганчарыка (аб ім пісалі «Ленінскі прызыў»за 18 снежня 1990 г. і «Літаратура і мастацтва» за 7 снежня 1990 г.). Гэта быў літаратар, які з першымі творамі выступіў яшчэ да рэвалюцыі, у 1914 г. Менавіта тады ён і фарміраваўся як творчая асоба. І большасць яго твораў паслярэвалюцыйнага перыяду напісана ў ранейшай манеры. У «Аршанскім маладняку» Міхась Ганчарык выступаў і як паэт, і як публіцыст, і як літаратурны крытык.

Не апошнюю ролю ў самабытнасці аршанскай філіі адыграла і супрацоўніцтва маладнякоўцаў з Максімам Іванавічам Гарэцкім. Вядомы пісьменнік быў на той час (з лютага

1926 г.) загадчыкам кафедры беларускай мовы і літаратуры ў Беларускай сельскагаспадарчай акадэміі ў Горках.Ён стаў для аршанскіх літаратараў аўтарытэтным настаўнікам. М. Гарэцкі надрукаваў у часопісе апавяданне «Хоцімка», крытычны артыкул «Бядуля пасля Кастрычніка» і запісы песень.

На кафедры беларускай мовы і літаратуры працаваў яшчэ адзін актыўны аўтар «Аршанскага маладняка» — выпускнік літаратурнага інстытута імя Валерыя Брусава ў Маскве Юрка Гаўрук. Шэрагу нумароў часопіса робяць гонар пераклады маладога аўтара з італьянскай (Пятрарка), нямецкай (Гётэ), англійскай (Шэкспір) і ўкраінскай (Леся Украінка, Паўло Тычына) моў.

Апрача таго, «Аршанскі маладняк» змяшчаў і ўласныя творы Ю. Гаўрука. Друкаваліся і традыцыйныя вершы: асяроддзе вымагала твораў зразумелых яму. Сярод такіх паэтаў у аршанскай філіі быў Алесь Вечар. Здольны паэт, тонкі лірык, ён выдаў толькі дзве кнігі вершаў — у 1930 і 1977 гг.

Проза «Аршанскага маладняка» не пакідае так багата ўражанняў: большасць твораў (за рэдкім выключэннем) прысвечана тэме грамадзянскай вайны і напісана даволі схематычна.

Маючы вопыт такога выдання, маючы ў мінулым і краязнаўчы альманах «Аршаншчына», мы б маглі іх зараз адрадзіць хоць бы ў адным літаратурна-краязнаўчым выданні.

Зміцер Дзядзенка.

Ленінскі прызыў. 1991. 11 і 13 ліпеня.

Вучыў жыццю рабфак

Гады юнацтва. У кожнага яны розныя, са сваімі падзеямі, складанасцямі, радасцямі. Маё юнацтва праходзіла ў гераічныя 1930-я гады, калі маладая Краіна Саветаў будавалася, мацнела з кожным годам. Гэта быў час, калі людзі прагна цягнуліся да ведаў, калі фарміраваліся свае кадры інтэлігенцыі — урачы, настаўнікі, інжынеры, якіх так не хапала краіне.

«Усе на рабфак!» — кінула кліч краіна. Тысячы юнакоў і дзяўчат селі за парты. У 1934 г., калі я паступіў на 2-і курс рабфака, мне было 16 гадоў. Працаваў у 4-й дыстанцыі сувязі і СЦБ станцыі Орша-Цэнтральная. Студэнтамі былі рабочыя, служачыя чыгуначнага вузла і прадпрыемстваў Оршы. Толькі выпускнікі 4-га курса вызваляліся ад работы і атрымлівалі стыпендыю. Займаліся ў вячэрні час у памяшканні чыгуначнай школы.

Што казаць, нялёгка пасля работы вечарам слухаць лекцыі і выконваць практычныя заданні. Але ўсе старанна вучыліся. Настойліва грызлі граніт навукі Лёня Папоў, Люба Сцяпанава, Сярожа Хацкевіч, Ася Караткевіч, Ядзя Харошча, Ніна Дакутовіч. І, нягледзячы на тое, што днём студэнты працавалі фізічна, былі заняткі і па фізкультуры. Гэта давала зарад бадзёрасці на наступныя дні. Выручала спартыўная зала чыгуначнага клуба. Для нас яна была адчынена ў 11 гадзін вечара. Хацелася пагуляць у баскетбол, валейбол, часам гульня зацягвалася за поўнач. Чыгуначнікам яшчэ нічога, дом побач, а вось гараджанам пасля заняткаў дадому даводзілася дабірацца амаль за 3 кіламетры. Часам недасыпалі, вучэбныя заданні даводзілася выконваць у выхадныя дні, а то і па начах. Але не было скаргаў на цяжкасці, і не было ніводнага выпадку адсеву з усяго факультэта. Выпускнікі нашай групы паспяхова здалі дзяржаўныя экзамены, атрымалі дыпломы і раз'ехаліся па краіне для паступлення ў вышэйшыя навучальныя ўстановы.

Упартасць і прага да ведаў узялі сваё: усе прайшлі конкурсныя выпрабаванні і былі прыняты на вучобу. Федзя Долбін стаў ваенным лётчыкам, Віктар Сцебянёў — ваенным мараком. Калі пачалася Вялікая Айчынная вайна, большасць студэнтаў пайшлі абараняць Радзіму. Многія аддалі за яе сваё жыццё: у Ленінградзе загінула Зіна Кунова, у паветраным баі — Фёдар Долбін, расстраляны фашыстамі партызан Іван Кудзян.

Памужнелыя студэнты, многія з сівізной на скронях, з заўчаснымі маршчынамі на твары, запаўнялі інстытуцкія аўдыторыі. Як і ў маладосці, няўтольная прага да ведаў усаджвала іх за падручнікі. Многія былыя рабфакаўцы сталі высокакваліфікаванымі спецыялістамі. Люба Гурская, цяпер Любоў

Майсееўна, урач, ёй прысвоена ганаровае званне заслужанага ўрача рэспублікі. Будуе магістральныя дарогі па краіне Павел Чарняўскі.

Нягледзячы на пенсійны ўзрост, многія працуюць і часта з любоўю ўспамінаюць сваю калыску навукі і сумленнага жыцця — Аршанскі рабочы факультэт пры Беларускім дзяржаўным універсітэце. *Л. Супрун.*

Нас вадзіла маладосць...

Жыццё маё пачыналася ў беднасці. У дзевяць год я не меў бацькоў. Рана пачалася і мая працоўная дзейнасць. Каб зарабіць на кавалак хлеба, прыбіраў у станцыйным буфеце, быў чысцільшчыкам абутку і прадаўцом газет.

Прадаючы газеты на Аршанскім чыгуначным вакзале, я быў сведкай рэвалюцыйных падзей. Памятаю, з якой цікавасцю людзі расхоплівалі газеты, дзе былі надрукаваны лозунгі бальшавікоў: «Уся ўлада — Саветам!», «Мір — народам!», «Зямля — сялянам!», а таксама першыя дэкрэты Савецкай улады, што падпісаў Уладзімір Ільіч Ленін.

На маіх вачах чыгуначнікі разганялі паліцыю і жандармерыю на станцыі Орша, абязбройвалі эшалоны карнілаўцаў, зрывалі пагоны ў афіцэраў. Ва ўсім гэтым актыўны ўдзел прымала моладзь.

Цяжкі гэта быў час. У 2 км ад станцыі Цэнтральнай і горада немцы займалі таварную станцыю. Орша стала пагранічным горадам. У гэты перыяд рэвалюцыйная моладзь стала групавацца вакол камуністаў. Тады і стварылася маладзёжная арганізацыя «Саюз юных камуністаў». Чыгуначнікі прадаставілі моладзі таварны вагон, які стаў штабам і клубам арганізацыі.

У распараджэнне саюза былі перададзены вучэбныя вінтоўкі: моладзь навучалася ваеннай справе. Па заданні работнікаў палітаддзела члены саюза, а разам з імі і я, перакідвалі праз дэмаркацыйную лінію на акупіраваную немцамі тэрыторыю газеты і лістоўкі з рэвалюцыйнымі зваротамі да нямецкіх салдат.

Вясной 1919 г. на станцыі Орша была створана арганізацыя Саюза Камуністычнай Моладзі. Памятаю першых камсамольцаў: Паўла Фёдарава, Міхаіла Кур'янава, Пятра Сухадольскага, Шабсая Ступельмана, Андрэя Дакутовіча, Пятра Осіпава, Андрэя Жанеўскага, Марыю Віткіну і іншых. У камсамольскую арганізацыю прымалі не ўсіх жадаючых, а толькі пасля дасканалай праверкі. Быў устаноўлены кандыдацкі стаж. Была і група спачуваючых. Мяне спачатку прынялі кандыдатам у члены камсамола, бо тады мне толькі споўнілася ўсяго трынаццаць год.

Да 1920 г. камсамольская арганізацыя чыгуначнага вузла налічвала больш за 100 чалавек. Актыўны ўдзел у рабоце арганізацыі прымалі Шабсай Ступельман, Пётр Сухадольскі, Міхаіл Салатанаў, Андрэй Жанеўскі, Андрэй Дакутовіч, Вольга Гурэвіч, Пётр Лагун, Емяльян Мікуловіч і іншыя.

У гэтым жа годзе па пуцёўцы чыгуначнага райкома камсамола Пётр Сухадольскі, Вольга Гурэвіч і я былі накіраваны на работу ў агітпункт палітаддзела Заходняга фронту. Агітпункт праводзіў палітычную і асветную работу сярод чырвонаармейцаў і мясцовага насельніцтва. Мы выступалі перад будзёнаўцамі з чытаннем рэвалюцыйных вершаў і баек Дзям'яна Беднага, чыталі воінам і насельніцтву газеты, растлумачвалі палітыку Савецкай улады.

З дапамогай актыву чыгуначны райком камсамола натхняў моладзь на вялікія справы. Шмат часу мы аддавалі правядзенню масавых суботнікаў. Часта галодныя, дрэнна апранутыя, камсамольцы самаддана працавалі на ачыстцы ад снегу чыгуначных пуцей, разгрузцы вагонаў, нарыхтоўцы паліва, прымалі пасільны ўдзел у рамонце паравозаў і вагонаў.

Мне добра памятаецца адзін з суботнікаў 1920 г. З-за рэлігійных забабонаў у першы дзень вялікадня многія не выйшлі на работу і некаму было разгружаць толькі што прыбыўшыя вагоны. Тады за справу ўзяліся камсамольцы. Спачатку мы разгрузілі вагоны з палівам, на другі дзень вялікадня — з харчаваннем. З радасцю насілі мы цяжкія мяшкі, хаця самі былі паўгалоднымі. Чыгуначнікі глядзелі на моладзь з павагай.

Калі над краінай навісла пагроза белапольскай акупацыі, па закліку Камуністычнай партыі побач з камуністамі на абарону маладой Савецкай рэспублікі сталі камсамольцы. У маі 1920 г. была праведзена партыйна-камсамольская мабілізацыя на Заходні фронт. Мой рост, а галоўнае — работа ў агітпункце — памаглі мне прайсці па мабілізацыі. Я быў залічаны на браняпоезд № 36, які насіў імя дарагога правадыра У. І. Леніна.

З імем Ільіча ў сэрцах мы змагаліся з ворагам. Моцна даставалася інтэрвентам у час нашых нечаканых і смелых налётаў. У чэрвені 1920 г. браняпоезд разам з дэсантным атрадам прарваўся ў варожы тыл каля Бабруйска. Разграміўшы гарнізон, мы захапілі трафеі — 2 гарматы, каля 500 снарадаў, шмат прадуктаў. І так было неаднойчы. Браняпоезд удзельнічаў у вызваленні Беларусі ад польскіх паноў.

У саставе каманды браняпоезда давялося змагацца на Каўказскім фронце з урангелеўцамі. Тут я быў паранены.

Зараз, як дарагую сэрцу рэліквію, захоўваю чырвонаармейскую кніжку перыяду грамадзянскай вайны.

У 1922 г. вярнуўся ў родную Оршу. Чыгуначная камсамолія налічвала тады ў сваіх радах больш за 250 чалавек. Абавязкі сакратара райкома выконваў Пётр Сухадольскі. Шмат было баявых спраў. Недабітыя кулацкія, эсэраўскія банды Іванова, Моніча то тут, то там з'яўляліся ў Аршанскім і Горацкім раёнах. Камсамольцы, будучы байцамі ЧОНа, прымалі актыўны ўдзел у ліквідацыі гэтых банд.

Камсамольцы-чыгуначнікі аказвалі вялікую дапамогу партыйнай арганізацыі ў шэфскай рабоце на сяле. Мы шэфствавалі тады над Талачынскім раёнам, выязджалі брыгадамі ў вёскі Багрынава, Волкавічы, Славені і іншыя, выступалі з дакладамі, канцэртамі, неслі ў сялянскія масы палымянае ленінскае слова, удзельнічалі ў ліквідацыі непісьменнасці, дапамагалі сельскай моладзі ствараць камсамольскія ячэйкі. Многія камсамольцы па пуцёўках камсамола былі мабілізаваны на работу ў вёску. Асабіста я 4 гады працаваў на палітасветнай рабоце ў Халопеніцкім раёне Мінскай вобласці.

Гарачым, неспакойным было наша юнацтва. Ленінскі камсамол рыхтаваў нас да новых, адказных спраў. У 1926 г. па рэкамендацыі камсамола я быў прыняты ў рады Камуністычнай партыі.

Вялікая загартоўка дапамагла нам у цяжкія гады барацьбы з гітлераўскай Германіяй. У радах Савецкай Арміі я прайшоў баявы шлях ад Масквы да Берліна. За баявыя заслугі ўзнагароджаны ордэнамі Баявога Чырвонага Сцяга, Айчыннай вайны 1-й і 2-й ступеняў, Чырвонай Зоркі і 8 баявымі медалямі.

Некалькі слоў хачу сказаць аб сваіх таварышах, выхаванцах нашай чыгуначнай камсамольскай арганізацыі. Пётр Осіпаў зараз рэктар Кастрамскога тэкстыльнага інстытута, Шабсай Ступельман таксама навуковы работнік, Андрэй Дакутовіч — палкоўнік у адстаўцы, Іосіф Юркоў выдатна праявіў сябе на аднаўленні горада Мінска і ўдастоены звання Героя Сацыялістычнай Працы. *С. Голубеў.*

Орша ў 1920-я

З успамінаў В. А. Касперскага, былога студэнта Аршанскага педтэхнікума

У 1927 — 29 гг. я вучыўся ў Аршанскім педтэхнікуме, які размяшчаўся ў будынку былой жаночай гімназіі, дзе ў свой час выкладаў П. М. Лепяшынскі. Горад добра мне запомніўся. Паміж Оршай 1920-х гадоў і Оршай сённяшняй — вялікая розніца. Тагачасныя рысы горада могуць сцерціся ў памяці пакаленняў, таму лічу сваім абавязкам пра гэта расказаць...

Горад быў кампактны, утульны. Яго межы распасціраліся крыху шырэй за тую тэрыторыю, якую цяпер прынята лічыць цэнтральнай часткай. Пераважалі адна-, двухпавярховыя забудовы, шчыльнасць якіх была такая вялікая, што я здзіўляўся, дзе маглі размясціцца 27 тыс. жыхароў. Менавіта столькі налічвалася тады ў Оршы. Вуліцы былі прыкладна ў 2,5 разы вузейшыя за сённяшнія.

БелДРЭСа яшчэ не было, і горад забяспечваўся электраэнергіяй ад станцыі, што была размешчана ў будынку цяперашняй друкарні.

Тады для Оршы не было неабходнасці ва ўнутрыгарадскім пасажырскім транспарце.

Усё, акрамя вакзала, знаходзілася ў радыусе 1,5 кіламетра ад цэнтра.

Аўтамабільны рух амаль не адчуваўся. Асноўным транспартам і прывычным элементам вулічнага пейзажу быў конь. У залежнасці ад свайго прызначэння коні адрозніваліся нават знешнім убранствам: летам былі запрэжаны ў рэсорныя фаэтоны з бомамі пад дугою, зімой — у вазкі з мядзведжым пакрывалам. Былі яшчэ ламавыя коні-цяжкавозы з шырокімі грузавымі калёсамі, сялянскія, прапахлыя сенам і дзёгцем, верхавыя для міліцыянераў і чырвонаармейцаў.

На адрэзку галоўнай вул. Леніна паміж вуліцамі Герцэна і Піянерскай працягласцю з паўкіламетра размяшчаліся важнейшыя адміністрацыйныя, культурныя і гандлёвыя будынкі: гарадскога тэатра, рэдакцыі і друкарні газеты «Камуністычны шлях» і інш. Там было заўсёды ажыўлена, асабліва па вечарах. Па вузкіх, залітых святлом тратуарах шчыльным натоўпам рухалася прыбраная і быццам бестурботная публіка, хоць турбот і праблем у аршанцаў хапала.

У той час у Оршы на месцы цяперашняй лазні ці дзесьці побач знаходзілася біржа працы. Гэта было брудна-шэрае з абшарпанымі сценамі і пакрытай скарынкай бруду падлогай пракуранае памяшканне, дзе мноства людзей сядзелі на падлозе або ціснуліся каля закратаваных акенцаў і прасілі любой работы.

Мы, студэнты, наведвалі біржу, каб атрымаць пуцёўкі на часовую работу. Каля акенцаў не трэба было тоўпіцца: упаўнаважаны студкома выносіў нам ільготныя пуцёўкі ў залу. Трэба было бачыць, якімі зайздроснымі вачыма глядзелі на гэта беспрацоўныя.

Зараблялі тады на некваліфікаваных работах да паўтара рубля, часам і менш. Аднойчы ў выхадны дзень я здабываў у кар'еры (на месцы цяперашняга ваенкамата) будаўнічы камень. Дзесятнік замераў на 80 капеек. Такія «заробкі» кідалі нават беспрацоўныя. Іншы раз, узяўшы начную пуцёўку, я ішоў працаваць грузчыкам на піўзавод.

Як вынікі пасляваеннай разрухі назіраліся ў Оршы сіроцтва, дзіцячая беспрытульнасць, беспрацоўе. Здараліся і хуліганства, кішэнныя, чамаданныя і іншыя дробязныя крадзяжы, але гэта зусім не азначала нейкай асаблівай маральнай разбэшчанасці, не насіла цынічнага характару, самаўпэўненасці ў беспакаранасці. Такое назіралася тады ва ўсіх гарадах. Не было задзірлівай вулічнай развязнасці захмялелай моладзі, паказнога брыдкаслоўя, наогул, непавагі да акружаючых. Хуліган, выпівоха, жулік паводзілі сябе стрымана, яны туляліся ад людзей, а не куражыліся. Хадзіць ноччу па Оршы было не страшна. У горадзе панавала атмасфера дзелавітай заклапочанасці і адначасова жыццярадаснай бадзёрасці, добразычлівай таварыскасці і ветлівасці.

З другой палавіны майго знаходжання ў Оршы там пачаліся сацыялістычныя будоўлі, вастрыня беспрацоўя зменшылася, і біржа была скасавана.

Найбольш значнымі прадпрыемствамі былі мясакамбінат і льнокамбінат. Ужо позняй восенню 1928 г. нас пасылалі, напрыклад, не на будоўлю мясакамбіната, а на ўборку будаўнічага смецця на яго тэрыторыі. Тым часам сярод хваёвага лесу пачыналі капаць катлаваны і траншэі пад аб'ектам будучага тэкстыльнага гіганта.

За станцыяй Орша-Усходняя ўзводзіліся сцены першага корпуса вагонарамонтнага дэпо. Пракладвалася новая чыгуначная ветка Орша — Лепель.

З аб'ектаў адміністрацыйна-культурнага будаўніцтва можна адзначыць дзяржбанк, чыгуначны клуб.

На масіве, які быў абмежаваны вакзалам, малым чыгуначным кальцом і цяперашняй вуліцай Молакава, быў закладзены вялікі парк. Цяпер ад яго засталіся толькі рэшткі. але калі я праходжу міма, угадваю дрэвы, якія, магчыма, былі пасаджаны мною.

Побач з дзяржбанкам, на рагу вуліц Герцэна і Мінскай, стаяў аднапавярховы цагляны будынак «Дом асветы» — клуб інтэлігенцыі з залай на 200 месцаў і кабінетамі. Там у свой час выступалі У. Ігнатоўскі, Янка Купала і іншыя пісьменнікі.

На рагу вуліц Леніна і Камсамольскай узвышалася велічнае збудаванне старадаўняй архітэктуры — дзеючы саборны храм. Да яго прымыкалі карпусы былога манастыра, дзе да рэвалюцыі размяшчалася духоўнае вучылішча, а ў мой час — палкавая школа. Перад пачаткам вайны будынак сабора быў пераабсталяваны пад аэраклуб, з пяці купалоў застаўся толькі адзін. Існаваў сабор і пасля вайны, але потым быў знесены. Манастырскія карпусы захаваліся.

На месцы цяперашняй загазаванай і запыленай вул. Карла Маркса была вул. Ціхая, утульная, уся ў зеляніне і кветках. На ёй, дзе цяпер дзіцячы сад, стаяў Дом селяніна.

Акруговы камітэт партыі знаходзіўся на сучаснай цэнтральнай плошчы.

На вул. Піянерскай акрамя прыватных дамоў і нашага інтэрната быў новы драўляны клуб будаўнікоў. Гэта вуліца ўпіралася ў Дняпроўскую прыстань, куды апрача грузавых барж прышвартоўваліся і невялікія пасажырскія параходы.

Паміж вул. Леніна і Дняпром былі ворыўныя землі, таксама знаходзіліся вапняковыя кар'еры, вапнавы завод, дзетпрыёмнік, базіраваўся кавалерыйскі эскадрон.

Цяпер цэнтр горада звязвае з вакзалам вул. Міру. Раней жа паміж вуліцамі Леніна і Пралетарскай была кароценькая вул. Чырвоная. Транспартная сувязь з вакзалам ажыццяўлялася па вул. Кірава, цераз чыгуначны праезд, які быў на месцы цяперашняга завода плаўленых сыроў. Далей на вакзал вяла брукаваная дарога. Месца завода «Легмаш» займалі балоты і невялічкія азерцы.

Там, дзе сёння мемарыял у гонар вызвалення Оршы, стаяў вялікі асабняк памешчыцкага тыпу, са скульптурамі львоў каля пад'езда, і гарадская паліклініка. Бальніца ж была ў былым жаночым манастыры базыльянак.

У Музейным зав., у будынку, дзе размяшчаецца вучылішча, працавала арцель па прыгатаванні славутага аршанскага безалкагольнага напітку «шпанка». Мне даводзілася каштаваць сусветна вядомы амерыканскі напітак «пепсі-кола», але яму далёка да аршанскай «шпанкі» 20-х гадоў. Шкада, што рэцэпт яе загінуў разам з майстрамі, якія пільна яго захоўвалі і не паспелі нікому перадаць.

Музейны зав. вёў у краязнаўчы музей, які размяшчаўся ў былым будынку царквы Апека. Гэты храм уяўляў сабой таксама гістарычную і архітэктурную каштоўнасць, але быў разбураны праз дваццаць гадоў пасля Вялікай Айчыннай вайны. У тыя гады перасталі існаваць званіца манастыра дамініканцаў, царква жаночага манастыра маравітанак, драўляная царква па вул. Пралетарскай і многае іншае з таго, што было адзначана гісторыяй.

Перыяд нэпа заканчваўся, але нейкі час ён яшчэ іграў пэўную ролю ў эканамічным жыцці: у дастатковай колькасці былі прадукты харчавання, танныя тавары шырокага ўжытку, але пакупная здольнасць насельніцтва была вельмі нізкай, не хапала грошай. Заработная плата рабочых была невялікай, да таго ж — беспрацоўе.

Заслуга нэпа ў тым, што ён падштурхоўваў да лепшай працы дзяржаўны і кааператыўны сектары: суб'екты гаспадарання павінны былі захоўваць рэнтабельнасць і канкурэнтаздольнасць, каб не апынуцца ў беспрацоўных. Але ўсіх сацыяльных праблем нэп не вырашыў.

Мне адзін раз пашанцавала: у час летніх канікулаў я ўладкаваўся па пуцёўцы біржы на будаўніцтва чыгуначнага моста цераз Днепр. На той час там былі вялікія заробкі. Будаўніцтва вялося без прымянення тэхнікі, пры дапамозе блочных пад'ёмнікаў, таляў, тросаў і лябёдак, і ўсё ж мост быў пабудаваны за адно лета.

Добра падзарабіўшы, восенню я купіў дэмісезоннае паліто з серабрыста-цёмна-шэрага бобрыка, цёмна-сіні гарнітур з англійскага бастону, ленінградскія скараходаўскія чаравікі моднага шакаладнага колеру, кепі-рэглан і іншую дробязь, нават яшчэ засталося крыху грошай.

З таго часу аблічча горада вельмі змянілася. Орша выросла ў вышыню і ў шырыню. З будаўніцтвам новых мікрараёнаў на ўзвышшах горад упершыню ў сваёй гісторыі пачаў выглядваць з вядомай па геаграфіі Аршанскай упадзіны. Гісторыя працягваецца ...

Подзвіг І. П. Кірпічова

КІРПІЧОЎ Іларыён Паўлавіч. Герой Савецкага Саюза (21.3.1940). Нарадзіўся 21.10.1914 г. ў в. Якаўлевічы Аршанскага раёна. З сялян. Да прызыву ў Чырвоную Армію працаваў на фабрыцы ў Ленінградзе. У Чырвонай Арміі з 1936 г. У 1941 г. скончыў танкавае вучылішча, у 1945 г. — Вышэйшую афіцэрскую бранятанкавую школу, у 1952 г. —

Вышэйшую афіцэрскую школу самаходнай артылерыі. Камандзір танка старшыня І. П. Кірпічоў вызначыўся ў савецка-фінляндскую вайну 1939 — 40 гг. 22.2.1940 г. экіпаж танка прарваўся да савецкай часці, якая была акружана праціўнікам, дапамог ёй устанавіць сувязь з камандаваннем. Пасля выканання задання танк падарваўся на міне і больш за суткі акружаны экіпаж адбіваў атакі ворага. У Вялікую Айчынную вайну ўдзельнік абароны і вызвалення Паўночнага Каўказа. Да 1960 г. ў Савецкай Арміі, падпалкоўнік, пасля на адміністрацыйнай рабоце.

Непераможны танк

Танк імкліва рвануўся наперад. Пакідаючы за сабой воблакі снежнага пылу, ён наблізіўся да невысокага пагорка, лёгка пераадолеў яго і, праляскаўшы настылымі на марозе гусеніцамі, схаваўся ў перадсвітальнай імгле.

Перамяшчацца танкістам давялося ў непасрэднай блізкасці ад пярэдняга краю праціўніка, а потым і па занятай ім тэрыторыі. Вораг час ад часу даваў аб сабе знаць: машына некалькі разоў была абстраляна з лёгкай гарматы. Але экіпаж, здавалася, не звяртаў ніякай увагі на абстрэлы і нічым не адказваў на выклік праціўніка. Не збаўляючы хуткасці, танкісты настойліва прасоўваліся далей. Яны помнілі пра дадзенае ім заданне.

На світанні 22 лютага 1940 г. камандзіра экіпажа Іларыёна Паўлавіча Кірпічова тэрмінова выклікаў да сябе камандзір батальёна. Яшчэ нядаўна гэты батальён называўся вучэбным і дыслацыраваўся ў адным з гарадкоў пад Ленінградам, у якім Кірпічоў праходзіў сваю вайсковую службу. Калі ў 1939 г. пачалася савецка-фінляндская вайна, ён у складзе батальёна пайшоў на фронт.

Распараджэнне камандзіра батальёна ў той дзень было кароткім. Ён растлумачыў, што адно з іх падраздзяленняў трапіла ў акружэнне і што трэба аднавіць з ім сувязь, даставіць воінам акумулятары для радыёстанцыі і пакет.

— Гэта даручаецца экіпажу вашага танка, — сказаў ён. — Пасля выканання задання вяртайцеся назад. Зрабіць гэта трэба як мага хутчэй.

Падраздзяленне савецкіх воінаў знаходзілася ў тыле праціўніка на адлегласці 40 — 50 кіламетраў. Каб пераадолець гэту адлегласць, патрабавалася не менш як дзве гадзіны.

Танкісты, нягледзячы на тое, што мясцовасць бесперапынна прастрэльвалася, прарваліся да сваіх і даставілі ім каштоўны груз. Калі ў эфіры зноў загучалі галасы савецкіх камандзіраў, якія прыступілі да ажыццяўлення ўзгодненых баявых дзеянняў, яны, адпачыўшы крыху, пачалі рыхтавацца ў зваротны шлях.

Набраўшы хуткасць, баявая машына імчалася ў размяшчэнне сваёй 13-й танкавай брыгады і наблізілася ўжо да станцыі Кямера, як раптам здарылася самае прыкрае: БТ-7 наскочыў на міны. Грымнулі аглушальныя выбухі — абедзве гусеніцы аказаліся перабітымі. Замоўк магутны грукат рухавіка. Застылі рычагі. Танк стаў нерухомым.

Іларыён Кірпічоў разам з механікам-вадзіцелем Леанідам Шаронавым і вежавым стралком Аляксеем Лашковым не паспелі апамятацца, як убачылі: з-за бліжэйшага ўзгорка, густа парослага хмызняком, да танка кінуліся варожыя аўтаматчыкі. Калі яны прыблізіліся метраў за трыццаць, закрычалі: «Рус, здавайся!»

— Спакойна, рабяты, спакойна, — прамовіў, звярнуўшыся да таварышаў, Кірпічоў і тут жа скамандаваў: — Падрыхтавацца да бою! Няхай ведаюць, што савецкія воіны не здаюцца!

Ён схапіў гранату, высунуўся на адно імгненне з вежы, размахнуўся і... Аўтаматчыкі, якія падступалі да танка, разгубіліся і тут жа закапаліся ў снег. Услед за выбухам гранаты ўдарыла кулямётная чарга, бабахнула танкавая гармата. Густы ланцуг пяхоты пахіснуўся, падаўся назад і кінуўся ўрассыпную.

З таго моманту танк БТ-7, які быў аснашчаны гарматай і двума кулямётамі, ператварыўся ў браніраваную крэпасць. Некалькі разоў праціўнік кідаўся ў атаку, спрабаваў з ходу ўзяць танк, але кожны раз сустракаў кулямётна-гарматны агонь і адкочваўся назад. Потым зноў насядаў і зноў адступаў. Калі фіны пераканаліся ў марнасці сваіх спроб захапіць танк і яго экіпаж, яны вырашылі пачакаць, пакуль сцямнее.

Як толькі сцямнела, атакі аднавіліся з новай сілай. На нерухомы танк абрушылася лавіна агню. Пад яго прыкрыццём варожыя салдаты, якія трымалі напагатове запальныя бутэлькі, падпаўзалі ўсё бліжэй і бліжэй. Камандзір і яго сябры ведалі, што самае галоўнае для іх цяпер — захаваць вытрымку і спа-

кой, не паддацца слабасці і паніцы. І ў іх нават думкі не ўзнікла, каб здаць сваю маленькую крэпасць. Вежа ўвесь час знаходзілася пад знішчальным варожым абстрэлам.

Яшчэ больш ускладнілася становішча, калі былі разбіты прыцэльныя прыборы танка. Агонь цяпер вялі без прыбораў, усляпую, але танкісты вырашылі цвёрда: «Трымацца да апошняга патрона!»

Абаронцы браніраванай крэпасці працягвалі жыць і змагацца. Каб біць ворагаў без промаху, яны ў момант невялікага зацішша знялі кулямёты, выйшлі з жалезнага палону і пад прыкрыццём танка працягвалі весці агонь. За адным з кулямётаў залёг Кірпічоў, за другім — Лашкоў. Начная цемра разрывалася асляпляльнымі ўспышкамі гранат — імі час ад часу частаваў праціўніка Шаронаў. Кожны выдатна разумеў сваю высокую адказнасць і дзейнічаў смела, умела і рашуча.

Байцы не адчувалі нават марозу, які ўсё больш мацнеў, балюча хапаў за рукі і твар. Не заўважылі, як адышла ноч і наступіла раніца.

— А сёння ж, рабяты, свята! — радасна закрычаў раптам Кірпічоў. — Віншую, ад усяго сэрца віншую вас з Днём Чырвонай Арміі!

— Дзякуй, камандзір, не забыў, — адгукнуўся Шаронаў і тут жа з жартам у голасе дадаў: — Нічога не скажаш, свята ўдалося на славу. Такая музыка на ім!

— Куды як весела! — пагадзіўся з ім Лашкоў і паказаў на варожую пазіцыю: — А яны ж, мабыць, таксама ведаюць пра наша свята. Вось і лезуць, як азвярэлыя, каб знішчыць нас або ўзяць у палон.

— Нічога, рабяты, нічога, — спакойна заўважыў Кірпічоў. — У такім выпадку ў нас у Якаўлевічах гавораць прыкладна так: «Сказала Насця, як удасца».

Якаўлевічы... Вёска ў Аршанскім раёне, дзе нарадзіўся Кірпічоў. Там прайшло ўсё яго басаногае дзяцінства. На вузкай палосцы зямельнага надзелу разам з бацькам-селянінам здабываў хлеб. У 1930 г. шаснаццацігадовы падлетак стаў рабочым тутэйшай суконнай фабрыкі, але папрацаваў на ёй толькі два гады: на электрастанцыі, ад якой сілкавалася фабрыка, здарыўся пажар, і вытворчасць сукна спынілася. Іларыён падаўся адтуль у Ленінград, горад сваёй даўняй і запаветнай мары. Там ён адразу ўладкаваўся працаваць, а па вечарах наведваў школу рабочай моладзі. У 1936 г. быў прызваны ў Чырвоную Армію.

На неаднаразовыя заклікі здацца і тым самым захаваць сабе жыццё танкісты адказвалі ўзмацненнем агню. З наступленнем світання добра стала відаць, што снег вакол танка густа пачырванеў ад крыві і пачарнеў ад дыму. Там і тут валяліся варожыя трупы. Заўважылі танкісты і бліндаж, з якога фіны вялі асабліва шалёную стральбу. Кірпічоў у думках адзначыў, што кулямётамі іх не ўзяць. Зноў загаварыла гармата. Трыма снарадамі яна ўшчэнт разнесла асінае гняздо, і салдаты, што засталіся ў жывых, кінуліся наўцёкі. Навокал стала нязвыкла ціха, і Кірпічоў нават падумаў, што бой закончаны.

Але цішыня раптам зноў узарвалася. Застрачылі аўтаматы і кулямёты, прагрымелі выбухі гранат. У бок танка панёсся бязлітасны вогненны шквал, пасля чаго рушылі лыжнікі. Над заснежанай раўнінай пачулася: «Рус, здавайся!».

Больш за суткі ў неверагодна цяжкіх умовах працягваўся паядынак. Мужныя і храбрыя танкісты зрабілі сваю крэпасць непрыступнай.

У адзін з кароткіх прамежкаў паміж перастрэлкамі Кірпічоў раптам неяк насцярожыўся, прыціх і пачаў прыслухоўвацца. Чуйным вухам ён улавіў знаёмы да болю гул матораў і адразу здагадаўся: «Свае! Ідуць на выручку!».

— Браткі, нашы! — закрычаў ён хрыплым ад холаду і стомленасці голасам. — Нашы танкі ідуць!

Да канца дня асада танка была знята. Экіпаж адрамантаваў яго і працягваў выкананне баявой задачы. У раёне дзеяння гераічнага экіпажа налічвалася каля 70 знішчаных ворагаў.

Праз месяц, 22 сакавіка, газеты надрукавалі Указ Прэзідыума Вярхоўнага Савета СССР аб прысваенні найбольш адважным байцам і камандзірам звання Героя Савецкага Саюза, у тым ліку і камандзіру непераможнага танка БТ-7 старшыне Іларыёну Паўлавічу Кірпічову.

Амаль 25 гадоў жыцця аддаў Кірпічоў ганаровай і цяжкай службе ў арміі. Ён таксама ўдзельнік Вялікай Айчыннай вайны, паспеў закончыць тры ваенныя навучальныя ўстановы: танкавае вучылішча (1941), Вышэйшую

афіцэрскую бранятанкавую школу (1945) і Вышэйшую афіцэрскую школу самаходнай артылерыі (1952). Пасля звальнення ў запас (1960) у званні падпалкоўніка Кірпічоў пасяліўся ў Ленінградзе, працаваў механікам у будаўнічым трэсце і нямала зрабіў, каб яго любімы горад стаў яшчэ больш прыгажэйшым.

Г. А. Каралёў.

Воіны-землякі, якія загінулі ці прапалі без вестак у савецка-фінляндскую вайну 1939 — 40 гг.

АНКІНОВІЧ Ісідар Фадзеевіч, н. ў 1895.

ВАСІЛЬЕЎ Нічыпар Цімафеевіч, н. ў 1911, загінуў 12.2.1940.

ВАЦУРА Піліп Васілевіч, рад., загінуў 9. 3.1940.

ГАЙДУКОЎ Іван Максімавіч, н. ў 1908 у в. Ленькавічы, рад., памёр ад ран 10. 3.1940.

ДЗЯРНОЎ Іван Сцяпанавіч, н. ў 1904 у Оршы, рад., памёр ад ран 1.3.1940.

КАВАЛЁЎ Яўген Іванавіч, н. ў Аршанскім р-не.

КАЛДОЎЦАЎ Якаў Сямёнавіч, н. ў 1915 у в. Пугляі, рад., загінуў 12.12.1939.

КРОТАЎ Мікалай Сяргеевіч, н. ў в. Тарчылава, рад., загінуў 1.1.1940.

КУПЧЫН Сямён Мікітавіч, н. ў 1908, памёр ад ран 1.3.1940.

КУХАРЭНКА Пётр Фёдаравіч, н. ў 1914, прапаў без вестак у 1940.

ЛАГУНОЎСКІ Канстанцін Іванавіч, н. ў 1908 у Оршы, рад., загінуў 22.12.1939.

ЛІПУНОЎ Фёдар Сямёнавіч, н. ў 1907 у в. Нарэйкава, прапаў без вестак.

ЛІХАЧОЎ Ігнат Міхеевіч, н. ў 1908 у Кіеве, загінуў 22.12.1939.

ЛУЧКОВА Еўдакія Сямёнаўна, н. ў в. Новае Сяло, рад., загінула 1.2.1940.

МАРКІЯНОВІЧ Аляксандр Рыгоравіч, н. ў 1909 у Оршы, загінуў 5.2.1940.

МІНЧАНКА Раман Яфімавіч, рад., загінуў 22.1.1940.

МІРОНАЎ Пётр Мікалаевіч, загінуў у студзені 1940.

НАВІЧЭНКА Мікалай Арцёмавіч, н. ў в. Смётанка, рад., загінуў 1.1.1940.

НОВІКАЎ Сцяпан Данілавіч, н. ў 1920, загінуў 20.2.1940.

ПІНЧУК Васіль Рыгоравіч, н. ў 1912

ПРАКАПЕНКА Іван Паўлавіч, н. ў Аршанскім р-не, рад., памёр ад ран 18.1.1940.

ПЫХАР Тарас Сямёнавіч, н. ў 1906, загінуў 8.1.1940.

СІМАНОВІЧ Фёдар Ерафеевіч, н. ў 1899.

СТАБРОЎСКІ Гаўрыла Ільіч, загінуў 9.2.1940.

СУДНІЧЭНКА Макар Нічыпаравіч, н. ў 1907, загінуў 4.3.1940.

СУШНЯКОЎ Якаў Цітавіч, н. ў 1913 у в. Брухава, рад., загінуў 3.3.1940.

ТАТАРЖЫЦКІ Іосіф Іосіфавіч, н. ў 1906.

УСІЦНАЎ Фёдар Сямёнавіч, рад., прапаў без вестак 1.12.1939.

ФАЛЬКОВІЧ Фёдар Яфрэмавіч, н. ў 1904, рад., загінуў 21.2.1940.

ФІЛІПОВІЧ Мікалай Васілевіч, н. ў Аршанскім р-не, рад. 335-га сп, прапаў без вестак 1.12.1939.

ФІЛІПОВІЧ Сысой Паўлавіч, рад., загінуў 1.3.1940.

ЧАБАТАРОЎ Сцяпан Захаравіч, прапаў без вестак.

ЧАЙКО Сяргей Рыгоравіч, н. ў Оршы, загінуў 12.3.1940.

ШАБАДРОЎ Кірыла Фёдаравіч, н. ў 1915, загінуў 2.2.1940.

ШАВЕКА Нічыпар Лук'янавіч, н. ў 1909, прапаў без вестак 1.2.1940.

ШАЛАШОЎ Іван Антонавіч, н. ў 1913, рад., прапаў без вестак 1.2.1940.

ШАМШУРАЎ Канстанцін Іосіфавіч, загінуў 4.2.1940.

ШАРАЙ Трафім Васілевіч, н. ў 1902, загінуў 6.2.1940.

ШУМАНСКІ Уладзімір Пятровіч, н. ў 1917, загінуў 17.3.1940.

ВЕРНУТЫЯ ІМЁНЫ

Ахвяры палітычных рэпрэсій

Не абышлі палітычныя рэпрэсіі горад Оршу і Аршанскі раён. Дакладных звестак аб ахвярах няма. Начальнік падраздзялення УКДБ па Віцебскай вобласці паведамляе: «Абагульненых даных аб рэпрэсіях па гораду Оршы і раёну ва Упраўленні КДБ па Віцебскай вобласці не маецца, таму што сістэматызацыя іх па раёнах і абласцях не праводзілася». (5.1.93 г., 10/4-Р-6318).

Трэба адзначыць, што ў адрозненне ад іншых рэгіёнаў рэпрэсіі ў Оршы не набылі масавага характару. Па паказаннях сведак, смяротныя прыгаворы прыводзіліся ў здзяйсненне ў раёне Кабыляцкай гары і па Магілёўскай шашы. Расстрэлы ў раёне Кабыляцкай гары былі ў 1936—39 гадах.

У памяць ахвяр палітычных рэпрэсій 1920—50-х гадоў на Кабыляцкай гары збудаваны абеліск з надпісам:

Хотелось бы всех поимённо назвать,
Да отняли список, и негде узнать.

А.Ахматова.

Старшыня камісіі па аказанні садзейнічання ў забеспячэнні праў і інтарэсаў рэабілітаваных і ўвекавечанні памяці ахвяр рэпрэсій у 1920—50-х гадах А.Г.Рабушаў.

ГОРАД ОРША

АБРАМЕНКА Афанасій Іудавіч, н. ў 1901, в. Пустогін Ульскага р-на, начальнік 4-га аддзялення службы руху станцыі Орша, пражываў у Оршы. Асуджаны 29.4.1938. Расстраляны 29.4.1938. Рэабілітаваны 25.10.1962.

АБЯЛЬЧУК Іван Сямёнавіч, н. ў 1887, в. Ракошыца Уздзенскага р-на, рабочы на будаўніцтве Аршанскага льнокамбіната, пражываў у Оршы. Асуджаны 11.11.1938. Расстраляны 28.11.1938. Рэабілітаваны 11.9.1989.

АВЕРКІН Яфім Архіпавіч, н. ў 1904, в. Міхеёўка Дубровенскага р-на, начальнік канцылярыі Аршанскай турмы, пражываў у Оршы. Арыштаваны 30.6.1938. 19.12.1938 справа спынена.

АВЯР'ЯНАЎ-ВАРАБ'ЁЎ Антон Яфімавіч, н. ў 1910, в. Хомена Дубровенскага р-на, электрамантёр турмы г. Орша, пражываў у Оршы. Арыштаваны 30.6.1938. 27.2.1939 справа спынена.

АГАРАК (АГАРОК) Васіль Макаравіч, н. ў 1887, в. Сабалі Чашніцкага р-на, цясляр на будаўніцтве Аршанскага льнокамбіната, пражываў у Оршы. Асуджаны 28.11.1937 на 10 гадоў. Рэабілітаваны 7.2.1961.

АГАФОНАВА Пелагея Рыгораўна, н. ў 1899, хут. Шыпіліпаўка Хазскага р-на (Украіна), без

На адкрыцці помніка ахвярам палітычных рэпрэсій каля пас. Андрэеўшчына. Выступае С.С.Шаўроў.

пэўных заняткаў, пражывала ў Оршы. Асуджана 3.11.1937 на 10 гадоў. Рэабілітавана 20.4.1955.

АГЕЕНКА Аляксандра Сяргееўна, н. ў 1893, г. Орша, швачка. Асуджана 3.11.1937 на 10 гадоў. Рэабілітавана 20.4.1955.

АГЕЕНКА Ганна Дзмітрыеўна, н. ў 1866, в. Межава Аршанскага р-на, пражывала ў Оршы. Асуджана 3.11.1937 на 10 гадоў. Рэабілітавана 20.4.1955.

АДАМОВІЧ Іван Вікенцьевіч, н. ў 1893, в. Пушча Плешчаніцкага р-на, рабочы цагельнага завода, пражываў у Оршы. Асуджаны 15.9.1937. Расстраляны 29.9.1937. Рэабілітаваны 10.10.1989.

АДАМОВІЧ Мікалай Ануфрыевіч, н. ў 1888, Мінск, галоўны бухгалтар вагоннага дэпо станцыі Орша, пражываў у Оршы. Асуджаны 28.9.1938. Расстраляны 14.10.1938. Рэабілітаваны 16.10.1989.

АДАМОВІЧ Міхаіл Міхайлавіч, н. ў 1915, в. Пушча Плешчаніцкага р-на, рабочы цагельнага завода, пражываў у Оршы. Асуджаны 15.9.1937 на 10 гадоў. Рэабілітаваны 10.10.1989.

АДАМОВІЧ Станіслава Іосіфаўна, н. ў 1898, г. Смаленск, машыністка рэдакцыі газеты «Большавіцкі сігнал», пражывала ў Оршы. Асуджана 20.10.1937. Расстраляна 10.11.1937. Рэабілітавана 10.9.1955.

АДАМОВІЧ Станіслаў Вікенцьевіч, н. ў 1907, в. Пушча Плешчаніцкага р-на, рабочы цагельнага завода, пражываў у Оршы. Асуджаны 15.9.1937. Расстраляны 29.9.1937. Рэабілітаваны 10.10.1989.

АДЫНЕЦ Харытон Нічыпаравіч, н. ў 1899, в. Застарынне Бешанковіцкага р-на, бухгалтар дома адпачынку Наздроўшчына, пражываў у Оршы. Асуджаны 11.11.1938 на 10 гадоў. Рэабілітаваны 1.2.1941.

АД'ЮТАВА Клаўдзія Спірыдонаўна, н. ў 1918, в. Зілупе Латвійскай ССР, гандляр ларка в/ч 250, пражывала ў Оршы. Арыштавана 24.10.1941. 1.11.1941 справа спынена.

АЗАРЭВІЧ Антаніна Андрэеўна, н. ў 1906, г. Орша, касір на станцыі Орша. Асуджана 22.10.1937. Расстраляна 10.11.1937. Рэабілітавана 10.9.1955.

АЗАРЭВІЧ Леанід Майсеевіч, н. ў 1900, г. Орша, памочнік начальніка па фінансавай частцы ФГК. Асуджаны 13.5.1933 на 3 гады. Рэабілітаваны 21.6.1957.

АЗАРЭВІЧ Сяргей Майсеевіч, н. ў 1906, г. Орша, машыніст паравознага дэпо станцыі Орша. Асуджаны 16.4.1938. Расстраляны 15.5.1938. Рэабілітаваны 14.5.1955.

АКАЛОВІЧ Пётр Адамавіч, н. ў 1916, в. Малыя Жаберычы Крупскага р-на, акумулятаршчык станцыі Орша, пражываў у Оршы. Асуджаны 20.10.1937. Расстраляны 10.11.1937. Рэабілітаваны 11.2.1958.

АКАЛОВІЧ Фёдар Адамавіч, н. ў 1906, в. Жаберычы Крупскага р-на, электрамеханік станцыі Орша, пражываў у Оршы. Асуджаны 20.10.1937. Расстраляны 10.11.1937. Рэабілітаваны 11.2.1958.

АКСАМІТ Міхаіл Антонавіч, н. ў 1873, в. Юхновічы Мінскага р-на, вартаўнік кінатэатра, пражываў у Оршы. Асуджаны 10.1.1938. Расстраляны 28.1.1938 у Оршы. Рэабілітаваны 31.10.1989.

АКУЛАЎ Мікалай Адамавіч, н. ў 1891, в. Макраны Слуцкага пав., загадчык гаража Белваенгандлю, пражываў у Оршы. Асуджаны 22.9.1938. Расстраляны 29.11.1938. Рэабілітаваны 18.12.1958.

АЛЕЙНІКАЎ Адам Сямёнавіч, н. ў 1913, в. Забалоцце Смалявіцкага р-на, рабочы Аршанскага льнокамбіната, пражываў у Оршы. Асуджаны 9.3.1938. Расстраляны 2.4.1938. Рэабілітаваны 26.10.1989.

АЛЕЙНІКАЎ Аляксандр Аляксандравіч, н. ў 1919, г. Кіеў, бухгалтар канторы «Заготскот», пражываў у Оршы. Арыштаваны 23.9.1949. 25.2.1950 сасланы ў Краснаярскі край.

АЛЕКСЯЁНАК Дзмітрый Фёдаравіч, н. ў 1906, в. Кавалі Віленскага пав., аглядчык вагонаў вагоннага ўчастка 4-й станцыі Орша, пражываў у Оршы. Асуджаны 23.9.1937. Расстраляны 27.9.1937. Рэабілітаваны 16.11.1992.

АЛФЕЕЎ Іван Міхайлавіч, н. ў 1875, г. Орша, бухгалтар «Белхарчгандлю». Асуджаны 28.11.1937 на 10 гадоў. Рэабілітаваны 24.11.1989.

АЛЬХІМЕНКА Мікалай Арцёмавіч, н. ў 1902, ст. Пагодзіна Пружанскага р-на, інжынер завода «Чырвоны барацьбіт», пражываў у Оршы. Асуджаны 22.9.1935 на 8 гадоў. Рэабілітаваны 10.12.1958.

АЛЯКСЕЕЎ Васіль Аляксандравіч, н. ў 1886, г. Смаленск, машыніст паравознага дэпо станцыі Орша, пражываў у Оршы. Асуджаны 4.10.1937. Рэабілітаваны 15.5.1962.

АЛЯХНОВІЧ Калікст Францавіч, н. ў 1891, в. Аляксандраўка Шклоўскага р-на, урач бальніцы імя Сямашкі, пражываў у Оршы. Асуджаны 22.9.1938. Расстраляны 3.10.1938. Рэабілітаваны 2.10.1989.

АЛЯХНОВІЧ Уладзімір Іванавіч, н. ў 1896, ст. Крупкі, тэлеграфіст станцыі Орша, пражываў у Оршы. Асуджаны 12.10.1931. У тэрмін пакарання залічаны тэрмін знаходжання пад следствам з 14.7.1931 да 12.10.1931. Рэабілітаваны 24.11.1989.

АНАНЬЕВА Васа Піліпаўна, н. ў 1890, в. Разбойна Смаленскай вобл., без пэўных заняткаў, пражывала ў Оршы. Асуджана 3.11.1937 на 10 гадоў. Рэабілітавана 20.4.1955.

АНДРЫЯНАЎ Дзмітрый Якаўлевіч, н. ў 1904, в. Касторны Курскай вобл., начальнік авіямайстэрань, пражываў у Оршы. Арыштаваны 15.7.1938. 9.4.1939 апраўданы.

АНДРЭЕЎ-КІЛЬЧЭЎСКІ Мікалай Аляксандравіч, н. ў 1881, г. Бабруйск, майстар паравознага дэпо ст. Орша, пражываў у Оршы. Асуджаны 28.12.1937. Расстраляны (дата не ўказана). Рэабілітаваны 16.4.1957.

АНІКЕЕЎ Андрэй Сцяпанавіч, н. ў 1898, в. Лісуны Аршанскага р-на, грузчык станцыі Орша-Усходняя, пражываў у Оршы. Асуджаны 24.9.1937 на 10 гадоў. Памёр у заключэнні 8.6.1943. Рэабілітаваны 18.10.1989.

АНКІНОВІЧ Вольга Сідараўна, н. ў 1921, в. Кашына Аршанскага р-на, загадчыца ларка сельскага спажывецкага таварыства, пражывала ў Оршы. Асуджана 16.10.1946 на 10 гадоў. Рэабілітавана 1.6.1971.

АНТАНОВІЧ Лізавета Антонаўна, н. ў 1891, в. Галынка Слуцкага р-на, бухгалтар ваенна-рамонтнага пункта станцыі Орша, пражывала ў Оршы. Асуджана 15.6.1938 на 10 гадоў. Рэабілітавана 15.1.1955.

АНТАНОВІЧ Павел Іванавіч, н. ў 1883, в. Пераволачык Талачынскага р-на, ваенны кіраўнік Аршанскага чыгуначнага тэхнікума, пражываў у Оршы. Асуджаны 28.12.1937. Расстраляны 27.1.1938. Рэабілітаваны 13.5.1960.

АНТОНАЎ Харытон Паўлавіч, н. ў 1882, в. Скачкова Смаленскага р-на, інжынер паравознага аддзялення станцыі Орша, пражываў у Оршы. Асуджаны 25.5.1938. Расстраляны (дата не ўказана). Рэабілітаваны 20.11.1956.

АПАНАСЁНАК Трафім Васілевіч, рабочы льнокамбіната, пражываў у Оршы. Асуджаны 26.5.1938. Расстраляны 13.7.1938. Рэабілітаваны 18.9.1989.

АРЛОЎ Фядот Яўстафіевіч, н. ў 1881, в. Лоўжа Сіроцінскага р-на, вартаўнік кар'ера 533 ст. Орша, пражываў на кар'еры 533. Асуджаны 14.2.1938. Расстраляны 14.3.1938. Рэабілітаваны 1.10.1993.

АРЦІШУК Фёдар Акімавіч, н. ў 1887, в. Паніквы Брэсцкага пав., пражываў у Оршы. Асуджаны 9.7.1933 на 3 гады з высылкай ў Заходнюю Сібір. Рэабілітаваны 27.12.1957.

АРЦІШЭЎСКАЯ Станіслава Міхайлаўна, н. ў 1892, пас. Барань Аршанскага р-на, праваднік вагонаў Аршанскага рэзерва праваднікоў, пражывала ў Оршы. Асуджана 22.11.1937 на 10 гадоў. Рэабілітавана 30.9.1957.

АРЦІШЭЎСКІ Браніслаў Антонавіч, н. ў 1881, мяст. Бобр Крупскага р-на, машыніст дэпо ст. Орша, пражываў у Оршы. Асуджаны 21.6.1929 на 10 гадоў. Рэабілітаваны 15.8.1958.

АРЦЮШКЕВІЧ Парфірый Пракопавіч, н. ў 1887, в. Галашоўка Аршанскага р-на, экспедытар Аршанскай базы сувязі, пражываў у Оршы. Асуджаны 28.11.1937 на 10 гадоў. Рэабілітаваны 23.1.1960.

АРЫНІЧ Фёдар Антонавіч, н. ў 1892, в. Тарасіна Плешчаніцкага р-на, цясляр Аршанскага льнокамбіната, пражываў у Оршы. Асуджаны 16.9.1937 на 10 гадоў. 8.6.1949 сасланы ў Новасібірскую вобласць. Рэабілітаваны 19.11.1962.

АСІПОВІЧ Васіль Гаўрылавіч, н. ў 1910, в. Валодзькі Сенненскага р-на. Асуджаны 5.11.1946 на 10 гадоў. Рэабілітаваны 27.10.1964.

АСКЕРКА Васіль Іосіфавіч, н. ў 1907, г. Орша, начальнік склада станцыі Орша. Асуджаны 15.6.1938 на 10 гадоў. Рэабілітаваны 4.3.1957.

АСТАПСКІ Браніслаў Іосіфавіч, н. ў 1897, г. Высока-Літоўск, вартаўнік 6-й дыстанцыі пуці станцыі Орша, пражываў на станцыі Орша. Асуджаны 28.9.1938. Расстраляны 14.10.1938. Рэабілітаваны 19.3.1959.

АСТРОЦЕНКА Аляксандр Іосіфавіч, н. ў 1898, ст. Нікалаеўская Паўночна-Асецінскай АССР, пражываў у Оршы. Асуджаны 19.6.1946 на 3 гады. Рэабілітаваны 25.3.1994.

АСТРЭЙКА Фама Васілевіч, н. ў 1901, в. Кудзінава Капыльскага р-на, рабочы Аршанскага льнокамбіната, пражываў у Оршы. Асуджаны 28.11.1937 на 10 гадоў. Рэабілітаваны 22.12.1989.

АЎЧЫННІКАЎ Уладзімір Еўсцігнеевіч, н. ў 1869, г. Клімавічы Магілёўскай вобл., загадчык касы Аршанскага аддзялення дзяржбанка, пражываў у Оршы. Асуджаны 9.11.1937. Расстраляны 26.11.1937 у Оршы. Рэабілітаваны 17.9.1989.

АХОЦКІ Пётр Паўлавіч, н. ў 1897, в. Макшаны Пензенскай вобл., галоўны бухгалтар Аршанскага мясакамбіната, пражываў у Оршы. Асуджаны 11.12.1937. Расстраляны 16.1.1938. Рэабілітаваны 25.5.1959.

БАБАРЫКА Іван Афанасьевіч, н. ў 1879, г. Орша, пажарнік дэпо станцыі Орша. Асуджаны 20.6.1929 да ссылкі на Урал тэрмінам на 3 гады. Другі раз асуджаны 25.9.1937. Расстраляны 11.10.1937. Рэабілітаваны 7.4.1989 і 16.4.1992.

БАБІЦКІ Аляксандр Сцяпанавіч, н. ў 1884, в. Судаль Барысаўскага р-на, тэлеграфіст станцыі Орша, пражываў у Оршы. Асуджаны 28.12.1937. Расстраляны 27.1.1938. Рэабілітаваны 25.5.1959.

БАБІЦКІ Вікенцій Міхайлавіч, н. ў 1882, мяст. Халопенічы Лепельскага р-на, садоўнік Аршанскага гаркамгаса, пражываў у Оршы. Асуджаны 29.11.1937. Расстраляны 21.12.1937. Рэабілітаваны 23.10.1989.

БАБІЦКІ Іван Адамавіч, н. ў 1883, в. Маласаі Крупскага р-на, праваднік вагона станцыі Орша, пражываў у Оршы. Асуджаны 15.6.1938 на 10 гадоў. Рэабілітаваны 6.4.1957.

БАБКО Антон Васілевіч, н. ў 1890, в. Скворчыцы Навагрудскага пав., абходчык станцыі Орша, пражываў на станцыі Орша. Асуджаны 10.12.1937 на 10 гадоў. Памёр у заключэнні 26.8.1939. Рэабілітаваны 3.8.1957.

БАБОК Міхаіл Антонавіч, н. ў 1895, в. Калюты Дрысенскага р-на, бухгалтар Аршанскага агенцтва Галоўнага ўпраўлення аўтатрактарнай прамысловасці, пражываў у Оршы. Асуджаны 14.12.1937. Расстраляны 16.1.1938. Рэабілітаваны 20.12.1966.

БАБРОЎСКАЯ Любоў Уладзіміраўна, н. ў 1912, в. Свяцк Навазыбкаўскага р-на, хатняя гаспадыня, пражывала ў Оршы. Асуджана 28.11.1937 на 5 гадоў. Рэабілітавана 20.11.1956.

БАБРОЎСКІ Павел Казіміравіч, н. ў 1902, в. Аляксандрава Калінінскай вобл., загадчык вучэбнай часці чыгуначнай школы на станцыі Орша, пражываў у Оршы. Асуджаны 28.12.1937. Расстраляны 27.1.1938. Рэабілітаваны 20.11.1957.

БАГАДЗЕВІЧ Мартын Прохаравіч, н. ў 1904, в. Казечына Аршанскага р-на, начальнік цэха Аршанскага мясакамбіната, пражываў у Оршы. Асуджаны 14.12.1937. Расстраляны 16.1.1938. Рэабілітаваны 14.4.1958.

БАГДАНАЎ Васіль Паўлавіч, н. ў 1892, в. Лабараўка Смаленскай вобл., дарожны майстар Заходняй чыгункі, пражываў на станцыі Орша. Асуджаны 28.9.1938. (Звестак аб пакаранні няма.) Рэабілітаваны 14.9.1959.

БАГДАНОВІЧ Юльян Іванавіч, н. ў 1893, в. Галаўкі Заслаўскага р-на, пячнік арцелі «Працаўнік», пражываў у Оршы. Асуджаны 21.9.1938. Расстраляны 22.11.1938. Рэабілітаваны 12.9.1989.

БАГУЗАЎ Павел Паўлавіч, н. ў 1904, в. Ліцкі Аршанскага р-на, старшыня калгаса «Чырвоны бераг», пражываў у Оршы. Асуджаны 4.10.1037. (Звестак аб пакаранні няма.) Рэабілітаваны 5.7.1957.

БАГУЦКІ Пётр Вікенцьевіч, н. ў 1912, в. Беразіно Бягомльскага р-на, рабочы Аршанскага льнокамбіната, пражываў у Оршы. Асуджаны 9.3.1938. Расстраляны 2.4.1938. Рэабілітаваны 26.10.1989.

БАЗІЛЕНКА Соф'я Мітрафанаўна, н. ў 1922, пас. Арэхі Аршанскага р-на, выхавацельніца Аршанскага дзіцячага дома, пражывала ў Оршы. Арыштавана 23.12.1944. 16.7.1946 вызвалена.

БАЗЫЛЕНКА Раман Парфір'евіч, н. ў 1894, в. Арэхі Аршанскага р-на, дырэктар Аршанскага гарводаправода, пражываў у Оршы. Асуджаны 22.11.1937. Расстраляны 19.12.1937. Рэабілітаваны 15.12.1958.

БАЙКО Іван Васілевіч, н. ў 1893, в. Стачак Гродзенскай губ., прараб на будаўніцтве швейнай арцелі, пражываў у Оршы. Асуджаны 10.1.1938. Расстраляны 28.1.1938. Рэабілітаваны 31.10.1989.

БАЛТМАН Іван Пятровіч, н. ў 1897, г. Рыга, слесар вагоннага ўчастка № 4 станцыі Орша, пражываў на станцыі Орша. Асуджаны 15.6.1938 на 10 гадоў. Рэабілітаваны 2.11.1957.

БАНДАРЭНКА Міхаіл Дзмітрыевіч, н. ў 1888, ст. Ярцава Заходняй чыгункі, старшы тэхнік 6-й дыстанцыі пуці Заходняй чыгункі, пражываў у Оршы. Асуджаны 28.12.1937. Расстраляны 27.1.1938. Рэабілітаваны 12.10.1989.

БАРАВІК Даніла Несцеравіч, н. ў 1889, в. Вязьменічы Аршанскага р-на, конюх Аршанскай базы «Заготзерне», пражываў у Оршы. Асуджаны 21.1.1935 на 3 гады. Рэабілітаваны 19.11.1991.

БАРАВІК Кірыла Кандрацьевіч, н. ў 1908, в. Дубровіцы Сенненскага р-на, пуцявы рабочы, пражываў на станцыі Орша-Усходняя. Асуджаны 20.11.1937. Расстраляны 19.12.1937. Рэабілітаваны 31.7.1959.

БАРАНОЎСКІ Аляксандр Васілевіч, н. ў 1888, в. Машыцы Слуцкага р-на, выкладчык Аршанскага педагагічнага вучылішча, пражываў у Оршы. Асуджаны 20.10.1937. Расстраляны 17.1.1938. Рэабілітаваны 21.1.1960.

БАРАНОЎСКІ Ісак Мартынавіч, н. ў 1885, в. Гуры Аршанскага р-на, возчык Аршанскага гарсавета, пражываў у Оршы. Асуджаны 28.9.1937. Расстраляны 13.10.1937. Рэабілітаваны 3.8.1963.

БАРАНОЎСКІ Эдуард Вітольдавіч, н. ў 1910, станцыя Міас Самапа-Златаустаўскай чыгункі, майстар пад'ёмнага цэха дэпо станцыі Орша, пражываў на станцыі Орша-Заходняя. Асуджаны 20.11.1937. Расстраляны 19.12.1937. Рэабілітаваны 30.3.1959.

БАРАШ Ягор Ігнацьевіч, н. ў 1913, в. Люботы Талачынскага р-на, грузчык «Асінторфа», пражываў у Оршы. Асуджаны 29.8.1937 на 10 гадоў. Рэабілітаваны 29.10.1960.

БАРАДЗІНСКАЯ-АБРАМОВІЧ Ядвіга Францаўна, н. ў 1910, мяст. Ракаў, рабочая арцелі «Кастрычнік», пражывала ў Оршы. Асуджана 15.11.1937. Расстраляна 20.12.1937. Рэабілітавана 17.9.1989.

БАРОЎСКІ Андрэй Платонавіч, н. ў 1896, г. Орша, бухгалтар медыка-санітарнага ўпраўлення Чырвонага Крыжа станцыі Орша. Асуджаны 21.10.1937. Расстраляны 5.11.1937. Рэабілітаваны 29.9.1989.

БАРОЎСКІ Мікалай Платонавіч, н. ў 1899, г. Орша, загадчык гаспадаркі аўтарамонтнага завода. Арыштаваны 25.12.1944. 19.7.1945 справа спынена.

БАРКОЎСКІ Сямён Герасімавіч, н. ў 1897, в. Ліплянск Багушэўскага р-на, сакратар Аршанскага хлебакамбіната, пражываў у Оршы. Асуджаны 6.12.1937. Расстраляны 20.12.1937. Рэабілітаваны 16.10.1989.

БАРУШКА Васіль Максімавіч, н. ў 1893, в. Блудні Пружанскага пав., вагонны майстар станцыі Орша, пражываў у Оршы. Асуджаны 23.2.1938. Расстраляны 26.3.1938. Рэабілітаваны 28.6.1958.

БАТУРЭВІЧ Сяргей Пятровіч, н. ў 1894, в. Беражніца Лельчыцкага р-на, рабочы Аршанскага вапнавага завода, пражываў у Оршы. Асуджаны 4.10.1937. Расстраляны 16.10.1937. Рэабілітаваны 7.10.1977.

БАХМЕЦЬЕЎ Антон Ісакавіч, н. ў 1892, в. Есманава Мсціслаўскага р-на, загадчык гаспадаркі станцыі Орша, пражываў у Оршы. Асуджаны 25.3.1945 на 17 гадоў з паражэннем у правах на 5 гадоў. Рэабілітаваны 21.1.1959.

БАЯРЧУК Вікенцій Андрэевіч, н. ў 1878, в. Юшкевічы Гродзенскай губ., праваднік паяздоў

Для аховы ад партызан перакрыжавання шашэйных дарог Орша — Віцебск, Барысаў — Смаленск немцы выставілі артылерыйскае падраздзяленне. Было гэта вясной 1942 г. Неўзабаве туды была накіравана звязаная з Заслонавым падпольшчыца Людміла Шыбека. Менш за месяц спатрэбілася гэтай смелай дзяўчыне, каб падраздзяленне ў поўным складзе перайшло на бок партызан. На 12 фурманках яны прывезлі ў брыгаду Заслонава вялікую колькасць вінтовак, станковыя і ручныя кулямёты, патроны, каля 400 снарадаў і харчаванне. У брыгадзе з'явіліся дзве 45-міліметровыя гарматы.

У той жа час падпольшчыкі групы Леаніда Кандрацьева ўкаранілі сваіх людзей у буйны гарнізон, сфарміраваны немцамі ў Вялікім Сяле. Некалькі падпольшчыкаў на чале з Паўлам Смірновым паступілі на службу ў паліцыю. У пачатку мая патрыёты разграмілі гарнізон, захапілі вялікую колькасць зброі, боепрыпасаў, іншыя трафеі і разам з «народнікамі», што перайшлі на іх бок, улiліся ў партызанскі атрад «Знішчальнік».

І гэта не адзіны выпадак, калі вызначыліся падпольшчыкі з групы Леаніда Кандрацьева. Вось яшчэ два эпізоды з іх дзейнасці. Летам 1942 г. ў пас. Высокае немцы абсталявалі майстэрні для рамонту грузавікоў. Працавалі там і ахоўвалі памяшканні «народнікі». Падпольшчыкі атрымалі заданне — разлажыць гарнізон і знішчыць майстэрні. Не прайшло і месяца, як майстэрні ў Высокім згарэлі з усім абсталяваннем. Згарэлі таксама прыбудовы, дзе захоўваліся боепрыпасы, і склад з гаручым. Тыя ж, хто ажыццяўляў аперацыю, перайшлі да партызан.

Летам наступнага года ў выніку дзейнасці той жа падпольнай групы на бок партызан перайшоў увесь асабовы склад аўтароты на чале з камандзірам і яго намеснікам. Яны прыхапілі з сабой усё ротнае ўзбраенне і 10 аўтамашын.

Актыўную агітацыю сярод «народнікаў» вялі таксама падпольныя групы Э.Г.Эрнца, С.С.Благачыннага, Е.Н.Шамшуровай, В.Т.Прыгоды, Дз.Н.Бохана, І.Г.Яцко і многія іншыя. Аднак нямала падпольшчыкаў паплацілася за гэта сваім жыццём. У справаздачы групы ГФП-723 за сакавік 1943 г. чытаем: «...для расследавання выпадкаў дэзерцірства служачых палка 700 (Асінторф) сярод цывільных асоб было арыштавана 46 чалавек, прызнаных падазронымі, 5 чалавек расстраляна. За падрыхтоўку людзей у партызаны і процігерманскую прапаганду, вывад людзей у партызаны расстраляны Паўленка Іван...

У эскадроне 286, раскватараваным у Стараселлі, было ўстаноўлена, што многія ўкраінцы маюць намер дэзерцірваць і пайсці ў партызаны. За кароткі тэрмін пайшло 15 чалавек, а ў ноч з 2 на 3 уцяклі яшчэ двое... 9 служачых гэтай часці мелі такі ж намер. Іх схапілі і аддалі ваеннаму трыбуналу. Як было ўстаноўлена, усю гэтую работу вяла руская жанчына Міронава Галіна з вёскі Рацава. Было даказана, што яна мела сувязь з партызанамі і ўкраінцамі. Па загаду начальніка групы расстраляна...» (Нацыянальны архіў Рэспублікі Беларусь, ф. 4855, воп. 1, спр. 9, л. 32 — 43).

У красавіку таго ж года начальнік гэтай групы дакладваў у Берлін: «...намі былі злоўлены Цярэшчанка Аляксандр і Смірноў Юрый. Як было выяўлена, яны мелі заданне пранікнуць у нацыянальную армію і знутры разлажыць яе і перавесці на бок партызан. Пасля допыту расстраляны» (Нацыянальны архіў Рэспублікі Беларусь, ф. 4855, воп. 1, спр. 9, л. 35 — 43).

У справаздачы групы ГФП-723 за чэрвень 1943 г. ўтрымліваюцца наступныя запісы: «...на падставе дадзеных, атрыманых ад аднаго добраахвотніка, нам удалося раскрыць у Оршы падпольную арганізацыю, якая займалася вярбоўкай людзей у атрад Хадорыка. Мы перахапілі яго сувязных па горадзе Орша і за яго межамі. Галавой цэнтра быў рускі ваеннапалонны Эрнц Міхаіл, які зарэкамендаваў сябе інвалідам (абедзьве нагі адмарожаныя, хадзіў на мыліцах). У такім выглядзе ён хадзіў усюды, дапускаўся ва ўсе ўстановы, збіраў разнастайную інфармацыю. Эрнц знайшоў сабе надзейных памочнікаў у службе парадку, сярод якіх быў Казлоўскі Уладзімір — зондэрфельдфебель, які вербаваў сярод служачых парадку людзей і рыхтаваў іх да пераходу ў партызаны, здабываў у нямецкіх падраздзяленнях гранаты...

Былы ваеннаслужачы Хлебчык (лейтэнант-лётчык) меў заданне ад Эрнца працаваць у якасці вярбоўшчыка. Ён арганізоўваў сходы, на якіх рыхтаваў людзей для пераходу ў партызаны... Вышэйназваныя асобы па рашэнню ваеннага суда палявой камендатуры расстраляны».

У барацьбе супраць падпольшчыкаў фашысцкія ўлады шырока скарыстоўвалі правакатараў і агентуру, набраную са здраднікаў, дэзінфармацыю, катаванні, тэрор. Даверлівасць некаторых сувязных і падпольшчыкаў, якія ўстанаўлівалі сувязь з падманнымі групамі, што арганізоўваліся нямецкімі карнымі органамі, вельмі дорага абыходзілася патрыётам. Аднак ліквідаваць аршанскае падполле фашыстам так і не ўдалося.

Для падпольшчыкаў на ўсіх этапах іх барацьбы галоўнай заставалася дыверсійная дзейнасць на транспартных артэрыях і ў першую чаргу — на чыгуначным вузле. Пасля таго, як у канцы лютага 1942 г. разам з Заслонавым у ліку вялікай групы чыгуначнікаў у лес пайшлі і ўсе члены падрыўных груп, увесь цяжар барацьбы на вузле лёг на плечы камсамольска-маладзёжных груп на чале з Г.Шчэрбам, Дз.Боханам, А.Рыбаковым, С.Чэбрыкавым, П.Шурміным, С.Прыгодам, П.Белавусавым і некаторых іншых. У складзе гэтых груп у асноўным былі юнакі і дзяўчаты. Аднак пастаянная сувязь з партызанамі, ад якіх яны атрымлівалі магнітныя міны, падбор праверaных сувязных і дастаткова прадуманая канспірацыя дазволілі гэтым гру-

пам паспяхова дзейнічаць на працягу доўгага часу. За перыяд 1942 — 1944 гг. яны здзейснілі шмат смелых дыверсійных актаў, хоць дзейнічаць даводзілася ў вельмі складаных умовах. Аб эфектыўнасці гэтай барацьбы сведчаць і дакументы нямецкай чыгуначнай адміністрацыі: «За сем месяцаў 1942 г. былі 304 напады на аб'екты... З лютага па чэрвень 1942 г. толькі мінамі было падарвана 200 паравозаў, з якіх 110 рамантуюцца на паравозных заводах Германіі. Яны выведзены мінімум як на паўгода... Страты ў людзях і асабліва ў каштоўнейшай матэрыяльнай частцы вельмі вялікія...»

Група пад кіраўніцтвам братоў Васіля і Аляксея Рыбаковых была арганізавана ў жніўні 1941 г. «Арляняты» (так называлася група) займаліся дыверсійнай дзейнасцю на чыгунцы. Бутэлькамі з гаручай сумессю знішчалі вагоны з боепрыпасамі, псавалі хадавыя часці рухомага саставу, выносілі зброю з вагонаў. У маі 1942 г. кіраўнік групы Васіль Рыбакоў быў арыштаваны і пакараны смерцю. Яго жорстка катавалі, але Васіль не выдаў нікога. Групу ўзначаліў яго брат Аляксей. Маладыя падпольшчыкі падкладвалі магнітныя міны ў цягнікі, падарвалі спецыяльны вагон з нямецкімі афіцэрамі, 2 паравозы і кран на вугальным складзе. У красавіку 1944 г. ў групу быў укаранёны агент ГФП-723. Пры падрыхтоўцы да падрыву чыгуначнага маста члены групы былі арыштаваны і расстраляны.

Актыўна дзейнічалі на чыгуначным вузле групы, якія ўзначальваў Дзмітрый Бохан. З лютага 1942 па люты 1944 гг. падпольшчыкі гэтых груп падарвалі 13 нямецкіх эшалонаў з боепрыпасамі, баявой тэхнікай і гаруча-змазачнымі матэрыяламі, 5 паравозаў, 14 аўтамашын з салдатамі і афіцэрамі праціўніка, пашкодзілі 78 паравозаў, знішчылі 235 вагонаў з рознымі ваеннымі грузамі.

Летам 1943 г. ў выніку аперацыі, праведзенай пад кіраўніцтвам Дз.Бохана, была знішчана нафтабаза групы армій «Цэнтр», размешчаная на ўскраіне Оршы. Магнітныя міны пад нафтабакі падклалі двое «народнікаў» з аховы базы. З імі патрыёты ўстанавілі сувязь і далучылі да дыверсійнай работы. Ад выбухаў мін узнік пажар. Згарэла 1400 тон бензіну, загінулі і атрымалі раненні 30 гітлераўцаў. Аб гэтай дыверсіі начальнік групы ГФП-723 дакладваў у Берлін асобна: «...на складах забеспячэння гаручым на паўднёвай ускраіне Оршы ў 6 гадзін 10 хвілін і 6 гадзін 25 хвілін адбыліся два выбухі, згарэла вялікая колькасць бензіну, паранена шмат абслугоўваючага персаналу. Выбухі адбыліся ад магнітных мін» (Нацыянальны архіў Рэспублікі Беларусь, ф. 4855, воп. 2, спр. 2, л. 174).

А некалькімі месяцамі раней вялікі склад гаруча-змазачных матэрыялаў быў знішчаны на станцыі. З гэтага складу ішло забеспячэнне гаручым і змазачнымі матэрыяламі чыгуначнага вузла і аўтатранспарту карных часцей і падраздзяленняў. Дыверсію з дапамогай дзвюх магнітных мін ажыццявіў падпольшчык Ціхан Падвіцкі, які паводле задання Дз.Бохана ўладкаваўся на гэты склад рабочым. У выніку склад быў знішчаны, графік руху паяздоў сарваны на працяглы час.

Пра размах і эфектыўнасць работы падпольшчыкаў, якіх узначальваў Бохан, сведчаць яго справаздачы падпольнаму райкому партыі аб расходаванні мін: «...Наш член падпольнай арганізацыі Павел Масаловіч, — пісаў ён у 1943 г., — пад наліўны састаў з бензінам паставіў дзве магнітныя міны. Выбух адбыўся на перагоне. Згарэлі 42 цыстэрны з бензінам. А член групы «А» знішчыў 23 цыстэрны з бензінам. В.Кузняцоў на станцыі Орша-Заходняя падклаў міну пад зборны састаў. У выніку выбуху згарэла 7 цыстэрнаў з бензінам, 2 вагоны з боепрыпасамі, 2 платформы з аўтамашынамі, 12 платформаў з будаўнічымі матэрыяламі...» (Архіў КДБ СССР, справа «Няўлоўных», т. 1, л. 40).

Пра смеласць і дзёрзкія задумкі 19-гадовага кіраўніка падпольных груп Дз.Бохана сведчыць датаваная 1943 годам запіска, перададзеная праз сувязных у падпольны райком партыі: «Цяпер тэрмінова як магчыма больш патрабуецца магнітных мін. Усё гэта неабходна для таго, каб адначасова ўзняць у паветра ўсе аб'екты, на якіх ёсць мае людзі... Цяпер маіх людзей разам з сем'ямі неабходна адправіць у атрад. Я застаюся і прапаную такі план: у самы бліжэйшы час узарваць артылерыйскія склады... Другім этапам намечана замініраваць склады, падарваць пуці, крыжавіны, масты, вадакачку на чыгунцы — увогуле, «пагаспадарыць» на станцыі. Сам я сыходжу, калі не траплю ў рукі гестапа, пасля ўзрыву станцыі». Аднак не ўсе задумкі давялося ажыццявіць. У лютым 1944 г., вяртаючыся з баявога задання, Дз.Бохан натрапіў на карнікаў. Адстрэльваўся да апошняга патрона, а потым, падпусціўшы ворагаў бліжэй, узарваў сябе гранатай. Як і барацьба, смерць яго была гераічнай.

Значныя страты акупантам нанесла дыверсійная група, якую ўзначальваў Георгій Іванавіч Шчэрба. У падпольную арганізацыю ён уступіў у ліпені 1941 г., звязаўшыся з партарганізатарам аршанскага партыйнага цэнтра В.І.Еўсюкевічам. Выконваў дыверсійныя заданні па вывадзе са строю рухомага саставу на чыгуначнай станцыі. Пазней стаў членам групы Дзмітрыя Бохана, а потым сам узначаліў дыверсійную групу, члены якой падарвалі шмат вагонаў з боепрыпасамі і ваеннымі грузамі, цыстэрнаў з гаручым, спалілі 10 аўтамашын праціўніка з ваенным рыштункам. У снежні 1943 г. падпольшчыкамі групы Шчэрбы быў спалены хлебазавод і некалькі вагонаў з мукой. У пачатку 1944 г. фашысцкія следчыя органы змаглі высачыць падпольшчыкаў. Г.Шчэрба, яго брат Барыс і яшчэ 25 падпольшчыкаў былі схоплены і заключаны ў турму. Следства цягнулася два месяцы. Змардаваныя допытамі і катаваннямі, у красавіку 1944 г. патрыёты былі расстраляны.

У 1942—1943 гг. некалькі эфектыўных дыверсійных актаў здзейснілі падпольшчыкі Ф.Я.Коўтуна. Гэтая група была арганізавана Дз.Боханам у ахоўнай роце чыгуначнага вузла, сфарміраванай немцамі з палонных украінцаў, якіх немцы скарыстоўвалі для аховы саставаў і суправаджэння грузаў, што і было выкарыстана падпольшчыкамі. 25 жніўня 1943 г. Ф.Я.Коўтун суправаджаў чыгуначны састаў з Оршы да станцыі Рослаўль. Трыма магнітнымі мінамі, што былі яму перададзены, ён замініраваў састаў. Міны спрацавалі на станцыі Самалюбаўка. Выбухамі было знішчана 54 вагоны з боепрыпасамі і іншымі грузамі, разбураны будынак станцыі, парушаны чыгуначныя пуці. Рух на гэтай станцыі быў спынены на 7 дзён.

Падпольшчыкі групы перапраўлялі да партызан узрыўчатку і боепрыпасы, здабытыя з нямецкіх складоў, выкралі ўзоры новых нямецкіх боепрыпасаў, якія з дапамогай партызан былі дастаўлены савецкаму камандаванню. У верасні 1943 г. Ф.Я.Коўтун і некалькі членаў яго групы ўдачна пераправіліся ў лес да партызан 1-й Заслонаўскай брыгады.

Актыўна дзейнічалі на чыгуначным вузле і іншыя падпольныя групы (С.Чэбрыкава, П.Шурміна, С.Прыгоды, П.Белавусава), пра што сведчаць данясенні групы ГФП-723: «...3.07.1943 г. адбыўся выбух састава з бензінам. Састаў стаяў у тупіку Орша-Заходняя.

3.07.1943 г. ў 19 гадзін на перагоне Орша—Пагодзіна загарэўся састаў з нафтай і цалкам згарэў. Састаў адправіўся са ст. Орша-Заходняя.

15.07.1943 г. На перагоне Орша—Крычаў загарэўся састаў з гаручым. Састаў ішоў праз ст. Орша.

16.07.1943 г. На перагоне Орша—Крычаў загарэўся састаў, які следаваў з Оршы.

23.07.1943 г. На станцыі Орша-Цэнтральная падарваны састаў з бензінам. Цалкам згарэла 6 цыстэрнаў.

24.08.1943 г. На станцыі Орша-Заходняя адбыўся выбух трох цыстэрнаў з дызельным палівам. Пажар перакінуўся на вагоны, што стаялі побач. Згарэлі вагоны з маторамі, платформы са светламашынамі і іншай ваеннай маёмасцю» (Нацыянальны архіў Рэспублікі Беларусь, ф. 4855, воп. 2, спр. 2, л. 133, 150, 173, 174).

Магнітныя міны, што ўстанаўлівалі аршанскія падпольшчыкі, часта спрацоўвалі за межамі зоны адказнасці ГФП-723, і таму фактычная колькасць дыверсій значна перавышае дадзеныя аршанскага філіяла службы.

Трымаючы справаздачу за атрыманыя ў ліпені 1943 г. міны, кіраўнік падпольнай дыверсійнай групы Сцяпан Прыгода пісаў: «З брыгады я атрымаў 15 магнітных мін, іх поўнасцю зрасходаваў са сваёй групай. У асноўным яны былі скарыстаны для падрыву цыстэрнаў з гаручым. Намі знішчана 700 тон бензіну, 80 вагонаў з рознымі ваеннымі грузамі, 5 аўтамашын з жывой сілай, забіта салдат і афіцэраў 29, паранена 22, выведзены са строю 3 паравозы. На ветцы з выхадам на Смаленск пусцілі пад адхон воінскі эшалон» (Нацыянальны архіў Рэспублікі Беларусь, ф. 3500, воп. 19, спр. 40, л. 173).

Пра размах дыверсійнай дзейнасці аршанскіх падпольшчыкаў у 1943 г. сведчаць і дзённікавыя запісы А.З.Кардоўскай — сувязной падпольнага райкома партыі. Вось толькі адзін з іх: «24 чэрвеня 1943 г. я разам з Верай Еўсюкевіч была накіравана ў Оршу. Захапілі з сабою 10 магнітных мін, якія перадала Прыгодзе С. і Кашыну В. 4 ліпеня 1943 г. Прыгода С. на 41-м кіламетры узарваў 5 цыстэрнаў, знішчыў 250 тон гаручага. 4 ліпеня машыніст Баклан на 21-м кіламетры, перад Зубрамі, узарваў 3 цыстэрны з гаручым, знішчыў 150 тон бензіну. 12 ліпеня Прыгода Васіль на станцыі Орша-Заходняя ўзарваў 4

цыстэрны, знішчана 200 тон гаручага. 17 ліпеня машыніст Баклан на 62-м кіламетры перад станцыяй Цёмны Лес узарваў 3 цыстэрны, знішчана 150 тон гаручага. 17 ліпеня Прыгода С. на станцыі Орша-Заходняя ўзарваў 5 цыстэрнаў, знішчана 250 тон гаручага... 27 ліпеня Савіцкі Генадзь, 16-гадовы хлапчук, паставіў магнітку пад састаў — узарвалася на станцыі Орша. Згарэла 5 цыстэрнаў з гаручым, платформа з бочкамі гаручага. Згарэла 370 тон. Адначасова згарэў склад з прадуктамі. 19 жніўня я разам з Верай Еўсюкевіч адправілася ў Оршу на кані, захапіўшы з сабой 15 магнітных мін. Міны былі перададзены Шчэрба Г...» (Нацыянальны архіў Рэспублікі Беларусь, ф. 4855, воп. 1, спр. 9, л. 17—18).

Па-рознаму склаліся лёсы гэтых дзвюх жанчын, удзельніц падпольнай барацьбы з ліпеня—жніўня 1941 г. Алена Захараўна Кардоўская ў 1944 г. стала камісарам атрада «Дзядзя Косця» партызанскай брыгады імя К.С.Заслонава, дажыла да Перамогі, плённа працавала ў пасляваенны час. Вера Іванаўна Еўсюкевіч у верасні 1943 г. была схоплена фашысцкімі карнымі органамі і па-зверску закатавана. Былы партарганізатар і кіраўнік падпольных груп на чыгуначным вузле, якая ведала асабіста многіх падпольшчыкаў, яна не выдала ніводнага. Ніякія катаванні не зламалі волю гэтай мужнай жанчыны.

Дыверсійная дзейнасць падпольшчыкаў на чыгуначным транспарце працягвалася да вызвалення горада ад нямецка-фашысцкіх захопнікаў. Па няпоўных даных, падпольшчыкамі Оршы за час 1941—1944 гг. выведзены са строю 253 паравозы, падарваны 41 эшалон з жывой сілай, гаручым, баявой тэхнікай і іншымі ваеннымі грузамі, асобна знішчана 336 вагонаў, цыстэрнаў і платформ, падарвана больш за 20 аўтамашын з салдатамі, афіцэрамі, ваеннымі грузамі, узарвана і спалена 15 складоў з боепрыпасамі, авіябомбамі, гаручым і харчаваннем, знішчана больш за 2 тыс. салдат і афіцэраў праціўніка, пакарана смерцю некалькі дзесяткаў здраднікаў і нямецкіх агентаў.

Значныя страты захопнікам нанеслі падпольшчыкі, якія дзейнічалі на гаспадарчых і ваенных аб'ектах, у нямецкіх установах і мясцовых управах. Так, дзеяннямі падпольнай групы С.С.Благачыннага былі сарваны спробы нямецкіх улад аднавіць ільнокамбінат. Члены гэтай групы спалілі ў Оршы, Талачыне, Бабры і Коханаве ўсе склады з сыравінай, прызначанай акупантамі для адпраўкі ў Германію.

Аршанскія падпольшчыкі не раз рабілі дыверсіі на БелДРЭС, якая падавала электраэнергію ў гарады і пасёлкі Віцебскай вобласці. Паколькі на саму станцыю трапіць удавалася далёка не заўсёды, патрыёты, каб сарваць падачу электрычнасці, падрывалі мачты перадач, трансфарматарныя блокі, рвалі правады.

Адчайна і вельмі вынікова дзейнічала падпольная дыверсійная група пад кіраўніцтвам Зінаіды Шэвень. Уладкаваўшыся на працу ў лётную сталовую на аэрадроме Балбасава, сёстры Зінаіда і Аляксандра Шэвень, Марына Мамаева прыцягнулі да дыверсійнай работы гітлераўскага салдата, чэха па нацыянальнасці (прозвішча не ўстаноўлена). Ён выконваў абавязкі запраўшчыка самалётаў. Перад вылетам самалётаў, да якіх меў доступ, ён закладваў магнітныя міны ў бомбавыя адсекі. Самалёты ўзрываліся ў паветры. З дапамогай гэтага салдата дзяўчаты падарвалі 7 аўтамашын, 5 цыстэрнаў з гаручым, радыёстанцыю, гараж з запчасткамі да самалётаў. На запасных пуцях, што вялі да аэрадрома, узарвалі эшалон з авіябомбамі і 2 вагоны з рознай маёмасцю, самалёт-бамбардзіроўшчык і інш. У красавіку 1944 г., пасля аперацыі па знішчэнні радыёстанцыі, сёстры Шэвень і іх памочнік былі схоплены фашысцкімі карнымі органамі і расстраляны. Марыі Мамаевай удалося схавацца і перайсці да партызан. Ужо трапіўшчы ў лапы следчых, сёстры Шэвень паказалі выключную мужнасць: іх катавалі распаленым жалезам, але ні адна не сказала пра міну замаруджанага дзеяння, што была ўстаноўлена імі ў адну з аўтамашын. І ў час, калі каты практыкаваліся ў сваіх брудных справах, міна ўзарвалася. Машына ўжо знаходзілася ў гаражы. Будынак гаража і аўтамабілі, што знаходзіліся ў ім, былі знішчаны.

Вынікі дыверсійнай дзейнасці аршанскіх падпольшчыкаў за перыяд з 1941 па 1944 г. не паддаюцца дакладнаму падліку. Аднак не падлягае сумненню, што ўзброеным сілам і транспарту акупантаў былі нанесены значныя страты. Актыўнай дзейнасцю аршанскага падполля былі сарваны многія гаспадарчыя планы фашыстаў. Ім так і не ўдалося наладзіць работу аршанскіх прамысловых прадпрыем-

стваў, увесь час зрываліся і сельскагаспадарчыя нарыхтоўкі акупантаў.

Важнай сферай дзейнасці падпольшчыкаў з'яўлялася разведка. Пачынаючы з восені 1941 г. яна мэтанакіравана праводзілася многімі падпольнымі групамі. Асаблівую цікаўнасць разведкі ў 1941—1943 гг. выклікалі перамяшчэнне войск, баявой тэхнікі і ваенных грузаў праз Оршу, ваенныя аб'екты праціўніка, характар дзейнасці акупацыйных улад. У 1944 г. побач з гэтым на першы план вылучаецца вывучэнне сістэмы абарончых збудаванняў ворага, размяшчэнне агнявых і іншых баявых сродкаў, вычарпальная характарыстыка нямецкіх часцей і злучэнняў, якія трымалі абарону на Аршанска-Мінскім накірунку. Вялікую работу па зборы разведвальнай інфармацыі правялі падпольныя групы Б.А.Маісеева, І.К.Петрачэнкі, Л.М.Асташкевіча, П.К.Белавусава, Е.В.Грачыхі, Г.І.Шчэрбы і інш. Са студзеня 1942 г., калі была наладжана пастаянная радыёсувязь кіраўнікоў падполля са штабам партызанскага руху і камандаваннем Чырвонай Арміі, гэта дзейнасць набыла больш аператыўны характар.

Вялікае значэнне для збору разведвальнай інфмармацыі мела пранікненне падпольшчыкаў у варожыя ўстановы і створаныя акупантамі органы кіравання.

Паводле задання кіраўнікоў падполля ў аршанскую гарадскую ўправу ўладкаваўся падпольшчык Л.В.Кандрацьеў. Пасада інспектара чыгункі давала яму магчымасць збіраць каштоўную інфармацыю пра транспартныя перавозкі праціўніка, здраднікаў. Здабытыя звесткі ён перадаваў праз свайго брата С.Кандрацьева ў партызанскую брыгаду К.С.Заслонава. Браты Кандрацьевы правялі шэраг буйных дыверсій. Л.В.Кандрацьеў пагеройску загінуў пры выкананні баявога задання ў лютым 1944 г.

Высокай выніковасцю ў зборы разведінфармацыі вызначалася падпольная група Л.Я.Пісарава. Яна была створана пры гарадской управе. Л.Я.Пісараў узначальваў гарадскую жыллёвую кантору, адкрытую акупантамі. З яго дапамогай падпольшчыкі атрымалі магчымасць размяшчаць у Оршы сваіх разведчыкаў і партызан і афармляць ім прапіску. Для падпольнага райкома партыі і брыгады імя Заслонава быў складзены план горада Орша з указаннем размяшчэння агнявых сродкаў, казарм, складоў і іншых ваенных аб'ектаў праціўніка. Л.Я.Пісараў выкраў і перадаў у штаб брыгады спісы работнікаў акупацыйных устаноў горада, паліцэйскіх і агентаў ворага. Работнікі акупацыйных устаноў, якія ўваходзілі ў яго групу, таксама займаліся зборам разведвальнай інфармацыі. Члены групы праводзілі работу ў лагерах ваеннапалонных, здабывалі сакрэтныя загады і інструкцыі акупацыйных улад, забяспечвалі дакументамі патрыётаў, якім удавалася ўцячы з фашысцкіх лагераў і турмаў, даставалі для партызан і падпольшчыкаў паперу і медыкаменты.

Каштоўныя звесткі пра некаторыя воінскія часці, што дыслацыраваліся ў Оршы, пра абарончыя збудаванні ворага атрымліваў падпольны райком партыі ад землеўпарадчыка аршанскай гарадской управы Я.П.Ісачанкі. Займаемая ва ўправе пасада давала яму магчымасць наведваць некаторыя ваенныя аб'екты акупантаў. Усе заўважаныя абаронныя збудаванні і агнявыя сродкі ён наносіў на карту, а пры магчымасці і фатаграфаваў. Карты і фотаздымкі перадаваў праз сувязных партызанам. У сакавіку 1944 г. Я.П.Ісачанка быў схоплены карнымі органамі акупантаў і расстраляны.

У вясенне-летні перыяд 1944 г. падпольшчыкі Оршы аказалі вялікую дапамогу органам разведкі Чырвонай Арміі ў вывучэнні абароны гітлераўцаў на Аршанска-Мінскім напрамку. Праз штаб брыгады імя Заслонава ў штаб 3-га Беларускага фронта было перададзена каля 200 карт, схем, замалёвак, пісьмовых паведамленняў аб праціўніку. У гэтых дакументах дэталёва раскрывалася сістэма абароны немцаў — яе будова, глыбіня, месцы размяшчэння агнявых сродкаў і складоў боепрыпасаў, характар інжынернага абсталявання мясцовасці, наяўнасць доўгачасовых абарончых збудаванняў. Практычна савецкае камандаванне атрымала ўсю неабходную інфармацыю пра абарону праціўніка.

Дзейнасць падпольшчыкаў у Оршы ажыццяўлялася ў вельмі складаных умовах, асабліва ў апошні год акупацыі. Высокая канцэнтрацыя армейскіх часцей, сіл паліцыі бяспекі і карных атрадаў, насаджэнне ворагам паўсюдна сваёй агентуры, асцярожнасць акупантаў, якія сталі вельмі падазронымі, значна ўскладнялі барацьбу патрыётаў. Да трапіўшых у фашысцкія засценкі падпольшчыкаў прымяняліся самыя зверскія катаванні. Фа-

шысты шырока выкарыстоўвалі практыку масавых арыштаў, метады псіхалагічнага ўздзеяння і запалохвання. Намаганнямі следчых органаў з дапамогай асобных здраднікаў у 1944 г. ў горадзе і раёне былі раскрыты некалькі падпольных груп. У лютым арыштаваны 16 членаў падпольнай дыверсійнай групы Аляксея Рыбакова, якія дзейнічалі на чыгуначным вузле, у маі — 11 чалавек з групы Аркадзя Нікалаева, якая дзейнічала ў друкарні. Некалькі раней — у красавіку 1944 г. ў пасёлку Барань за сувязь з партызанамі было арыштавана 50 чалавек. Многія загінулі ў час катаванняў, астатніх падпольшчыкаў немцы расстралялі.

У адказ на фашысцкі тэрор падпольшчыкі і партызаны прымалі карныя меры да кіраўнікоў нямецкіх службаў, іх памагатых і агентуры. Так, у 1943 г. партызанамі быў забіты камандзір нямецкіх карных атрадаў. Неўзабаве яго месца заняў афіцэр войск СС, які пры допытах савецкіх людзей вызначаўся асаблівай жорсткасцю, «працаваў» заўсёды п'яны. Садыст быў прысуджаны падпольшчыкамі да пакарання смерцю. Падрыхтаваць і правесці аперацыю было даручана Яўгену Ісачанку. У састаў групы ўвайшлі Дз.Бохан, Н.Кандрацеў, І.Сухадольская і Н.Бабура. Неўзабаве эсэсавец знік. Яго выкралі ноччу з кватэры. Атрымаўшы ад ворага каштоўныя звесткі пра планы карнікаў, іх агентуру і правакатараў, падпольшчыкі прысуд выканалі — з каменем на шыі скінулі фашыста ў Днепр.

Пакуль фашысты шукалі новага камандзіра карных атрадаў, патрыёты знішчылі яшчэ аднаго вылюдка — каменданта Смалянскага гарнізона. Прысланы на яго месца новы камендант, не жадаючы сабе таго ж лёсу, асаблівага запалу не паказваў і хутка быў адпраўлены на фронт. А вось афіцэр, які заняў яго месца, быў сапраўдным зверам. Маленькі таўстун, ён нагадваў сваім выглядам клапа. Так яго і называлі мясцовыя жыхары. «Клоп» разгарнуў буйную дзейнасць, увёў у практыку масавыя расстрэлы ні ў чым не вінаватых людзей. Для ліквідацыі гэтага ката падпольшчыкі ўкаранілі ў кантору камендатуры камсамолку Ніну Кунцэвіч. Выдатна ведаўшая нямецкую мову, сціплая і выхаваная дзяўчына зрабіла добрае ўражанне на афіцэраў камендатуры. Камендант і яго намеснік не адмовілі, калі яна і яе сяброўка Маша запрасілі іх да апошняй на вяселле. У в. Вязьмічы, што пад Смалянамі, іх чакалі партызаны. Намеснік каменданта паспеў выхапіць пісталет і застрэліцца, а каменданта з шафёрам схапілі і адправілі да партызан. Крыху пазней групай Яўгена Ісачанкі быў выкрадзены новы камандзір карных атрадаў — здраднік Якаўлеў. У штабе брыгады імя Заслонава, куды яго даставілі падпольшчыкі, ён расказаў пра правакатараў і агентаў, што былі засланы немцамі ў падпольныя групы і партызанскія атрады.

Падобных выпадкаў было шмат. У паведамленні члена Аршанскага падпольнага райкома партыі А.П.Максіменкі гаварылася: «З Оршы былі выкрадзены начальнік паліцыі, яго намеснік, начальнік аператыўна-разведвальнага ўпраўлення і іншыя» (Архіў КДБ СССР, справа «Няўлоўных», т. 1, л. 33, 40, 65).

За час акупацыі падпольшчыкамі і партызанамі былі знішчаны сотні фашысцкіх карнікаў, іх прыспешнікаў і агентаў, стаўленікаў «новага парадку». Акты помсты мелі не толькі вялікае палітычнае значэнне, але і аказвалі псіхалагічнае ўздзеянне на фашысцкіх катаў і іх прыспешнікаў. Трапіўшы ў рукі да падпольшчыкаў і партызан, гэтыя людзі расказвалі ўсё, што ведалі. У значнай ступені барацьба падпольшчыкаў супраць карных органаў фашыстаў і іх памагатых дазволіла захаваць ад правалаў нямала падпольных патрыятычных груп.

Доўгія тры гады цягнулася акупацыя Оршы. Тры гады ў выключна цяжкіх умовах вялі барацьбу з захопнікамі патрыёты Аршаншчыны. На працягу гэтага перыяду ў горадзе і раёне былі арганізаваны і дзейнічалі больш за 80 падпольных груп, якія налічвалі ў сваім складзе звыш за тысячу падпольшчыкаў.

Барацьба была няроўнай. Падпольшчыкам, у большасці сваёй маладым людзям мірных прафесій, процістаялі добра ўзброеныя і абучаныя армейскія і паліцэйскія сілы, прафесіяналы з вялікім вопытам, якія мелі ў сваім распараджэнні транспарт і ўсе віды сувязі. У гэтай няроўнай барацьбе загінула больш за 600 падпольшчыкаў. Многія з іх былі закатаваны ў фашысцкіх засценках.

Гібель многіх патрыётаў і поўнае знішчэнне асобных падпольных груп на некалькі дзесяцігоддзяў схавала ад нашчадкаў прозвішчы і подзвігі членаў Аршанскага патрыятычнага

Пісьмо падпольшчыцы І.Сухадольскай.


Прощай родимая мать, прощай не забывай свою небозримую дочь, которая погибает, которая умирает не своей Смертью, а от руки палача Прощай не забывай и не думай, что твоя дочь умирала со слезами, она умирала и последнее слово сказала Прощай дорогая Россия Прощай некалядная мать

падполля. Не было каму расказаць пра іх, а многія аказаліся па розных прычынах несправядліва забытыя. Аднавіць праўду пра іх гераізм, зрабіць вядомымі іх прозвішчы дазволіла самаадданая праца даследчыка Нічыпара Нічыпаравіча Крашаніннікава. Больш за паўстагоддзя па крупінках збіраў ён матэрыял, сустракаўся з падпольшчыкамі, іх сваякамі, вывучаў дакументы, знаходзіў жывых удзельнікаў і сведкаў тых падзей. Сабраныя ім дакументы і ўспаміны не памесцяцца і ў дзесятках ёмістых папак. Сам франтавік і патрыёт, ён шанаваў, як святыню, памяць пра герояў падполля і зрабіў усё, каб уваскрэсіць іх імёны. Дзякуючы яго самаадданай працы сталі вядомыя прозвішчы і, зразумела, дзейнасць, многіх аршанскіх патрыётаў.

П а р т ы з а н с к і р у х. Адначасова з падпольнай барацьбой супраць акупантаў і ў непарыўнай сувязі з ёй на Аршаншчыне складваўся і набіраў сілу партызанскі рух. У першыя месяцы акупацыі ў раёне ўзнікла некалькі партызанскіх груп. У іх склад увахо-дзілі афіцэры і салдаты Чырвонай Арміі і мясцовыя патрыёты. У асенне-зімовы перыяд 1941—1942 гг. такія групы ўзніклі ў вёсках Кашына, Рубашына, Грабянёва, Гразіна, Звягі, Асінаўка, Мажэеўка, Каменка і многіх іншых населеных пунктах Аршанскага раёна.

Да вясны 1942 г. намаганнямі падпольных партыйных арганізацый, салдат і афіцэраў Чырвонай Арміі, што трапілі ў акружэнне, былі створаны партызанскія атрады імя Варашылава, «Знішчальнік», «Дзяніса», «Чырвоныя партызаны», партызанскія групы А.Катуліна (пазней атрад «Грозны»), В.Нячаева, П.Лямаева, С.Агароднікава, М.Сабакіна, М.Хадорыка, І.Сіўцова, В.Быкава, Б.Клюшнікава, П.Смірнова, М.Лушчына, В.Кадо і інш.

У пачатку сакавіка 1942 г., ратуючыся ад правалу, з Оршы пайшлі ў лес многія падпольшчыкі чыгуначнага вузла на чале з К.С.Заслонавым. У в. Лагі Аршанскага раёна імі быў арганізаваны партызанскі атрад. Колькасць атрада хутка расла. У яго склад ужо ў сакавіку—красавіку 1942 г. ўліліся партызанскія групы П.П.Лямаева, Д.Е.Касачова, П.В.Смірнова, Л.І.Сяліцкага, створаныя з трапіўшых у акружэнне вайскоўцаў, а таксама жыхароў вёсак Межава і Каменка Аршанскага раёна. Пазней атрад стаў ядром партызанскай брыгады. Малаколькасныя партызанскія атрады і групы у той час у большасці сваёй не мелі сувязі з камандаваннем Чырвонай Арміі і паміж сабой. На свой страх і рызыку кожная група вяла барацьбу адасоблена. Партызаны нападалі на дробныя паліцэйскія гарнізоны, знішчалі здраднікаў, рабілі засады на шашэйных дарогах, праводзілі дыверсіі на чыгуначных перагонах, знішчалі фашысцкія склады і майстэрні, раздавалі насельніцтву нарабаванае акупантамі харчаванне, псавалі лініі сувязі і электрапередачы, вялі антыфашысцкую агітацыю і прапаганду. Рашаць баявыя задачы больш буйнога маштабу малалікія партызанскія групы ў той час не маглі. Аднак і іх дзейнасць наносіла акупантам адчувальныя страты.

Характэрная ў гэтых адносінах баявая дзейнасць партызан пад камандаваннем К.С.Заслонава. «Сакавік месяц. Арганізацыя баявога атрада, сцягванне зброі, аб'яднанне груп. Арганізацыя разведкі і барацьба з контрэвалюцыйнымі элементамі. Знішчана 8 паліцэйскіх, 2 бургамістры, знішчана 1 земская гаспадарка ў Межаве, адабраны савецкія грошы. 23 сакавіка 1942 г. пушчаны пад адхон цягнік на перагоне Асінаўка—Хлюсціна, сарваны тым самым рух на 21 гадзіну.

Красавік месяц. ...Знішчана 12 паліцэйскіх, адзін бургамістр. Спушчаны цягнік на перагоне Орша—Хлусава, чым перарваны рух на 27 гадзін.

Май месяц. На станцыі Бурбін спалена 8 хлебных складоў, чым знішчана да 2000 тон хлеба (зерне). Указаныя запасы хлеба з 4 па 10 мая павінны былі быць перавезены ў Гер-

манію, для чаго на станцыі Талачын засяроджвалася 500 грузавых аўтамашын. 13 мая 1942 г. на перагоне Коханава—Талачын спушчаны пад адхон цягнік, які ішоў на Оршу. 18 мая 1942 г. спушчаны цягнік на перагоне Хлусава—Хлюсціна. Знішчана паліцэйскіх і тайных нямецкіх агентаў 38 чалавек (у раёне Лепель—Чашнікі). У паласе Оршы знішчана паліцэйскіх — 5, а ў Сенненскім раёне 16 паліцэйскіх, 1 бургамістр і ў раёне вёскі Лагі (Аршанскі раён) — 42 гітлераўцы, з іх 11 афіцэраў. Знішчана аўтамашын — 9 і матацыклаў — 2.

Чэрвень месяц. 4 чэрвеня 1942 г. на перагоне Стайкі—Багушэўск (на 51 км па няцотным пуці) шляхам мініравання пуці і моста спушчаны цягнік з аўтамашынамі. Рух быў перарваны на 34 гадзіны, пасля чаго быў адкрыты аднакалейны рух, двухкалейны быў адноўлены толькі 9 чэрвеня 1942 г.

16 чэрвеня 1942 г. на перагоне Пагост—Коханава шляхам мініравання спушчаны цягнік. 26 чэрвеня 1942 г. на перагоне Хлусава—Орша мініраваннем пуці спушчаны пад адхон 1 цягнік. Знішчаны 42 паліцэйскія, 12 гітлераўцаў і 6 аўтамашын» (З дакладной запіскі камісараў партызанскіх атрадаў брыгады «Дзядзі Косці» І.С.Шурмана і Л.І.Сяліцкага члену Ваеннага савета 4-й ударнай арміі сакратару Віцебскага абкома КП(б)Б І.А.Стулаву аб баявой дзейнасці атрада «Дзядзі Косці» і фарміраванні брыгады ў кн. «Усенародны партызанскі рух у Беларусі ў гады Вялікай Айчыннай вайны». Мн., 1967. Т. 1. С. 217).

Логіка партызанскай барацьбы дыктавала неабходнасць аб'яднання партызанскіх сіл, паляпшэння кіраўніцтва імі, падначалення іх дзейнасці агульнаму плану барацьбы з акупантамі, узгаднення дзеяння партызанскіх сіл з дзеяннямі армій і франтоў. Для рашэння гэтых задач 30 мая 1942 г. пры Стаўцы Вярхоўнага Галоўнакаманадавання былі створаны Цэнтральны і Беларускі штабы партызанскага руху. На гэтыя штабы былі ўскладзены задачы па аператыўным кіраўніцтве партызанскімі сіламі, забеспячэнне партызан узбраеннем, боепрыпасамі, сродкамі сувязі, падрыхтоўка і ўлік кадраў.

Пазней, у 1943—1944 гг., калі фронт наблізіўся да межаў Беларусі, пры ваенных саветах франтоў арганізоўваліся прадстаўніцтвы і аператыўныя групы Цэнтральнага і Беларускага штабоў партызанскага руху, якія ажыццяўлялі кіраванне партызанскімі сіламі, узгадненне іх дзеянняў з баявымі задачамі рэгулярных часцей Чырвонай Арміі.

Як і паўсюдна на Беларусі, партызанскі рух у Аршанскім раёне прайшоў у сваім развіцці тры асноўныя этапы.

Першы, найбольш цяжкі этап, — з ліпеня 1941 г. па лістапад 1942 г., ад зараджэння да разгортвання масавай партызанскай барацьбы. Дзеянні савецкіх патрыётаў, якія мелі напачатку акупацыі разрознены, недастаткова арганізаваны характар, перараслі пад канец 1942 г. ў мэтанакіраваныя, планамерныя і арганізаваныя выступленні. У асноўным склаліся прынцыпы і тактыка дзеянняў партызан. Іх барацьба, набываючы ўсё больш наступальны характар, становіцца рознабаковай і эфектыўнай.

Лістапад 1942 — снежань 1943 гг. — другі этап партызанскага руху. Масавы партызанскі рух перарастае па сваіх маштабах ва ўсенародную вайну. Як і паўсюдна ў акупіраваных раёнах Беларусі, на Аршаншчыне ў гэты час рэзка ўзрос баявы і колькасны склад партызанскіх сіл. Іх дзейнасць стала яшчэ больш выніковай.

Трэці, завяршальны, этап партызанскага руху пачаўся з наступленнем Чырвонай Арміі на тэрыторыю Беларусі восенню — зімой 1943 г. Ён завяршыўся летам 1944 г., калі БССР была поўнасцю вызвалена савецкімі войскамі ад гітлераўскіх захопнікаў. Гэты этап характарызуецца непасрэдным аператыўна-палітычным баявым узаемадзеяннем партызан з рэгулярнымі часцямі і сумеснай барацьбой за вызваленне Беларусі.

Да лета 1942 г. ў Аршанскім раёне былі арганізаваны і дзейнічалі некалькі партызанскіх атрадаў і груп. Хуткімі тэмпамі павялічвалася іх колькасць. Партызанскія сілы ўзбуйняліся.

У ліпені 1942 г. ў Бабінавіцкім лесе паблізу в. Сафіёўка на базе атрада «Дзядзі Косці» была сфарміравана партызанская брыгада К.С.Заслонава. Акрамя атрада «Дзядзі Косці», у брыгаду ўвайшлі асобны зводны атрад І.Шурмана, асобны зводны атрад П.Смірнова — Л.Сяліцкага, партызанская група «Мікалая», асобны атрад Сатушкі — А.Андрэева. Арганізацыйна брыгада складалася з 5 партызанскіх атрадаў і падрыўной групы колькасцю 20 чалавек. Камандзірам брыгады стаў Канстанцін Сяргеевіч Заслонаў, камісарам — Людвіг Іванавіч Сяліцкі. Брыгада стала асноўным партызанскім злучэннем у Аршанскім раёне і паспяхова вяла барацьбу з нямец-

ка-фашысцкімі акупантамі да вызвалення горада і раёна. Пасля гібелі Заслонава камандзірам брыгады стаў Л.І.Сяліцкі, а брыгада атрымала імя К.С.Заслонава. Колькасць байцоў у брыгадзе хутка расла.

23 верасня 1943 г. паводле ўказання Беларускага штаба партызанскага руху была арганізавана другая партызанская брыгада імя Заслонава. Камандзірам яе быў прызначаны В.П.Комлеў, камісарам — В.Е.Бяляеў. У склад брыгады ўвайшлі 6 атрадаў, што былі выдзелены з першай брыгады. За час свайго існавання брыгады правялі 122 баі з акупантамі і іх памагатымі. Партызанамі-заслонаўцамі было знішчана 7878 варожых салдат і афіцэраў, узята ў палон 2139 гітлераўцаў, узарвана 12 230 рэек, пушчана пад адхон 218 воінскіх эшалонаў, разбіта 104 паравозы, 1191 вагон з жывой сілай і тэхнікай ворага, узарвана 40 мастоў, 596 аўтамашын і бронемашын, знішчаны 24 склады з боепрыпасамі, разбурана 16 прамысловых прадпрыемстваў, 4 чыгуначныя станцыі, збіты 1 самалёт, выведзены са строю 33 танкі.

Акрамя гэтых дзвюх брыгад, у Аршанскім раёне дзейнічалі і іншыя партызанскія атрады і брыгады, у тым ліку брыгада «Баці», «Багушэўская брыгада», «16-я Смаленская брыгада», брыгада «Чэкіст», «115-я Горацкая брыгада», брыгада «Звязда», асобны атрад «Артур», некаторыя іншыя партызанскія фарміраванні. У іх складзе было нямала аршанцаў. Па няпоўных даных, толькі на камандных і палітычных пасадах у партызанскіх атрадах і брыгадах знаходзілася больш за 200 жыхароў горада і раёна, якія прайшлі школу падпольнай барацьбы. У брыгадах Заслонава — гэта К.Заслонаў, Л.Анкіновіч, А.Максіменка, В.Лазорскі, Н.Сіўцоў, М.Сабакін, Ф.Сплашноў, Ф.Нячаеў, С.Чэбрыкаў, П.Шурмін, П.Белавусаў, А.Андрэеў, К.Гурын, С.Прыгода, Г.Піпчанка, В.Ждановіч, С.Агароднікаў, Д.Касачоў, Н.Ягораў, Г.Ражанскі, В.Тарацінскі, В.Навумаў, А.Снытко, К.Грышчанкоў, А.З.Кардоўская, А.Катулін, В.Будыс, П.Шэвердаў, Е.Наталевіч, Ф.Фядосаў, В.Марчак, В.Казлоўскі, С.Вакар, В.Цітоў, А.Стаховіч, С.Казлоўскі, Г.Амельчанка, Г.Кукса, П.Смірноў, І.Васільеў, Н.Банаеў, В.Гусеў, Л.Кандрацьеў, С.Кандрацьеў і інш.

У брыгадзе «Баці» — В.Бойка, П.Яфімчык, В.Шыбека, В.Кадо, Г.Аляксандраў, А.Гавяда, А.Жылінскі, М.Баркоўскі, В.Бірыч, Ф.Ткачэнка.

У брыгадзе «Чэкіст» — М.Хадорык, П.Клюшнікаў, Н.Масюраў, В.Мальчэўскі.

У Горацкіх партызанскіх фарміраваннях — В.Быкаў, Н.Саўчак, С.Кузьмін, Г.Думчы, М.Радзівонаў, М.Шараў, В.Бурлаеў, В.Гумінскі, В.Часаўскіх, Е.Дзерваед, А.Кукса і інш.

У брыгадзе «Граза», — Н.Ліманскі, Ф.Мяжэвіч, П.Осіпаў, у брыгадзе «Аляксея» — сакратары Аршанскага гаркома партыі Паўлоўскі і Рэзнікаў, А.Агарак і інш.

Аршанцы і выхадцы з Аршанскага патрыятычнага падполля былі ў брыгадах Шлапакова, Кірылава, Зюкава, Лявонава, Жуніна, імя Б.Хмяльніцкага. *У.С.Багамазаў.*

Дакументы сведчаць

Пастанова ЦК ВКП(б) аб арганізацыі барацьбы ў тыле германскіх войск.

18 ліпеня 1941 г.

В войне с фашистской Германией, захватившей часть советской территории, исключительно важное значение приобрела борьба в тылу германской армии. Задача заключается в том, чтобы создать невыносимые условия для германских интервентов, дезорганизовать их связь, транспорт и сами воинские части, срывать все их мероприятия, уничтожать захватчиков и их пособников, всемерно помогать созданию конных и пеших партизанских отрядов, диверсионных и истребительных групп, развернуть сеть наших большевистских подпольных организаций на захваченной территории для руководства всеми действиями против фашистских оккупантов. Во всем этом нас беззаветно поддержат в каждом селе сотни и тысячи наших братьев и друзей, попавших теперь под пяту германских фашистов и ждущих с нашей стороны помощи в деле организации сил для борьбы с оккупантами.

Чтобы придать всей этой борьбе в тылу германских войск самый широкий размах и боевую активность, необходимо взяться за организацию этого дела на месте самим руководителям республиканских, областных и районных партийных и советских организаций, которые

должны в занятых немцами районах лично возглавить это дело, возглавить группы и отряды самоотверженных борцов, уже ведущих борьбу по дезорганизации вражеских войск и по уничтожению захватчиков.

...ЦК ВКП(б) требует от ЦК национальных компартий, обкомов и райкомов в захваченных и находящихся под угрозой захвата врагом областях и районах проведения следующих мер:

1. Для организации подпольных коммунистических ячеек и руководства партизанским движением и диверсионной борьбы в районы, захваченные противником, должны быть направлены наиболее стойкие руководящие партийные, советские и комсомольские работники, а также преданные Советской власти беспартийные товарищи, знакомые с условиями района, в который они направляются.

2. В районах, находящихся под угрозой захвата противником, руководители партийных организаций должны немедля организовать подпольные ячейки.

Для обеспечения широкого развития партизанского движения в тылу противника партийные организации должны немедля организовать боевые дружины и диверсионные группы из числа участников гражданской войны и из тех товарищей, которые уже проявили себя в истребительных батальонах, в отрядах народного ополчения и др. ...

3. Партийные организации под личным руководством их первых секретарей должны выделить для сформирования и руководства партизанским движением опытных боевых и до конца преданных нашей партии, лично известных руководителям парторганизаций и проверенных на деле товарищей.

4. ...ЦК ВКП(б) требует, чтобы руководители партийных организаций лично руководили всей этой борьбой в тылу немецких войск, чтобы они вдохновляли на эту борьбу преданных Советской власти людей личными примером, смелостью и самоотверженностью, чтобы вся эта борьба получила размах непосредственной, широкой и героической поддержки Красной Армии, сражающейся на фронте с германским фашизмом.

Друкуецца па кн.: КПСС в резолюциях и решениях съездов, конференций и пленумов ЦК. Т. 6. 1941—1954. М., 1971. С. 23—24.

Партызанскія фарміраванні, якія дзейнічалі на Аршаншчыне

1-я партызанская брыгада імя К.С.Заслонава

Створана 15 ліпеня 1942 г.

У верасні 1941 г. ў Маскве па ініцыятыве начальніка паравознага дэпо ст. Орша К.С.Заслонава з добраахвотнікаў, былых чыгуначнікаў станцый Орша, Смаленск і Вязьма сфарміраваны 18-ы дыверсійны атрад. Пры пераходзе цераз лінію фронту ў Бельскім р-не Смаленскай вобласці частка байцоў атрада загінула, некаторыя з-за хваробы былі адпраўлены ў савецкі тыл. Група на чале з К.С.Заслонавым у сярэдзіне лістапада 1941 г. прыбыла ў Оршу, дзе пачала дзейнічаць падпольна. 23 лютага 1942 г. К.С.Заслонаў з групай выйшаў у лес і стварыў партызанскі атрад.

Камандзір атрада: Заслонаў Канстанцін Сяргеевіч

(«Дзядзька Косця»)

верасень 1941 — кастрычнік 1941

люты 1942 — ліпень 1942

Камісары: Якушаў Фёдар Мікітавіч

верасень 1941 — кастрычнік 1941

Андрэеў Анатоль Яўгенавіч

люты 1942 — чэрвень 1942

У сакавіку—красавіку 1942 г. ў склад атрада ўвайшлі партызанскія групы П.П.Лімаева, Д.Я.Касачова, М.В.Смірнова, Л.І.Сяліцкага, створаныя з ваеннаслужачых, якія не выйшлі з акружэння, а таксама жыхары вёсак Межава і Каменка Аршанскага раёна. Пазней да атрада К.С.Заслонава далучыліся атрады М.П.Харланава, В.П.Комлева і група ўдзельнікаў Аршанскага патрыятычнага падполля. Гэтыя атрады і групы 15 ліпеня 1942 г. былі аб'яднаны ў брыгаду К.С.Заслонава (пасля гібелі 14 лістапада 1942 г. камандзіра стала насіць яго імя). У ліпені ў брыгадзе арганізаваны атрады В.П.Комлева, А.П.Завадскага, М.В.Смірнова (пазней імя М.І.Кутузава) і дыверсійная група М.М.Лушчына, потым атрады В.Ф.Лазорскага, П.Д.Смірнова. 18 жніўня ў брыгаду ўвайшоў атрад «Быстры», які прыбыў з савецкага тылу.

У жніўні — верасні 1942 г. ў выніку цяжкіх баёў з ворагам частка партызан з атрадаў В.П.Комлева, А.П.Завадскага, П.Д.Смірнова, «Быстры» і група М.М.Лушчына выйшлі ў савецкі тыл. З партызан, што засталіся, былі створаны новыя атрады «Знішчальнік», імя Аляксандра Неўскага, імя В.І.Чапаева, імя С.Г.Лазо. У канцы 1942 г. ў склад брыгады ўвайшлі атрады імя К.Я.Варашылава, «Чэкіст» (пазней імя С.М.Кірава) і «Перамога», у маі 1943 г. — ініцыятыўная група на чале з В.П.Комлевым, на базе якой быў адноўлены атрад В.П.Комлева. У ліпені—лістападзе 1943 г. створаны атрады «Мсцівец», «Дзядзькі Косці», «Дзяніса», «Малады бальшавік», імя П.К.Панамарэнкі, імя Суворава, «Ураган», «Аршанец», «Камсамолец», «Грозны», імя Ф.Л.Фядосава, у красавіку 1944 г. — імя І.В.Сталіна.

У верасні 1943 г. паводле ўказання Віцебскага падпольнага абкома КП(б)Б атрад імя А.В.Суворава перададзены Багушэўскай брыгадзе (другога складу), атрады імя В.І.Чапаева, С,Г.Лазо, імя П.К.Панамарэнкі, «Малады бальшавік», «Мсцівец», В.П.Комлева выдзелены для арганізацыі 2-й брыгады імя К.С.Заслонава. Камандзіру брыгады К.С.Заслонаву прысвоена званне Героя Савецкага Саюза.

Брыгада дзейнічала ў Аршанскім, Сенненскім, Багушэўскім, Чашніцкім, Талачынскім раёнах Віцебскай і Халопеніцкім раёне Мінскай абласцей.

28 чэрвеня 1944 г. ў складзе 13 атрадаў яна злучылася з часцямі Чырвонай Арміі. За ўвесь перыяд дзейнасці брыгады ў ёй налічвалася 2476 партызан. З іх: мужчын — 2217, жанчын — 259; беларусаў — 1647, рускіх — 666, украінцаў — 100, іншых нацыянальнасцей — 63; членаў ВКП(б) — 106, кандыдатаў — 85, членаў ВЛКСМ — 623, беспартыйных — 1662.

Камандзіры брыгады: Заслонаў Канстанцін Сяргеевіч
ліпень 1942 — лістапад 1942, загінуў
Сяліцкі Людвіг Іванавіч
лістапад 1942 — красавік 1944
Іваноў Барыс Канстанцінавіч
красавік 1944 — чэрвень 1944
Камісары: Сяліцкі Людвіг Іванавіч
ліпень 1942 — красавік 1943
Любімцаў Міхаіл Ціханавіч
красавік 1943 — чэрвень 1943
Іваноў Барыс Канстанцінавіч
чэрвень 1943 — чэрвень 1944
Начальнікі штаба: Лімаеў Пётр Пятровіч
ліпень 1942 — лістапад 1942
Палажэнцаў Васіль Радзівонавіч
лістапад 1942 — красавік 1943
Смірноў Віктар Нікандравіч
красавік 1943 — чэрвень 1944

Атрад «Быстры»

Арганізаваны ЦК КП(б) Беларусі ў маі 1942 г. ў савецкім тыле. У чэрвені прыбыў у Аршанскі раён, дзе да жніўня дзейнічаў самастойна. У канцы верасня 1942 г. частка яго партызан выйшла ў савецкі тыл, астатнія былі размеркаваны па атрадам брыгады.

Камандзір атрада: Амельчанка Гаўрыіл Рыгоравіч
май 1942 — верасень 1942
Камісар: Алай Павел Уладзіміравіч
май 1942 — верасень 1942
Начальнік штаба: Панкратаў Васіль Нічыпаравіч
май 1942 — верасень 1942

Атрад імя К.Я.Варашылава

Створаны ў маі 1942 г. на базе груп — удзельнікаў аршанскага патрыятычнага падполля І.Ф.Сіўцова, Ф.П.Сплашнова, В.Е.Нячаева і групы ваеннаслужачых на чале з У.Александроўскім, якая не выйшла з акружэння. У атрад увайшла таксама падпольная група з в. Юрцава Аршанскага раёна.

Да чэрвеня 1942 г. атрад дзейнічаў самастойна, потым — у складзе Багушэўскай брыгады, з канца 1942 г. — у 1-й брыгадзе імя К.С.Заслонава. Са снежня 1942 па ліпень 1943 г. называўся «Мсцівец». На дзень злучэння з часцямі Чырвонай Арміі налічваў 183 партызаны.

Камандзіры атрада: Сіўцоў Іван Фаміч
май 1942 — лістапад 1942
Сабакін Міхаіл Мітрафанавіч
лістапад 1942 — красавік 1943, загінуў
Сплашноў Фёдар Пятровіч
красавік 1943 — чэрвень 1944
Камісары: Александроўскі Уладзімір
май 1942, загінуў
Анкіновіч Лявон Нічыпаравіч
май 1942 — верасень 1943
Ждановіч Васіль Сцяпанавіч
верасень 1943 — чэрвень 1944
Начальнікі штаба: Яфімчык Павел Мікалаевіч

май 1942 — чэрвень 1942
Салодкі Андрэй Ціханавіч
чэрвень 1942 — жнівень 1942
Крушынскі Аляксей Сцяпанавіч
жнівень 1942 — кастрычнік 1942
Сплашноў Фёдар Пятровіч
кастрычнік 1942 — красавік 1943
Ждановіч Васіль Сцяпанавіч
красавік 1943 — верасень 1943
Ягораў Мікалай Сцяпанавіч
верасень 1943 — чэрвень 1944, загінуў

Атрад імя М.І.Кутузава

Сфарміраваны ў маі 1942 г.

На дзень злучэння з часцямі Чырвонай Арміі налічваў 114 партызан.

Камандзіры атрада: Смірноў Мікалай Васілевіч, загінуў
Палажэнцаў Васіль Радзівонавіч
— лістапад 1942 г.
Лебедзеў Уладзімір Фёдаравіч
лістапад 1942 — снежань 1942
Свірын Пётр Дзмітрыевіч
снежань 1942 — красавік 1943
Грамыка Рыгор Аляксандравіч
май 1943 — ліпень 1943
Гурусаў Мікалай Іванавіч
ліпень 1943 — май 1944
Фірсаў
— май 1944
Камісары: Сяліцкі Людвіг Іванавіч
— ліпень 1942
Сыркін Васіль
Барысаў Мікалай Сцяпанавіч
— кастрычнік 1942
Свірын Пётр Дзмітрыевіч
лістапад 1942 — снежань 1942
Бадуноў Мікалай Іванавіч
снежань 1942 — жнівень 1943
Вятошкін Максім Іванавіч
— чэрвень 1944, загінуў
Зацюпа Іван Ісаевіч
— чэрвень 1944
Начальнікі штаба: Вольскі Усевалад Пятровіч
жнівень 1942 —
Мудракоў Емяльян Гаўрылавіч
май 1943 — сакавік 1944
Васілеўскі Стафан Афанасьевіч
сакавік 1944 — чэрвень 1944

Атрад «Перамога».

Арганізаваны летам 1942 г. з жыхароў Талачынскага раёна і ваеннаслужачых, якія не выйшлі з акружэння. Да канца лістапада 1942 г. дзейнічаў самастойна.

На дзень злучэння з часцямі Чырвонай Арміі налічваў 117 партызан.

Камандзіры атрада: Апсатараў Баймет Мінглішавіч
жнівень 1942 — студзень 1943
Вашкін Міхаіл Пятровіч
студзень 1943 — чэрвень 1944
Камісары: Карцаў Уладзімір Пятровіч
студзень 1943 — верасень 1943
Кузняцоў Мікалай Міронавіч
кастрычнік 1943 — студзень 1944
Осіпаў Рыгор Мікалаевіч
студзень 1944 — май 1944, загінуў
Белянкоў Піліп Пракопавіч
май 1944 — чэрвень 1944
Начальнікі штаба: Шаршун Павел Іванавіч
студзень 1943 — кастрычнік 1943
Смалянкоў Віктар Францавіч
кастрычнік 1943 — чэрвень 1944

Атрад імя Аляксандра Неўскага

Створаны ў верасні 1942 г.

На дзень злучэння з часцямі Чырвонай Арміі налічваў 126 партызан.

Камандзіры атрада: Фядосаў Фёдар Лявонцьевіч
верасень 1942 — красавік 1943, загінуў
Снапкоў Міхаіл Пятровіч
красавік 1943 — жнівень 1943, загінуў
Краўчанка Іван Іванавіч
верасень 1943 — лістапад 1943, загінуў
Пятроў Барыс Іванавіч
снежань 1943 — сакавік 1944
Іваноў Сцяпан Тарасавіч
сакавік 1944 — чэрвень 1944
Красноўскі Мікалай Сяргеевіч
чэрвень 1944
Камісары: Чэбрыкаў Сяргей Іванавіч
верасень 1942 — чэрвень 1944, загінуў
Васілёнак Георгій Міхайлавіч
чэрвень 1944
Начальнікі штаба: Голубеў Андрэй Якаўлевіч
студзень 1943 — кастрычнік 1943
Іваноў Сцяпан Тарасавіч
снежань 1943 — сакавік 1944
Кавалёў Віктар Аляксеевіч
сакавік 1944 — май 1944
Васілеўскі Уладзімір Васілевіч
май 1944 — чэрвень 1944

Атрад «Знішчальнік»

Створаны ў верасні 1942 г.

На дзень злучэння з часцямі Чырвонай Арміі налічваў 240 партызан.

Камандзіры атрада: Касачоў Дзяніс Яфімавіч
— лістапад 1942, загінуў
Смірноў Павел Нічыпаравіч
лістапад 1942 — студзень 1943
Тарацінскі Васіль Іванавіч
люты 1943 — снежань 1943
Кажэўнікаў Даніла Нічыпаравіч
снежань 1943 —
Навумаў Мікалай Дзмітрыевіч
люты 1944 — чэрвень 1944
Камісары: Харланаў Міхаіл Паўлавіч
верасень 1942
Купрыхін Леанід Міхайлавіч
верасень 1942 — лістапад 1942, загінуў
Банаеў Нічыпар Сямёнавіч
снежань 1942 — май 1943
Матвеенка Максім Афанасьевіч
май 1943 — студзень 1944
Сушкевіч Аляксей Аляксеевіч
люты 1944 — чэрвень 1944
Начальнікі штаба: Тарацінскі Васіль Іванавіч
лістапад 1942 — студзень 1943
Чысцякоў Аляксандр Пракопавіч
май 1943 — чэрвень 1944

Атрад імя С.М.Кірава

Сфарміраваны ў канцы лістапада 1942 г. на базе ініцыятыўнай групы М.С.Кажэўнікава, вылучанай атрадам імя К.Я.Варашылава. Да ліпеня 1943 г. называлася «Чэкіст».

На дзень злучэння з часцямі Чырвонай Арміі налічваў 127 партызан.

Камандзіры атрада: Кажэўнікаў Міхаіл Сямёнавіч
лістапад 1942 — ліпень 1943
Сырамяцкі Васіль Сямёнавіч
ліпень 1943 — чэрвень 1944
Камісары: Гурын Кузьма Ягоравіч
лістапад 1942 — верасень 1943
Піпчанка Гарый Якаўлевіч
верасень 1943 — чэрвень 1944
Начальнікі штаба: Казлоў Савелій Аляксеевіч
— снежань 1942, загінуў
Піпчанка Гарый Якаўлевіч
снежань 1942 — верасень 1943
Румо Канстанцін Сяргеевіч
верасень 1943 — чэрвень 1944

Атрад «Аршанец»

Арганізаваны ў пачатку 1943 г. з партызан, вылучаных атрадам «Знішчальнік».

На дзень злучэння з часцямі Чырвонай Арміі налічваў 85 партызан.

Камандзір атрада: Дзямідаў Кузьма Філатавіч
кастрычнік 1943 — чэрвень 1944
Камісар: Прыгода Сцяпан Трыфанавіч
кастрычнік 1943 — май 1944
Начальнікі штаба: Валаткевіч Аляксандр Канстанцінавіч
кастрычнік 1943 — сакавік 1944
Шаршун Павел Іванавіч
сакавік 1944 — красавік 1944
Тарацінскі Васіль Іванавіч
красавік 1944 — чэрвень 1944

Атрад «Дзядзькі Косці»

Сфарміраваны ў пачатку чэрвеня 1943 г. на базе групы У.Я.Сарнова, якая прыбыла ў сярэдзіне мая ў тыл ворага па заданні ЦК КП(б)Б.

На дзень злучэння з часцямі Чырвонай Арміі налічваў 246 партызан.

Камандзіры атрада: Сарноў Уладзімір Якаўлевіч
чэрвень 1943 — ліпень 1943, загінуў
Званкоў Фама Гур'янавіч
ліпень 1943 — снежань 1943
Верхаводзька Уладзімір Міхайлавіч
снежань 1943 — чэрвень 1944
Камісары: Верхаводзька Уладзімір Міхайлавіч
чэрвень 1943 — снежань 1943
Кардоўская Алена Захараўна
сакавік 1944 — чэрвень 1944
Начальнік штаба: Снытко Аляксандр Дзмітрыевіч
чэрвень 1943 — чэрвень 1944

Атрад «Дзяніса»

Створаны ў ліпені 1943 г. на базе ініцыятыўнай групы Р.Я.Лявыкіна, вылучанай атрадам «Знішчальнік».

На дзень злучэння з часцямі Чырвонай Арміі налічваў 179 партызан.

Камандзіры атрада: Лявыкін Рыгор Якаўлевіч
ліпень 1943 — май 1944, загінуў
Токараў Іван Якаўлевіч
чэрвень 1944
Камісар: Пліско Адольф Карлавіч
ліпень 1943 — чэрвень 1944

Начальнік штаба: Арыкаў Мікалай Фёдаравіч
верасень 1943 — чэрвень 1944, загінуў

Атрад «Камсамолец»

Створаны ў пачатку кастрычніка 1943 г. з партызан, вылучаных атрадам «Перамога». Паводле загада па брыгадзе ад 12 сакавіка 1944 г. з-за малалікасці быў расфарміраваны, асабовы склад яго перададзены атраду «Аршанец».

Камандзір атрада: Шаршун Павел Іванавіч
кастрычнік 1943 — сакавік 1944
Камісары: Карцаў Уладзімір Пятровіч
кастрычнік 1943 — снежань 1943
Рыжанскі Георгій Іосіфавіч
студзень 1944 — сакавік 1944
Начальнік штаба: Падалінскі Міхаіл Афанасьевіч
кастрычнік 1943 — сакавік 1944

Атрад «Ураган»

Арганізаваны ў пачатку кастрычніка 1943 г. з партызан, вылучаных атрадам «Дзяніса».

На дзень злучэння з часцямі Чырвонай Арміі налічваў 50 партызан.

Камандзіры атрада: Палянскі Канстанцін Іванавіч
кастрычнік 1943 — май 1944
Каўтун Фёдар Яўціхіевіч
май 1944 — чэрвень 1944
Голубеў Андрэй Якаўлевіч
чэрвень 1944
Камісар: Голубеў Андрэй Якаўлевіч
кастрычнік 1943 — чэрвень 1944
Начальнік штаба: Ральцэвіч Іван Іванавіч
кастрычнік 1943 — чэрвень 1944

Атрад «Грозны»

Сфарміраваны 7 лістапада 1943 г. на базе групы «Грознага» (50 чалавек), якая дзейнічала ў Аршанскім раёне з 1942 г. [Камандзір групы Катулін Аляксей Іванавіч («Грозны»), загінуў 25 кастрычніка 1942 г.].

На дзень злучэння з часцямі Чырвонай Арміі налічваў 139 партызан.

Камандзір атрада: Будыс Уладзімір Яфімавіч
лістапад 1943 — чэрвень 1944
Камісары: Наталевіч Яўстафій Архіпавіч
лістапад 1943 — студзень 1944
Васілёнак Георгій Міхайлавіч
люты 1944 — чэрвень 1944

Начальнік штаба: Галавін Аркадзь Васілевіч
лістапад 1943 г. —

Атрад імя Ф.Л.Фядосава

Створаны ў канцы лістапада 1943 г. з партызан, вылучаных атрадам імя А.Неўскага. Атраду нададзена імя камандзіра атрада імя А.Неўскага Ф.Л.Фядосава, які загінуў у баі 20 красавіка 1943 г.

На дзень злучэння з часцямі Чырвонай Арміі налічваў 103 партызаны.

Камандзір атрада: Апсатараў Баймет Мінглішавіч
лістапад 1943 — снежань 1943
Камісар: Берашэвіч Пракоп Сцяпанавіч
снежань 1943 — чэрвень 1944
Начальнік штаба: Сагалін Сяргей Паўлавіч
снежань 1943 — май 1944, загінуў

Атрад імя І.В.Сталіна

Створаны ў красавіку 1944 г.

На дзень злучэння з часцямі Чырвонай Арміі налічваў 56 партызан.

Камандзір атрада: Шаршун Павел Іванавіч
красавік 1944 — чэрвень 1944
Камісар: Скроба Аркадзь Сяргеевіч
красавік 1944 — чэрвень 1944
Начальнік штаба: Шэвердаў Пётр Іванавіч
— чэрвень 1944, загінуў.

Партызаны праводзілі дывэрсіі на чыгункі Орша — Віцебск, Орша — Лепель, Орша — Смаленск, Віцебск — Полацк, на шашэйных і грунтавых дарогах Віцебск — Бешанковічы — Камень, Орша — Мінск, Багушэўск — Сянно — Чашнікі, Сянно — Чарэя — Халопенічы, Сянно — Талачын, Орша — Сянно і інш. Вялі баі з карнікамі, каб утрымаць свой раён дзеяння, у тым ліку разграмілі варожыя гарнізоны ў вёсках Горбава Лёзненскага раёна (13.8.1942), Драголі Руднянскага раёна Смаленскай вобласці (16.8.1942), Лагі Аршанскага (25.10.1942), Купаваць, Алексінічы, Расна Сенненскага, Янова Багушэўскага раёнаў (лістапад — снежань 1942, студзень 1943). У студзені — красавіку 1943 г. ў час баявога рэйду па тэрыторыі Сенненскага, Багушэўскага, Віцебскага, Бешанковіцкага, Чашніцкага, Лепельскага раёнаў Віцебскай і Халопеніцкага раёна Мінскай абласцей правялі 8 баёў з праціўнікам. У красавіку разам з іншымі брыгадамі вывелі са строю чыгунку Орша — Ле-

Помнік партызанам у в. Сафіеўка.

пель, разграмілі станцыі Смаляны, Лемніца, Бурбін, Вятны. Толькі ў жніўні 1943 г. ў аперацыі «рэйкавая вайна» на чыгунцы Віцебск — Орша падарвалі больш за тысячу рэек. У верасні вялі цяжкія абарончыя баі ў Сенненскім раёне на рубяжах вёсак Асінаўка — Шылькі — Чараўкі — Сінянка — Аўсішча. У кастрычніку ўдзельнічалі ў баях за г. Чашнікі. У лютым 1944 г. разам з Сенненскай партызанскай брыгадай вялі баі за ўтрыманне апорнага пункта і аэрадрома каля в. Новая Беліца, у маі за выхад з варожай блакады і прарыў абароны на ўчастку воз. Сялява — в. Боркі Халопеніцкага раёна. У чэрвені 1944 г. разам з часцямі Чырвонай Арміі ўдзельнічалі ў баях за вызваленне населеных пунктаў.

2-я партызанская брыгада імя К.С.Заслонава

Створана 25 верасня 1943 г. паводле ўказання БШПР і Віцебскага падпольнага абкома КП(б)Б на базе атрадаў імя В.І.Чапаева, імя Ц.Г.Лазо, імя П.К.Панамарэнкі, «Малады бальшавік», «Мсцівец» і В.П.Комлева, вылучаных 1-й брыгадай імя К.С.Заслонава. Пазней арганізаваны атрад «Кастрычнік». Брыгадзе нададзена імя Героя Савецкага Саюза К.С.Заслонава (загінуў 17 лістапада 1942 г.).

Брыгада дзейнічала ў Аршанскім, Сенненскім, Талачынскім, Чашніцкім, Лепельскім раёнах Віцебскай і Халопеніцкім раёне Мінскай абласцей.

Злучылася з часцямі Чырвонай Арміі 27 чэрвеня 1944 г. ў складзе 7 атрадаў агульнай колькасцю 905 партызан.

З іх: мужчын — 843, жанчын — 62; беларусаў — 546, рускіх — 281, украінцаў — 48, іншых нацыянальнасцей — 30; членаў ВКП(б)Б — 18, кандыдатаў — 57, членаў ВЛКСМ — 265, беспартыйных — 565.

Камандзір брыгады: Комлеў Васіль Паўлавіч

верасень 1943 — чэрвень 1944

Камісар: Бяляеў Валянцін Емяльянавіч

верасень 1943 — чэрвень 1944

Начальнікі штаба: Палажэнцаў Васіль Радзівонавіч

верасень 1943 — снежань 1943

Бальшуноў Міхаіл Максімавіч

студзень 1944 — чэрвень 1944, загінуў

Загер Міхаіл Сахнавіч

чэрвень 1944

Атрад імя М.І.Калініна

Сфарміраваны ў сакавіку 1942 г. з групы ваеннаслужачых на чале з В.П.Комлевым, якія не выйшлі з акружэння. Да ліпеня 1942 г. дзейнічаў самастойна, потым — у складзе 1-й брыгады імя К.С.Заслонава. 18 верасня 1942 г. ў час карнай аперацыі выйшаў у савецкі тыл, дзе быў расфарміраваны.

У маі 1943 г. па заданні БШПР у тыл ворага прыбыла ініцыятыўная група на чале з В.П.Комлевым, на базе якой атрад быў узноўлены. Да кастрычніка 1943 г. насіў імя камандзіра.

На дзень злучэння з часцямі Чырвонай Арміі налічваў 146 партызан.

Камандзіры атрада: Комлеў Васіль Паўлавіч

сакавік 1942 — верасень 1942

май 1943 — верасень 1943

Панушкін Піліп Іванавіч

верасень 1943 — лістапад 1943

Бальшуноў Міхаіл Максімавіч

лістапад 1943 — студзень 1944

Загер Міхаіл Сахнавіч

студзень 1944 — чэрвень 1944
Кажэўнікаў Міхаіл Сямёнавіч
чэрвень 1944
Камісары: Шурман Іван Сямёнавіч
ліпень 1942
Сарнычаў Аляксей Еўдакімавіч
жнівень 1942 — верасень 1942
Іваноў Барыс Канстанцінавіч
май 1943 — чэрвень 1943
Панушкін Піліп Іванавіч
чэрвень 1943 — верасень 1943
Загер Міхаіл Сахнавіч
верасень 1943 — студзень 1944
Цімошкін Іван Васілевіч
студзень 1944 — чэрвень 1944
Начальнікі штаба: Гурусаў Мікалай Іванавіч
май 1943 — ліпень 1943
Лебедзеў Уладзімір Фёдаравіч
лістапад 1943 — май 1944, загінуў
Карнюшын Іван Трафімавіч
чэрвень 1944

Атрад імя С.Г.Лазо

Створаны ў верасні 1942 г. на базе групы В.Е.Бяляева, якая дзейнічала з красавіка 1942 г. У снежні 1942 г. атраду прысвоена імя С.Г.Лазо.

На дзень злучэння з часцямі Чырвонай Арміі налічваў 146 партызан.

Камандзіры атрада: Бяляеў Валянцін Емяльянавіч
верасень 1942 — верасень 1943
Лебедзеў Уладзімір Фёдаравіч
кастрычнік 1943 — лістапад 1943
Панушкін Піліп Іванавіч
лістапад 1943 — чэрвень 1944
Камісары: Бойка Павел Майсеевіч
верасень 1942, загінуў
Балашоў Гаўрыіл Рыгоравіч
снежань 1942 — чэрвень 1944
Начальнікі штаба: Падлесны Георгій Нічыпаравіч
кастрычнік 1942 — ліпень 1943
Падалінскі Марк Уласавіч
кастрычнік 1943 — лістапад 1943
Бяляеў Рыгор Васілевіч
лістапад 1943 — чэрвень 1944
Белякоў Павел Аляксеевіч
чэрвень 1944

Атрад імя В.І.Чапаева

Арганізаваны ў верасні 1942 г.

На дзень злучэння з часцямі Чырвонай Арміі налічваў 138 партызан.

Камандзіры атрада: Салаўёў А.І.
верасень 1942 — лістапад 1942, загінуў
Нячаеў Васіль Еўдакімавіч
снежань 1942 — чэрвень 1944
Камісар: Рыбчанка Мітрафан Якаўлевіч
верасень 1942 — ліпень 1944
Начальнікі штаба: Кузняцоў Мікалай Міронавіч
верасень 1942 — ліпень 1943
Кучко Захар Пятровіч
жнівень 1943 — верасень 1943
Раманаў Іван Іванавіч
верасень 1943 — чэрвень 1944

Атрад імя П.К.Панамарэнкі

Створаны ў канцы ліпеня 1943 г. ў 1-й брыгадзе імя К.С.Заслонава на базе ініцыятыўнай групы Г.Н.Падлеснага, вылучанай атрадам імя С.Г.Лазо.

На дзень злучэння з часцямі Чырвонай Арміі налічваў 84 партызаны.

Камандзір атрада: Падлесны Георгій Нічыпаравіч
ліпень 1943 — чэрвень 1944
Камісары: Аранцаў Аляксандр Аляксеевіч
ліпень 1943 — сакавік 1944
Аляксееў Іван Міхайлавіч
сакавік 1944 — красавік 1944
Хрыпач Іван Сямёнавіч
красавік 1944 — чэрвень 1944
Кузняцоў Мікалай Міронавіч
чэрвень 1944
Начальнік штаба: Кулік Міхаіл Раманавіч
снежань 1943 — май 1944

Атрад «Малады бальшавік»

Сфарміраваны ў канцы ліпеня 1943 г. ў 1-й брыгадзе імя К.С.Заслонава на базе ініцыятыўнай групы П.В.Драздова, вылучанай атрадам імя В.І.Чапаева.

На дзень злучэння з часцямі Чырвонай Арміі налічваў 129 партызан.

Камандзіры атрада: Драздоў Пракоп Васілевіч
ліпень 1943 — кастрычнік 1943
Калухін Фёдар Васілевіч
кастрычнік 1943 — чэрвень 1944
Камісары: Бондараў Іван Іосіфавіч
ліпень 1943 — снежань 1943
Лямаеў Пётр Пятровіч
снежань 1943 — чэрвень 1944

Начальнікі штаба: Нікалаенка Рыгор Аляксеевіч
ліпень 1943 —
Крукоўскі Мікалай Ігнатавіч
— сакавік 1944
Вавілаў Дзмітрый Аляксеевіч
сакавік 1944 — чэрвень 1944

Атрад «Мсцівец»

Арганізаваны ў канцы ліпеня 1943 г. ў 1-й брыгадзе імя К.С.Заслонава на базе ініцыятыўнай групы П.П.Лямаева, вылучанай атрадам імя К.Я.Варашылава.

На дзень злучэння з часцямі Чырвонай Арміі налічваў 138 партызан.

Камандзіры атрада: Лямаеў Пётр Пятровіч
ліпень 1943 — кастрычнік 1943
Сцепаненка Аляксей Іванавіч
кастрычнік 1943 — снежань 1943
Палажэнцаў Васіль Радзівонавіч
снежань 1943 — чэрвень 1944
Камісары: Стаховіч Аркадзь Пракопавіч
ліпень 1943 — кастрычнік 1943
Гусеў Васіль Васілевіч
кастрычнік 1943 — чэрвень 1944
Начальнікі штаба: Гусеў Васіль Васілевіч
ліпень 1943 — кастрычнік 1943
Хацкевіч Міхаіл Аляксеевіч
кастрычнік 1943 — чэрвень 1944

Атрад «Кастрычнік»

Створаны ў пачатку лістапада 1943 г. з партызан, вылучаных атрадамі імя С.Г.Лазо і імя В.І.Чапаева.

На дзень злучэння з часцямі Чырвонай Арміі налічваў 117 партызан.

Камандзіры атрада: Куцепаў Іван Максімавіч
лістапад 1943 — чэрвень 1944
Бяляеў Рыгор Васілевіч
чэрвень 1944
Камісары: Новікаў Мікалай Пятровіч
лістапад 1943 — май 1944
Здрадоўскі Браніслаў Іосіфавіч
май 1944 — чэрвень 1944
Начальнік штаба: Падалінскі Марк Уласавіч
лістапад 1943 — чэрвень 1944, загінуў

Партызаны праводзілі дыверсіі на чыгуначных участках Орша—Мінск, Віцебск—Орша, на шашэйных і грунтавых дарогах Віцебск—Лепель, Віцебск—Сянно, Сянно—Багушэўск, Лепель—Чашнікі і інш. У кастрычніку 1943 г. вялі баі каля в. Валосава Талачынскага раёна. 21—24.10.1943 г. разам з брыгадай «Аляксея» (пазней імя А.Ф.Данукалава) удзельнічалі ў штурме варожага гарнізона ў в. Бачэйкава Бешанковіцкага раёна, адначасова разграмілі гарнізон у в. Слабодка Бешанковіцкага раёна, правялі 9 адкрытых баёў каля дарогі Камень—Бачэйкава, у выніку рух на дарогах Лепель—Бешанковічы і Бачэйкава—Чашнікі быў спынены на доўгі час. У аперацыі «рэйкавая вайна» на чыгункі Віцебск—Орша, Талачын—Орша падарвалі больш за 300 рэек. У студзені—лютым 1944 г. вялі баі за вёскі Вялікая Вядрэнь і Гурына, разграмілі варожы гарнізон у в. Луг Чашніцкага раёна, правялі засадныя баі каля вёсак Доўгае, Люлюкі Бешанковіцкага, Лізуны Багушэўскага, Мажулева Сенненскага раёнаў, у выніку якіх сарвалі нарыхтоўку фуражу і харчоў для франтавых часцей працаўніка. У красавіку—маі 1944 г. нанеслі ўдары па варожых гарнізонах у вёсках Маковічы, Грачэвічы і Чэрцы Лепельскага раёна, актывізавалі дзейнасць дыверсійныя групы на чыгункі Масква—Мінск каля ст. Талачын і на чыгуначным участку Орша—Коханава. Разам з Сенненскай партызанскай брыгадай у час блакады прарвалі лінію варожай абароны каля вёсак Адамаўка—Сялец Халопеніцкага раёна. У чэрвені 1944 г. разам з часцямі Чырвонай Арміі вялі баі на рубяжы вёсак Пасынкі, Кажары і Гілі Чашніцкага раёна, разграмілі варожы гарнізон у в. Слабада Халопеніцкага раёна.

Бараньскае падполле

Ваенны ўраган 1941 года... Многія жыхары пасёлка Барань пайшлі на фронт, некаторыя разам з заводам былі эвакуіраваны ў глыбокі тыл. На долю іншых выпаў суровы лёс змагацца з ворагам у падполлі.

Першай явачнай кватэрай у Барані стаў дом сям'і Казлоўскіх. Пры ўсім жаданні наўрад ці можна было б адшукаць для такой цяжкай і смяротна небяспечнай справы больш надзейную сям'ю. І перш за ўсё таму,

што сям'я гэта не выклікала ніякіх падазрэнняў у паліцаяў і немцаў. Сапраўды, якія могуць быць падазрэнні, калі 17-гадовы Уладзімір Казлоўскі супрацоўнічаў з паліцаямі. Быў ён загадчыкам па забеспячэнні паліцэйскіх участкаў (гарнізонаў) зброяй, боепрыпасамі, прадуктамі. Праўда, не ведалі фашысцкія прыслужнікі, што робіць усё гэта Уладзімір па заданні Георгія Андрэевіча Яўменава, камуніста, якому адзіным партыйным цэнтрам па кіраўніцтве падпольным і партызанскім рухам на Аршаншчыне была даручана Баранская зона.

Дарэчы, Яўменаў прыйшоў на завод «Чырвоны Кастрычнік» яшчэ падлеткам у 1925 г. За кароткі час стаў адным з самых кваліфікаваных настройшчыкаў цвіковых станкоў. Тут у поўнай меры выявіліся і яго здольнасці прапагандыста і агітатара.

У першы ж дзень вайны Георгій Андрэевіч прыйшоў у ваенкамат з цвёрдым намерам пайсці на фронт добраахвотнікам. Аднак па стане здароўя атрымаў адмову. Праз некалькі дзён яго запрасілі ў гарком партыі і прапанавалі застацца ў тыле ворага для падпольнай работы. На яго ўскладалася задача па арганізацыі сувязі паміж бараньскім падполлем і партызанскім рухам, аказанні партызанам дапамогі зброяй, боепрыпасамі, узрыўчаткай, медыкаментамі. Ставіліся яму ў абавязак таксама збор разведвальнай інфармацыі, падрыхтоўка надзейных людзей для папаўнення партызанскіх атрадаў.

Цяпер ужо дакладна ўстаноўлена, шо ў гады вайны ў Барані дзейнічала моцная падпольная група, якая была цесна звязана з Аршанскім падпольным партыйным цэнтрам.

Увесь дзень Уладзімір Казлоўскі, атрымаўшы на складах неабходнае, раз'язджаў на бацькавым кані па навакольных гарнізонах. Але значная частка атрыманага асядала ў партызанскім атрадзе Максіма Хадорыка. Гэты атрад бліжэй за астатнія быў да нямецкіх гарнізонаў. Дарэчы, у гэтым партызанскім атрадзе праходзілі праверку ўсе, хто туды трапляў. Праз Уладзіміра наладжвалася сувязь з падпольшчыкамі, якія здабывалі зброю, боепрыпасы, медыкаменты. З атрадам «Макса», які, без перабольшання, выконваў ролю авангарднага падраздзялення брыгады «Чэкіст», падтрымлівала самую цесную сувязь і група Яўменава. А «паліцэйскі» Казлоўскі, акрамя ўсяго іншага, перадаваў партызанам каштоўную разведвальную інфармацыю пра варожыя гарнізоны, іх колькасць і ўзбраенне. У тых выпадках, калі Уладзімір па нейкіх прычынах не мог перадаць партызанам зброю і боепрыпасы, ён пакідаў іх у вызначаных месцах, пра якія ведала толькі яго сястра Вольга. З вялікай перасцярогай пераносіла яна гэтыя прыпасы дадому. Калі ў доме набіралася даволі грузу, бацька, Пётр Андрэевіч, запрагаў каня, пільна хаваў усё і пад выглядам паездкі за дровамі адвозіў груз у вёску Рацава на явачную кватэру настаўніцы Галіны Андрэеўны Міронавай.

Па заданні Яўменава на немцаў працавалі не толькі Казлоўскія. У паліцэйскай управе Барані служыў камсамолец Аляксей Сафрановіч, у Аршанскай паліцыі — пляменнік Георгія Андрэевіча Юрый Шаткоўскі. Усе яны здабывалі разведвальную інфармацыю. А Георгій Андрэевіч асцярожна, але настойліва, працягваў шукаць патрэбных для падполля людзей. У адзін са жнівеньскіх дзён сустрэўся яму ў пасёлку Рыгор Дзмітрыевіч Яшчук, былы кінамеханік заводскага клуба і адначасова загадчык радыёвузла. Да вайны яны нядрэнна ведалі адзін аднаго. Яшчук быў цяпер пахмурны і злосны, ён не ўтойваў прычыну таго: радыёпрыёмнік захаваў, а карыстацца ім нельга — няма батарэек. Цяпер ён, некалі самы інфармаваны чалавек, блукае, быццам з завязанымі вачамі. Не прайшла крыўда і ад таго, што з-за хваробы не ўзялі яго на фронт. Дапамагла яму былая загадчыца клуба Людміла Яфімаўна Біруч (Пякарская). Яна перадала Яшчуку дзве батарэйкі, і ў той жа дзень яны разам слухалі першую перадачу з Масквы.

Георгій Яўменаў параіў Яшчуку карыстацца радыёпрыёмнікам больш асцярожна, папрасіў усё пачутае запісваць, перадаваць яму і па магчымасці інфармаваць мясцовае насельніцтва. Рыгор так і рабіў. А праз некалькі дзён атрымаў ад Яўменава тэксты некалькіх лістовак, зробленых па перадачах далёкай, але роднай Масквы з заданнем іх размножыць, раскleіць у пасёлку і навакольных вёсках. Гэта ўжо было небяспечней, чым проста слухаць Маскву, але Яшчук і Біруч выканалі сваё першае падпольнае заданне. У арміі нябачнага фронту двума байцамі стала больш.

Не прымусіла сябе чакаць новае, больш адказнае заданне: прыцягваць да падпольнай

работы моладзь, здабываць зброю, распаўсюджваць зводкі Саўінфармбюро...

Пастаянная сувязь з Оршай падтрымлівалася праз падпольшчыка Васіля Палтарацкага, што накіроўваўся Яўменавым і рэгулярна наведваўся ў Барань. Каб не прыцягваць увагі акупантаў і іх халуёў, у нямецкай адміністрацыі арандавалі ўчастак ракі Адроў — быццам для рыбнай лоўлі.

Прыходзіў з Оршы і другі падпольшчык — Аляксандр Пульянаў. Ён прыносіў лістоўкі, якія перадаваў Яшчуку. А той, скарыстоўваючы свой аўтарытэт сярод пасялковай моладзі, прыцягваў самых смелых, самых сумленных і мужных да поўнай небяспекі і суровай рамантыкі падпольнай работы. Неўзабаве вакол яго згуртавалася цэлая група маладых патрыётаў. На свяшчэнную барацьбу з ворагам сталі Марыя Франкова, Пелагея Сіроткіна, Станіслаў Бязлюдаў, Аляксандр Харытонаў, Павел Жаваранкаў, Ядзвіга Мацулевіч, Ліза Харытонава, Пётр Сазанкоў, Антон Пахомчык, Павел Франкоў, піянер Лёня Пякарскі. Моладзь дзейнічала пад кіраўніцтвам Г.Яўменава, які, аднак, для найбольш цяжкіх і адказных заданняў стварыў яшчэ адну моцную падпольную групу. Акрамя сям'і Казлоўскіх, у яе ўвайшлі Людміла Яфімаўна Біруч (Пякарская), Ксенія Анісімаўна Бязлюдава, Іван Іванавіч Пякарскі, які ўцёк з фашысцкага палону, партызанскія сувязныя Браніслава Антонаўна Кляўзо, Марыя Міхайлаўна Кантроўская, Паліна Фёдараўна Сіроткіна, Соф'я Аляксандраўна Пахомчык.

Вось што засведчылі архіўныя матэрыялы пра Браніславу Кляўзо і Марыю Кантроўскую: «Кляўзо Браніслава Антонаўна, 1907 года нараджэння, ураджэнка і жыхарка пас. Барань, па нацыянальнасці беларуска, беспартыйная, адукацыя 4 класы, хатняя гаспадыня. У лістападзе 1941 года была прыцягнута да падпольнай работы партарганізатарам Аршанскага партыйна-камсамольскага падполля тав. Яўменавым у якасці ўтрымальніцы явачнай кватэры ў пасёлку Барань. У далейшым была перададзена на сувязь М.Хадорыку. На яе кватэры праходзілі сустрэчы тт. Г.Яўменава і М.Хадорыка, а ў далейшым з сувязнымі разведчыкамі і членамі падпольных груп. На кватэры захоўваліся лістоўкі, выбуховыя рэчывы і медыкаменты, што перадаваліся М.Кантроўскай, а таксама хаваліся і адпачывалі разведчыкі, якія ішлі ў горад і на чыгуначны вузел Оршы. У красавіку 1944 года Кляўзо Б.А. арыштавана агентамі ГФП. Пасля катаванняў, разам з Кантроўскай М.М. расстраляна на могілках в. Барань». Паказанне А.Ф.Авяр'янава (Нацыянальны архіў Рэспублікі Беларусь, ф. 4855, воп. 1, спр. 9).

«Кантроўская Марыя Міхайлаўна, 1917 года нараджэння, ураджэнка в. Задроўе Аршанскага раёна Віцебскай вобласці, па нацыянальнасці беларуска, беспартыйная, адукацыя сярэдне-медыцынская, да вайны працавала аптэкарам у Оршы. Наладзіўшы сувязь з партарганізатарам партыйна-камсамольскага падполля тав. Г.Яўменавым і начальнікам партызанскага атрада тав. М.Хадорыкам, з лістапада 1941 года стала членам падпольнай групы. Выконвала абавязкі сувязной разведчыцы. Па ўказанні кіраўнікоў уладкавалася правізарам у Зарэчанскую аптэку. Забяспечвала падпольшчыкаў і партызан медыкаментамі, перавязачнымі матэрыяламі і медыцынскімі інструментамі. З развіццём партызанскага руху лячыла параненых партызан і камандзіраў. Асабіста сама праз Кляўзо Аляксандру адпраўляла ў горад міны, збірала разведвальную інфармацыю. У красавіку 1944 года Кантроўская М.М. была арыштавана агентамі ГФП. Пасля зверскіх катаванняў разам з Кляўзо Б.А. была расстраляна на могілках в. Барань Аршанскага раёна». Паказанні А.Ф.Авяр'янава (Нацыянальны архіў Рэспублікі Беларусь, ф. 4855, воп. 1, спр. 9).

Такім чынам, да восені 1942 года камуністу-падпольшчыку Георгію Яўменаву ўдалося стварыць у пасёлку Барань невялікую па колькасці, але адчувальную для ворага па баявых дзеяннях падпольную групу. Яна забяспечвала партызан зброяй, боепрыпасамі, харчаваннем, медыкаментамі, разведвальнай інфармацыяй. Сувязь з партызанамі надзейна падтрымлівалася праз членаў падпольнай групы, сярод якіх была і бясстрашная разведчыца Аня Несцяркова. Гэта пра яе ўспамінае Людміла Яфімаўна Біруч: «Глыбокай ноччу да нас стала прыходзіць з вёскі Хімы Аршанскага раёна Аня Несцяркова, камуністка, настаўніца. Яна прасіла нас дапамагчы ёй збіраць разведвальныя даныя. Мы ёй збіралі ўсё, што яна прасіла. Так у нас з ёй усталяваліся цесныя сувязі. Яна пачала прыходзіць да нас часцей, прыносіць лістоўкі».

Падпольшчыкі пасёлка кіраваліся ў сваіх дзеяннях указаннямі падпольнага партыйнага цэнтра. Сувязь з ім падтрымліваў сам Георгій Яўменаў і, акрамя яго, Ганна Карабкіна, вопытная падпольшчыца, інструктар гаркома партыі. Вялікую дапамогу аршанскія і баранскія падпольшчыкі аказвалі спецыяльным групам, што закідваліся з савецкага тылу. Так, на чале групы штабам Заходняга фронту ў студзені 1942 года быў перакінуты ў тыл праціўніка ў раён Оршы Канстанцін Андрэевіч Дудчанка. Да вайны ён працаваў у Оршы, ведаў многіх яе жыхароў, таму хутка звязаўся з кіраўніцтвам аршанскага падполля, у тым ліку і з Георгіем Яўменавым. Падпольшчыкі здабывалі звесткі пра месцазнаходжанне аэрадромаў праціўніка і пасадачных пляцовак, баявой тэхнікі на іх, складоў гаручага і боепрыпасаў, аб'ектаў супрацьпаветранай абароны. Літаральна праз некалькі дзён пасля прызямлення разведчык К.А.Дудчанка і падпольшчык Г.А.Яўменаў абышлі і нанеслі на карту ледзь не ўсе месцы размяшчэння гітлераўскіх воінскіх часцей, складоў і іншых важных аб'ектаў у навакольлі Оршы і Барані.

У цесным кантакце з гэтымі групамі працавала Ганна Цімафееўна Карабкіна, якая была пакінута для работы ў аршанскім падполлі партыйнымі органамі. Яна дапамагала разведчыкам надзейна ўсталявацца ў Оршы і Барані, забяспечвала іх каштоўнымі звесткамі пра праціўніка. Тут трэба зазначыць, што дзейнасць Карабкінай гэтым не абмяжоўвалася. Яна арганізавала пабег вялікай групы ваеннапалонных, што выкарыстоўваліся акупантамі на работах у каменедрабільным кар'еры на ўскраіне Оршы, пераправіла іх да партызан. Аднак у жніўні 1942 года агенты СД схапілі мужную патрыётку і пасля зверскіх катаванняў расстралялі.

Група К.А.Дудчанкі, выканаўшы заданне, у жніўні 1942 года вярнулася ў савецкі тыл. Але збор звестак для гэтай разведгрупы не прыпыніўся. Па заданні Георгія Яўменава гэтай справай займаліся ўсе члены падпольнай групы Барані. Яны ведалі, што звесткі тыя для Масквы, а таму былі па магчымасці поўныя і абсалютна дакладныя. А тым часам часцей пачала наведвацца ў Барань Аня Несцяркова — удзельніца аршанскага падполля. Акрамя ўсяго іншага, яна прыкладала шмат намаганняў па наладжванні растлумачальнай работы сярод паліцэйскіх, «народнікаў», схіленні іх да пераходу ў партызаны са зброяй у руках. Трэба адзначыць, што і ў гэтай, вельмі цяжкай, вельмі тонкай справе, баранскія падпольшчыкі дабіваліся значных вынікаў. Асабліва ўдавалася гэта камсамольцам Лідзіі Гурчанковай і Надзеі Якушэвіч.

Але і вораг, моцны, вераломны, упарта шукаў падпольшчыкаў. Гестапа, СД, сакрэтная палявая паліцыя ГФП рыхтавалі і засылалі правакатараў, учынялі павальныя аблавы і вобыскі. І вось жорсткі, дакладна разлічаны ўдар па бараньскіх падпольшчыках: у руках ворага Уладзімір, Вольга і Пётр Андрэевіч Казлоўскія, Аляксандр Сафрановіч, Галіна Міронава, Марыя Кантроўская, Браніслава Кляўзо. Няма слоў, каб апісаць усе катаванні і мучэнні, праз якія прайшлі патрыёты, якія так і не выдалі ворагу падпольных тайнаў і мужна прынялі смерць. Усіх іх расстралялі.

...Цёмнай ноччу карнікі ўварваліся ў кватэру Георгія Яўменава. Гестапаўцы абшукалі ў доме кожны кут, выкінулі з ложкаў дзяцей, параспорвалі матрацы і падушкі. Жорстка збіты яшчэ да допытаў і следства, Яўменаў апынуўся ў гестапа. Там яго доўга і жорстка катавалі. Але Яўменаў не толькі ў прытомнасці, але і ў стане трызнення не сказаў ні аднаго лішняга слова. 5 сакавіка 1943 года зняволеныя бачылі, як па двары правялі скрываўленага чалавека са скручанымі калючым дротам рукамі і кінулі ў машыну. Гэта быў Георгій Яўменаў. Яго расстралялі. Пазней нехта паведаміў пра гэта жонцы Яўменава, Веры Савельеўне. Але дзе расстраляны Георгій Андрэевіч, які роў ці яма сталі яго магілай — невядома.

На змену загінуўшым станавіліся народныя мсціўцы, яны наносілі па ворагу ўдар за ўдарам. Неўзабаве пасля гібелі Г.А.Яўменава баранская група атрымала ўказанне накіроўваць у лес, да партызан, усю падрыхтаваную моладзь. Юнакі і дзяўчаты з пасёлка Барань і навакольных вёсак групамі ўліваліся ў партызанскія атрады. Разам з імі былі людзі больш сталага ўзросту, якім нельга было заставацца ў падполлі. Слова «падрыхтаваныя» было ўжыта невыпадкова. Падрыхтаваны — азначала праверaны, выпрабаваны, хто даказаў вернасць і адданасць Айчыне, народу. Менавіта такімі паказалі сябе ў партызанскіх атрадах у баях з фашыстамі былыя рабочыя завода «Чырвоны Кастрычнік» і нау-

Лізавета І.Жолудзева.

Людміла І.Жолудзева.



І.І.Жолудзеў.

К.П.Жолудзева.

чэнцы пасялковай школы Пётр Мясніковіч, Станіслаў Бязлюдаў, Антон Пахомчык, Аляксандр Харытонаў, Пётр Сазанкоў, Леанід Пякарскі, Анатоль Біруч, Марыя Франкова, Барыс Рагозін, Лізавета Харытонава, Соф'я Іванова, Міхаіл Янкоўскі, Аляксей Свярчкоў, Леанід Мацулевіч, Аркадзь Мацулевіч, Людміла Біруч (Пякарская), камандзір дыверсійнай групы Іван Пякарскі, Людміла Георгіеўна Біруч (Чумакова), Анатоль Дамброўскі, Аляксандр Сафрановіч, Генадзь Гросберг, Павел Франкоў, Ганна Буевіч, Павел Жаваранкаў, Яўген Бацюкоў, Мікалай Есіповіч, Леанід Дзмітрыеў.

У пустых заводскіх памяшканнях фашысты абсталявалі склады з гаручым. Па ўказанні Георгія Яўменава Іван Пірагоў і Іван Пякарскі аднойчы ноччу адкрылі краны ёмістасцей, і ўсё гаручае выцекла ў раку Адроў. Група Пякарскага пусціла пад адхон тры варожыя эшалоны. У яго партызанскай характарыстыцы сказана: «Смелы, энергічны, аддадзены Савецкай радзіме».

Усе мужна змагаліся з ворагам. Але не ўсе дажылі да Дня Перамогі. У баях з карнікамі загінулі партызаны-камсамольцы Станіслаў Бязлюдаў, Аляксей Свярчкоў, Пётр Мясніковіч. Пакутніцкай смерцю ў гестапа загінулі Марыя Гурчанкова, Ядзвіга Мацулевіч, Вітольд Дамброўскі, Разалія Мядзведская, Алена Азаронак і Раман Азаронак.

Былі і такія, хто актыўна дапамагаў партызанам і падпольшчыкам прадуктамі харчавання, медыкаментамі, адзеннем і абуткам, збіраў зброю і ўзрыўчатку, хаваў партызан і падпольшчыкаў. Многія з іх расстраляны на месцах, закатаваны ў фашысцкіх канцлагерах. Пра іх няма ніякіх даных у архівах, дагэтуль пра іх ніхто не ведае. І гэта вялікая несправядлівасць. Пра гэтых безыменных герояў таксама павінны ведаць і цяперашняе, і будучае пакаленні. Ніхто не павінен быць забыты, і нішто не павінна быць забытае.

А.І.Ціханскі.

Сям'я патрыётаў

Пра сям'ю Жолудзевых з в. Дубавое аднавяскоўцы жартуючы гаварылі — «жалуды з аднаго дуба», тым самым параўноўваючы сям'ю з прыгажосцю і сілай гэтага вячыстага дрэва. Жыццё гэтай сям'і неразрыўна звязана з гераічным мінулым Аршаншчыны. Бацька, Іларыён Іосіфавіч Жолудзеў, з маладых гадоў — нязменны «пан сахі і касы». У 1920-я гады аднавяскоўцы неаднаразова выбіралі яго старшынёй Машкоўскай воласці, потым старшынёй Межаўскага сельсавета. А калі над Радзімай, над роднай вёскай навіслі чорныя ваенныя хмары, ён, у 65-гадовым узросце, адразу стаў на шлях барацьбы з нямецка-фашысцкімі акупантамі.

Анатоль І.Жолудзеў.

Аркадзь І.Жолудзеў.

В.І.Жолудзеў.

Я.І.Жолудзеў.

Паводле даведкі з Нацыянальнага архіва РБ: «У жніўні 1941 года Жолудзеў І.І. аршанскім партыйна-камсамольскім падполлем быў прыцягнуты да падпольнай работы ў якасці ўтрымальніка явачнай кватэры і быў перададзены на сувязь Дз.Бохану. Будучы сапраўдным патрыётам Радзімы, Жолудзеў праявіў выключныя здольнасці як разведчык. Адрасціўшы вялікую бараду, ён свабодна пранікаў у варожыя гарнізоны то пад выглядам папрашайкі, то пад выглядам мянялы рэчаў на прадукты. Яго разведвальныя даныя былі дакладныя і каштоўныя. З развіццём партызанскага руху ён рэгулярна паведамляў аб аперацыях, якія рыхтаваліся супраць партызан. Перадаваў зброю, боепрыпасы. Не раз выконваў і асабістыя заданні К.С.Заслонава. Бохан праз яго кватэру і праз яго асабіста ў партызаны перапраўляў вялікую колькасць савецкіх грамадзян. Ім самім было падрыхтавана і пераведзена ў брыгаду больш за 30 народнікаў з узбраеннем. Быў смелы і знаходлівы».

Надзейнай памочніцай мужа ў небяспечнай падпольнай рабоце стала яго верная сяброўка Ксенія Паўлаўна. Гэта жанчына актыўна садзейнічала «сынкам-партызанам», якія прыходзілі ў яе дом і знаходзілі там мацярынскае цяпло і клопат. У кнізе Аляксея Крушынскага «Выбухі над Дняпром» можна прачытаць некалькі пранікнёных радкоў, прысвечаных Ксеніі Паўлаўне.

Жолудзевы ішлі на бой з фашыстамі ўсёй сваёй грамадой. Разам з бацькамі, памнажаючы іх сілу і славу, ваявалі дзеці. Адны, як пісаў паэт, «усім смярцям назло» вярнуліся дамоў жывымі, а іншых назаўсёды забрала вайна. У ліку апошніх аказаўся старэйшы сын Валяр'ян. Да вайны ён працаваў у Віцебску ў сістэме «Заготлён», потым некаторы час — у Заходняй Беларусі. На фронт пайшоў у першыя дні вайны. Пайшоў — і прапаў у бязлітаснай вогненнай віхуры.

Наступнай ахвярай стаў Яўген. Ён — кадравы ваенны, скончыў Ленінградскую ваенную акадэмію сувязі і служыў у дэсантным корпусе. У 1942 г. быў закінуты ў варожы тыл каля Смаленска, дзе і загінуў.

Анатоля прызвалі ў армію ў 1939 г. Ваяваў у Крыме, удзельнічаў у аперацыі «Баграціён», вызваленні Полацка, Латвіі і Літвы, дайшоў да Кёнігсберга, быў паранены. Пасля вайны на гаспадарча-адміністрацыйнай, потым выкладчыцкай рабоце.

20-гадовы Аркадзь у 1941 г. датэрмінова скончыў пагранічнае вучылішча і атрымаў прызначэнне на пасаду начальніка вузла сувязі стралковага корпуса. У жніўні 1944 г. старшы лейтэнант Аркадзь Жолудзеў загінуў пры вызваленні Латвіі.

Дочкі Іларыёна Іосіфавіча і Ксеніі Паўлаўны — Людміла і Лізавета — спачатку ўдзельніцы партыйна-камсамольскага падполля, потым партызанкі атрада «Знішчальнік» 1-й Заслонаўскай брыгады. Цяпер Людміла жыве ў Мінску, Лізавета ў Ніжнім Ноўгарадзе.

Падпольшчыкі, партызаны, воіны Чырвонай Арміі... Кожны, калі Айчына апынулася ў смяротнай небяспецы, знайшоў сваё месца ў баявым страі. І кожны, як мог, набліжаў вялікую Перамогу. Але не кожнаму, на жаль, суджана яе святкаваць... *Г.Каралёў.*

Бясстрашныя патрыёты

За 20 кіламетраў на поўдзень ад Оршы, непадалёку ад Магілёўскай шашы, раскінулася вёска Якаўлевічы. Да Вялікай Айчыннай вайны дырэктарам Якаўлевіцкай сярэдняй школы працаваў Іван Гаўрылавіч Яцко. Яго жонка Матрона Емяльянаўна была загадчыцай навучальнай часткі ў школе. У іх было чацвёра дзяцей: сыны Уладзімір, Карл, Герман і дачка Ларыса.

З першых дзён акупацыі сям'я патрыётаў уключылася ў барацьбу з гітлераўскімі захопнікамі. Малалетнія Уладзімір з Карлам збіралі ў навакольных лясах зброю для партызан, бацькі аказвалі медыцынскую дапамогу параненым байцам і камандзірам Чырвонай Арміі.

Матрона Емяльянаўна добра ведала нямецкую мову, і гэта таксама было ўзята на ўзбраенне сям'і. На школьнай пішучай машынцы размнажалі зводкі Саўінфармбюро. Уладзімір і Карл распаўсюджвалі іх сярод насельніцтва суседніх вёсак.

У Якаўлевічах была раскватаравана нямецкая вайсковая часць. Будынак школы фашысты занялі пад склад для зброі і боепрыпасаў. Аднойчы, калі п'яныя нямецкія афіцэры гарлапанілі песні ў доме дырэктара школы, Карл, Уладзімір і іх таварыш Пётр Свірыдаў прабраліся агародамі да склада. Яшчэ з вечара яны назіралі за вартавым, які, падвыпіўшы, іграў на губным гармоніку. А калі месяц схаваўся за хмару, хлопцы непрыкметна і бясшумна праніклі ў нямецкі склад праз раней ім вядомы тайны ход. Прыселі, уважліва прыслухаліся. Стаяла мёртвая цішыня. Вынеслі аўтаматы, гранаты, міны, узрывальнікі. Заданне Івана Гаўрылавіча было выканана. Зброя неўзабаве была перапраўлена партызанам.

У сакавіку 1943 года чорныя хмары навісліі над сям'ёй Яцко. Па данасе правакатара Іван Гаўрылавіч быў арыштаваны разам з жонкай і іншымі мясцовымі падпольшчыкамі. Пад канвоем іх адправілі ў Оршу. Арыштаваныя мужна перанеслі ўсе здзекі, не выдалі іншых падпольшчыкаў. Пасля допытаў у маі яны былі расстраляны. На апошнім спатканні перад расстрэлам Матрона Емяльянаўна вельмі прасіла сына Карла захаваць яе партыйны білет. Сын просьбу маці выканаў. У 1944 г. пасля вызвалення аршанскай зямлі ад захопнікаў ён перадаў білет Аршанскаму райкому КПБ.

Дзядзька Уладзіміра і Карла Мікалай Яцко таксама выконваў заданні якаўлевіцкіх падпольшчыкаў. Ён паведамляў аб карных экспедыцыях, якія рыхтаваліся супраць партызан, збіраў і перадаваў ім зброю. У маі 1943 г. гітлераўцы арыштавалі і яго, але ён уцёк. Разам з пляменнікамі Уладзімірам і Карлам перайшоў да партызан. Калі народныя мсціўцы грамілі ў в. Светачаўка нямецкую варту маслазавода, то Карла і Уладзіміра ўзялі з сабой за праваднікоў, бо яны добра ведалі падыходы да вёскі. У партызанскім атрадзе браты даглядалі параненых, гатавалі абеды, самастойна хадзілі ў разведку ў тыл ворага.

Аднойчы, калі партызаны былі акружаны немцамі, трэба было разведаць сілы ворага ў Якаўлевічах. На гэта заданне накіраваўся Карл Яцко. Ён прыйшоў у вёску ноччу, а днём быў арыштаваны і адпраўлены ў аршанскае гестапа. Якія толькі катаванні не прымянялі ворагі: палілі агнём ногі, заганялі іголкі пад пазногці, бесчалавечна білі. Але Карл не сказаў ні слова аб падпольшчыках і партызанах.

Кожную ноч з камеры аршанскай турмы вывозілі на расстрэл патрыётаў. У адзін з вераснёўскіх дзён 1943 г. жыхары Оршы бачылі, як разам з дарослымі везлі на расстрэл юнага партызана. Выратаваў яго шчаслівы выпадак. На ворагаў наляцелі савецкія самалёты. Ірваліся бомбы, свісталі асколкі. Арыштаваныя накінуліся на канваіраў. Хтосьці тады сказаў Карлу:

— Уцякай хутчэй! Табе яшчэ жыць трэба!

І Карл гэта зрабіў. Некалькі дзён блукаў па лесе. Знайшоў яго, галоднага і змучанага, нейкі стары дзядуля і прывёз у вёску...

Як жа склаўся лёс членаў сям'і Івана Гаўрылавіча Яцко? Яго брат Мікалай Гаўрылавіч загінуў у раёне Быхава, калі партызаны злучаліся з рэгулярнымі часцямі Чырвонай Арміі. Уладзімір Іванавіч жыве ў Карагандзе. Тры яго дачкі закончылі інстытуты, а сын — сярэднюю школу. Карл Іванавіч Яцко, 1930 г. нараджэння, разам з братам Германам выхоўваўся ў дзіцячым доме ў г. Кранштат Ленінградскай вобласці. Пазней быў на праф-

саюзнай і партыйнай рабоце ў г. Уральск, працаваў начальнікам цэха на заводзе. Герман Іванавіч вырашыў захаваць памяць аб маці і жыве пад яе прозвішчам — Летнікаў, працуе майстрам па кантрольна-вымяральных прыборах у г. Коўдары Мурманскай вобласці.

Ларыса Іванаўна жыве ў г. Уральск. Яна скончыла Алма-ацінскі інстытут, працуе эканамістам на заводзе.

Пасля арышту Івана Гаўрылавіча і Матроны Емяльянаўны ўсе клопаты аб малых дзецях ляглі на плечы 83-гадовай бабулі Наталлі Станіславаўны (маці Матроны Емяльянаўны). Яна і пасля вайны не пакінула ўнукаў на волю лёсу, дапамагла кожнаму знайсці сваё месца ў жыцці.

Уладзімір і Карл Яцко часта сустракаюцца з былым начальнікам штаба 35-й партызанскай брыгады Ізотам Мікалаевічам Мамонавым, які жыве ў Арэнбургскай вобласці, адказваюць на пісьмы краязнаўцаў Аршанскага і Горацкага раёнаў. *Б.Ф.Шалуха.*

К.І.Яцко.

Свае партызаны

У майго дзеда Івана і бабкі Васюты было пяцёра дзяцей: трое сыноў — Ціт, Пятрок і Даніла, а таксама дзве дачкі — Наста і Аляксандра.

Гэта па бацькавай лініі.

У майго дзеда Пракопа і бабкі Яўхім'і было тры дачкі — Ульяна, Куліна, Мальвіна.

Гэта па матчынай лініі.

І бацька Даніла, і дзед Іван, і прадзед Сямён, і прапрадзед Анціп спрадвеку жылі ў Зубрэвічах. Мусіць, зубраўцамі, тутэйшымі былі і ўсе іншыя мае продкі па бацькавай лініі.

Зубрэвічы выбудаваліся на рэчцы Вуллянцы, якая каля Копысі ўпадае ў Дняпро, першыя, бо вёскам, што ўзніклі пасля іх, давалі адпаведныя імёны — Зарэчча, Панізоў, Вярхоўе.

Вёска мая знаходзіцца непадалёку ад Друцка, яна ўваходзіла калісьці ў Друцкае княства і была спадчынным уладаннем роду князёў Друцкіх. У радавым маёнтку Зубрэвічы жыў у 15 ст. князь Дзмітрый Зубрэвіцкі, ці Мітка Сякіра, сын Сямёна Дзмітрыевіча Друцкага, таго самага Друцкага, да якога мелі за гонар прыязджаць Ягайла з Вітаўтам, дзе Ягайла нават высватаў сабе жонку: вось якія прыгажуні жылі ў нашых краях!

Мая мама Ульяна Пракопаўна нарадзілася ў вёсцы Тумінічы — гэта яшчэ бліжэй да Друцка, якраз па дарозе туды і зусім пабач з вёскаю Дзятлава, каля якой ляжаў калісьці пакінуты нам 12 ст. Рагвалодаў камень з надпісам: «госпадзі, памажы рабу свайму Васілю ў хрышчэнні імем Рагвалоду»... Так маліўся ўнук Усяслава Чарадзея.

Мае Зубрэвічы, вёска на Аршаншчыне, знаходзяцца на самай мяжы са Шклоўскім раёнам. І таму вёскі Стараселле, Капысіца, Баркі, Дымава, Рацава, Галошава, хоць гэта ўжо і Шклоўшчына ды Талачыншчына, адміністрацыйная мяжа ніколі не аддзяляла ад нашых аршанскіх: Зарэчча, Панізоўе, Вярхоўе, Альхоўка, Бярозаўка, Лісуны, Дубраўка, Тумінічы, Копысь...

Баркі для зубраўцоў — такія ж свае, як і для баркоўцаў — Зубрэвічы.

Асабліва пад час Вялікай Айчыннай вайны гэтых раённых межаў не прызнавалі партызаны. Якія там межы! Барацьба з ворагам — найперш!

Партызанская брыгада «Чэкіст», якую ўзначаліў нядаўні начальнік пагранзаставы, старшы лейтэнант Герасім Кірпіч, базіравалася ў славутым Рацаўскім лесе, што на Шклоўшчыне, а дзейнічала і ў нашым Аршанскім раёне. У справаздачах і данясеннях

партызан нярэдка сустракаецца, што «у вёсках Альхоўка і Бярозаўка Аршанскага раёна сфарміравалася група лейтэнанта Барыса Мікалаевіча Клюшнікава», што «партызаны знішчылі валасныя ўправы ў Дубраўках і Тумінічах», што «атрад № 1 заняў абарону на ўзлеску па шляху Галошава—Стараселле», што «брыгада «Чэкіст» увесь неспакойны дзень 30 жніўня правяла ў Альхоўскім лесе»...

З Альхоўкі і Бярозаўкі пасля вайны хадзілі ў нашу школу мае аднакласнікі — якраз праз Альхоўскі лес. З Дубраўкі, дзе быў сельсавет, школьнікам яшчэ я насіў у свае Зубрэвічы пошту. У Тумінічах нарадзілася мая мама. У Галошава бацька браў мяне з сабою, калі ехаў малоць зерне — там быў вадзяны млын. У Альхоўскі лес я і сёння хаджу ў грыбы і арэхі, езджу ў дровы...

І прозвішчы партызан, пра якіх успамінаюць аператыўныя зводкі, вельмі ж характэрныя для нашых вёсак: Клюшнікаў, Масюроў, Шчарбакоў, Кантроўскія...

Значыць, брыгада «Чэкіст» Герасіма Кірпіча, якому пасля вайны было прысвоена званне ганаровага грамадзяніна горада Шклова, — і наша брыгада, і наша вайна, і нашы партызаны. Мае партызаны, бо якраз за сувязь з імі, за сувязь з гэтай брыгадай загінулі мае бацькі.

Таму мне хочацца па ўспамінах знаёмых і незнаёмых партызан, па ўспамінах самога Кірпіча, па кнізе І.Прускага «Партызанская брыгада «Чэкіст», узнавіць дзейнасць славутага партызанскага злучэння, згадаць, як гэта бачылася тады мне, шасці-сямігадоваму хлапчуку, як розныя баявыя аперацыі і немцаў, і партызан адбіваліся на нашым жыцці, у нашай памяці.

Мая цётка Наста, бацькава сястра, выйшла замуж у Зарэчча, як у нас казалі, за Пуцілёнка — за Антона Кантроўскага і таксама стала Кантроўскай. У іх нарадзіліся дачка і сын. Марыя перад самай вайною працавала ўжо настаўніцаю ў вёсцы Андрэеўшчына, што за Оршаю. А Коля, якога за белыя валасы ўсе звалі Сіўчыкам, заканчваў сярэднюю школу ў Зубрэвічах.

Сіўчыка я любіў. Ён прыязджаў да нас на лыжах, я станавіўся за яго спіною на палазы, абдымаў брата ззаду, і такім чынам не адзін раз мы з'язджалі з нашых узгоркаў. Ён жа вучыў мяне і танцаваць: «тумба баба — тумба дзед». Я любіў слухаць, як ён гаварыў з маім бацькам пра палітыку.

Коля і Марыя, якая вярнулася ў Зарэчча, як і ўся тагачасная моладзь, былі шчырымі патрыётамі сваёй зямлі. Яны вельмі перажывалі, што немцы ўжо ходзяць па нашых вуліцах, гергечуць у нашых хатах. Таму не дзіўна, што яны адразу ж пачалі шукаць партызан.

Першы знайшоў іх Сіўчык. Каля Зарэчча. У Альхоўскім лесе. Ён быў адным з першых у атрадзе Клюшнікава. А потым, калі загарэліся партызанскія кастры і ў Рацаўскім лесе, Мікалай Кантроўскі і там, абжываючыся, збудаваў свой шалаш.

А неўзабаве ён удзельнічаў ужо ў смелай, адчайнай аперацыі «Сенакос».

Калі разрозненныя партызанскія атрады ў чэрвені 1942 г. нарэшце аб'ядналіся ў адну моцную брыгаду «Чэкіст», усім стала відавочна, што мсціўцам не хапае зброі — яны радаваліся кожнай лішняй вінтоўцы, кожнаму патрону. Зброю трэба было недзе шукаць!

З гэтай мэтаю і быў праведзены той дзёрзкі «Сенакос».

На левабярэжжы Дняпра, дзе савецкія войскі, адступаючы, вялі цяжкія абарончыя баі, засталося шмат зброі, якая, несабраная, валялася ў траве. Вось партызаны і вырашылі, імітуючы сенакос, сабраць яе. Але ж сабраць зброю — гэта толькі частка клопатаў. А як пераправіць праз Дняпро, у партызанскую зону?

«Чым прасцей — тым лепш», — знайшлі выйсце партызаны. Яны запрэглі коней, паклалі на калёсы ў траву вінтоўкі ды аўтаматы, а зверху на іх навалілі зноў жа мурагу. «Касцы» моцна ўвязалі вазы вяроўкамі і паехалі прама гітлераўцам у рукі — на шклоўскі мост, які вельмі ахоўваўся немцамі. Па ім яны шчасліва перабраліся на свой партызанскі бераг.

Камандзір групы «Сенакос» Іван Шчарбакоў быў узнагароджаны за гэты подзвіг медалём «За баявыя заслугі».

У «сенакашэнні» прымаў удзел і наш Сіўчык: ён «вёў» па мосце адзін з вазоў.

Памятаю, як Коля расказваў пра гэта майму бацьку:

— Мы прыкінуліся такімі ўжо бесклапотнымі хлопцамі. А самім страшна — баімся, каб дзе што не зазвінела: мост жа дрогкі! А немцы асабліва не звяртаюць на нас увагі —

сена хлопцы накасілі! Дамоў вязуць! Я ўжо са сваім возам праехаў, мінуў вартоўніцу, як раптам чую ззаду: «Хальт!» У мяне і ногі падкасіліся: усё, думаю. Думаю, вось зараз крыкне: «Хэндэ гог!» Хацеў ужо нават каня паганяць ды драла адсюль даваць. Але нельга — за мною ж іншыя падводы. Усіх падвяду. Я тады паволі паварочваюся назад і бачу: немец прыязна ўсміхаецца і паказвае сабе пад ногі. Бачу, там ляжыць мая шапка! Трымаў яе з лейцамі і нечакана згубіў. Трохі адлегла ад сэрца, але ўсё роўна ногі ватныя. Падыходжу да немца, падымаю шапку, таксама ўсміхаюся, нават «данке шон» гавару яму і паволі, спакойна, каб не выклікаць падазрэння, вяртаюся да воза...

Немцы, як толькі з'явіліся ў Зубрэвічах, адразу ж загадалі ўсім здаць зброю. Сабраныя паляўнічыя стрэльбы і вінтоўкі яны замкнулі ў калгаснай канторы. Але тую ж ноч нехта зламаў замок і людзі паразабралі вінтоўкі нанова. Кажуць, што ў гэтым удзельнічаў і мой бацька. Сцвярджаць гэтага я не магу, бо не ведаю. Ведаю толькі, што бацьку дапытвалі немцы, але адпусцілі. І яшчэ ведаю, што ў нашым таку ў розных месцах было схавана некалькі вінтовак. Усю зброю бацька аддаў Колю. Пакінуў сабе толькі адну вінтоўку. Бельгійскую. З патронамі.

А партызаны, аб'яднаўшыся, смялей пачыналі барацьбу.

«Задачы партызан, — патрабавала дырэктыва ЦК КП(б)Б, — знішчаць ворагаў, не даваць ім спакою ні ўдзень, ні ўночы. Забіваць іх усюды, дзе застанеш, забіваць чым папала: тапаром, касой, ломам, віламі, нажом».

Немцы спакушалі:

«За памыснае супрацоўніцтва будуць выдавацца грашовыя ўзнагароды, а таксама гарэлка, папяросы і махорка. Сяляне, якія асабліва вылучацца ў змаганні з бальшавіцкімі бандамі, атрымаюць як узнагароду сялянскую гаспадарку».

Аднак вяскоўцы не вельмі спакушаліся нямецкаю гарэлкаю ды махоркаю...

Неўзабаве на дарозе паміж Зарэччам і Панізоўем нехта забіў двух немцаў. Ехалі на матацыкле, іх і застрэлілі. Мусіць, яны ўваходзілі ў лік тых захопнікаў, пра якіх у сваёй справаздачы пісаў адзін з партызанскіх атрадаў нашай зоны: «забіта чатыры немцы».

Пасля ўжо ў самім Панізоўі застрэлілі яшчэ двух. Прыйшлі ўночы партызаны, прымусілі перакладчыка Ягора Шачыкава пайсці разам з імі да хаты, дзе жылі, як у нас казалі, фельдфебелі, і той выклікаў немцаў на двор. Яны выйшлі, і стрэлы тут жа паклалі іх на ганак.

Немцы тады ачапілі тры вёскі — Панізоўе, Зарэчча, Зубрэвічы і нікога не выпускалі з іх.

Адразу ж злавілі, скруцілі і пасля пакутлівых допытаў і катаванняў застрэлілі перакладчыка. Злавілі і яго дачку Маню, партызанскую сувязную, якая была замужам у Ярках за Рымшам і, нічога не ведаючы, ішла з малым сынам Ванем да бацькоў у Панізоўе. Яе дужа доўга мучылі, выкалалі ёй вочы — усё дапытваліся, дзе партызаны, а затым, як і бацьку, застрэлілі. Іван Рымша застаўся сіратою — ён і цяпер жыве ў Панізоўі.

Гітлераўцы з абедзвюх вёсак узялі заложнікаў, прымусілі іх выкапаць сабе магілы і ўсіх расстралялі.

Сярод заложнікаў быў і дзядзька Антон — муж цёткі Насты і бацька Сіўчыка. Вядома, каго ж, як не яго, браць у заложнікі — сына даўно ў вёсцы ніхто не бачыў, і многія не толькі здагадваюцца, але і пэўна ведаюць, дзе ён. Дзядзька Антон прасіў заступіцца за яго мясцовага паліцая — закінь слова, чалавеча, ты ж ведаеш, што я нічога дрэннага нікому не рабіў і ні ў чым не вінаваты — але той злосна вылаяўся і спіхнуў чалавека наском бота ў яму...

Пасля забойства бацькі небяспечна было заставацца ў Зарэччы і Марыі — уночы прыйшоў Мікалай, забраў яе з сабою і павёў у Альхоўскі лес, да партызан, у атрад Клюшнікава. Угаворвалі яны ісці з сабою і маці, але цётка Наста не схацела: пажыву, казала, пакуль што тут, у сваёй хаце.

Марыя прыходзіла да нас і пасля гэтага, але я не бачыў яе твару і здагадваўся, што яна ў нашай хаце, звычайна па шэпту — партызанка прыходзіла толькі ўночы, святла пры ёй не запальвалі ніколі і ўголас не гаварылі.

Памятаю маё дзіцячае здзіўленне і незадаволенасць. Прачынаюся аднойчы ўночы і адчуваю нейкі рух, нейкія шорахі, нейкую таямніцу, але не ў хаце, а на вуліцы. Хуценька выбягаю на двор, навонкі і ў яшчэ не поўным месяцовым святле бачу нейкія калёсы, на якіх стаяць малочныя бідоны, бачу жанчын,

што моўчкі таўкуцца ля іх, бачу маму, якая з вядром у руках таксама падступаецца да бідонаў. Пазнаю Марыю, хачу павітацца з ёю, загаварыць, але яна адварочваецца ад мяне, не прызнаецца. Мне гэта крыўдна, незразумела — хочацца ж пахваліцца перад равеснікамі: бачыце, мая сястра — партызанка, яна прыехала з Альхоўскага лесу па малако для партызан, яна не баіцца, што ў Зубрэвічах ёсць немцы, што ў тым канцы вёскі — паліцэйскі ўчастак.

Я ж не разумею, што яна не хоча, каб яе пазналі, непакоіцца, каб не наклікаць на нашу хату бяды...

Партызаны, абжываючыся, часцей за ўсё прасілі, а потым, абжыўшыся, забіралі і самі. Каб нас не чапалі, Коля Сіўчык даў нам пісьмо на цэлых дзвюх старонках. І яно, ведаеце, дапамагала. Нават тады, калі Колі не было ўжо. Аднаго разу ўзімку партызаны пазабіралі з нашай хаты ўсё падчыстую. А як паказалі пісьмо — усё аддалі: «А, Кантроўскага Мікалая мы ведаем». Адно толькі бацькаў кажушок на вярнулі: сам камандзір групы як надзеў яго на сябе, так і не зняў — вельмі ж падышоў ён яму.

А партызаны пачалі ўжо тым часам па-сапраўднаму ваяваць.

Камандзір атрада Клюшнікаў і яго камісар Масюроў вывелі са строю нямецкі вузел сувязі ў Лісунах, дзе быў варожы гарнізон. Я нават і думкі не дапускаю, што ў гэтай аперацыі не ўдзельнічаў і наш Сіўчык — ён жа малады, гарачы, Лісуны недалёка ад Зарэчча, ды і дыверсію гэту праводзіў яго ж атрад...

У мястэчку Тараселле партызаны разграмілі паліцэйскі ўчастак, здабыўшы дзесяць вінтовак і сотню патронаў. Не сумняваюся, што і ў гэтым баю ўдзельнічаў Коля Кантроўскі.

Каля станцыі Копысь мсціўцы разабралі рэйкі і пусцілі пад адхон нямецкі поезд. Не веру, што наш Коля мог астацца ўбаку ад гэтай аперацыі.

Паспрабавалі немцы змагацца з імі хітрасцю — заслалі да партызан здрадніка, які з іхнім заданнем і пайшоў у лес. Яны далі яму атруту, якую «партызан» павінен быў усыпаць у ежу, у агульны кацёл. Аднак сапраўдных партызан пра гэта папярэдзілі сувязныя, і ў лесе за ім ужо сачылі — здрадніка якраз і злавілі за гэтым заняткам. Яго застрэлілі, як кажуць, без суда і следства, тут жа закапалі непадалёку, а калі прыйшла маці, каб спытацца, дзе яе сын, паказалі свежую магілку:

— Вунь там ён, сабака, ляжыць.

Словам, няўтульна стала жыць гітлераўцам на захопленай зямлі — не давалі ім спакою партызаны.

Тады яны задумалі прачасаць і Альхоўскі, і Рацаўскі лясы, выгнаць з іх партызан і расквітацца з імі на голым месцы.

